Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

**В. І. Саітава**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

Вучэбна-метадычны дапаможнік

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб’яднаннем
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў
для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-
інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Мінск
БДУКМ
2021

УДК 016:908+025.5](075.8)
ББК 78.375.5+78.554]я73
С149

Р э ц э н з е н т ы:
*Т. А. Швед,* дырэктар дзяржаўнай установы
«Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска»;
*В. А. Касап,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў
і камунікацый установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Саітава, В. І.**
Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства : вучэб.-метад.
С149 дапам. / В. І. Саітава ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2021. – 186 с.
ISBN 978-985-522-276-8.

Разгледжаны краязнаўства як грамадская з'ява, узнікненне і асноўныя этапы беларускага краязнаўства. Паказаны сутнасць і спецыфіка бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, яго арганізацыя, кірункі і формы, сучасныя тэхналогіі.

Адрасавана студэнтам устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі бібліятэчна-інфармацыйнай галіны. Можа быць выкарыстана ў сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў.

**УДК 016:908+025.5](075.8)**
**ББК 78.375.5+78.554]я73**

**ISBN 978-985-522-276-8**

© Саітава В. І., 2021
© Афармленне. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2021

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

**Спіс умоўных скарачэнняў** ……………………………………… 4

**УВОДЗІНЫ** ……………………………………………………………... 7

**ГЛАВА 1. КРАЯЗНАЎСТВА ЯК ГРАМАДСКАЯ З’ЯВА** …………………. 10
1.1. Тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні краязнаўства ……. 10
1.2. Рэгіянальная структура Беларусі як аснова айчыннага краязнаўства ……………………………………………………… 17
1.3. Узнікненне і асноўныя этапы развіцця беларускага краязнаўства ………………………………………………………… 26
1.4. Узнікненне і развіццё беларускага бібліяграфічнага і бібліятэчнага краязнаўства ……………………………………….. 32

**ГЛАВА 2. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА** ………………. 40
2.1. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: паняцце і структура …………………………………………………………….. 40
2.2. Краязнаўчая функцыя бібліятэкі …………………………….. 46
2.3. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк ……………… 49

**ГЛАВА 3. ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ РЭСУРСЫ БІБЛІЯТЭКІ** ……………………………………………………………….. 61
3.1. Краязнаўчы дакумент як асноўная адзінка краязнаўчага фонду ……………………………………………………………… 61
3.2. Спецыфіка краязнаўчага фонду бібліятэк ………………….. 64
3.3. Тэхналагічныя этапы фарміравання краязнаўчага фонду …... 73
3.4. Электронныя краязнаўчыя калекцыі і бібліятэкі …………… 83
3.5. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі ….. 86
3.6. Падрыхтоўка краязнаўчай бібліяграфічнай і фактаграфічнай прадукцыі ……………………………………………………… 104
3.7. Краязнаўчая інфармацыя на вэб-сайтах бібліятэк …………... 137

**ГЛАВА 4. БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ** ……………………………………………………. 141
4.1. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі …………………….. 141
4.2. Дзейнасць бібліятэкі па распаўсюджанні краязнаўчых ведаў .. 146
4.3. Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў ……………. 161

**Спіс выкарыстанай літаратуры** ……………………………….. 165
**Дадаткі** ……………………………………………………….. 169

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС УМОЎНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ

АБ – абласная бібліятэка
АБІС – аўтаматызаваная бібліятэчна-інфармацыйная сістэма
АНБ – абласная навуковая бібліятэка
АУНБ – абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка
АУБ – абласная ўніверсальная бібліятэка
БД – база даных
БДУ – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
БЗ – бібліяграфічны запіс
БССР – Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка
ВКЛ – Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае
ВРІ – выбарачнае распаўсюджанне інфармацыі
ДБ БССР – Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна
ДБА – даведачна-бібліяграфічны апарат
ЗЭК – зводны электронны каталог
ІКТ – інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі
КББД – краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць
КДБА – краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат
КІП – краязнаўчыя інфармацыйныя патрэбнасці
КІР – краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы
КК – краязнаўчы каталог
КФ – краязнаўчы фонд
НББ – Нацыянальная бібліятэка Беларусі
НБДАЗ – нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў
НДР – навукова-даследчая работа
НЭБ – нацыянальная электронная бібліятэка
РЗЭК – рэгіянальны зводны электронны каталог
СБ – сельская бібліятэка
СКК – сістэма карпаратыўнай каталагізацыі
СМІ – сродкі масавай інфармацыі
СССР – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік
УВА – установа вышэйшай адукацыі
УДК – універсальная дзесятковая класіфікацыя
ФЗ – фактаграфічны запіс
ЦБС – цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
ЭБ – электронная бібліятэка
ЭІР – электронны інфармацыйны рэсурс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЭК – электронны каталог

ЭКБ – электронная краязнаўчая бібліятэка

ЭКК – электронны краязнаўчы каталог

ЭКМВ – электронны каталог мясцовых выданняў

BELMARC (Belarusian Machine-Readable Cataloging) – Беларускі камунікатыўны фармат прадстаўлення бібліяграфічных запісаў у машыначытальнай форме

IFLA (International Federation of Library Associations and Institutions) – Міжнародная Федэрацыя бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Он стар и похож на свое одиночество.
Ему рассуждать о погоде не хочется.
Он сразу с вопроса: «А Вы не из Витебска?..»
Пиджак старомодный на лацканах вытерся…
«Нет, я не из Витебска...»

Долгая пауза.

А после – слова монотонно и пасмурно:

«Тружусь и хвораю...
В Венеции выставка...
Так Вы не из Витебска?..»
«Нет, не из Витебска...»
……………………………
И жалко, что я не из Витебска.

*Встреча Р. Рождественского и М. Шагала*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Краязнаўства – грамадскі рух і комплексная навуковая дысцыпліна, аб'ектам пазнання якіх з'яўляюцца асобныя рэгіёны, населеныя пункты ў межах краіны. Краязнаўства – адзін з самых змястоўна багатых, захапляльных, маральна вартасных і яркіх кірункаў дзейнасці бібліятэк і многіх іншых устаноў і арганізацый сучаснага грамадства. На працягу многіх дзесяцігоддзяў універсальныя публічныя і навуковыя бібліятэкі, спецыяльныя бібліятэкі развіваюць розныя напрамкі краязнаўчай дзейнасці. Агульная тэндэнцыя на бягучым этапе – рэалізацыя новых сучасных формаў і метадаў краязнаўчай дзейнасці, якія праяўляюцца праз сінтэз культуратворчасці і патэнцыялу інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій. Краязнаўства стварае ўмовы для праяўлення функцый бібліятэкі як інфармацыйнага, адукацыйнага і сацыякультурнага цэнтра, больш за тое, з пазіцый бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства абгрунтавана краязнаўчая функцыя публічнай бібліятэкі.

Бібліятэчная практыка бесперапынна прадстаўляе новыя крэатыўныя ўзоры краязнаўчай дзейнасці. Гэта ўласціва як айчынным, так і замежным бібліятэкам. Інтэнсіўна развіваецца навуковая дзейнасць па абагульненні дасягненняў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, вызначэнні яе далейшых шляхоў, праводзяцца міжнародныя, нацыянальныя і рэгіянальныя навуковыя канферэнцыі, выходзіць шмат публікацый.

Ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» выкладаюцца адпаведныя вучэбныя дысцыпліны. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (БДУКМ) студэнты факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый вывучаюць дысцыпліну «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства». Яна распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Гэта дысцыпліна дапамагае студэнтам фарміраваць прафесійныя веды, уменні і навыкі па краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. У сучасных умовах актуальным з'яўляецца стварэнне новых вучэбных матэрыялаў па «Бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве». Неабходна адзначыць, што комплексныя вучэб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя выданні па гэтай дысцыпліне не выходзілі ні ў Беларусі, ні ў Расіі, ні ў іншых краінах. Вучэбныя выданні канца XX – пачатку XXI ст., апублікаваныя ў Расіі, асвятлялі адзін ці некалькі кірункаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі і на сёння патрабуюць актуалізацыі. Гэтым тлумачыцца імкненне аўтара падрыхтаваць вучэбна-метадычны дапаможнік комплекснага зместу, у якім адлюстраваны найбольш важныя тэмы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» з'яўляецца вывучэнне студэнтамі тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйных, метадычных і тэхналагічных пытанняў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк; фарміраванне ўменняў і навыкаў па стварэнні і выкарыстанні краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў; засваенне бібліятэчна-бібліяграфічных формаў і метадаў давядзення краязнаўчых ведаў да карыстальнікаў.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступных задач:

– асэнсаванне грамадскай ролі краязнаўства, яго структуры, формаў і кірункаў;

– засваенне тэрмінасістэмы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– разуменне арганізацыйных асаблівасцей краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

– прымяненне тэхналогій і методыкі формаў і працэсаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі;

– авалоданне метадамі пошукава-даследчай работы па краязнаўстве.

Вывучэнне дысцыпліны скіравана на фарміраванне прафесійных кампетэнцый:

– арганізацыя адукацыйна-выхаваўчай і культурна-дасугавай работы сродкамі бібліятэк;

– рэалізацыя бібліятэчных праграм у адпаведнасці з нацыянальнымі прыярытэтамі культурнай палітыкі.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– асноўныя паняцці бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– задачы, змест, структуру, формы арганізацыі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– віды краязнаўчых дакументаў і патрэбнасцей у краязнаўчай інфармацыі;

– формы існавання краязнаўчых бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў, тэхналогію іх стварэння, развіцця і выкарыстання ў абслугоўванні карыстальнікаў;

**умець:**

– фарміраваць і выкарыстоўваць краязнаўчыя дакументныя фонды бібліятэк, іх бібліяграфічныя рэсурсы;

– ствараць краязнаўчыя інфармацыйныя прадукты;

– рэалізоўваць усе віды краязнаўчага бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання;

**авалодаць методыкай і тэхналогіямі:**

– стварэння краязнаўчых інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў і паслуг;

– прадстаўлення паслуг па краязнаўстве;

– распаўсюджання краязнаўчых ведаў;

– пошукава-даследчай дзейнасцю.

Вучэбна-метадычны дапаможнік змяшчае 4 главы, якія адлюстроўваюць узнікненне і развіццё айчыннага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, асноўныя напрамкі і з'явы сучаснага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў Беларусі і за межамі краіны.

Дысцыпліна «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» цесна звязана з вучэбнымі дысцыплінамі: «Дакументалогія», «Гісторыя кнігі», «Бібліятэказнаўства. Тэорыя», «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя», «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» і інш. Паспяхова засвоіць змест, логіку і паслядоўнасць матэрыялу студэнтам дапамогуць дадаткі.

Выданне адрасавана студэнтам дзённай і завочнай формаў навучання ўстаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі бібліятэчна-інфармацыйнай галіны. Можа быць выкарыстана ў сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГЛАВА 1
# КРАЯЗНАЎСТВА ЯК ГРАМАДСКАЯ З'ЯВА

## 1.1. Тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні краязнаўства

Ведаць свой край, дзе нарадзіўся ці жыве, жадае кожны чалавек. Для адных – гэта навуковы інтарэс, праца і абавязак, для іншых – захапленне, турыстычная прыемнасць, але для ўсіх – замілаванасць і любоў да малой радзімы. Магутным поклічам прызываюць нашчадкаў помнікі мінуўшчыны, цудоўныя краявіды, постаці змагароў за свабоду, дзеячаў мастацтва, навукі, культуры, адукацыі. Высакародныя пачуцці падштурхоўваюць людзей да набыцця ведаў, даследавання роднага краю, працы на карысць яго развіцця, ушанавання гістарычных сімвалаў. Такая дзейнасць мае даўнія карані і выражаецца ў паняцці «краязнаўства».

У аснове тэрмінасістэмы краязнаўства пакладзена агульнаславянскае слова «край», якое спачатку абазначала тэрыторыі, размешчаныя ўздоўж межаў дзяржавы[1]. З цягам часу пад «краем» пачалі разумець любыя мясцовасці ў межах краіны, якія цэнтрываліся каля пэўнага геаграфічнага аб'екта. Тэрмінам «краязнаўства» і «краеведение», прынятым у беларускай навуцы, адпавядаюць замежныя «local history», «krajoznawstwo», «regional studies» і інш.

Сучаснае краязнаўства – гэта грамадскі рух і комплексная навуковая дысцыпліна, аб'ектам пазнання якіх з'яўляюцца асобныя рэгіёны, населеныя пункты ў межах краіны. Краязнаўства як грамадскі рух ахоплівае прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва, што аб'ядноўваюцца ў таварыствы, гурткі і іншыя аматарскія суполкі, і асобных краязнаўцаў-аматараў. Краязнаўства як навуковая дысцыпліна даследуе гісторыю, прыроду, экалогію, эканоміку, сацыяльную сферу, культуру вызначаных тэрыторый. Комплекснае краязнаўства разглядае ўсе звесткі ва ўзаемасувязі. Галіновае краязнаўства паглыблена

[1] У канстытуцыях (пастановах) вальных сеймаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, апублікаваных у «Volumina legum», так называюцца некаторыя этнічныя беларускія тэрыторыі ўздоўж мяжы з Маскоўскай дзяржавай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вывучае асобныя кірункі: гістарычны, геаграфічны, этнаграфічны, літаратурны, тапанімічны, рэлігійны і інш.

Край – канкрэтная частка тэрыторыі дзяржавы, якая ў многіх даследаваннях звычайна супадае з адзінкамі сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення і вызначаецца з улікам змяненняў гістарычных межаў, а таксама фізіка-геаграфічных, прыродна-кліматычных, геалагічных, эканамічных і іншых крытэрыяў раяніравання. Паняцце «край» працяглы час выкарыстоўваецца ў айчыннай навуцы, у тым ліку ў бібліятэказнаўстве і бібліяграфазнаўстве. Цяпер актыўна ўжываюць і тэрмін «рэгіён». Аднак ім і вытворнымі ад яго намінуюць розныя тэрыторыі, як вельмі вялікія, напрыклад Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён, заходнееўрапейскі рэгіён, дзе знаходзяцца дзясяткі дзяржаў, так і тэрыторыі ў межах адной дзяржавы, уключна да асобных населеных пунктаў, напрыклад рэгіён Мінск. Тэрмін «рэгіён» абазначае буйное тэрытарыяльнае аб’яднанне як унутры краіны, так і свеце ў цэлым, для якога характэрны агульныя кліматычныя і геаграфічныя ўмовы, развітыя эканамічныя, палітычныя, культурныя, этнічныя і іншыя сувязі.

Дзейнасць краязнаўцаў накіравана *на вывучэнне* асобных тэрыторый у межах краіны, таму яе вынікам з’яўляюцца *краязнаўчыя веды і інфармацыя*. Краязнаўцы сцвярджаюць, што непаўторныя ў часе комплексы з’яў, іх істотныя рысы самі сабой утвараюць у свядомасці даследчыка прасторавыя межы рэгіёна. Лічыцца, што вельмі малая тэрыторыя – дом, вуліца, якія не адлюстроўваюць з неабходнай паўнатой пералічаных сукупнасцей і сувязей, не могуць называцца краем, аднак з’яўляюцца аб’ектамі краязнаўчага вывучэння. На тэрыторыі краю аб’ектамі вывучэння становяцца розныя з’явы, працэсы, канкрэтныя людзі, помнікі, прадпрыемствы і інш. У краязнаўстве сфарміраваліся розныя прадметныя сферы вывучэння вызначанай мясцовасці: яе прыроды, эканомікі, дэмаграфіі, гісторыі, мовы, культуры, мастацтва. На іх аснове сфарміраваліся галіны краязнаўства. Галіновае краязнаўства паглыблена вывучае асобныя кірункі: гістарычны, геаграфічны, этнаграфічны, літаратурны, тапанімічны, мемарыяльны, лінгвакультуралагічны, ахову помнікаў і інш.[2] Сярод шматлікіх галін развіваюцца

[2] Саітава В. І. Краязнаўства // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 567.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства, і комплекснае краязнаўства, што разглядае ўсе звесткі ва ўзаемасувязі.

Краязнаўчае вывучэнне мясцовасці і атрыманыя веды маюць пэўную спецыфіку, заснаваную на *краязнаўчым прынцыпе*, які рэалізуецца праз удакладненне, канкрэтызацыю і раскрыццё навуковых паняццяў мясцовымі фактамі і вопытам практычнай дзейнасці. Можна паставіць пытанне: ці патрэбна жыхару Вілейшчыны, які жадае апісаць яе лясы, вывучаць адрозненне сасны ад ёлкі, хвойных ад ліставых? Ці трэба краязнаўцу, які вывучае фізічны тып насельніцтва Палесся, ведаць функцыі шматлікіх органаў чалавека? Вядома, не. Краязнавец зыходзіць з непаўторных і адметных рыс краю ў часе і прасторы, індывідуальнасці краю, імкнецца выявіць яго вобраз.

Менавіта ў краязнаўчых даследаваннях засяроджваюцца на тых прадметах, з'явах і працэсах, якія ўплываюць на дасягненне непаўторнасці, вобліку і адметнасці, што мае край. Такім чынам, *краязнаўчыя веды – гэта сістэматызаваныя і даставерныя звесткі пра асаблівасці гістарычнага шляху і культуры пэўнага рэгіёна і яго насельніцтва*. Існуе *краязнаўчы падыход*, які ўяўляецца абгрунтаваным пры вывучэнні краю як асобнай, непаўторнай у прасторы і часе адметнасці. Краязнаўчы падыход – асноўны метад краязнаўства. Выкарыстоўваюцца таксама метады вывучэння дакументальных крыніц, даследавання прадметаў матэрыяльнай культуры, палявыя даследаванні і назіранні, анкетаванне, картаграфаванне, бібліяграфічныя і інш.

У пэўныя гістарычныя перыяды вылучаюцца галоўныя тэмы, задачы, вакол якіх канцэнтруюцца даследаванні краю. Напрыклад, у савецкі час асабліва вывучаліся гісторыя рэвалюцыйнага і партызанскага руху, падзеі Вялікай Айчыннай вайны, развіццё сацыялістычнай эканомікі, на сучасным этапе – гістарычнае мінулае, традыцыі, звычаі, сямейна-радавая гісторыя. Высокую каштоўнасць маюць комплексныя даследаванні рэгіёнаў і населеных пунктаў, якія рознабакова адлюстроўваюць мінулае і сучаснасць.

У сваёй дзейнасці краязнаўцы выкарыстоўваюць вялікае кола крыніц. Да краязнаўчых адносяцца крыніцы ўсіх відаў, якія заключаюць звесткі аб тым ці іншым краі. Краязнаўчая інфармацыя як вынік пазнавальнай і камунікатыўнай дзейнасці ў галіне краязнаўства фіксуецца ў розных формах і перадаецца па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каналах, існых у пэўны гістарычны перыяд. У наш час як сінонімы выкарыстоўваюцца паняцці «краязнаўчая інфармацыя» і «рэгіянальная інфармацыя». Гэта інфармацыя, па змесце звязаная з рэгіёнам, з тэрытарыяльнымі праблемамі мінулага і сучаснасці. Звесткі, створаныя ў краі (рэгіёне), не залежна ад іх зместу таксама становяцца аб'ектам краязнаўчага вывучэння.

Крыніцы краязнаўства падзяляюцца на рэчавыя, пісьмовыя, аўдыявізуальныя і электронныя.

*Рэчавыя крыніцы* – гэта любыя аб'екты матэрыяльнай культуры: вынікі археалагічных раскопак (старажытныя прадметы, збудаванні або пахаванні, тое, што захавалася на зямной паверхні, пад зямлёй і пад вадой), этнаграфічных экспедыцый (вопратка, гаспадарчыя рэчы і інш.), прыродных даследаванняў (узоры мінералаў), розныя вырабы: прадукты вытворчасці (хлеб), прылады працы, бытавыя рэчы, упрыгожанні і інш.

*Пісьмовыя крыніцы* падзяляюцца на дзве асноўныя групы: актавага (дакументальнага) і літаратурнага (апавядальнага) характару. Да крыніц *актавага* характару адносяцца заканадаўчыя матэрыялы, юрыдычныя дакументы, афіцыйная перапіска, статыстычныя даныя, карты, планы, канцылярскія дакументы. Да крыніц *літаратурнага* характару – летапісы, хронікі, мемуары, запісы, дзённікі, прыватныя пісьмы, нарысы, карэспандэнцыі, гістарычныя раманы, апавяданні, аповесці, навуковыя гістарычныя працы, геаграфічныя апісанні і інш. Створаныя чалавекам, пісьмовыя крыніцы адлюстроўваюць рэчаіснасць і суб'ектыўны светапогляд аўтара, вучонага, падарожніка. Гэта прадукты гістарычнай рэальнасці пэўнага часу. Яны і частка той рэчаіснасці, і яе вобраз адначасова. Праз уяўленне чалавека жыццё адбіваецца ў іх своеасабліва і шматпланава, што дае магчымасць наступным даследчыкам пазнаваць гэту зніклую, непаўторную рэчаіснасць.

*Друкаваныя крыніцы* маюць разнастайны характар і падзяляюцца па відах (кнігі, брашуры, лістоўкі, газеты, часопісы, ноты і інш.).

*Аўдыявізуальныя крыніцы* – гуказапісы ўдзельнікаў важных падзей у краі, знакамітых ураджэнцаў, творы выяўленчага мастацтва, адпаведныя кінафотафонадакументы.

*Электронныя крыніцы* – інфармацыя на CD-ROM, DVD-ROM, сеткавыя краязнаўчыя рэсурсы. Створаны шматлікія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сайты адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, населеных пунктаў, прысвечаныя знакамітым людзям. Колькасць і інфармацыйная насычанасць рэсурсаў бесперапынна павялічваюцца.

Краязнаўства як грамадская з'ява мае наступныя асаблівасці:

1) інфраструктурны характар, г. зн. уключанасць у многія галіны, прафесіі, установы і арганізацыі;

2) комплексны характар – вывучэнне тэрыторый па шэрагу кірункаў;

3) таксанамічная[3] прырода, што праяўляецца ў дамінаванні тэрытарыяльнай прыметы, якая, у сваю чаргу, звязана з пэўным зместам.

Сучаснае краязнаўства ярка выражае свой сацыяльны характар і рэалізуецца ў важных грамадскіх функцыях: *пошукавадаследчай, выхаваўчых* (патрыятычнае, грамадзянскае, маральнае сталенне асобы, падмурак нацыянальнай свядомасці), *адукацыйнай, рэкрэацыйнай, асветніцкай* функцыях. Поліфункцыянальнасць краязнаўства садзейнічае актыўнаму выкарыстанню здабыткаў культурнай спадчыны як рэсурсу сацыяльна-эканамічнага развіцця, росту іміджу і інвестыцыйнай прывабнасці рэгіёнаў.

Задачы краязнаўства спецыфічна праяўляюцца ў розных грамадскіх сферах. Краязнаўцам-даследчыкам неабходна арганізаваць збор матэрыялу *для навуковых даследаванняў*, правесці поўную яго апрацоўку і вывучэнне. Рэкамендуецца забяспечыць рэпрэзентацыйнасць звестак, інакш аналіз можа быць прыблізным ці нават скажоным. Важна прасачыць тэрытарыяльнае распаўсюджанне аб'ектаў, з'яў. Гэта значыць, што недастаткова зафіксаваць у межах рэгіёна наяўнасць вывучаемага, але трэба адзначыць і іншыя пункты яго існавання, класіфікаваць аб'екты па групах.

Краязнаўства стымулюе развіццё многіх навук, узаемадзейнічае з імі. Даследчыкі збіраюць і апрацоўваюць фактычны матэрыял, патрэбны для развіцця этнаграфіі, фалькларыстыкі, геаграфіі, мовазнаўства, генеалогіі, тапанімікі і іншых навук.

У *папулярызацыі ведаў* і *сферы культуры* галоўнымі задачамі краязнаўства з'яўляюцца выхаванне патрыятызму, інфармацыйна-рэгіянальнага стылю мыслення, сацыяльнай актыў-

---

[3] Таксон (ад *лац.* ацэньваць) – група самастойных аб'ектаў, звязаных той ці іншай ступенню агульнасці ўласцівасцей і прымет.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці, рацыянальных паводзін у навакольнай прыроднай і сацыяльнай сферах, засваенне культурных здабыткаў рэгіянальнай супольнасці. Сацыяльная дамінанта – фарміраванне патрыятызму, любові да малой радзімы і краіны, ідэйна-маральных арыенціраў асобы, накіраваных на разумнае выкарыстанне разнастайных мясцовых рэсурсаў, заклапочанасці ў захаванні, распаўсюджанні і перадачы назапашаных культурных каштоўнасцей. Краязнаўства з'яўляецца надзейным падмуркам грамадзянскага выхавання і засваення дзяржаўнай ідэалогіі.

У *галіне адукацыі* краязнаўства на працягу многіх дзесяцігоддзяў займае важнае месца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўсіх узроўняў сістэмы адукацыі ў Беларусі. Краязнаўчы матэрыял садзейнічае больш эфектыўнаму засваенню вучэбнага матэрыялу дзякуючы цеснай сувязі з навакольным жыццём і практычнай дзейнасцю. Гэта пацвярджае і вопыт адукацыі ў замежных краінах, таму краязнаўчыя веды разглядаюцца як кампанент ведаў і светапогляду сучаснага адукаванага чалавека і спецыяліста.

Краязнаўства садзейнічае сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму развіццю розных сфер і галін асобных мясцовасцей і населеных пунктаў, зберажэнню і рацыянальнаму выкарыстанню мясцовых прыродных рэсурсаў, экалагічнаму выхаванню, турызму. Краязнаўства – дзейсны інструмент тэрытарыяльнага брэндзінгу.

Структураванне краязнаўства як грамадскай з'явы не мае агульнапрызнаных падыходаў. Шматаспектная класіфікацыя краязнаўства прапанавана М. М. Шчэрбай[4]. Яна заснавана на наступных прыметах:

– *галіновыя/тэматычныя патрэбнасці* (змястоўны аспект), на падставе якога вылучаюць этнаграфічнае, археалагічнае, геаграфічнае, гістарычнае, літаратурнае, эканамічнае краязнаўства і інш.;

– *інстытуцыянальная прымета* дазваляе вылучыць архіўнае, бібліятэчнае, музейнае, школьнае, турыстычнае, царкоўнае краязнаўства і інш. Па гэтых каналах ствараецца і распаўсюджваецца краязнаўчая інфармацыя. У межах сацыяльных

[4] Щерба Н. Н. Краеведение и библиотека: сущность, внутренняя структура и внешние связи // Московский государственный институт культуры : Межвуз. сб. науч. тр. – М., 1992. – Вып. 97. – С. 153–177.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інстытутаў фарміруецца арганізацыйная аснова краязнаўчай дзейнасці, ствараюцца адметныя тэарэтычныя, гістарычныя і метадычныя веды;

– прымета *формаў рэалізацыі краязнаўчай дзейнасці* дазваляе вылучаць тры асноўныя формы краязнаўства: дзяржаўнае, школьнае, грамадскае.

У дзяржаўным краязнаўстве вывучэннем рэгіёнаў займаюцца ўстановы навукова-даследчага профілю: навукова-даследчыя арганізацыі, музеі, архівы, бібліятэкі, УВА.

Школьнае краязнаўства развіваецца ў школах і іншых вучэбна-выхаваўчых установах, якія арганізуюць вучэбную, пазашкольную і іншую дзейнасць вучняў па краязнаўстве.

У грамадскім краязнаўстве ўдзельнічаюць краязнаўцы-аматары і грамадскія арганізацыі. Напрыклад, у беларускім краязнаўстве ў розныя часы адметную ролю адыгралі такія грамадскія арганізацыі, як Віленскі музей старажытнасцей і археалагічная камісія пры ім (XIX ст.), Беларускае краязнаўчае таварыства (канец XX ст.).

Па *прымеце «рэалізацыя грамадскіх задач»* краязнаўства падзяляецца на навуковае, вытворчае, пазнавальнае (у дапамогу адукацыі і самаадукацыі), асветніцкае, камерцыйнае.

Суб’ектамі краязнаўства з’яўляюцца асобы, якія прафесіянальна і як аматары займаюцца гэтай дзейнасцю: праводзяць краязнаўчыя даследаванні, папулярызуюць краязнаўчыя веды, выкладаюць краязнаўчыя дысцыпліны. Вывучэнне краю – абавязак спецыялістаў-краязнаўцаў. Гэта супрацоўнікі краязнаўчых музеяў, архіваў, экскурсаводы, бібліятэкары, выкладчыкі, вучоныя і інш. Вялікую колькасць складаюць і непрафесіянальныя краязнаўцы – людзі розных прафесій, узроўню адукацыі, узросту – ад школьнікаў да пенсіянераў. Прафесіянальных краязнаўцаў і аматараў вызначаюць такія інтэлектуальныя, псіхалагічныя і грамадзянскія рысы, як імкненне пастаянна паглыбляць веды пра край, высокі інтэлектуальны ўзровень, начытанасць, развітая гістарычная свядомасць, адчуванне інфармацыйнай сувязі з папярэднімі пакаленнямі, з дадзенай тэрыторыяй, высокі ўзровень кантактнасці, ініцыятыўнасць, энергічнасць, энтузіязм, здольнасць пераадольваць перашкоды, высокая самаацэнка, упэўненасць у сваіх сілах, пачуццё ўласнай годнасці. У цэлым самаасэнсаванне гэтых людзей часцей за ўсё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зыходзіць з дзейснага пачатку – з імкнення пераадолець недахопы мясцовага жыцця і актыўна ўдзельнічаць у развіцці краю.

### Пытанні і заданні да тэмы 1.1

1. Дайце азначэнне краязнаўства, раскрыйце яго ролю і задачы.
2. Назавіце арганізацыйныя формы краязнаўства.
3. Дайце характарыстыку краязнаўства па прымеце суб'екта.
4. Як праяўляецца краязнаўчы прынцып?
5. Ахарактарызуйце крыніцы і метады краязнаўства.
6. Па якіх прыметах магчыма структураваць краязнаўства?

## 1.2. Рэгіянальная структура Беларусі як аснова айчыннага краязнаўства

Пры даследаванні любой тэмы краязнавец павінен вырашыць праблему тэрытарыяльных межаў. Для гэтага выкарыстоўваюць прыметы падзелу тэрыторыі краіны, які ажыццяўляецца з разнастайнымі мэтамі дзяржаўнага кіравання, гаспадарчай, прыродаахоўнай і іншай дзейнасці. Яны носяць пераважна штучны або натуральны характар, г. зн. створаны людзьмі або сфарміраваны прыродай, часам у працэсе гістарычнага развіцця. Асноўныя прыметы падзелу наступныя:

– *адміністрацыйна-тэрытарыяльная*, паводле якой органы ўлады праводзяць падзел, неабходны для дзяржаўнага кіравання ўсімі галінамі і сферамі. Гэта падзел на часткі – адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (акругі, вобласці, губерні, землі, правінцыі, штаты, раёны, дэпартаменты і інш.), на аснове якіх ствараюцца і дзейнічаюць органы дзяржаўнай улады, кіравання і самакіравання. Асноўная мэта такога падзелу – стварыць аптымальныя ўмовы эфектыўнай арганізацыі і дзеяння ўсяго дзяржаўнага механізму. Ажыццяўляецца ён з улікам прыродна-гістарычных, эканамічных і геаграфічных умоў, нацыянальных асаблівасцей, сацыякультурных, палітычных і іншых фактараў. Раяніраванне па гэтай прымеце адлюстроўвае законы, згодна з якімі краіна дзеліцца на сістэму вялікіх і дробных цэласных адзінак і ў той жа час жыве ў гэтых адзінках як

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

дзяржаўнае цэлае. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел з'яўляецца пераважна штучным і пры неабходнасці мяняецца;

– *прыродная (фізіка-геаграфічная)*, заснаваная на еднасці прыродна-геаграфічных характарыстык, паводле яе вучонымі абгрунтоўваецца прыродна-геаграфічнае раяніраванне. Прыродныя раёны фарміруюцца пад уплывам прыродных фактараў, яны існуюць доўгія гістарычныя перыяды: напрыклад, Белавежская пушча, Палессе і інш.;

– *эканамічная*, па якой вылучаюцца эканамічныя раёны. Такое раяніраванне выкарыстоўваецца для фарміравання аптымальнай эканамічнай сістэмы з улікам традыцый гаспадарчай дзейнасці. Эканамічнае раяніраванне цесна звязана з адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структурай краіны;

– *культурна-гістарычная*, што абумоўлівае спецыфіку мясцовай культуры. Прыкладамі з'яўляюцца Падняпроўе, Панямонне, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе, Паазер'е;

– *этнічная* прымета апісвае асаблівасці рассеяння мясцовага насельніцтва, этнічнай структуры. Улічваецца ў кіраванні дэмаграфічнымі і эканамічнымі працэсамі, пры вывучэнні гістарычнага мінулага. Так, у міжваенны перыяд у БССР былі нацыянальныя сельскія саветы і калгасы. У сучасных мультыэтнічных краінах краязнаўцы пераважна даследуюць этнічны фактар як адзін з элементаў фарміравання мясцовага насельніцтва;

– *канфесіянальная*, адлюстроўвае склад насельніцтва па веравызнаннях. Праводзіцца вышэйшымі канфесіянальнымі органамі.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель пачаў фарміравацца ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Ужо пры вялікім князю Вітаўце краіна падзялялася на судова-адміністрацыйныя акругі: княствы, намесніцтвы, межы якіх склаліся ў мінулым, але не былі вызначаны заканадаўча[5]. Княствы і намесніцтвы з'яўляліся асноўнымі адміністрацый-

[5] Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 3 т. – Мінск, 2005. – Т. 1. – С. 35.

Польскі даследчык сцвярджае, што ў XIII ст. тэрыторыя ВКЛ падзялялася на дзве часткі. Цэнтральная (галоўная) складала палітычнае ядро дзяржавы. Гэта былі княствы: Ашмянскае, Браслаўскае, Берасцейскае, Віленскае, Вілкамірскае, Ваўкавыскае, Гарадзенскае, Клецкае, Кобрынскае, Копыльскае, Лідскае, Мінскае, Мсціслаўскае, Нясвіжскае, Навагрудскае, Пінскае, Рэчыцкае, Слонімскае, Слуцкае, Троцкае, – а таксама Тураўская і Упіцкая землі. Яны мелі саманазву Літва. Другая частка – землі, якія «прыслухоўваліся», – Віцебская, Валынская, Жмудская (сучасная Літва), Кіеўская, Падляшша, Падольская, Полацкая, Смаленская, Чарнігава-Северская і некаторыя інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нымі адзінкамі і, у сваю чаргу, падзяляліся на больш дробныя – воласці, якія існавалі ў XIII–XVI стст. У валасцях жылі даннікі, якія ўтваралі абшчыну. Тэрыторыі валасцей часта станавіліся аб’ектам узнагароды шляхты за службу Айчыне і вялікаму князю, таму паступова распадаліся ў працэсе феадальных зямельных адносін. Воласці, якія не былі перададзены ў прыватную ўласнасць, атрымалі назвы «старастваў», ці «дзяржаў».

Па прыкладзе Польскага каралеўства ў XV ст. намесніцтвы пачалі называцца паветамі.

У канцы XVI ст. з дзяржаўных зямель выдзелілі адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі – эканоміі, прызначаныя для задавальнення патрэб караля (вялікага князя) і прыдворнай казны. Існавалі Брэсцкая, Гродзенская, Кобрынская, Магілёўская, Лідская, Пінская і Слонімская эканоміі. Эканоміі мелі ўласнае адміністрацыйна-гаспадарчае кіраванне.

У 1413 г. былі ўтвораны першыя вялікія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – Віленскае і Троцкае ваяводствы, куды ўваходзілі каля 20 беларускіх княстваў і намесніцтваў. З пачатку XVI ст. статус ваяводстваў атрымалі Полацкае, Навагрудскае, Віцебскае і Смаленскае намесніцтвы.

У 1565–1566 гг. у ВКЛ была праведзена буйная адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа: усю тэрыторыю падзялілі на 30 паветаў. Паветы былі замацаваны Статутам 1588 г. Тэрыторыя Беларусі (поўнасцю ці часткова) уваходзіла ў 16 паветаў і 9 ваяводстваў. Гэта ваяводствы: Брэсцкае, Віленскае, Віцебскае, Мінскае, Мсціслаўскае, Навагрудскае, Полацкае, Падляшскае (цэнтр – Драгічын), Троцкае. Так, у Троцкім ваяводстве былі не толькі ўласна літоўскія землі, як Каўнас, але і заходнія тэрыторыі сучаснай Гродзеншчыны і Беласточчыны, напрыклад Гродна, Масты, Лунна, Скідзель, Сувалкі і інш. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. Мазырскі павет і Падляшскае ваяводства адышлі да Польскага каралеўства. У 1618–1654 гг. да Беларусі адносілася Смаленскае ваяводства са Старадубскім паветам. Самымі буйнымі былі Віленскае і Мінскае ваяводствы, найменшым – Мсціслаўскае.

Паводле Канстытуцыі 1791 г. былі створаны яшчэ пяць паветаў: Завілейскі (цэнтр – Паставы), Эйшышскі, Случарэцкі, Кобрынскі і Пінска-Зарэчны (з 1792 г. – Запінскі, цэнтр – Столін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура ВКЛ была больш дасканалай, чым у Польскім каралеўстве, другім суб'екце Рэчы Паспалітай.

У маі 1772 г. усходнія беларускія землі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай увайшлі ў склад Расійскай імперыі. Насельніцтва было прыведзена да прысягі імператрыцы Кацярыне ІІ, пачаліся мерапрыемствы па апісанні тэрыторыі і рэвізіі насельніцтва, неабходныя для ўвядзення новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і падаткаабкладання. На працягу некалькіх гадоў (па меры захопу новых беларускіх зямель) расійскі ўрад мяняў структуру іх адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу: ствараліся то намесніцтвы, то губерні, мяняліся іх назвы і межы. Папярэдні адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, што існаваў у ВКЛ, быў праігнараваны. Напрыклад, пасля першага падзелу ў 1772 г. усходнія беларускія землі былі ўключаны ў склад Магілёўскай і Пскоўскай губерняў і падзелены спачатку на правінцыі, затым на паветы. Самі губерні былі пераўтвораны ў намесніцтвы, а з зямель Пскоўскай вылучылі Полацкую губерню (у 1778–1796 гг. – намесніцтва) у складзе 11 паветаў.

У 1796 г. Магілёўскае і Полацкае намесніцтвы былі ліквідаваны, а паветы ўвайшлі ў склад новай, Беларускай губерні з цэнтрам у г. Віцебску[6]. Упершыню тэрмін «беларускі» быў ужыты ў якасці назвы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі на гістарычна-этнічнай тэрыторыі Беларусі. У 1802 г. Беларуская губерня была ліквідавана, а яе тэрыторыя падзелена на Віцебскую і Магілёўскую.

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі адышла цэнтральная частка Беларусі. У 1793 г. была створана Мінская губерня (у 1795–1796 гг. – намесніцтва) з цэнтрам у Мінску, якая складалася з 13 паветаў.

Пасля трэцяга падзелу былі ўтвораны Слонімская і Віленская губерні, якія ў 1797 г. увайшлі ў Літоўскую губерню[7]. Указам Аляксандра І ад 19 верасня 1801 г. гэта губерня была падзелена на Віленскую і Гродзенскую.

---

[6] Беларуская губерня ахоплівала 16 паветаў: Беліцкі, Віцебскі, Гарадоцкі, Магілёўскі, Мсціслаўскі, Аршанскі, Полацкі, Рагачоўскі, Сенненскі, Чавускі і інш.

[7] Літоўская губерня мела 19 паветаў, у тым ліку Ашмянскі, Слонімскі, Навагрудскі, Гродзенскі, Ваўкавыскі, Лідскі, Брэсцкі, Кобрынскі, Пружанскі. Губернскім горадам была Вільня.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1802–1917 гг. на тэрыторыі Беларусі існавалі пяць губерняў: Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская. Часткова беларускія землі ўваходзілі ў Ковенскую губерню. Беларускія землі былі і ў складзе Беластоцкай вобласці, пасля скасавання апошняй яе землі адышлі да Гродзенскай губерні.

З адменай Статута ВКЛ (1840) паветы былі скасаваны, але сам тэрмін захаваўся ў беларускай мове як адпаведнік «уезда» ў рускай мове.

З 1797 г. былі ўведзены воласці як састаўная частка павета, але ў 1830–1850 гг. яны былі скасаваны.

Паветы і воласці зноў былі адноўлены падчас рэформаў Аляксандра II. У 1861 г. паветы падзялілі на воласці. Воласці былі ўведзены для былых памешчыцкіх і дзяржаўных сялян як вышэйшая адзінка саслоўнага сялянскага самакіравання (існавалі валаснoе праўленне, суд, сход). Воласці былі скасаваны ў 1925 г. у БССР.

У перыяд праўлення Часовага ўрада Віленская, Віцебская, Магілёўская і Мінская губерні атрымалі назву Заходняя вобласць з цэнтрам у Мінску[8], якая ў верасні 1918 г. была перайменавана ў Заходнюю камуну і праіснавала да абвяшчэння 1 студзеня 1919 г. Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР).

Стварэнне БССР мела велізарнае значэнне для нацыянальна-дзяржаўнага развіцця беларусаў. У рэспубліцы быў праведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Аднак ва ўмовах польскага наступлення ў лютым 1919 г. Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні былі ўключаны ў склад РСФСР, а замест Магілёўскай губерні была ўтворана Гомельская. Не занятая палякамі частка БССР увайшла ў Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку, якая пасля ўступлення польскіх войскаў у Мінск спыніла сваё існаванне.

Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. значная частка беларускіх зямель адышла да Польшчы. У складзе БССР засталіся толькі шэсць паветаў: Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, Мінскі і Слуцкі былой Мінскай губерні. У гэтых межах 30 снежня 1922 г. БССР увайшла ў склад СССР. У выні-

[8] З-за пагрозы нямецкага наступлення цэнтр перанесены ў Смаленск (люты 1918 г.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ку двух тэрытарыяльных узбуйненняў рэспублікі ў 1924 і 1927 гг. з РСФСР былі вернуты ўсходнія беларускія землі, што было адной з прычын змен адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Заменены былі назвы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак дарэвалюцыйнага перыяду. Замест губерняў, паветаў і валасцей з'явіліся акругі, раёны і сельскія саветы. Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу 17 ліпеня 1927 г. былі створаны 10 акруг, 100 раёнаў і 1202 сельскія саветы. Запланаванае на пачатак 1930 г. трэцяе ўзбуйненне тэрыторыі БССР не адбылося, і частка яе ўсходніх зямель засталася ў складзе РСФСР. Да 1930 г. акругі ў БССР былі скасаваныя, але захаваўся падзел на раёны, колькасць якіх паменшылася да 90 за кошт узбуйнення. У 1935 г. адноўлены чатыры акругі на мяжы з Польшчай: Лепельская, Мазырская, Полацкая і Слуцкая.

У студзені – лютым 1938 г. былі ўтвораны пяць абласцей: Віцебская, Гомельская, Магілёўская, Мінская і Палеская.

Тэрыторыя Заходняй Беларусі з 1921 г. па 1939 г. знаходзілася ў складзе Польшчы, дзе мела неафіцыйную назву Крэсы Всходне (ускраінныя ўсходнія землі). У БССР для гэтага рэгіёна выкарыстоўвалі геаграфічную назву Заходняя Беларусь, вядомую значна раней, чым быў заключаны Рыжскі мірны дагавор[9]. На землях Заходняй Беларусі былі ўтвораны чатыры ваяводствы – Віленскае, Навагрудскае, Беластоцкае і Палескае (ваяводскі цэнтр – г. Брэст-над-Бугам) і 26 паветаў. Ва ўсіх паветах Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў пераважала беларускае насельніцтва; у Беластоцкім ваяводстве было восем беларускіх паветаў (Аўгустоўскі, Беластоцкі, Бельскі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Саколкаўскі, Сувалкаўскі і частка Высока-Мазавецкага). У Палескім ваяводстве беларусы не складалі большасці толькі ў двух паветах. Паветы падзяляліся на гміны.

17 верасня 1939 г. Заходняя Беларусь была ўключана ў склад БССР. На яе тэрыторыі стварылі новыя вобласці: Баранавіцкую, Беластоцкую, Вілейскую і Пінскую.

Напярэдадні Другой сусветнай вайны частка беларускіх зямель была перададзена Прыбалтыйскім рэспублікам, у тым

---

[9] Міхнюк У. М. Заходняя Беларусь: граніцы, тэрыторыя і насельніцтва : гістарыягр. нататкі // Бел. гіст. часопіс. – 2004. – № 11. – С. 14–21.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліку Віленскі край, сельскае насельніцтва якога пераважна было беларускім.

У час нямецка-фашысцкай акупацыі ў 1941–1944 гг. заходняя частка беларускіх зямель пад назвай акругі Беларусь была ўключана ва Усходнюю Прусію, паўднёвыя землі – у рэйхскамісарыят Украіна, а ўсходнія – у зону тылу. Астатняя частка, прыкладна 1/3, была названа генеральнай акругай Беларусь з цэнтрам у Мінску рэйхскамісарыята Остланд. Сельсаветы былі перайменаваны ў воласці.

У пасляваеннай БССР неаднаразова адбываліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкай акупацыі 17 раёнаў Беластоцкай і 3 раёны Брэсцкай абласцей былі перададзены Польшчы, ліквідавана Беластоцкая вобласць. 20 верасня 1944 г. створаны новыя вобласці: Бабруйская, Гродзенская і Полацкая, а Вілейская рэарганізавана ў Маладзечанскую. У 1954 г. адбылося скарачэнне абласцей і іх узбуйненне. Былі ліквідаваны Бабруйская, Баранавіцкая, Палеская, Пінская і Полацкая вобласці, а ў 1960 г. – Маладзечанская.

У 1964 г. праведзены даволі значныя змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні на раённым узроўні, а таксама адбылася шырокая кампанія па змене назваў населеных пунктаў, што было зроблена без уліку важнасці захоўвання гістарычных назваў. У далейшым колькасць раёнаў і сельскіх саветаў мянялася, станавілася больш гарадоў, устойліва памяншалася колькасць сельскіх пасяленняў.

Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел замацаваны ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 1998 г. № 154-З «Об административно-территориальном устройстве Республики Беларусь»[10]. Структура гэтага падзелу адлюстравана ў базе даных (БД) Нацыянальнага кадастравага агенцтва «Единый реестр административно-территориальных и территориальных единиц Республики Беларусь» (Реестр АТЕ и ТЕ), нарматыўных даведніках «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь», картаграфічных выданнях. Важнай крыніцай з'яўляюц-

[10] Об административно-территориальном устройстве Республики Беларусь [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь от 5 мая 1998 г. № 154-З : с изм. и доп. от 23 нояб. 2005 г. № 62-З и 17 мая 2007 г. № 230-З // Эталон. Законодательство Респ. Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2020.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца геаграфічныя аўтарытэтныя файлы ў Нацыянальнай базе даных аўтарытэтных запісаў (НБДАЗ).

Па стане на 2020 г. у Рэспубліцы Беларусь 6 абласцей, 118 раёнаў, 115 гарадоў, 85 пасёлкаў гарадскога тыпу, 1151 сельскіх саветаў, 23 065 сельскіх населеных пунктаў[11].

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел з'яўляецца асноўным у краязнаўстве. Ён найбольш выкарыстоўваецца ў бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве, часам у спалучэнні з некаторымі іншымі прыметамі вылучэння тэрыторый. Пры падрыхтоўцы інфармацыйнай прадукцыі, бібліяграфічным абслугоўванні карыстальнікаў, у дзейнасці па папулярызацыі краязнаўчых ведаў неабходна зыходзіць з дакладна акрэсленых межаў тэрыторыі. Напрыклад, пры падрыхтоўцы бібліяграфічнага дапаможніка пра раён выяўляюцца дакументы, прысвечаныя асобным населеным пунктам, прыродным, гаспадарчым і іншым аб'ектам, якія знаходзяцца ў яго граніцах, а пры напаўненні гістарычнага раздзела дапаможніка ўзнікае неабходнасць вывучыць дадаткова адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць краю, яго эканамічныя, рэлігійныя, грамадскія сувязі з суседнімі тэрыторыямі ў розныя гістарычныя перыяды.

Раяніраванне па прыметах прыроды належыць да найбольш складаных, паколькі будуецца на шматлікіх прыметах, і па кожнай навукоўцамі адпаведных прыродазнаўчых галін створана пэўная рэгіянальная структура. Гэта прыметы: тэктанічная (структура зямной паверхні на тэрыторыі Беларусі); кліматычная (колькасць ападкаў, тэмпература паветра, кірункі ветру і інш.); геамарфалагічная (раяніраванне далін рэк, камавых масіваў і інш.); феналагічная (назіранні за рухам сокаў, наступленнем цвіцення, калашэння, васковай спеласці раслін); гідралагічная; глебавая; забруджанне радыенуклідамі; ландшафтная і інш. Кожная з іх выклікае ўвагу краязнаўцаў. Напрыклад, рэкі і азёры, якіх у Беларусі каля 30 тыс., з'яўляюцца не толькі аб'ектам навуковых даследаванняў, гаспадарчай дзейнасці, адпачынку, але і аказваюць вялікі ўплыў на фарміраванне свядомасці і выхаванне патрыятычных пачуццяў, любві да малой радзімы і да краіны. Прыкладаў таму безліч: А. Міцкевіч і во-

[11] Республика Беларусь. Статистический ежегодник 2020 / Национальный статистический комитет Респ. Беларусь. – Минск, 2020. – С. 30.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зера Свіцязь, Э. Ажэшка, Я. Колас і Нёман, У. Караткевіч і Днепр…

Рэгіянальныя прыродныя структуры, як правіла, маюць асаблівае значэнне ў дзейнасці спецыяльных бібліятэк, напрыклад, для падрыхтоўкі бібліяграфічнай прадукцыі і выканання запытаў спецыялістаў. У краязнаўчай дзейнасці бібліятэкараў важнае значэнне мае веданне найбуйнейшых прыродна-геаграфічных правінцый, выдзеленых па сукупнасці прыродных прымет. На тэрыторыі Беларусі такіх правінцый пяць – гэта Беларускае Паазер'е, Беларуская ўзвышанасць, Перадпалессе, Прыдняпроўе (Усходне-Беларуская правінцыя), Беларускае Палессе.

Дзяржаўны запаведны фонд Рэспублікі Беларусь ахоплівае 1580 млн га. Да асабліва ахоўных прыродных тэрыторый адносяцца нацыянальныя паркі, прыродныя запаведнікі і заказнікі. Гэта Бярэзінскі біясферны запаведнік, нацыянальныя паркі «Белавежская пушча», «Прыпяцкі», «Браслаўскія азёры», «Нарачанскі», заказнікі рэспубліканскага і мясцовага прызначэння. У запаведны фонд уваходзяць 98 заказнікаў рэспубліканскага і 282 заказнікі мясцовага значэння, 327 помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння[12].

У дзейнасці бібліятэкара-краязнаўцы, як правіла, узнікае неабходнасць спалучаць прыметы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага і прыродна-геаграфічнага падзелу. Падрабязныя геаграфічныя і прыродныя апісанні правінцый і іншых аб'ектаў падаюцца ў навуковай літаратуры, шматлікіх даведачных выданнях, адлюстраваны на картах. Асобна варта звярнуць увагу на вучэбныя дапаможнікі, выдадзеныя ва ўніверсітэтах краіны[13].

На сучасным этапе эканамічнае раянiраванне праводзіцца часцей за ўсё на аснове адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, у межах якога створаны падрабязныя гаспадарчыя карты і апісанні. Са спецыяльнымі мэтамі эканамічнага стыму-

[12] Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://minpriroda.gov.by/ru. – Дата доступа: 14.05.2021.

[13] Бубенько Т. С. История и материальная культура Витебска (IX–XVIII вв.) : курс лекций. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2003. – 150 с. ; Сухарев А. А. Беларусь Северная / М-во образования Респ. Беларусь, Учреждение образования «Витебский гос. ун-т им. П. М. Машерова». – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2016. – 204 с. ; Багамольнікава Н. А. Анамастыка Гомельшчыны: назвы роднага краю ў тапонімах : практычнае кіраўніцтва для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія. – Гомель : ГДУ ім. Ф. Скарыны, 2012. – 45 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лявання створаны свабодныя эканамічныя зоны ў Мінску, Гомелі, Гродне і іншых буйных прамысловых цэнтрах.

У мінулым таксама існавалі пэўныя эканамічныя тэрытарыяльныя адзінкі. Эканамічныя адзінкі ў ВКЛ – старасты і эканоміі – служылі для забеспячэння патрэб двара караля (вялікага князя), цэнтральных кіраўнічых органаў.

Самастойнымі эканамічнымі адзінкамі ў краязнаўчых даследаваннях і апісаннях з'яўляюцца прамысловыя, сельскагаспадарчыя і іншыя прадпрыемствы.

### Пытанні і заданні да тэмы 1.2

1. Дайце азначэнне краязнаўства, раскрыйце яго ролю і задачы.
2. Назавіце арганізацыйныя формы краязнаўства.
3. Дайце характарыстыку краязнаўства па прымеце суб'екта.
4. Апішыце крыніцы і метады краязнаўства.
5. Пералічыце прыметы, па якіх вядзецца падзел тэрыторыі краіны на часткі.
6. Па якой прымеце падзел краіны на часткі лічыцца пераважна штучным?
7. Ахарактарызуйце падзел Беларусі па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прымеце ў розныя гістарычныя перыяды.
8. Прадстаўце рэгіянальнае раяніраванне Беларусі па прыродна-геаграфічнай і эканамічнай прыметах.

## 1.3. Узнікненне і асноўныя этапы развіцця беларускага краязнаўства

Краязнаўства ў Беларусі мае глыбокія гістарычныя карані, узыходзіць да фіксавання звестак пра беларускія землі ў летапісах і хроніках, падарожных запісках, у вуснай фальклорнай спадчыне. У XVI–XVIII стст. ішоў працэс узнікнення навуковага краязнаўства (прыродазнаўчага: Ж. Э. Жылібер, С. Б. Юндзіл і гістарычнага: А. Гваньіні, М. Стрыйкоўскі). Уздым краязнаўства, асабліва грамадскага, у Беларусі адбываецца з пачатку XIX ст. Выдатным фактам згуртавання аматараў краязнаўства для навуковай і асветніцкай дзейнасці стала стварэнне Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ім па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам Я. Тышкевіча. У навуковыя даследаванні і апісанні беларускіх мясцовасцей значны ўклад унеслі З. Даленга-Хадакоўскі, Т. Нарбут, Ю. Нямцэвіч, Я. Баршчэўскі, А. Кіркор, Ю. Крашэўскі, А. Плятар, К. і Я. Тышкевічы, У. Сыракомля, П. Шпілеўскі.

Спад краязнаўчага руху пасля задушэння паўстання 1863–1864 гг. змяніўся яго новым уздымам у апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст. Узніклі новыя краязнаўчыя аматарскія арганізацыі (Віцебская губернская вучоная архіўная камісія, Таварыства вывучэння Беларускага краю і інш.), выразны краязнаўчы кірунак праявіўся ў дзейнасці губернскіх статыстычных камітэтаў. Плённа займаліся краязнаўчай працай М. Я. Нікіфароўскі, А. К. Ельскі, П. В. Шэйн, Е. Р. Раманаў, А. М. Семянтоўскі, А. П. Сапуноў, Э. Гутэн-Чапскі, М. Ф. Кусцінскі, Я. Ф. Карскі, В. А. Шукевіч.

У 1920-я гг. краязнаўства ў БССР атрымала дзяржаўны статус, набыло развітую арганізацыйную структуру. Краязнаўства прызнана масавым навукова-культурным рухам; яно цесна звязана з навуковымі цэнтрамі. У БССР Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК) дзейнічала з 1923 г. пры Інстытуце беларускай культуры, у 1929–1936 гг. пры Беларускай Акадэміі навук. У бюро працавалі А. Смоліч, С. Скандракоў, В. Азбукін, К. Крапіва, В. Пераход, У. І. Пічэта, Р. К. Шукевіч-Траццякоў. У сярэдзіне 1920-х гг. склаліся тры тыпы краязнаўчых арганізацый: а) акружныя краязнаўчыя таварыствы; б) раённыя краязнаўчыя таварыствы; в) гурткі. Задачы краязнаўства вызначаліся на Усебеларускіх з’ездах (1926, 1927) і канферэнцыях (1924, 1929, 1930). У 1929 г. дзейнічала 301 краязнаўчая арганізацыя з 10 510 членамі[14]. Краязнаўцы ўнеслі выдатны ўклад у збор моўнага, этнаграфічнага, фальклорнага матэрыялу, прыродазнаўчае, санітарна-гігіенічнае вывучэнне шэрагу тэрыторый БССР. На ўздыме ў другой палове 1920-х гг. перад краязнаўчым рухам пачалі ставіцца не ўласцівыя яму задачы, з’явіліся беспадстаўныя і небяспечныя палітычныя абвінавачанні. Гэта прывяло да спынення краязнаўчай работы ў другой палове 1930-х гг., рэпрэсій. Выдатныя дзеячы краязнаўства гэтага перыяду: З. Бядуля, Д. М. Васілеўскі, М. І. Каспяровіч,

[14] Саітава В. І. Гісторыя краязнаўства Беларусі : вучэб. дапам. – Мінск, 2009. – С. 109.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З. К. Магілёўчык, П. Ф. Салаўёў, М. М. Улашчык, А. А. Шлюбскі, С. С. Шутаў, М. М. Шчакаціхін.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–30-я гг. арганізаваны рэгіянальныя аддзяленні Польскага краязнаўчага таварыства. Нацыянальна свядомымі дзеячамі створаны Беларускі музей імя І. Луцкевіча (1921–1944). Вядомыя краязнаўцы: Я. Булгак, А. Луцкевіч, Я. Драздовіч, Р. Гарашкевіч, І. Стаброўскі, Ю. Ядкоўскі.

У пасляваенны перыяд узрасла роля краязнаўства ў выхаваўчай, патрыятычнай рабоце сярод школьнікаў і моладзі. Пачалі праводзіцца турыстычна-краязнаўчыя экспедыцыі школьнікаў, стварацца школьныя музеі, шырока ажыццяўлялася пошукавая і збіральніцкая дзейнасць. Актыўна працавалі студэнцкія краязнаўчыя арганізацыі ў ВНУ (Гродзенскі пед-інстытут, Мінскі педінстытут А. М. Горкага, БДУ і інш.). Хутка пашыралася сетка краязнаўчых музеяў. У бібліятэках вызначыўся самастойны напрамак краязнаўчай дзейнасці, з’явіліся спецыялізаваныя структурныя падраздзяленні, назапашваліся краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы. Значны ўклад уносіла Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускае таварыства аховы прыроды, Беларускі фонд культуры.

У канцы 1980-х гг. пад уплывамі дэмакратызацыі грамадства, росту нацыянальнай свядомасці, а затым набыцця суверэнітэту пачаўся новы этап развіцця краязнаўства. У 1989 г. створана Беларускае краязнаўчае таварыства (БКТ; старшыня Г. А. Каханоўскі), сфарміраваліся абласныя і раённыя рэгіянальныя суполкі БКТ. Узятая за ўзор арганізацыйная структура ЦБК у новых умовах не замацавалася, БКТ спыніла сваю дзейнасць.

У сучасным краязнаўчым руху ўдзельнічаюць суб’екты розных інстытуцыянальных формаў краязнаўства. Грамадскае краязнаўства прадстаўлена шматлікімі краязнаўчымі арганізацыямі, якія самастойна вызначаюць задачы, напрамкі і формы дзейнасці, сярод іх Віцебскі краязнаўчы фонд імя А. П. Сапунова (старшыня А. М. Падліпскі), «Талака» (Гомель), Заходнепалескае навукова-краязнаўчае таварыства «Загароддзе» (старшыня Ф. Д. Клімчук), Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О. Гедэмана, краязнаўчае таварыства ім. К. Тызенгаўза (г. Па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ставы), Тураўскае навукова-асветнае таварыства. Працягласць існавання і актыўнасць дзейнасці грамадскіх краязнаўчых арганізацый залежыць ад шэрагу фактараў, у тым ліку іх лідараў. Задачы краязнаўства з'яўляюцца арганічнымі і для грамадскіх арганізацый экалагічнага, турыстычнага, нацыянальна-культурнага і іншага характару. Сярод рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый плённа працуюць у краязнаўчым кірунку Беларускі фонд культуры і Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Плённа працуюць асобныя краязнаўцы-аматары, прадстаўнікі розных прафесій.

Школьнае краязнаўства каардынуецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскім цэнтрам экалогіі і краязнаўства, адпаведнымі ўстановамі ў абласцях і раёнах. Вызначаецца высокай арганізаванасцю, разнастайнасцю напрамкаў і форм дзейнасці. У школах праводзяцца этапы Усебеларускай турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» (раней «Наш край»), штогадовы рэспубліканскі конкурс «Пазнай Радзіму – выхавай сябе», працуюць шматлікія краязнаўчыя музеі, вядзецца пошукава-даследчая работа, выкладаюцца краязнаўчыя факультатыўныя дысцыпліны («Оршеведение», «Стаўбцоўшчыназнаўства»).

Музейнае краязнаўства лідзіруе ў кірунках навуковай і асветніцкай дзейнасці. З'явіліся дзяржаўныя музеі гісторыі гарадоў Магілёва і Мінска. Музеі рыхтуюць буйныя асветніцкія праекты, праводзяць навуковыя канферэнцыі, публікуюць навуковыя вынікі: зборнікі навуковых артыкулаў і іншых матэрыялаў («Краязнаўчыя запіскі» Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, «Магілёўшчына» Магілёўскага абласнога музея імя Е. Р. Раманава).

Ва ўстановах вышэйшай адукацыі (УВА) уносіцца важкі ўклад у вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыплін комплексу краязнаўства, рыхтуюцца кадры ў галіне геаграфічнага, гістарычнага, літаратурнага, моўнага, музейнага, бібліятэчнага і іншых напрамкаў краязнаўства.

Інтэграваная вучэбная дысцыпліна «Краязнаўства» выкладаецца студэнтам спецыяльнасці 1-89 01 01 Туризм и гостеприимство ў БДУ, Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, Полацкім, Палескім дзяржаўных універсітэтах і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па гэтай жа спецыяльнасці, але ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі – вучэбная дысцыпліна «Краеведение Беларуси». Вучэбная дысцыпліна «Краеведение Беларуси» выкладаецца на філалагічных факультэтах універсітэтаў.

Ва УВА выкладаюцца шматлікія краязнаўчыя вучэбныя дысцыпліны, адпаведныя будучай спецыяльнасці. Так, гісторыкі, студэнты спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейное дело и охрана историко-культурного наследия (по направлениям) вывучаюць «Гістарычнае краязнаўства» (БДУ, БДУКМ, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны і інш.); «Краеведение с основами музееведения» (БДУ); «Краеведение и этнография Беларуси» (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка); «Краязнаўства і этналогія», «Літаратурнае краязнаўства», «Физическая география Витебской области» (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава); «Краеведение и этнология Беларуси» – з’яўляецца асноўнай (дзяржаўны кампанент) у адукацыйнай праграме I ступені для спецыяльнасці «гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» ў Мазырскім дзяржаўным універсітэце, Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова; дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» і «Краязнаўчае крыніцазнаўства» выкладаюцца студэнтам спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) (БДУКМ).

Суб’екты краязнаўчага руху імкнуцца да ўзаемадзеяння і абмену дасягненнямі. Выдатная роля належыць «Краязнаўчай газеце» (з 2003 г.; галоўны рэдактар М. Гілеп), на старонках якой асвятляюцца навіны краязнаўства, вынікі завершаных даследаванняў, формы працы музеяў, бібліятэк, устаноў адукацыі, звесткі пра беларускіх краязнаўцаў, друкуецца «Малая краязнаўчая энцыклапедыя». Краязнаўчы рух падтрымліваецца мясцовымі ўладамі, што дазваляе рэалізоўваць буйныя тэматычныя праекты, укараняць вынікі даследаванняў.

Адметнай з’явай сучаснасці сталі краязнаўчыя канферэнцыі і чытанні, якія праводзяцца на міжнародным, рэспубліканскім і рэгіянальным узроўнях у многіх раённых, абласных цэнтрах. Традыцыйнымі сталі Браслаўскія, Гродзенскія, Карэліцкія, Каладзееўскія (г. Барысаў), Лепельскія, Лунінецкія, Магілёўскія, Шацілкаўскія (г. Светлагорск) і многія іншыя чытанні і кан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ферэнцыі. Рэгулярна праводзяцца раённыя, гарадскія, абласныя і рэспубліканскія педагагічныя краязнаўчыя чытанні.

Суб'екты краязнаўства актыўна распаўсюджваюць фіксаваныя краязнаўчыя веды праз друк, СМІ, інтэрнэт. Вынікам дзейнасці мясцовых краязнаўцаў і спецыялістаў навуковых устаноў было завяршэнне ў 2005 г. выпуску ўнікальнага шматтомнага выдання гісторыка-дакументальных хронік «Памяць». Выходзяць краязнаўчыя навуковыя, даведачныя, навукова-папулярныя і вучэбныя выданні. Сярод іх комплексныя апісанні рэгіёнаў, хронікі, радаводы, мемуары.

Краязнаўчыя матэрыялы друкуюцца ў рэспубліканскім, абласным і раённым перыядычным друку, у тым ліку ў выданнях краязнаўчага характару «Лідскі летапісец» (з 1997 г.), «Куфэрак Віленшчыны» (з 2000 г.), «Павет» (выданне браслаўскіх краязнаўцаў, з 2001 г.), «Лунінецкі сшытак» (з 2002 г.), «Вілейскі павет» (з 2014 г.) і інш. Дакументальныя фільмы і праграмы папулярызуюць краязнаўчыя веды («Падарожжа дылетанта», «Наперад у мінулае»).

Дасягненні сучаснага краязнаўчага руху звязаны з імёнамі соцень адданых гэтай справе вучоных, спецыялістаў і аматараў, у іх ліку: Г. А. Каханоўскі, У. А. Гілеп, А. І. Мальдзіс, А. П. Грыцкевіч, В. У. Скалабан, А. І. Бутэвіч, А. Карлюкевіч, А. І. Валахановіч, В. П. Рагойша, А. М. Падліпскі, М. В. Півавар, І. В. Грабянчук, А. У. Дзянісаў, С. В. Суднік, А. С. Кузьміч, А. В. Кузьміч, В. М. Герасімаў.

### Пытанні і заданні да тэмы 1.3

1. Ахарактарызуйце гістарычныя і культурныя фактары, якія спрыялі ўзнікненню краязнаўства на беларускіх землях.
2. Назавіце імёны заснавальнікаў навуковага напрамку ў беларускім краязнаўстве ў XVI–XVIII стст.
3. Пералічыце грамадскія краязнаўчыя арганізацыі ў перыяд XIX – пачатак XX ст.
4. Параўнайце арганізацыйную структуру краязнаўства ў БССР і ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд.
5. У які час дзейнічала Беларускае краязнаўчае таварыства (БКТ), якой была яго арганізацыйная структура і кірункі працы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Ахарактарызуйце інстытуцыянальныя формы беларускага краязнаўства на сучасным этапе.

## 1.4. Узнікненне і развіццё беларускага бібліяграфічнага і бібліятэчнага краязнаўства

Сучаснае бібліятэчна-бібліяграфічная краязнаўства з'яўляецца адным з важных напрамкаў прафесійнай дзейнасці бібліятэк Беларусі па развіцці і забеспячэнні патрэбнасцей грамадства ў краязнаўчай інфармацыі. Узнікла на падставе інтэграцыі бібліятэчнай, бібліяграфічнай і краязнаўчай дзейнасці ў межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута і прайшло пэўныя этапы фарміравання, адметныя асэнсаваннем грамадскай значнасці краязнаўчых дакументаў, іх высокай каштоўнасцю як сегмента інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і надзвычай шырокімі магчымасцямі для выяўлення, арганізацыі і прамоцыі краязнаўчых ведаў, што ў адпаведнасці са стратэгіяй Міжнароднай Федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў (ІФЛА) садзейнічае ўкладу бібліятэк у абарону, умацаванне і ўзвышэнне культурнай спадчыны ў разнастайных формах. У развіцці беларускага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства магчыма вылучыць 4 буйныя этапы:

1) XVII ст. – першая палова XIX ст.;
2) сярэдзіна XIX ст. – да 1920-х гг.;
3) 1920-я гг. – пачатак 1990-х;
4) сярэдзіна 1990-х гг. – наш час.

*Першы этап* (XVII ст. – першая палова XIX ст). Беларускае бібліяграфічнае краязнаўства ўзнікла разам са з'яўленнем краязнаўчых дакументаў і стала больш ранняй з'явай, чым бібліятэчнае краязнаўства. У XVII ст. ствараліся краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы, прысвечаныя населеным пунктам, адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам, фізіка-геаграфічным аб'ектам Беларусі. Гэта былі несамастойныя формы бібліяграфічных матэрыялаў, змешчаныя ў навуковай, даведачнай літаратуры, зборніках заканадаўчых актаў у форме падрадковых бібліяграфічных заўваг, унутрыкніжных спісаў, прадметных паказальнікаў да выданняў. У кантэкст новых ведаў, створаных аўтарам, з іх дапамогай інтэграваліся ранейшыя, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляла карыстальнікам «аглядаць» распрацаванасць пытання і весці пошук дакументаў. Прыкладам можа быць выдатнае бібліяграфічнае аснашчэнне твораў Ігната Сцябельскага, прысвечаных гісторыі хрысціянства ў Полацку («Два вялікія светачы на гарызонце Полацкім…», «Храналогія…»). У першай з іх аўтар змясціў «апісанне значнейшых аўтараў і кніг іх», ёмістыя падрадковыя і ўнутрытэкставыя бібліяграфічныя спасылкі, «рэгістр асоб і прадметаў»[15].

Латэнтныя бібліяграфічныя матэрыялы, прысвечаныя беларускім рэгіёнам і асобам, змяшчаліся ў гербоўніках шляхты, польскамоўных выданнях Статута ВКЛ 1588 г. У тагачасных бібліятэках краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы яшчэ не рыхтаваліся. Адпаведная інфармацыя спадарожнічала навуковай працы, але асобна не вызначылася як кірунак у дзейнасці бібліятэк.

*Другі этап* (сярэдзіна XIX ст. – да 1920-х гг.) адметны памнажэннем краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялаў, у т. л. з'яўленнем дыягенетычных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і стварэннем краязнаўчых фондаў у бібліятэках. Варта падкрэсліць, што краязнаўчая бібліяграфія, як і на папярэднім этапе, плённа развівалася дзякуючы навукова-даследчай дзейнасці, а таксама актыўнасці шэрагу перыядычных выданняў, чым у выніку мэтанакіраванай бібліятэчнай работы. Напрыклад, краязнаўцы-даследчыкі публікавалі тэматычныя агляды літаратуры і біябібліяграфічныя паказальнікі (А. Ф. Рыпінскі, І. М. Даніловіч, Е. Р. Раманаў, А. П. Смародскі).

Тэрытарыяльным аб'ектам у гэтай бібліяграфічнай прадукцыі былі рэгіёны, вызначаныя па розных прыметах, і беларускія землі ў цэлым, якія магчыма разглядаць у краязнаўчым ракурсе на падставе іх уваходжання ў склад іншых дзяржаўных утварэнняў і ўспрымаць як тэрытарыяльна-этнічнае цэлае.

Факты, звязаныя з развіццём бібліятэчнага краязнаўства, выяўляюцца з мэтанакіраваным стварэннем спецыялізаваных фондаў у бібліятэках. На пачатку перыяду былі зафіксаваны ў бібліятэках навучальных і канфесіянальных устаноў, у прыватных асоб рукапісы і выданні, прысвечаныя беларускім

[15] Stebelski I. Dwa wielkie światła na horyzoncie Połockim z cieniów zakonnych powstające, czyli żywoty s. s. panien i matek Ewfrozyny i Parascewii zakonnic i hegumenii. T. 1. – Lwów : Nakładem xięgarni Zelmana igla, 1866. – 137 s.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

землям: напрыклад, у бібліятэцы Тышкевічаў знаходзіліся «рэчы немалога інтарэсу для гісторыі, асабліва краёвай»[16]. Далейшае развіццё грамадскага краязнаўчага руху спрыяла фарміраванню прыватных краязнаўчых кнігазбораў, сярод якіх былі вельмі каштоўныя В. П. Федаровіча і А. П. Сапунова па гісторыі Віцебшчыны, святара Гінтоўга па гісторыі Гродзеншчыны, А. К. Ельскага, Г. Татура і інш. Каштоўныя зборы краязнаўчых дакументаў былі ў бібліятэках Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі, Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (ВВАК), іншых грамадскіх краязнаўчых арганізацый, а таксама ў асобных спецыяльных і публічных бібліятэках. Так, у бібліятэцы ВВАК налічвалася 1859 найменняў у 3726 экзэмплярах, з іх 600 кніг былі прысвечаны Віцебшчыне. Свае выданні перадалі краязнаўцы А. П. Сапуноў, В. С. Арсеньеў, У. К. Стукаліч, В. А. Кадыгробаў, М. М. Багародскі і інш. Захаваныя ў тагачасных бібліятэках дакументы былі бібліяграфічна адлюстраваны ў каталожных матэрыялах, што служылі для ўліку складу фондаў і маглі быць выкарыстаны ў пошукавых мэтах. Такімі былі першыя крокі вызначэння краязнаўства ў бібліятэках як асобнага напрамку, а бібліяграфічныя прыёмы, ужываныя адносна краязнаўчых дакументаў, былі традыцыйнымі для тагачаснай методыкі бібліятэчнай бібліяграфіі – яе каталожных формаў. Спецыфіка бібліяграфавання прасочваецца ў навуковых і бібліяграфічных работах краязнаўцаў-даследчыкаў.

Ключавымі падставамі для вылучэння *трэцяга этапу* (1920-я гг. – пачатак 1990-х гг.) развіцця бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства было стварэнне БССР, пазіцыянаванне краязнаўства як неабходнага элемента развіцця галіновых ведаў пра Беларусь, фарміравання нацыянальнай свядомасці і патрыятызму, а таксама як сістэматычнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне бібліятэчнай і бібліяграфічнай справы.

Цікава адзначыць, што ўпершыню ўласна навуковыя, краязнаўчыя і бібліяграфічныя арганізацыі і бібліятэкі ў якасці адной з галоўных сваіх задач лічылі бібліяграфаванне краязнаўчай і беларусазнаўчай літаратуры. Гэта паказваюць дакументы структур Інбелкульта, у т. л. яго Бібліяграфічнай камісіі

[16] Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilno : Ant. Marcinowskiego, 1847. – S. 489. IV s.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Цэнтральнага бюро краязнаўства, Дзяржаўнай бібліятэкі БССР (ДБ БССР) і інш.

Менавіта ў гэты час бібліятэкары пачалі лічыць сваім прафесійным абавязкам вывучэнне роднага краю. Так, Віцебскае бібліятэчнае аб'яднанне ўжо ў 1924 г. разгледзела тэму «Бібліятэкар і краязнаўства». Галоўным цэнтрам бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства стала ДБ БССР, дзе былі назапашаны краязнаўчыя выданні і створана Цэнтральная краязнаўчая картатэка, у якой напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны мелася каля 200 тысяч бібліяграфічных запісаў. Копіі картак перадаваліся ў іншыя бібліятэкі. На аснове картатэкі Бібліяграфічнай камісіяй быў падрыхтаваны паказальнік «Геаграфія Беларусі. Падарожжы», апублікаваны ў часопісе «Наш край». Краязнаўчыя выданні ДБ БССР адлюстроўвала ў бягучых дзяржаўных бібліяграфічных паказальніках і рэтраспектыўных бібліяграфічных выданнях. Такімі дзеяннямі ДБ БССР стварала інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне краязнаўства ва ўсіх яго формах, а яе арганізацыйны і метадычны вопыт садзейнічаў далейшаму развіццю краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–30-я гг. інтэграцыйныя працэсы ў бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве праявіліся вельмі выразна. Асобныя бібліятэкі фарміравалі фонды краязнаўчай літаратуры, living рознымі сродкамі папулярызавалі яе сярод чытачоў, сярод іх гарадская бібліятэка г. Ліды і бібліятэка Беларускага музея імя І. Луцкевіча, краязнаўчыя бібліятэкі і фонды фотадакументаў у Пінскім, Ваўкавыскім, Глыбоцкім, Лідскім і іншых аддзелах Польскага краязнаўчага таварыства (ПКТ). Асобна трэба адзначыць дзейнасць Публічнай бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта і Публічнай бібліятэкі імя Яўстахія і Эміліі Урублеўскіх (Вільня) па бібліяграфічнай рэгістрацыі новых выданняў заходнебеларускага рэгіёна і літаратуры, прысвечанай яму. Сярод іх бібліяграфічных выданняў асабліва важныя паказальнікі «Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў … годзе», «Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёна» і «Бібліяграфія гісторыі зямель б. В. Кн. Літоўскага за год…» (1929–1936; выходзілі на польскай мове). Калі ў першых паказальніках адлюстраваны новыя мясцовыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выданні, то ў апошнім дакументы розных відаў, апублікаваныя ў многіх краінах свету.

У пасляваенны перыяд бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ў Беларусі пачало развівацца хуткімі тэмпамі. Таму спрыялі фактары, звязаныя як з аднаўленнем і развіццём бібліятэчнай галіны, павелічэннем выпуску краязнаўчай літаратуры, так і з гісторыка-культурнымі і эканамічнымі асаблівасцямі перыяду. У абласных, многіх публічных і некаторых спецыяльных бібліятэках выдзяляліся фонды краязнаўчай літаратуры, ствараліся краязнаўчыя каталогі, картатэкі, бібліяграфічныя дапаможнікі, папулярызаваліся краязнаўчыя веды. Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Магілёўская і Маладзечанская абласныя бібліятэкі пачалі выпуск краязнаўчых календароў, комплексных, тэматычных і персанальных бібліяграфічных паказальнікаў. Змест іх быў звязаны найперш з гераічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі, працоўнымі дасягненнямі па аднаўленні эканомікі.

ДБ БССР узначаліла навукова-метадычнае забеспячэнне краязнаўчай работы бібліятэк: выпусціла метадычныя матэрыялы, праводзіла семінары і канферэнцыі, стажыроўкі бібліёграфаў-складальнікаў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і інш. Асабісты значны ўклад у развіццё гэтых ініцыятыў належалі дырэктару бібліятэкі І. Б. Сіманоўскаму і галоўнаму бібліёграфу Р. М. Чыгіровай.

На рубяжы 1960–70-х гг. у абласных бібліятэках былі створаны аддзелы/сектары беларускай і краязнаўчай літаратуры, найбуйнейшым бібліяграфічным рэсурсам у якіх сталі краязнаўчыя каталогі. Пачаўся выпуск паказальнікаў тыпу «Новая літаратура аб вобласці», дзе з асаблівай паўнатой распісваліся рэгіянальныя газеты, матэрыялы з якіх не траплялі ў «Летапіс газетных артыкулаў» Кніжнай палаты БССР. У канцы перыяду абласныя і публічныя бібліятэкі сталі важнымі інфармацыйнымі цэнтрамі па краязнаўстве ў рэгіёнах.

Пашыраўся краязнаўчы напрамак і ў дзейнасці спецыяльных бібліятэк. Тут былі сфарміраваны дакументныя фонды і бібліяграфічныя рэсурсы аб мясцовасці і сваёй арганізацыі (установе), задаволены патрэбнасці спажыўцоў інфармацыі па краязнаўстве. Так, бібліятэка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ўзгадняла краязнаўчую работу з кафедрай гісторыі БССР.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У бібліятэцы былі створаны ўніверсальная краязнаўчая картатэка, некалькі тэматычных краязнаўчых картатэк («Польшча і Гродзеншчына» і інш.), выдадзены бібліяграфічны паказальнік «Принеманский край. Города и районные центры» (1982). На занятках па асновах бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў і навукова-гістарычных даследаванняў студэнты знаёміліся з бібліяграфічнымі рэсурсамі краязнаўства, атрымлівалі ўяўленні аб яго крыніцах і метадах фактаграфічнага і бібліяграфічнага пошуку[17].

Пачалося вывучэнне гісторыі айчыннага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства і яго выкладанне як самастойнай дысцыпліны пры падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Асаблівую ролю ў гэтай справе адыгралі В. Е. Лявончыкаў і Л. Р. Амяльковіч.

*Чацвёрты, сучасны этап* (з сярэдзіны 1990-х гг.) характарызуецца планамернай і мэтанакіраванай працай па фарміраванні краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, задавальненні і развіцці патрэбнасцей у краязнаўчай інфармацыі. Павысілася ўвага да пытанняў фарміравання краязнаўчых фондаў і калекцый, у т. л. набыцця дакументаў (ці іх копій), якія па розных прычынах адсутнічаюць у бібліятэках, удасканалення краязнаўчага даведачна-пошукавага апарату.

Адбываецца трансфармацыя матэрыяльных формаў краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў. Скарачаецца вядзенне краязнаўчых картатэк і карткавых каталогаў, выпуск друкаваных дапаможнікаў. З пачатку XXI ст. дынамічна павялічваецца лічбавы кантэнт краязнаўчай інфармацыі, прадстаўлены ўнікальнымі бібліяграфічнымі, фактаграфічнымі, паўнатэкставымі базамі даных (БД) і электронна-тэкставымі рэсурсамі. Доступ да многіх з іх магчымы праз раздзелы «Краязнаўства» ці самастойныя краязнаўчыя сайты бібліятэк. Наспеў час інтэгравання краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў у найбуйнейшыя нацыянальныя праекты: Зводны электронны каталог (ЗЭК) бібліятэк Беларусі і электронны рэсурс «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі». Стварэнне рэгіянальных зводных каталогаў бібліятэк Беларусі забяспечвае інтэграцыю метаданых інфар-

[17] Мараш Я. Н., Таюрская Г. М. Библиографическая работа библиотеки Гродненского университета по историческому краеведению // Вопросы библиографоведения и библиотековедения : межвед. сборник. – Минск, 1985. – Вып. 6. – С. 159–164.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мацыйных бібліятэчных рэсурсаў на ўзроўні абласцей і краіны. Гэтыя рэсурсы змяшчаюць бібліяграфічныя звесткі пра склад фондаў 20 бібліятэк усіх абласцей, і краязнаўчы блок з'яўляецца асабліва каштоўным.

Абласныя бібліятэкі і цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы (ЦБС) разгарнулі навукова-даследчую работу па краязнаўстве. Правядзенне даследча-пошукавай работы па розных галінах і тэмах краязнаўства звязана з усё большым уключэннем бібліятэк у структуру арганізацый, якія здзяйсняюць навуковыя даследаванні, а таксама з даступнасцю для бібліятэкараў метадалагічнага інструментарыя краязнаўства. Бібліятэкі збіраюць мясцовыя тапонімы, звесткі пра ўраджэнцаў і землякоў, помнікі архітэктуры, гісторыі і культуры, гісторыі пасяленняў, культурныя традыцыі і інш. Бібліятэкі праводзяць даследаванні ў супрацоўніцтве з іншымі ўстановамі і арганізацыямі, якія займаюцца вывучэннем тэрыторыі, па магчымасці ў межах рэгіянальных праграм. Выдатным прыкладам гэтай дзейнасці можа быць навукова-даследчая работа Брэсцкай абласной універсальнай бібліятэкі (АУБ) і асабісты ўнёсак А. А. Мяснянкінай (1958–2019) – намесніка дырэктара па навуковай рабоце, у арганізацыю Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання».

Бібліятэкі актыўна ўводзяць многія новыя формы распаўсюджання краязнаўчых ведаў, паспяхова распрацоўваюць і здзяйсняюць праекты; адаптуюць да лічбавай сучаснасці музейныя, экскурсійна-турыстычныя і сацыякультурныя тэхналогіі. Адным з прыкладаў можа быць дзейнасць Гомельскай АУБ па рэалізацыі музейных праектаў. Інтэграванне бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў сацыякультурную прастору садзейнічае пашырэнню маштабаў і разнастайнасці прадстаўлення аўтэнтычных культурных кодаў і рэгіянальных брэндаў, іх трансляцыі ў сусветную культуру, уплывае на асэнсаванне і засваенне чалавекам рэгіянальнай культурнай спадчыны. У перспектыве дзякуючы выкарыстанню бібліяграфічных метадаў і інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій бібліятэкі разам з іншымі сацыяльнымі інстытутамі могуць выступіць цэнтрамі інтэграцыйных працэсаў па генерыраванні новых форм краязнаўчых рэсурсаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Павялічыўся ўклад беларускіх даследчыкаў у распрацоўку тэарэтычных, гістарычных, арганізацыйных, метадычных і тэхналагічных пытанняў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства: І. У. Градоўкіна, М. Э. Ігнатовіч, А. І. Касінская, Т. В. Кузьмініч, А. А. Мяснянкіна, А. В. Прадзеіна, С. А. Пугачова, В. І. Саітава, Т. Ф. Сокал, І. М. Стрыжонак і інш.

**Пытанні і заданні да тэмы 1.4**

1. Назавіце асноўныя этапы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.
2. У якіх бібліятэках былі фонды краязнаўчай літаратуры ў XIX ст.?
3. Ахарактарызуйце краязнаўчую бібліяграфічную прадукцыю ў XIX ст.
4. У які перыяд праявілася інтэграванне бібліятэчных і бібліяграфічных працэсаў і з’яў?
5. Якую краязнаўчую бібліяграфічную работу ў 1920–30-я гг. вялі бібліятэкі ў БССР і ў Заходняй Беларусі (у складзе Польшчы)?
6. Раскрыйце ролю ДБ БССР і абласных бібліятэк у арганізацыі краязнаўчага напрамку ў 1950–80-я гг.
7. Якія новыя з’явы акрэсліліся ў бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве на сучасным этапе?
8. Назавіце імёны знаных дзеячаў беларускага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГЛАВА 2
# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА

## 2.1. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: паняцце і структура

*Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства* – гэта прафесійная дзейнасць бібліятэк па развіцці і забеспячэнні патрэбнасцей грамадства ў краязнаўчай інфармацыі. Абазначаецца таксама некаторымі іншымі паняццямі: *бібліятэчнае краязнаўства, краязнаўчая бібліятэчная дзейнасць*. Гэтыя тэрміны шырока выкарыстоўваюцца ў прафесійнай камунікацыі і нярэдка разумеюцца як сінонімы. Змест іх шырокі – яны ахопліваюць розныя віды працы бібліятэк па стварэнні, распаўсюджанні і выкарыстанні краязнаўчай інфармацыі.

Акрамя таго, ужываюцца паняцці *краязнаўчае бібліятэказнаўства* і *краязнаўчае бібліяграфазнаўства*, якія адносяцца да навуковай дзейнасці ў галіне краязнаўства. Устойлівым з'яўляецца тэрмін *краязнаўчая бібліяграфія*, што адносіцца да асобнага віду бібліяграфічнай дзейнасці, функцыянаванне якога забяспечваюць не толькі бібліятэкі, але і архівы, музеі, выдавецтвы, СМІ і іншыя сацыяльныя інстытуты. Веданне сутнасці гэтых паняццяў важна для бібліятэчнага спецыяліста, паколькі спрыяе развіццю тэарэтычнага мыслення, неабходнага для яго паспяховай прафесійнай дзейнасці па краязнаўстве.

Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ўзнікла на падставе бібліятэчнай, бібліяграфічнай і краязнаўчай дзейнасці ў межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута. Гэта адносна самастойная галіна бібліятэчнай дзейнасці, накіраваная на задавальненне краязнаўчых патрэб грамадства сродкамі бібліятэк, у тым ліку бібліяграфічнымі. Такім чынам, паняцце «бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» ахоплівае ўсе з'явы і працэсы краязнаўчага характару, якія ажыццяўляюцца ў бібліятэцы, г. зн. па сутнасці выражае інтэграванасць краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі і адначасова падкрэслівае значнасць бібліяграфічнага складніка ў рабоце бібліятэкі. Паняцце «бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» можа выкарыстоўвацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і для абазначэння інтэграванай навуковай і вучэбнай дысцыпліны, аб’ектам якой з’яўляецца краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі ва ўсіх яе праяўленнях.

У прафесійнай лексіцы часта ўжываецца абагульняючае паняцце «бібліятэчнае краязнаўства». Яно ахоплівае ўсе бібліяграфічныя працэсы, уласцівыя бібліятэцы, аднак яўна не выражае бібліяграфічны складнік і адпаведную навуку. Такім чынам, «бібліятэчнае краязнаўства» як абагульняючы тэрмін выкарыстоўваецца:

– для апісання ўсёй краязнаўчай сферы бібліятэчнай дзейнасці;

– для назвы галіновай навуковай дысцыпліны. Н. М. Кушнарэнка дала ёй наступнае азначэнне: «*Бібліятэчнае краязнаўства* – гэта комплексная тэарэтыка-прыкладная дысцыпліна, якая вывучае краязнаўчую бібліятэчную дзейнасць як сістэму»[18].

Падагульняючы змест і асаблівасці паняццяў «бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», «бібліятэчнае краязнаўства» і «краязнаўчая бібліятэчная дзейнасць», магчыма выкарыстоўваць іх як сінонімы.

Паняцце «бібліяграфічнае краязнаўства» мае сваю спецыфіку. Бібліяграфічнае краязнаўства можа разглядацца як адносна самастойная галіна бібліяграфічнай дзейнасці, што ажыццяўляецца ў межах бібліяграфічнага сацыяльнага інстытута і ахоплівае бібліяграфічныя з’явы краязнаўчага характару ў бібліятэках, архівах, музеях, СМІ, выдавецтвах, кніжным гандлі, створаныя краязнаўцамі-даследчыкамі. Больш вядомым тэрмінам-сінонімам з’яўляецца паняцце «краязнаўчая бібліяграфія». *Краязнаўчая бібліяграфія* – гэта від бібліяграфіі, у межах якога збіраецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная інфармацыя (прадукцыя) пра дакументы, напісаныя на тэрыторыі пэўнага краю і/ці прысвечаныя яму. На сучасным этапе нярэдка як сінонім паняцця «краязнаўчая бібліяграфія» ўжываецца тэрмін «рэгіянальная бібліяграфія». Абавязковая ўмова, каб тэрмін «рэгіён» быў меншым за дзяржаўныя межы краіны, г. зн. супадаў з трактоўкамі паняцця «край». Калі ж рэгіён пераўзыходзіць дзяржаўныя межы адной краіны (рэгіён

---

[18] Кушнаренко Н. Н. Библиотечное краеведение : учебник. – М., 2007. – С. 41.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заходняя Еўропа і пад.), вышэйзгаданыя тэрміны не супадаюць і не могуць быць сінонімамі.

Бібліяграфічнае краязнаўства, ці краязнаўчая бібліяграфія, развіваецца і як навуковая галіна. Тут больш дакладны тэрмін «краязнаўчае бібліяграфазнаўства» – дысцыпліна, што даследуе краязнаўчую бібліяграфічную дзейнасць у грамадстве. Калі аб'ектам бібліяграфічнага краязнаўства становяцца з'явы, якія ажыццяўляюцца ў бібліятэцы, то магчыма ўжываць паняцце «бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства». Але, як адзначалася вышэй, часта выкарыстоўвацца скарочаны тэрмін «бібліятэчнае краязнаўства», які ахоплівае і краязнаўчую бібліяграфічную дзейнасць бібліятэкі.

Такім чынам, бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ўзнікла, калі бібліятэкі пачалі задавальняць патрэбнасці грамадства ў ведах, інфармацыі, дакументах пра вызначаны край, населены пункт. Яго станаўленне і развіццё адбываецца ў межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута і адлюстроўвае ўнутраную структуру бібліятэчнай справы як базавай галіны, таму ўключае сферу практыкі, навукі, адукацыі, кіравання. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ўяўляе сабой сістэму, куды ўваходзяць базавая (практычная) падсістэма – краязнаўчая практычная дзейнасць бібліятэкі, і вытворныя ад яе віды дзейнасці: навукова-даследчая, вучэбна-выхаваўчая і арганізацыйна-кіруючая. На бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ўплывае ўзровень развіцця розных аспектаў бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і краязнаўства, дасягненні інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства характарызуецца *метадалагічнымі прынцыпамі* навуковасці, сацыяльнай абумоўленасці, мабільнасці, дэмакратызму, арганізацыі і самаарганізацыі; сістэмнасці; інтэгратыўнасці і дыферэнцыраванасці. Прынцыпы маюць канкрэтна-гістарычны характар, узнікаюць пад уздзеяннем розных фактараў, актуалізуюцца або страчваюць значэнне. Напрыклад, у савецкі перыяд у краязнаўчай дзейнасці бібліятэк прэваліраваў прынцып камуністычнай партыйнасці, што выказвалася ў фарміраванні і папулярызацыі дакументаваных краязнаўчых ведаў пра ўсталяванне савецкай улады, дасягненні сацыялістычнага будаўніцтва ў рэгіёнах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У наш час *прынцып навуковасці* праяўляецца ў вывучэнні інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў краязнаўчай інфармацыі, у набыцці ў краязнаўчыя фонды дакументаў, якія адлюстроўваюць сучасны ўзровень ведаў пра рэгіёны, у арганізацыі гэтых фондаў і цалкам краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк на падставе навуковых класіфікацыйных схем.

*Сацыяльная абумоўленасць* бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства выказваецца ў цеснай сувязі зместу краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі з патрэбамі і задачамі ўстойлівага рэгіянальнага развіцця.

*Мабільнасць* бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства прасочваецца ва ўкараненні інавацыйных форм і метадаў, асабліва праектаў, якія ў бібліятэках прымяняюцца для фарміравання і распаўсюджання фіксаваных краязнаўчых ведаў, а таксама ў бесперапынным павелічэнні напрамкаў і паглыбленні зместу краязнаўчых даследаванняў.

*Дэмакратызм* увасоблены ў адкрытасці інфармацыйных краязнаўчых рэсурсаў для ўсяго насельніцтва, у даступнасці інфармацыйна-пошукавых сістэм атрымання краязнаўчай інфармацыі.

На праяўленне *прынцыпаў арганізацыі і самаарганізацыі* бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства істотна ўплывае дэцэнтралізаваны характар сучаснага этапу краязнаўства[19]. Неабходна адзначыць станоўчую ролю «Палажэння аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь» ад 28 снежня 1993 г., выкананне якога дапамагло павысіць арганізацыйны ўзровень краязнаўчай дзейнасці ў бібліятэках краіны[20]. У Расіі падобную ролю адыгрываюць кіраўніцтвы па краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, прынятыя Расійскай бібліятэчнай асацыяцыяй. Прынцып самаарганізацыі выказваецца ў самастойных рашэннях бібліятэкі адносна арганізацыйных формаў, кірункаў і зместу дзейнасці па краязнаўстве. У бібліятэках распрацаваны лакальныя дакументы, якія акрэсліваюць краязнаўчую работу.

*Прынцып сістэмнасці* ўвасоблены ў мэтанакіраваным развіцці элементаў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства: краязнаўчага фонду, інфармацыйна-пошукавых сістэм, сістэм

---

[19] У міжваенны перыяд у БССР пэўны час краязнаўчай дзейнасцю кіравала Цэнтральнае бюро краязнаўства.

[20] Скасавана загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2010 г. № 64.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абслугоўвання карыстальнікаў, пошукава-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці і інш. Кожны элемент вызначаецца сістэмай сувязей з іншымі элементамі і са знешнім асяроддзем. Напрыклад, абслугоўванне карыстальнікаў па краязнаўстве непасрэдна звязана са складам краязнаўчага фонду, яго адпаведнасцю іх інфармацыйным патрэбнасцям, са складам і камфортнасцю інфармацыйна-пошукавых сістэм (краязнаўчых каталогаў, баз даных, бібліяграфічных дапаможнікаў, архіваў выкананых даведак), з тэхналогіямі, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэцы (аўтаматызаваныя ці іншыя), з місіяй і задачамі, якія ставіць бібліятэка. Такім чынам, выконваючы сваю ролю, кожны элемент садзейнічае ўстойліваму функцыянаванню бібліятэчнага краязнаўства.

Праз *інтэгратыўнасць* праяўляецца цесная сувязь бібліятэкі, бібліяграфічных працэсаў і іншых сацыяльных інстытутаў, якія вядуць краязнаўчую работу. Сумесна з архівамі, музеямі, універсітэтамі, навуковымі ўстановамі бібліятэкі фарміруюць зводныя краязнаўчыя каталогі і каталогі мясцовых выданняў, паўнатэкставыя краязнаўчыя базы даных; удзельнічаюць у фарміраванні баз даных аўтарытэтных запісаў; інтэграванні іншых пошукавых сістэм у краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы і ўласных краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў у сусветную інфармацыйную прастору.

*Прынцып дыферэнцыраванасці* праяўляецца ў стварэнні спецыялізаваных краязнаўчых структур у асобных бібліятэках, спецыялізацыі бібліятэкараў-бібліёграфаў па краязнаўстве як кірунку дзейнасці.

Асаблівае значэнне маюць прынцыпы фарміравання інфармацыйна-рэгіянальнага стылю мыслення і інфармацыйнага пакрыцця тэрыторыі. Яны спецыфічныя для бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. *Прынцып інфармацыйна-рэгіянальнага стылю мыслення* дазваляе чалавеку заўважаць навакольныя з’явы і працэсы ў кантэксце інфармацыі, якая паступае з розных каналаў, крыніц і тэрыторый, і стымулюе ацэньваць, параўноўваць, прымаць рашэнні пра асабістыя дзеянні на карысць развіцця краю. *Прынцып інфармацыйнага пакрыцця* праяўляецца ў тым, што краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы (КІР) ахопліваюць усю тэрыторыю краю, каб пазбегнуць прабелаў па населеных пунктах і звязаных з імі падзей і асоб.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэты краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці (КББД):

– фарміраванне дасканалай сістэмы краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў;

– забеспячэнне даступнасці краязнаўчай інфармацыі пра рэгіён;

– прамоцыя краязнаўчых ведаў пра рэгіён у інфармацыйнай прасторы;

– фарміраванне і развіццё патрэбнасцей у краязнаўчай інфармацыі.

Гэтыя мэты датычаць карыстальнікаў бібліятэкі, насельніцтва рэгіёна і супольнасці асоб, якія могуць цікавіцца рэгіёнам у сацыяльных медыя і інтэрнэце.

Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства мае чатыры асноўныя кірункі дзейнасці:

1. *Практычная дзейнасць* бібліятэк па такіх напрамках, як выяўленне, набыццё ў фонд дакументаў, якія па змесце звязаны з краем, іх захаванне і папулярызацыя; стварэнне сістэмы бібліяграфічных і фактаграфічных рэсурсаў; забеспячэнне доступу да знешніх інфармацыйных рэсурсаў; краязнаўчае бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне; метадычнае забеспячэнне іншых бібліятэк. У межах гэтага кірунку бібліятэка ўсе свае намаганні накіроўвае на тое, каб знайсці і прадставіць карыстальніку краязнаўчы матэрыял, стварыць яму камфортныя ўмовы для атрымання і спажывання краязнаўчай інфармацыі.

2. *Асветніцкая дзейнасць* скіравана на папулярызацыю ведаў пра край з выкарыстаннем усіх сродкаў, даступных сучаснай бібліятэцы, ініцыяванне і рэалізацыю праектаў і акцый, мэта якіх – садзейнічаць фарміраванню сацыяльна каштоўных рысаў асобы, актывізацыі прадстаўнікоў мясцовай супольнасці ў вырашэнні задач прагрэсіўнага рэгіянальнага развіцця і фарміраванне пазітыўнага іміджу тэрыторыі ў віртуальнай прасторы.

3. *Навукова-пазнавальная дзейнасць*, вывучэнне роднага краю. Пашыраецца пошукава-даследчая дзейнасць бібліятэкараў, вынікам якой з’яўляюцца новыя факты з розных гістарычных этапаў развіцця краю ці жыцця канкрэтных людзей, даклады на навуковых канферэнцыях, публікацыі і іншыя формы фіксацыі атрыманых ведаў. Калі пры бібліятэцы працуе аб’яд-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нанне краязнаўцаў, то яму прадстаўляецца памяшканне, ажыццяўляецца інфармацыйнае забеспячэнне ў кантэксце тэматыкі даследчай работы ўдзельнікаў аб'яднання. Бібліятэкі нярэдка выступаюць арганізатарамі буйных форм навуковай работы: канферэнцый, чытанняў.

4. *Метадычная дзейнасць* накіравана на маніторынг КББД у рэгіёне, выяўленне, абагульненне і ўкараненне інавацый у практыку краязнаўчай бібліятэчнай дзейнасці, забеспячэнне павышэння кваліфікацыі спецыялістаў па краязнаўстве і ў галіне КББД, на падрыхтоўку адпаведных аналітычных матэрыялаў.

### Пытанні і заданні да тэмы 2.1

1. Дайце азначэнне паняццям «бібліяграфічнае краязнаўства», «бібліятэчнае краязнаўства», бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», растлумачце іх сэнс і сувязі.

2. Назавіце прынцыпы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

3. Якія мэты і асноўныя кірункі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства?

## 2.2. Краязнаўчая функцыя бібліятэкі

Дзейнасць па краязнаўстве набыла такія маштабы і сацыяльную значнасць, што з'явілася падстава для абгрунтавання *краязнаўчай сацыяльнай функцыі* бібліятэкі. Тэрмін «краязнаўчая функцыя бібліятэкі» ўвёў расійскі вучоны Б. Ф. Валодзін. Яго сутнасць ён бачыць у стварэнні рэгіянальнай памяці – дакументнай і інфармацыйнай, а таксама ў каардынацыі дзейнасці бібліятэк і іншых сацыяльных інстытутаў па краязнаўстве. Б. Ф. Валодзін падкрэслівае, што краязнаўчая функцыя з'яўляецца галоўнай, вызначальнай у дзейнасці абласных бібліятэк, бібліятэк рэгіянальнага ўзроўню[21]. Яна арганічна яднаецца з інфармацыйнай, культурна-асветнай і адукацыйнай сацыяльнымі функцыямі. Н. М. Кушнарэнка разглядае гэту функцыю як вытворную ад прыкладных сацыяльных функцый

[21] Володин Б. Ф. Споры вокруг перспектив // Библиотекарь. – 1989. – № 5. – С. 26–29.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі. Краязнаўчая функцыя мае выразнае практычнае значэнне, яна фактычна пранізвае ўсе кірункі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці.

І. М. Стрыжонак і В. І. Саітава разглядаюць краязнаўчую функцыю адносна чатырох асноўных элементаў бібліятэкі як сістэмы. У бібліятэках існуюць:

1) краязнаўчыя фонды;

2) кантынгент спажыўцоў дакументаў, бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі па краязнаўстве;

3) бібліятэчны персанал, які ажыццяўляе краязнаўчую работу;

4) матэрыяльна-тэхнічная база па краязнаўстве[22].

Краязнаўчая функцыя аб'ядноўвае ўсе элементы і раскрывае канкрэтны сэнс, змест кожнага элемента з улікам краязнаўчай спецыфікі: краязнаўчы дакумент змяшчае краязнаўчыя веды; галоўным калектыўным суб'ектам бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства выступаюць абласныя ўніверсальныя бібліятэкі і публічныя бібліятэкі. Яны выконваюць краязнаўчую функцыю з улікам асаблівасцей гісторыі, прыроды, навукі, эканомікі, культуры, сацыяльнага жыцця краю; ажыццяўляюць фарміраванне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, арганізуюць доступ да іх рэальных і віртуальных карыстальнікаў, папулярызуюць веды. Да суб'ектаў належаць таксама бібліятэчныя спецыялісты, якія вядуць краязнаўчую работу, даследчыкі, карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі. Бібліятэчны персанал выконвае апрацоўку краязнаўчых дакументаў, стварае другасны (бібліяграфічны і фактаграфічны) узровень прадстаўлення дакументаў, якія маюцца ў фондзе бібліятэкі і па-за яе межамі, у тым ліку ў аддаленым доступе. Бібліятэкары актыўна далучаюцца да краязнаўчых даследаванняў гістарычнай і сучаснай тэматыкі, развіваюць музейны напрамак у межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута і інш. Спажывец выкарыстоўвае краязнаўчыя дакументы, краязнаўчую бібліяграфічную і фактаграфічную інфармацыю. Акрамя таго, краязнаўчы дакумент – гэта яшчэ і матэрыяльны носьбіт, аб'ект, набыты бібліятэкай за аплату, таму ён з'яўляецца часткай краязнаўчага

[22] Стрыжонак І. М., Саітава В. І. Краязнаўчая функцыя бібліятэкі як сацыяльна-культурнага інстытута грамадства // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. – Минск, 2008. – Вып. 2. – С. 681–686.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фонду і матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэкі. У шэрагу бібліятэк створаны музейныя экспазіцыі, прысвечаныя рэгіёну, якія таксама вызначаюцца пэўнай матэрыяльнай каштоўнасцю. Усе пералічаныя элементы агульнасістэмныя, яны падначалены краязнаўчай функцыі; кожны элемент згодна са сваім прызначэннем праяўляе яе змест.

Краязнаўчую функцыю адносна дзіцячай бібліятэкі як сістэмы даследавала Т. М. Сомава[23]. Яна паказала, што краязнаўчая функцыя праяўляецца ў наданні краязнаўству ў дзіцячай бібліятэцы прыярытэтнага значэння ў фарміраванні бібліятэчнага фонду, у вядзенні каталогаў і картатэк, у стварэнні бібліяграфічных дапаможнікаў, у абслугоўванні карыстальнікаў, масавай рабоце, у навукова-метадычнай дзейнасці. Дадаць да гэтых слушных высноў магчыма толькі тое, што дзіцячыя бібліятэкі хутка ўкараняюць сучасныя формы прадстаўлення КІР і распаўсюджання краязнаўчых ведаў, цікавыя для сучасных дзяцей і падлеткаў.

Магчыма падсумаваць, што хаця краязнаўчая функцыя не з’яўляецца асноўнай, сутнаснай функцыяй бібліятэкі, але яна прасякае ўсе элементы сістэмы і выконваецца ўсімі гэтымі ўстановамі. Праз краязнаўчую функцыю, з дапамогай разнастайных формаў і кірункаў дзейнасці бібліятэка рэалізуе сваё прызначэнне па задавальненні краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, па стварэнні адпаведных рэсурсаў і забеспячэнні доступу да іх.

Любая бібліятэка можа быць і аб’ектам краязнаўчай дзейнасці ў тых выпадках, калі вывучаецца яе гісторыя, роля бібліятэкі ў культуры рэгіёна.

### Пытанні і заданні да тэмы 2.2

1. Хто вылучыў і абгрунтаваў краязнаўчую функцыю бібліятэкі?
2. Растлумачце праяўленне краязнаўчай функцыі бібліятэкі.

[23] Сомова Т. Н. Краеведческая деятельность детской библиотеки : учеб.-практ. пособие ; Орловский гос. ин-т искусств и культуры. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 88 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.3. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк

Разнастайнасць бібліятэк, якія вядуць краязнаўчую дзейнасць, спецыфіка іх задач і асаблівасці інфармацыйных рэсурсаў (у шырокім сэнсе) патрабуюць арганізаваць краязнаўчую дзейнасць.

Вялікае значэнне надае гэтаму ІФЛА. Адным са стратэгічных кірункаў ІФЛА ў перыяд 2016–2021 гг. з’яўляецца падтрымка дзейнасці бібліятэк па захаванні культурнай спадчыны ў розных формах, уключаючы традыцыйнае, гістарычнае, самабытнае (аўтэнтычнае) і сучаснае ўвасабленні[24]. У складзе ІФЛА функцыянуе *секцыя генеалогіі і мясцовай гісторыі*. Федэрацыя ставіць перад бібліятэкамі наступныя мэты:

– садзейнічаць развіццю глабальных сеткавых узаемадзеяння паміж спецыялістамі па генеалогіі і мясцовай гісторыі, а таксама бібліятэкамі, архівамі і музеямі;

– падтрымліваць і развіваць найлепшыя традыцыйныя і электронныя генеалагічныя матэрыялы і рэсурсы па мясцовай гісторыі, весці актыўную прамоцыю вэб-доступу да лічбавага кантэнту і паслуг, запускаць парталы як інструменты для сувязі рэсурсаў па генеалогіі і мясцовай гісторыі.

У многіх бібліятэках свету, асабліва заходніх краін, створаны аддзелы краязнаўства (мясцовай гісторыі), генеалогіі і сямейнай гісторыі. Такія падраздзяленні функцыянуюць, напрыклад, у нацыянальных, рэгіянальных навуковых універсальных і публічных бібліятэках ЗША, Канады, Аўстраліі. У абласных публічных бібліятэках Беларусі, Расіі, Украіны існуюць аддзелы краязнаўства, назвы якіх адрозніваюцца. Структурныя падраздзяленні па краязнаўстве маюцца і ў некаторых публічных бібліятэках.

Агульныя мэты, характар арганізацыі КББД і яе змест былі акрэслены ў «Палажэнні аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Беларусі», якое дзейнічала ў перыяд з 1993 па 2010 г. Цяпер няма падобнага дакумента, які б садзейнічаў развіццю краязнаўчай дзейнасці айчынных бібліятэк на сучасным этапе. У Расіі прыняты 2 новых кіраўніцтвы, што адлюстроўваюць

[24] Стратегический план 2016–2021. Принято Правлением ИФЛА, декабрь 2015 [Электронный ресурс] // International Federation of Library Associations and Institutions. – Режим доступа: https://www.ifla.org/files/assets/hq/gb/strategic-plan/2016-2021-ru.pdf. – Дата доступа:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучасныя рэаліі бібліятэчнага краязнаўства. Гэта «Руководство по краеведческой деятельности центральной библиотеки субъекта РФ»[25] і «Руководство по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ»[26]. Падобны дакумент функцыянуе і ва Украіне.

*Арганізацыі краязнаўчай дзейнасці ў АУБ.* Абласная ўніверсальная бібліятэка з’яўляецца галоўным цэнтрам бібліятэчнабібліяграфічнага краязнаўства, адной з вядучых устаноў у галіне краязнаўства ў цэлым.

Краязнаўчая работа ажыццяўляецца рознымі структурнымі падраздзяленнямі АУБ пад кіраўніцтвам дырэктара бібліятэкі ці яго намесніка. У беларускіх бібліятэках цэнтрам краязнаўчай работы з’яўляецца аддзел краязнаўства. У структуры АУБ Беларусі функцыянуюць:

*Аддзел краязнаўства* – гэта назва найбольш поўна адпавядае зместу і напрамкам дзейнасці краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі. У аддзелах працуе звычайна не менш за 4 спецыялісты, напрыклад у Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы (АНБ) – 4, а ў Віцебскай абласной бібліятэцы (АБ) – 12 спецыялістаў, з іх 8 бібліёграфаў.

У Брэсцкай і Віцебскай АБ ёсць аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі; у Магілёўскай АБ – беларускай і краязнаўчай літаратуры; у Мінскай АБ – краязнаўчай літаратуры; у Гомельскай АУБ, Гродзенскай АНБ – аддзел краязнаўства.

Для параўнання, у абласных універсальных навуковых бібліятэках (АУНБ) Расіі функцыянуюць аддзелы бібліятэчнага краязнаўства, аддзелы краязнаўчай літаратуры. Ва ўкраінскіх АУНБ маюцца такія ж аддзелы, у асобных сустракаюцца аддзелы дакументаў і навуковых даследаванняў па пытаннях краязнаўства (Нікалаеўская АУНБ), рэгіянальныя інфармацыйныя цэнтры (РІЦ), як «Харкаўшчына» ў Харкаўскай АУНБ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[25] Руководство по краеведческой деятельности библиотек центральной библиотеки субъекта РФ : Принято на Всероссийском библиотечном конгрессе (XXII Ежегодной конференции РБА). Красноярск, 18 мая 2017 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://info.rounb.ru/elbibe/kray/ruk-vo-po-kraeved-deyat-centr-bibliotek.pdf.

[26] Руководство по краеведческой деятельности библиотек РФ : Принято на Всероссийском библиотечном конгрессе (XXIII Ежегодной конференции РБА). Владимир, 17 мая 2018 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rba.ru/content/about/doc/ruk_kraev_pub.pdf.

Асноўным зместам дзейнасці аддзелаў краязнаўства з'яўляюцца:

– выяўленне, збор, арганізацыя, захаванне і прадастаўленне ў карыстанне краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Абласная бібліятэка па прынцыпе вычарпальнай паўнаты збірае мясцовыя выданні і краязнаўчыя дакументы і ажыццяўляе іх бібліяграфічны ўлік;

– стварэнне на іх аснове і прадстаўленне доступу да бібліяграфічных, фактаграфічных і паўнатэкставых інфармацыйных рэсурсаў. АУБ дае доступ да мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў са свайго фонду і з іншых кнігасховішчаў; да бібліяграфічнай інфармацыі і аўтарытэтных даных пра мясцовыя выданні і краязнаўчыя дакументы; да фактаграфічнай інфармацыі пра край;

– бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне рэальных і віртуальных карыстальнікаў;

– навукова-метадычная і каардынацыйная дзейнасць у галіне бібліятэчнага краязнаўства;

– навукова-даследчая дзейнасць;

– арганізацыя ўзаемадзеяння з іншымі бібліятэкамі і ўстановамі па стварэнні карпаратыўных інфармацыйных рэсурсаў (зводных бібліяграфічных каталогаў, баз даных і інш.), падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў, навуковых даследаванняў.

Па напрамку *бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне* прадстаўляць наступныя прадукты і паслугі:

– бібліяграфічнае абслугоўванне рэальных і віртуальных карыстальнікаў па разавых і доўгачасова дзеючых запытах краязнаўчага характару і кансультацыйная дапамога ў рабоце з крыніцамі краязнаўчай інфармацыі. У расійскіх бібліятэках функцыянуюць службы тыпу «Краязнаўчая даведка».

У якасці *метадычнага і каардынацыйнага цэнтра* абласная бібліятэка фарміруе стратэгію КББД у рэгіёне, арганізуе, каардынуе, аналізуе і метадычна забяспечвае яе:

– удзельнічае ў распрацоўцы дакументаў, якія рэгламентуюць арганізацыю КББД у самой бібліятэцы і ў рэгіёне;

– аказвае метадычную дапамогу публічным бібліятэкам, ажыццяўляе суправаджэнне рэалізацыі праектаў рознага ўзроўню ў галіне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ацэньвае інфармацыйна-рэсурснае забеспячэнне бібліятэк і іншых арганізацый, якія ажыццяўляюць краязнаўчую дзейнасць;

– рыхтуе аналітычныя матэрыялы, ініцыіруе прыняцце кіраўнічых рашэнняў у галіне краязнаўчай дзейнасці;

– здзяйсняе маніторынг краязнаўчай дзейнасці бібліятэк рэгіёна з мэтай ацэнкі якасці бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў, краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і паслуг, якія ствараюць бібліятэкі;

– выяўляе і садзейнічае ўкараненню інавацый у практыку публічных бібліятэк рэгіёна;

– праводзіць конкурсы на найлепшую арганізацыю краязнаўчай работы ў публічных бібліятэках рэгіёна;

– садзейнічае павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў у галіне краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці.

Як *навуковы цэнтр АУБ* арганізуе і праводзіць даследаванні па праблематыцы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

АУБ праводзіць шырокую асветніцкую і рэкрэацыйную дзейнасць сярод насельніцтва, рэалізуючы масавыя мерапрыемствы, праекты і праграмы.

Кожны з гэтых напрамкаў дастаткова выдзелены, характарызуецца пэўнымі формамі і метадамі.

У АУБ распрацоўваюцца *лакальныя дакументы*, у якіх адлюстраваны арганізацыйныя і тэхналагічныя падставы краязнаўчай дзейнасці:

– уставы і палажэнні пра бібліятэкі;

– палажэнні пра аддзел краязнаўства (дадатак А);

– палажэнні пра сектар дэпазітарнага захавання краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў;

– палажэнне пра фонд краязнаўчага аддзела.

Універсальныя абласныя бібліятэкі распрацоўваюць «Палажэнні аб аддзеле краязнаўства» з улікам мясцовых умоў і практыкі сваёй краязнаўчай работы або іншых бібліятэк.

У змесце Палажэння вылучаюцца некалькі блізкіх па сэнсе раздзелаў:

*I. Агульныя палажэнні:* прызначэнне аддзела і сутнасць яго дзейнасці (вобласць прымянення), нарматыўнае забеспячэнне.

*II. Мэта,* задачы, асноўныя функцыі аддзела.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*III. Упраўленне аддзелам:* арганізацыя дзейнасці, узаемадзеянне з іншымі структурнымі падраздзяленнямі бібліятэкі, правы і абавязкі супрацоўнікаў аддзела (Дадатак А).

Палажэнне зацвярджаецца дырэктарам абласной бібліятэкі.

Распрацоўваюцца службовыя інструкцыі спецыялістаў аддзела краязнаўства з мэтай рацыянальнага раздзялення працы і спецыялізацыі. Пры штаце, напрыклад, у 4–5 чалавек вылучаюцца пасады: загадчыка аддзела, вядучага (галоўнага) бібліятэкара, бібліёграфа, бібліятэкара.

Адпаведна службовым абавязкам *загадчык аддзела,* як правіла, выконвае наступныя функцыі:

– ажыццяўляе кіраўніцтва ўсёй дзейнасцю аддзела і адказвае за яе эфектыўнасць;

– бярэ актыўны ўдзел у арганізацыі і каардынацыі краязнаўчай дзейнасці ў самой абласной бібліятэцы і ў межах вобласці;

– стварае планы і справаздачы работы аддзела; удзельнічае ў распрацоўцы нарматыўнай, канцэптуальнай, праграмнай і іншай дакументацыі бібліятэкі;

– непасрэдна ўплывае на фарміраванне краязнаўчага фонду і забяспечвае паступленне мясцовага абавязковага экзэмпляра твораў друку;

– наладжвае сувязі аддзела з іншымі бібліятэкамі вобласці, а таксама ўстановамі і арганізацыямі, якія працуюць у галіне краязнаўства;

– арганізуе, распрацоўвае, каардынуе і праводзіць навукова-даследчую работу па пытаннях бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– бярэ ўдзел у падрыхтоўцы і рэдагаванні краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў;

– забяспечвае рэкламу дзейнасці аддзела; ініцыіруе і падтрымлівае сувязі з грамадскасцю;

– асвятляе дзейнасць аддзела, КББД абласной бібліятэкі і сістэмы бібліятэк рэгіёна ў цэлым у СМІ і навуковых выданнях.

*Вядучы (галоўны) бібліятэкар* адпаведна сваім службовым абавязкам:

– арганізуе выкананне планавых заданняў аддзела, дыферэнцыраванае абслугоўванне абанентаў і правядзенне інфармацыйных мерапрыемстваў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– фарміруе краязнаўчы фонд, стварае краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (ДБА);

– ажыццяўляе прагляд мясцовых перыядычных выданняў з мэтай вядзення краязнаўчых каталогаў;

– арганізуе пастаянныя выставы;

– удзельнічае ў правядзенні масавых мерапрыемстваў,

– ажыццяўляе бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве, у т. л. праз віртуальную даведачную службу, электронную дастаўку дакументаў (ЭДД);

– вывучае вопыт краязнаўчай работы бібліятэк вобласці і аказвае ім неабходную метадычную дапамогу.

*Бібліёграф* адказвае за бібліяграфічны кірунак краязнаўчай дзейнасці абласной бібліятэкі і бібліятэк рэгіёна; складае бібліяграфічныя дапаможнікі; вядзе зводны краязнаўчы каталог, ажыццяўляе бібліяграфічнае інфармаванне і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве і інш.

*Бібліятэкар* краязнаўчага аддзела ў суадносінах са сваімі службовымі абавязкамі забяспечвае дакументавыдачу ў аддзеле; вядзе даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне; удзельнічае ў арганізацыі краязнаўчага ДБА; арганізуе адкрыты доступ да краязнаўчага фонду; адказвае за яго расстаноўку і захаванасць; вывучае склад карыстальнікаў, праводзіць масавыя мерапрыемствы па краязнаўстве, укараняе новыя формы работы і інш.

Спецыялісты краязнаўчага аддзела ствараюць інфармацыйныя матэрыялы для анлайн-рэсурсаў, сацыяльных медыя, загружаюць аўдыя- і відэападкасты ў інтэрнэт, апрацоўваюць і размяшчаюць фатаграфіі, выкарыстоўваюць разнастайныя камп'ютарныя праграмы, аператыўна перадаюць інфармацыю на сайт.

Для забеспячэння паслядоўнасці і пераемнасці выканання краязнаўчай работы распрацоўваюцца *тэхналагічныя і іншыя палажэнні і інструкцыі:*

– зводны профіль краязнаўчых фондаў бібліятэк краю;

– інструкцыя аб парадку адбора і перадачы краязнаўчых і мясцовых выданняў на дэпазітарнае захоўванне;

– шлях краязнаўчага дакумента ў працэсе фарміравання краязнаўчых фондаў;

– палажэнне пра зводны краязнаўчы каталог і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аддзелы краязнаўства ажыццяўляюць планаванне і справаздачу краязнаўчай базы даных (КБД), самастойнае планаванне вядзецца і тады, калі бібліятэка ўдзельнічае ў рэалізацыі дзяржаўнай або рэгіянальнай краязнаўчай праграмы. Планы і справаздачы КБД уваходзяць у адпаведныя агульныя (комплексныя) дакументы бібліятэкі.

*Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці публічных бібліятэк*. Краязнаўчая работа ажыццяўляецца практычна ўсімі структурнымі падраздзяленнямі мясцовай публічнай бібліятэкі, але ў нямногіх з іх створаны сектары краязнаўства ў складзе аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі: Пінскай ЦГБ і Мазырскай ЦРБ імя А. С. Пушкіна (сектары краязнаўства), Маладзечанскай ЦРБ (сектар даведачна-бібліяграфічнай інфармацыі і краязнаўства), Барысаўскай ЦРБ імя І. Х. Каладзеева, Кобрынскай ЦРБ (краязнаўчы інфармацыйны цэнтр), Камянецкай ЦРБ ім У. М. Ігнатоўскага (гісторыка-краязнаўчы цэнтр). У структурных краязнаўчых падраздзяленнях вядзецца работа прыкладна па тых жа напрамках, як і ў аддзелах краязнаўства АУБ. Наяўнасць самастойнага падраздзялення сведчыць аб вялікай увазе менавіта да краязнаўчай дзейнасці. Напрыклад, у краязнаўчым інфармацыйным цэнтры Кобрынскай ЦРБ вядуцца збор, захоўванне, вывучэнне, распаўсюджанне краязнаўчых дакументаў і інфармацыі пра іх. Збіраюцца кнігі, папкі газетных і часопісных артыкулаў, папкі-дасье, архіўныя матэрыялы і рукапісы краязнаўцаў, карты, схемы горада і раёна, альбомы, паштоўкі, фотаздымкі, бібліяграфічныя паказальнікі, электронныя версіі краязнаўчых кніг, мясцовых газет і друкаваных сцэнарыяў краязнаўчых мерапрыемстваў бібліятэкі, фонды відэафільмаў, радыёаглядаў і відэапрэзентацый. Фарміруюцца ЭІР: краязнаўчы каталог і БД паўнатэкставых дакументаў.

У многіх ЦБС Беларусі дзейнічаюць бібліятэкі-філіялы, бібліятэкі-музеі, якія спецыялізуюцца на краязнаўстве. У сельскіх, дзіцячых і школьных бібліятэках адведзены спецыялізаваныя пакоі, гасцёўні, куткі, краязнаўчыя інфармацыйныя цэнтры. Напрыклад, этнакуткі «Спадчына» аформлены ў Падлужанскай СБ (Мсціслаўская бібліятэчная сістэма), «Нашай вёскі спадчына жывая» ў Вяліказімніцкай СБ (Слаўгарадская бібліятэчная сістэма). Вядомасць у Беларусі і за яе межамі атрымала Ляснянская бібліятэка-музей у складзе Слаўгарадскай цэнтра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лізаванай сеткі публічных бібліятэк. У ***Сялецкай СБ (Бярозаўская раённая цэнтралізаваная сістэма)*** дзейнічае *віртуальная* ***літаратурна-краязнаўчая гасцёўня «Вытокі Башты»***, у якой сабраны паўнатэкставыя, фактаграфічныя, бібліяграфічныя, выяўленчыя матэрыялы аб выдатных асобах, гістарычна звязаных з гэтай вёскай: паэтах, празаіках, драматургах, рэлігійных дзеячах.

Наогул сістэмная цэласнасць краязнаўчай дзейнасці публічных бібліятэк характарызуецца не столькі арганізацыйнай афармленасцю, колькі зместам. Як адзначалася раней, краязнаўчая функцыя ўласцівая публічным бібліятэкам, ажыццяўляецца імі незалежна ад наяўнасці асобнага структурнага падраздзялення. Заканамерна, што краязнаўчую работу ў публічных бібліятэках вядуць супрацоўнікі *аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі*, ***бібліятэчнага маркетынгу*, *камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду***. Кожны супрацоўнік бібліятэкі ўдзельнічае ў КББД незалежна ад пасады і ўчастка работы з улікам профілю, функцыянальных абавязкаў, схільнасцей.

Планаванне і справаздачнасць КББД вядзецца ў комплексных планах і справаздачах публічных бібліятэк. Самастойнае планаванне і справаздача КДБ вядуцца тады, калі ў бібліятэцы створана спецыяльнае краязнаўчае падраздзяленне (сектар, цэнтр, група), або калі бібліятэка ўдзельнічае ў рэалізацыі дзяржаўнай або рэгіянальнай краязнаўчай праграмы.

Публічныя бібліятэкі развіваюць сувязі са шматлікімі партнёрамі, сярод якіх абласныя і іншыя бібліятэкі, краязнаўчыя музеі, навучальныя ўстановы, цэнтры дзіцячага турызму і краязнаўства, грамадскія арганізацыі (БРСМ, нацыянальна-культурныя таварыствы, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны), мясцовыя СМІ, мясцовыя органы ўлады і кіравання, арганізацыі, установы і прадпрыемствы.

*Краязнаўчая дзейнасць дзіцячых бібліятэк.* Арганізацыйна яна можа быць набліжана да публічных ці спецыяльных бібліятэк – гэта залежыць ад традыцый, маштабаў краязнаўчай работы, рэсурсных магчымасцей. Актыўна выкарыстоўваюцца конкурсныя, прэзентацыйныя і гульнёвыя формы работы. У гэтых бібліятэках рэалізуюцца ўнікальныя праграмы і праекты, плённа развіваецца ўзаемадзеянне з адукацыйнымі ўстановамі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеямі, грамадскімі арганізацыямі, выдатнымі землякамі. На краязнаўчым змесце рэалізуюцца задачы патрыятычнага, грамадзянскага, эстэтычнага, экалагічнага і іншых кірункаў выхавання маладога пакалення. Прыярытэтнае значэнне надаецца непасрэдным і віртуальным зносінам з дзецьмі, іх бацькамі, настаўнікамі і выхавацелямі.

*Краязнаўчая дзейнасць спецыяльных бібліятэк.* У спецыяльных бібліятэках, як правіла, фарміруюцца краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы, ствараюцца асобныя элементы краязнаўчага ДБА, выкарыстоўваюцца формы папулярызацыі краязнаўчых ведаў. Структурныя падраздзяленні краязнаўчага характару адсутнічаюць. Краязнаўчую работу выконваюць супрацоўнікі існуючых структурных падраздзяленняў у адпаведнасці з асноўнымі функцыянальнымі абавязкамі. Так, у бібліятэках устаноў адукацыі краязнаўчая работа сфакусіравана на адлюстраванні гісторыі і сучаснасці самой установы, яе педагагічнага калектыва, навучэнцаў і выпускнікоў, дасягненняў у навукова-педагагічнай дзейнасці. Ствараюцца базы даных, праекты, віртуальныя выставы, лічбавыя фотаархівы, бібліяграфічныя паказальнікі прац выкладчыкаў.

*Роля нацыянальных бібліятэк у развіцці краязнаўства.* Нацыянальныя бібліятэкі шэрагу краін вядуць актыўную работу па краязнаўстве, генеалогіі і краязнаўчай фатаграфіі. Сярод іх Нацыянальная бібліятэка Францыі, Бібліятэка Кангрэса (ЗША), Нацыянальная бібліятэка Беларусі і інш. У замежных бібліятэках функцыянуюць аддзелы краязнаўства (мясцовай гісторыі) і генеалогіі. Статус гэтых бібліятэк і перадавыя тэхналогіі дазваляюць фарміраваць і прадстаўляць у інтэрнэце каштоўныя інфармацыйныя рэсурсы, што прыцягвае карыстальнікаў (індывідуальных, калектыўных) з любых кропак свету. Тут існуюць выдатныя магчымасці для маніторынгу інтэрнэт-прасторы з мэтамі выяўлення новых рэсурсаў для забеспячэння краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей жыхароў і ўраджэнцаў рэгіёнаў краіны, для развіцця сучасных паслуг, для ажыццяўлення даследаванняў.

Напрыклад, Нацыянальная бібліятэка Францыі захоўвае шматлікія дакументы па гісторыі французскіх сем’яў і рэгіянальнай гісторыі (краязнаўстве) – гэта генеалагічныя даследаванні, мясцовы перыядычны друк, рукапісныя матэрыялы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і інш. Рэсурсы Richelieu-Louvoie (Рышэлье-Лувуа) і François-Mitterrand (Франсуа-Мітэран) на сайце бібліятэкі прапануюць генеалагічныя даведнікі, слоўнікі, гербоўнікі, краязнаўчыя даведнікі, публікацыі мясцовых органаў улады, рэлігійных цэнтраў. Асобную калекцыю складаюць некалькі соцень назваў зборнікаў радаводаў на CD-ROM. Кампакт-дыскі ўтрымліваюць багатыя біяграфічныя матэрыялы, у т. л. неапублікаваны кантэнт з прыватных крыніц. Персанал дапамагае карыстальнікам адшукаць продкаў.

Аддзел краязнаўства і генеалогіі Бібліятэкі Кангрэса валодае адным з найбагацейшых у свеце збораў амерыканскіх і замежных краязнаўчых і генеалагічных публікацый, алічбаваных рэсурсаў, баз даных і спецыялізаванымі пошукавымі інструментамі, у т. л. віртуальнай даведачнай службай па краязнаўстве і генеалогіі.

Багатыя інфармацыйныя рэсурсы і дасканалыя інтэрнэт-пошукавыя інструменты прапануюць Бібліятэка і Архіў Канады. Гэта алічбаваныя газеты канадскіх правінцый, архіўныя фонды, фатаграфіі. Для правядзення даследаванняў па ўзнаўленні радаводаў, пошуку продкаў, іх фотаздымкаў, фактаў мясцовай гісторыі прапануецца падрабязная даведка.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (раней Дзяржаўная бібліятэка БССР) з першых гадоў свайго існавання прадстаўляла інфармацыйныя рэсурсы ў рэгіёназнаўчым (тапаграфічным) аспекце, садзейнічала развіццю краязнаўчай дзейнасці ў бібліятэках рэспублікі, яе метадычнаму забеспячэнню, стварэнню краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі і інш. Выдатны асабісты ўклад належаў І. Б. Сіманоўскаму і Р. М. Чыгіровай, якія бачылі перспектыўнасць бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў 2018 г. створаны сектар краязнаўства і праектнай работы. *Яго асноўныя задачы наступныя:*

– фарміраванне краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў;

– навукова-даследчая і навукова-метадычная дзейнасць у галіне КББД;

– ажыццяўленне навуковых і выдавецкіх праектаў, якія адлюстроўваюць дакументальную спадчыну, гісторыю і культуру Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– удзел у каардынацыі дзейнасці структурных падраздзяленняў НББ і бібліятэк краіны, інфармацыйных устаноў па стварэнні краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі;

– удзел у павышэнні прафесійнага ўзроўню бібліятэчных кадраў краіны.

Сярод асноўных кірункаў краязнаўчай дзейнасці НББ магчыма адзначыць наступныя:

1) вывучэнне, узнаўленне і папулярызацыя дакументальнай спадчыны рэгіёнаў. Як вынік створаны краязнаўчыя электронныя інфармацыйныя рэсурсы. НББ сумесна з партнёрамі: АУБ, кафедрамі гісторыі БДУ і рэгіянальных універсітэтаў, замежнымі бібліятэкамі і музеямі ажыццяўляе мультымедыйныя праекты па алічбоўцы дакументаў, каштоўных для вывучэння мінулага рэгіёнаў Беларусі. Такімі былі выданні «Памятных кніжак…» беларускіх губерняў, «Юзаф Ігнацый Крашэўскі» (1812–1887), «Деятельность Витебской ученой архивной комиссии (1909–1919): документы и материалы» и «Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии (1864–1915)». Ва ўсіх дадаткова прадстаўлены даведачны, бібліяграфічны, ілюстрацыйны і музычны матэрыял;

2) прадстаўленне аддаленым карыстальнікам доступу да КІР бібліятэк краіны праз Віртуальны чытальны зал НББ – раздзел «Рэсурсы арганізацый партнёраў». НББ праводзіць цыклы інфармацыйных (прэзентацыйных) мерапрыемстваў, напрыклад «Информационные сокровища земли белорусской», на якіх абласныя бібліятэкі прэзентуюць створаныя краязнаўчыя рэсурсы;

3) арганізацыя буйных навуковых мерапрыемстваў, напрыклад, міжнароднага навукова-практычнага семінара «Бібліятэчнае краязнаўства: тэрыторыя вялікіх магчымасцей і перспектыў» (май 2012), і выданне аднайменнага зборніка. Даклады краязнаўчай тэматыкі чытаюцца падчас правядзення міжнародных бібліятэчных кангрэсаў «Бібліятэка як феномен культуры», а VII кангрэс (2020) быў прысвечаны краязнаўчай і краіназнаўчай тэматыцы. НББ вывучае магчымасці індэксавання краязнаўчых дакументаў па УДК і публікуе метадычныя рашэнні па індэксаванні дакументаў краязнаўчага зместу па гуманітарных, сацыяльна-палітычных і прыродазнаўчых навуках;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) навукова-метадычная дапамога бібліятэкам рэгіёна па краязнаўстве. Напрыклад, кіраўнікі і вядучыя спецыялісты НББ выступаюць па пытаннях краязнаўства на семінарах, удзельнічаюць у іншых формах прафесійных зносін бібліятэчных спецыялістаў.

У бібліятэках вывучаецца стан краязнаўчай дзейнасці. Карысным з'яўляецца правядзенне сацыялагічных даследаванняў сярод карыстальнікаў і бібліятэчных спецыялістаў. Узор пісьмовага апытання бібліятэкараў-краязнаўцаў прыведзены ў дадатку Б.

## Пытанні і заданні да тэмы 2.3

1. Ахарактарызуйце ролю Міжнароднай Федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў у развіцці краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

2. Якая арганізацыйная структура краязнаўства ў абласной універсальнай бібліятэцы, цэнтралізаваных сістэмах публічных бібліятэк, у спецыяльных бібліятэках?

3. Якую ролю ажыццяўляюць у развіцці краязнаўства нацыянальныя бібліятэкі?

4. Ці ёсць у складзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі структурнае падраздзяленне па краязнаўстве?

5. Назавіце асноўныя кірункі дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па краязнаўстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГЛАВА 3
# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ РЭСУРСЫ БІБЛІЯТЭКІ

## 3.1. Краязнаўчы дакумент як асноўная адзінка краязнаўчага фонду

Краязнаўчыя дакументы захоўваюцца ў бібліятэках, архівах, музеях, органах навукова-тэхнічнай інфармацыі (НТІ). У кожнай з гэтых установ ёсць спецыфіка, звязаная з фарміраваннем і выкарыстаннем краязнаўчых дакументаў. Краязнаўчы фонд з’яўляецца структурнай адзінкай агульнага фонду бібліятэкі. *Краязнаўчы фонд бібліятэкі (КФ)* – гэта ўпарадкаваная сукупнасць дакументаў, якія зместам і/ці формай звязаны з краем і прызначаны для грамадскага выкарыстання. КФ прызначаны для рэалізацыі бібліятэкамі шырокіх сацыяльных задач і фарміруецца з матэрыялаў, для захавання і арганізацыі якіх існуюць бібліятэкі. Дакументы, што складаюць гэты фонд, называюцца *краязнаўчымі*. Упершыню тэрмін быў выкарыстаны і ахарактарызаваны С. Н. Акуліч[27]. *Краязнаўчы дакумент (КД)* поўнасцю ці часткова па сваім змесце і фармальных прыметах (аўтарства, стварэнне, выпуск) звязаны з пэўным краем (рэгіёнам). Пры гэтым пад зместам краязнаўчага дакумента разумеецца адлюстраваная ў ім інфармацыя пра край, а пад формай – звесткі пра месца выдання, аўтарскую прыналежнасць і дачыненне да краю іншых асоб, якія ўдзельнічалі ў стварэнні дакумента. Такое абагульняючае паняцце, што дае магчымасць з вычарпальнай паўнатой аб’яднаць усе дакументы, звязаныя з краем, з’яўляецца *зборным*. Неабходна ўлічваць, што да КД адносяцца не толькі тыя з іх, набыццё, захаванне і прадстаўленне ў выкарыстанне якіх уласцівыя для бібліятэк як грамадскага інстытута, але іншыя віды дакументаў, што выяўляюць краязнаўчы характар, напрыклад гербы, эмблемы, пячаткі.

У практычнай дзейнасці бібліятэк *зборнае* паняцце КД, як правіла, раздзяляецца на два *канкрэтных*: «краязнаўчы дакумент» і «мясцовы дакумент». Паняцце *«краязнаўчы дакумент»*

[27] Акулич С. Н. О сущности понятия «краеведческий документ» // Советское библиотековедение. – 1990. – № 4. – С. 53–59.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ядноўвае ўсе выданні, неапублікаваныя і аўдыявізуальныя матэрыялы, машыначытальныя носьбіты інфармацыі, якія поўнасцю ці па асноўным сваім змесце прысвечаны краю, незалежна ад мовы, месца і тыражу выдання. Паняцце *«мясцовы дакумент»* аб’ядноўвае ўсе выданні, неапублікаваныя і аўдыявізуальныя матэрыялы, машыначытальныя носьбіты інфармацыі, створаныя на тэрыторыі краю. Безумоўна, мясцовыя дакументы, напрыклад, газеты, кнігі і іншыя ўтрымліваюць звесткі пра мінулае і сучаснасць. Аднак могуць быць мясцовыя выданні, змест якіх не звязаны з краем, напрыклад рэгіянальнае выданне падручніка «Вышэйшая матэматыка». Для бібліятэкі важнае значэнне маюць як краязнаўчыя па змесце, так і па форме дакументы, але пэўны прыярытэт надаецца краязнаўчым па змесце дакументам, незалежна ад таго, з’явіліся яны ў гэтай мясцовасці ці за яе межамі. Звернем увагу на тое, што раздзяленне паняцця «краязнаўчы дакумент» на краязнаўчы і мясцовы атрымала шырокае распаўсюджанне ў бібліятэчнай практыцы, а таксама выкарыстоўваецца ў нарматыўных і метадычных матэрыялах. Напрыклад, у расійскіх кіраўніцтвах па краязнаўчай дзейнасці выкарыстаны абодва тэрміны: краязнаўчы і мясцовы дакументы.

На фарміраванне краязнаўчых фондаў істотна ўплываюць наступныя асаблівасці функцыянавання краязнаўчай інфармацыі:

– краязнаўчая інфармацыя фіксуецца не толькі ў асобных (самастойных) дакументах, але рассейваецца па дакументах некраязнаўчага зместу – галіновых, краіназнаўчых;

– краязнаўчыя дакументы характарызуюцца ўнікальнасцю і высокай каштоўнасцю, што пазбаўляе іх ад хуткага старэння.

Каб набыць краязнаўчыя дакументы ў фонд, трэба зрабіць экспертызу *краязнаўчай каштоўнасці дакумента*. Краязнаўчая каштоўнасць дакумента – сукупнасць зместавых і фармальных характарыстык, якія дазваляюць бібліятэкару аддаць перавагу таму ці іншаму краязнаўчаму дакументу, ажыццявіць яго асэнсаваны выбар як аб’екта фарміравання краязнаўчага фонду. Пры аналізе каштоўнасці краязнаўчага дакумента бібліятэкар улічвае агульныя і дапаможныя прыметы (крытэрыі). *Агульныя*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*прыметы* дазваляюць вызначыць каштоўнасць КД для яго захавання:

– змястоўная сувязь з краем;

– узровень суадносін з задачамі, тыпам або відам, профілем бібліятэкі;

– адпаведнасць КД краязнаўчым інфармацыйным патрэбнасцям карыстальнікаў бібліятэкі;

– актуальнасць, навізна;

– навуковая або мастацкая каштоўнасць.

Для адбору краязнаўчага дакумента, асабліва калі неабходна здзейсніць выбар з некалькіх, рэкамендуецца ўлічваць дапаможныя прыметы (крытэрыі):

– шырокае сацыяльнае прызначэнне дакумента;

– функцыянальнае прызначэнне для пазнання краю;

– мясцовае паходжанне і выданне дакумента;

– комплексны характар яго зместу;

– гуманітарны сэнс інфармацыі, якая прысутнічае ў дакуменце;

– аб'ём краязнаўчай інфармацыі;

– аўтарства;

– мова дакумента;

– час яго стварэння і выдання.

Такім чынам, *ідэальны каштоўны краязнаўчы дакумент* валодае сукупнасцю краязнаўчых якасцей: ён звязаны зместам з краем; шырокага сацыяльнага прызначэння; функцыянальна прызначаны для вывучэння краю; створаны і выдадзены ў рэгіёне; напісаны мясцовым аўтарам; комплекснага характару; гуманітарнага зместу; цалкам прысвечаны краю; выдадзены на дзяржаўнай мове або мове карэннага насельніцтва; супадае па часе стварэння, выдання і апісання мясцовых падзей. Бібліятэкар арыентуецца на прыметы ідэальна каштоўнага КД, і параўноўваючы з ім новы КД, прымае рашэнне пра набыццё яго ў фонд бібліятэкі, вызначае колькасць экзэмпляраў, месца захавання, спосаб выкарыстання, вырашае пытанне пра адлюстраванне КД у краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце. Краязнаўчая каштоўнасць дакумента – гэта інтэгральны крытэрый, які дапамагае вызначыць найбольш важныя дакументы.

Такія дакументы складаюць *ядро КФ*. Спецыяліст улічвае ўсе характарыстыкі дакумента і прымае рашэнне:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– набыць КД у фонд дэпазітарнага захавання, фонд аператыўнага абслугоўвання ў краязнаўчым аддзеле, для іншых структурных падраздзяленняў бібліятэкі;

– выдаваць на дом, па міжбібліятэчным абанеменце (МБА);

– адлюстроўваць у бібліяграфічных паказальніках, на выставе;

– уключаць у склад пэўнай калекцыі, у электронную бібліятэку (ЭБ) і інш.

Вызначаецца *экзэмплярнасць* КД, напрыклад, у абласной бібліятэцы: мінімальная экзэмплярнасць КД – 2–3 экзэмпляры, мясцовых выданняў – 1–2 экзэмпляры. Максімальную экзэмплярнасць кожная бібліятэка вызначае сама. Пры гэтым улічваецца час стварэння КД, магчымасці набыцця страчаных экзэмпляраў, кошт дакамплектавання фонду КД, улік мясцовых умоў, структуры бібліятэкі, неабходнасць забеспячэння КД іншых бібліятэк сістэмы, рэгіёна.

**Пытанні і заданні да тэмы 3.1**

1. Патлумачце паняцці «краязнаўчы дакумент», «мясцовы дакумент».
2. Што такое «краязнаўчая каштоўнасць дакумента»?
3. Якая экзэмплярнасць краязнаўчых і мясцовых дакументаў аптымальная для фонду абласной універсальнай бібліятэкі?

## 3.2. Спецыфіка краязнаўчага фонду бібліятэк

Краязнаўчы фонд бібліятэкі з’яўляецца каштоўным інфармацыйным рэсурсам усебаковага пазнання і развіцця любога рэгіёна, асновай краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі. У даследаванні феномена краязнаўчага фонду бібліятэкі значны ўклад унесены С. М. Крываронценка[28]. Краязнаўчы фонд (КФ) – гэта фонд, звязаны з краем *зместам* (фонд краязнаўчых дакументаў) і/ці *паходжаннем* (фонд мясцовых выданняў). Цяпер шырэй выкарыстоўваецца паняцце «краязнаўчыя фонды».

[28] Криворотенко С. Н. Краеведческий фонд библиотек : учеб. пособие. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 64 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век»).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Парадак арганізацыі, фарміравання, захоўвання і выкарыстання краязнаўчага фонду рэгламентуецца адпаведным Палажэннем. Узор такога дакумента адлюстраваны ў дадатку В.

Фарміраванне КФ ажыццяўляецца на аснове агульнафондавых прынцыпаў і агульнапрынятай тэхналогіі. Незалежна ад тыпу і віду бібліятэкі выяўляюць, збіраюць і захоўваюць краязнаўчыя дакументы, але ведамасная прыналежнасць, статус бібліятэкі і іншыя асаблівасці ўплываюць на камплектаванне фонду. Пры фарміраванні КФ важную ролю адыгрываюць улік асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага, культурна-гістарычнага, прыродна-кліматычнага профілю рэгіёна, а таксама краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў.

У фонд краязнаўчых дакументаў уключаюцца матэрыялы, *цалкам* прысвечаныя дадзенаму рэгіёну або любой яго частцы, што змяшчаюць *значныя па аб’ёме або каштоўнасці звесткі* пра яго. Да іх адносяцца:

– краязнаўчыя выданні, незалежна ад фізічнай формы, тыпу і віду, мовы, часу і месца выдання (стварэння). Уключаюцца таксама электронныя копіі друкаваных выданняў, створаныя ў мэтах забеспячэння іх захаванасці і даступнасці;

– неапублікаваныя дакументы (рукапісы, фатаграфіі, лісты, дзённікі і інш.);

– электронныя копіі неапублікаваных краязнаўчых дакументаў, якія створаны ў мэтах забеспячэння захаванасці арыгіналаў або атрыманы замест арыгіналаў;

– сеткавыя краязнаўчыя дакументы, адабраныя па крытэрыях аўтарытэтнасці, інфарматыўнасці, арыгінальнасці і правамерна скапіраваныя з інтэрнэту.

Электронныя копіі неапублікаваных краязнаўчых дакументаў і сеткавыя краязнаўчыя дакументы, якія не з’яўляюцца выданнямі, уключаюцца ў электронны краязнаўчы архіў, каб забяспечыць захаванасць унікальных і эфемерных матэрыялаў.

Падфонды (архівы) неапублікаваных і сеткавых краязнаўчых дакументаў фарміруюцца выбарачна, з улікам іх інфармацыйнай каштоўнасці.

Відавая разнастайнасць краязнаўчых выданняў, якія дамініруюць у КФ бібліятэк, вельмі шырокая:

– кнігі і брашуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– перыядычныя і прадаўжальныя выданні (выданні з працягам);

– выяўленчыя выданні (фотаальбомы, календары, паштоўкі, плакаты, лістоўкі, праспекты, каталогі музеяў і інш.);

– аўдыявізуальныя выданні (аўдыякнігі, відэафільмы, дыяпазітывы, грампласцінкі, магнітныя стужкі, кампакт-дыскі, кінафільмы);

– ноты;

– картаграфічныя выданні;

– электронныя выданні;

– прамысловыя каталогі на мясцовую прадукцыю;

– апісанні вынаходніцтваў мясцовых наватараў і інш.

Важнай з'яўляецца дыферэнцыяцыя краязнаўчых выданняў па:

– *мэтавым і чытацкім прызначэнні*: афіцыйныя, навуковыя, вучэбныя, вытворчыя, навукова-папулярныя, даведачныя, інфармацыйныя, літаратурна-мастацкія, выданні для дзяцей і юнацтва, для службовага карыстання і інш.

– *па знакавай прыродзе інфармацыі*: картаграфічныя, нотныя, выяўленчыя выданні, фотаальбомы і інш.

– *па характары інфармацыі*: манаграфіі, зборнікі навуковых прац, энцыклапедыі, біяграфічныя даведнікі, літаратурна-дакументальныя выданні і інш.

З вышэйадзначанага відаць, што ў КФ бібліятэкі ўключаюцца дакументы, вельмі розныя па сваёй фізічнай прыродзе і іншых характарыстыках, таму ў ім выдзяляюць асобныя фонды, падфонды і калекцыі. Асноўнымі часткамі КФ з'яўляюцца:

– фонд краязнаўчых (па змесце) дакументаў;

– фонд мясцовых выданняў.

На сучасным этапе вылучаныя па пэўнай прымеце часткі фонду называюцца калекцыямі.

Абласныя і публічныя бібліятэкі імкнуцца да збору максімальна *поўнага, універсальнага* па змесце фонду краязнаўчых (у т. л. мясцовых) дакументаў. Такія фонды з'яўляюцца асабліва каштоўнымі і складаюць унікальную частку сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фонду.

У межах КФ бібліятэкі магчыма фарміраванне асобных падфондаў (калекцый) па:

– *відах дакументаў*: фатаграфій, паштовак, нот і інш.;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– на падставе *храналагічных*, *тэматычных прымет* (улёткі перыяду Вялікай Айчыннай вайны);

– па прымеце *персоны*, *арганізацыі*, *установы*.

У *фонд мясцовых выданняў* уключаны дакументы, якія выйшлі на тэрыторыі рэгіёна, незалежна ад іх зместу, формы, тыпу і віду выдання, мовы і часу выхаду ў свет. Пры ўсёй іх разнастайнасці неабходна адзначыць каштоўнасць мясцовых перыядычных выданняў, выдадзеных на розных гістарычных этапах, асабліва газет, што справядліва лічацца летапісамі мясцовага жыцця. Паўната гэтай часткі фонду ў абласных бібліятэках забяспечваецца паступленнем мясцовага абавязковага экзэмпляра (АЭ).

Спецыфічныя адрозненні ў складзе і структуры краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў ствараюць умовы для задавальнення разнастайных краязнаўчых патрэбнасцей карыстальнікаў, забяспечваюць умовы для каардынаванага фарміравання сукупнага КФ бібліятэк рэгіёна і яго ўзаемавыкарыстання. КФ асобнай бібліятэкі прадстаўляе самастойную сістэму, з’яўляецца падсістэмай агульнага фонду бібліятэкі, кампанентам КФ бібліятэк раёна, вобласці, краіны.

*КФ мае наступныя ўласцівасці*:

– тэматычны, тыпалагічны, відавы, храналагічны і моўны склад КФ супадае з параметрамі бібліятэчнага фонду наогул;

– краязнаўчыя дакументы маюць пастаянную высокую каштоўнасць;

– абнаўленне КФ адбываецца больш павольна, чым усяго фонду, бо краязнаўчыя дакументы захоўваюцца пастаянна (іх не спісваюць як састарэлыя па змесце);

– стабільны склад;

– галоўнай характарыстыкай КФ з’яўляецца яго паўната, а не велічыня;

– велічыня КФ залежыць ад інтэнсіўнасці дакументнага патоку; экзэмплярнасць набытых выданняў абумоўлена запытамі карыстальнікаў;

– у самастойны КФ не ўваходзяць матэрыялы пра край, якія змешчаны ў выглядзе асобных глаў, абзацаў і г. д., акрамя тых выпадкаў, калі гэтыя выпіскі (у выглядзе тэматычных папак, копій артыкулаў) афармляюцца ў самастойныя адзінкі захавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пералічаныя ўласцівасці сведчаць пра тое, што краязнаўчы фонд мае ўсе прыметы ядзернай часткі бібліятэчнага фонду, адначасова ў ім можна выдзеліць ядро – гэта найбольш каштоўныя краязнаўчыя дакументы.

*КФ розных тыпаў бібліятэк маюць свае асаблівасці.* Па складзе КФ падзяляюцца на:

– універсальныя, што фарміруюць АУБ, публічныя бібліятэкі і бібліятэкі краязнаўчых музеяў;

– шматгаліновыя – бібліятэкі ўніверсітэтаў, бібліятэкі сістэмы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

– галіновыя – навукова-тэхнічныя бібліятэкі (НТБ) прадпрыемстваў, медыцынскія, сельскагаспадарчыя бібліятэкі.

Найбольш поўныя КФ збіраюць абласныя ўніверсальныя бібліятэкі Беларусі. Аб’ём іх КФ ахоплівае некалькі тысяч ці дзясяткаў тысяч экзэмпляраў, пры гэтым краязнаўчыя дакументы ў іх аб’ёме складаюць меншую частку ў параўнанні з мясцовымі. Абласныя бібліятэкі атрымліваюць мясцовы АЭ твораў друку, што дазваляе ім выконваць функцыю дэпазітарыяў краязнаўчых і мясцовых дакументаў. КФ абласных бібліятэк фарміруюцца з улікам сукупнага профілю вобласці і разлічаны на задавальненне ўніверсальных інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, у т. л. звязаныя з навуковай, кіраўнічай і адукацыйнай дзейнасцю, бізнесам, аматарскімі захапленнямі, самаадукацыяй і інш. Па прынцыпе выбіральнасці і магчымасцей бібліятэкі камлектуюцца замежныя і неапублікаваныя дакументы, прысвечаныя краю. Якасны адбор характэрны для ўключэння ў фонд сеткавых рэсурсаў.

Цяпер у краязнаўчым фондзе Брэсцкай АБ было каля 40 тыс. экз. кніг, 40 папак «малых форм» друкаваных выданняў Брэсцкай вобласці (буклетаў, афіш, плакатаў, паштовак) на беларускай, рускай, украінскай і польскай мовах, больш за 160 назваў беларускіх перыядычных выданняў. Аб’ём краязнаўчага фонду аддзела краязнаўства Гродзенскай АНБ складае 18 185 дакументаў, Гомельскай – каля 25 000 адзінак захоўвання, аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Віцебскай АБ – 22 000 экз., аддзела беларускай літаратуры і краязнаўства Магілёўскай АБ – 4800 адз., з якіх каля 500 – рэдкія выданні[29].

---

[29] Атрымана з краязнаўчых аддзелаў АУБ.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчыя фонды АУБ пастаянна павялічваюцца і ўзбагачаюцца каштоўнымі крыніцамі. Напрыклад, у 2006 г. фонд Магілёўскай АБ папоўніўся фотадакументамі па гісторыі Магілёва XIX – пачатку XX ст. з асабістага архіву жыхаркі горада, фотаздымкамі вызвалення Магілёўскай вобласці ў 1944 г. і гераічных абаронцаў горада. Раней у краязнаўчым фондзе Магілёўскай АБ былі толькі два экзэмпляры каштоўнага дарэвалюцыйнага выдання «Памятныя кніжкі Магілёўскай губерні», а цяпер гэта поўная калекцыя з 35 друкаваных выданняў і такой жа колькасці электронных (кампакт-дыскаў, падрыхтаваных НББ з удзелам фонду «Русский мир»). Электронныя выданні «Памятных кніжак…» паступілі і ў іншыя абласныя і публічныя бібліятэкі краіны. Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна рэалізавала краязнаўчы ціфлапраект «Гродна: пачуць нябачнае», вынікам якога сталі 9 аўдыякніг па гісторыі Гродна.

Краязнаўчы фонд (ці яго актыўна выкарыстоўваемая частка) знаходзіцца ў краязнаўчых структурных падраздзяленнях абласных і асобных публічных бібліятэк. Фонд мясцовых выданняў – у кнігасховішчы. На пастаянным захаванні ў іншых структурных падраздзяленнях могуць знаходзіцца:

– спецвіды тэхнічнай дакументацыі;

– рэдкія мясцовыя некраязнаўчыя выданні;

– рэдкія краязнаўчыя выданні і неапублікаваныя дакументы (пры адсутнасці неабходных умоў захоўвання ў краязнаўчым падраздзяленні);

– нотныя, выяўленчыя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы;

– выданні на замежных мовах.

АУБ мэтанакіравана фарміруе ўласны дэпазітарны фонд, які ўключае мясцовыя і краязнаўчыя выданні, незалежна ад крыніцы набыцця, практычнай і навуковай каштоўнасці, актыўнасці выкарыстання, формы публікацыі і месца захоўвання ў бібліятэцы. У якасці дэпазітарыя АБ:

– выяўляе і вылучае для захоўвання мясцовыя выданні і краязнаўчыя дакументы ў сваім фондзе;

– пастаянна захоўвае ў сваім фондзе мясцовыя (1–2 экз.) і краязнаўчыя (2–4 экз.) выданні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэка праводзіць рэгулярнае абследаванне фізічнага стану экзэмпляраў, вызначае меры па іх кансервацыі і рэстаўрацыі.

*Публічныя бібліятэкі* вырашаюць задачу якаснага адбору краязнаўчых дакументаў і прадстаўлення іх для актыўнага выкарыстання абанентамі. КФ публічных бібліятэк не носяць дэпазітарнага характару, але выключэнне краязнаўчых дакументаў з фонду абмежавана. Склад КФ арыентаваны на профіль абслугоўваемай тэрыторыі і задавальненне агульнакультурных краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў.

Цэнтралізаваныя сістэмы публічных бібліятэк у абласных гарадах, як правіла, не абслугоўваюць вучоных і спецыялістаў. Тэматычная ўніверсальнасць і вузкая спецыялізацыя краязнаўчых запытаў і патрэбнасцей прадстаўнікоў гэтых груп забяспечваецца фондамі ўніверсальных абласных і іншых навуковых бібліятэк.

Публічныя бібліятэкі сярэдніх і малых гарадоў набываюць у фонд выданні, разлічаныя на задавальненне не толькі агульнакультурных, пазнавальных, але і навуковых, вучэбных, вузкапрофільных патрэбнасцей карыстальнікаў у галіне краязнаўства. У цэнтральных бібліятэках цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы сканцэнтраваны навуковыя і іншыя краязнаўчыя выданні, прызначаныя для задавальнення вышэйадзначаных індывідуальных патрэбнасцей (ІП) карыстальнікаў, а ў фондах бібліятэк-філіялаў – пераважна масавыя краязнаўчыя выданні. Сучасная тэндэнцыя – фарміраванне фондаў краязнаўчых і мясцовых выданняў у ЦБ сістэм публічных бібліятэк з вычарпальнай паўнатой, што адпавядае іх ацэнцы як асабліва каштоўных і ўнікальных у складзе сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фонду.

Падфонды (архівы) неапублікаваных і сеткавых краязнаўчых дакументаў фарміруюцца выбарачна, на падставе вызначэння іх інфармацыйнай каштоўнасці.

*Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі* арыентуюцца на далучэнне юных грамадзян да культурных каштоўнасцей роднага краю, яго пазнання, на фарміраванне патрэбнасцей карыстальнікаў у краязнаўчых дакументах. Краязнаўчыя фонды гэтых бібліятэк універсальныя, фарміруюцца з улікам узросту карыстальні-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў, а таксама інтарэсаў арганізатараў пазакласнай і пазашкольнай работы, бацькоў і разлічаны на задавальненне агульнакультурных і вучэбных краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей. Камплектуецца фонд дакументамі, прысвечанымі мясцовасці, дзе знаходзіцца школа. Значную яго частку займае мастацкая літаратура, творы мясцовых пісьменнікаў, падарожнікаў, біяграфічныя і даведачныя выданні. У складзе краязнаўчага фонду школьнай бібліятэкі збіраюцца дакументы па гісторыі школы, яе дасягненнях, выдатных выпускніках і настаўніках.

Спецыфіка КФ *бібліятэк устаноў вышэйшай адукацыі (УВА)* заключаецца ў тым, што яны разлічаны на задавальненне навукова-даследчых і вучэбных краязнаўчых патрэбнасцей. Склад краязнаўчага фонду вызначаецца профілем УВА і пераважна з'яўляецца шматгаліновым ці галіновым. У КФ гэтых бібліятэк уваходзяць:

– выданні ўніверсальнага і галіновага зместу, звязаныя з рэгіёнам, дзе знаходзіцца навучальная ўстанова, напрыклад даведачныя, навуковыя і вучэбныя выданні;

– усе выданні, апублікаваныя ў межах самой установы (работы выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў), а таксама дакументы, прысвечаныя навучальнай установе, жыццю і творчасці яе супрацоўнікаў. У бібліятэках УВА фарміруюцца рэпазіторыі, праз якія адбываецца доступ да разнастайных публікацый навукова-педагагічнага калектыву. Праз інтэрнэт магчыма знаёміцца і з навуковымі перыядычнымі выданнямі, якія выпускаюцца ва УВА.

*КФ спецыяльных бібліятэк (навукова-тэхнічных і інш.)* фарміруецца з улікам інтарэсаў прафесійнага калектыву, з мэтай садзейнічаць умацаванню іміджу прадпрыемства ў рэгіёне і за яго межамі. КФ накіраваны на задавальненне навукова-даследчых, вытворчых, прафесійных краязнаўчых патрэбнасцей карыстальнікаў. Спецыяльныя бібліятэкі збіраюць:

– дакументы, якія змяшчаюць звесткі пра гісторыю развіцця і сучасны стан канкрэтнага прадпрыемства (установы), дасягненні яго калектыву і найлепшых супрацоўнікаў. Дакументы, выдадзеныя самім прадпрыемствам, павінны камплектавацца *вычарпальна поўна*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты: прамысловыя каталогі на мясцовую прадукцыю, апісанне вынаходстваў мясцовых рацыяналізатараў, справаздачы пра навукова-даследчую работу (НДР) і інш. Наяўнасць такіх дакументаў – асаблівасць КФ спецыяльных бібліятэк.

***Сукупны краязнаўчы фонд рэгіёна.*** На сучасным этапе актуальная праблема фарміравання сукупнага краязнаўчага фонду рэгіёна.

Для яе вырашэння бібліятэкам краю неабходна мець:

– каардынаванае камплектаванне. Асновай каардынацыі з’яўляецца зводны профіль, які дазваляе прадставіць стан і структуру камплектавання краязнаўчых фондаў бібліятэк – удзельніц каардынацыі і рацыянальна размяркоўваць сродкі;

– сістэму дэпазітарнага захавання;

– узаемную інфармацыю пра склад, месцазнаходжанне і новыя паступленні краязнаўчых дакументаў;

– іх узаемавыкарыстанне на тэрыторыі краю;

– сістэму мясцовага абавязковага экзэмпляра твораў друку;

– зводны краязнаўчы каталог (друкаваны або электронны);

– зводны профіль фарміравання сукупнага КФ, што садзейнічае рацыянальнаму размеркаванню краязнаўчых дакументаў паміж бібліятэкамі ўсіх ведамстваў.

Камплектаванне сукупнага КФ прадугледжвае раздзяленне ўсіх наяўных і паступаючых краязнаўчых дакументаў на тры групы:

– КД, патрэбныя ўсім без выключэння бібліятэкам;

– КД, неабходныя асобным катэгорыям бібліятэк;

– КД, важныя для некаторых або асобных, канкрэтных бібліятэк.

У справе каардынаванага камплектавання краязнаўчых фондаў істотная роля належыць АУБ, якія з’яўляюцца кіраўнічым, інфармацыйна-рэсурсным і навукова-метадычным цэнтрам краязнаўчай дзейнасці ў абласцях. Такім чынам, існуе пэўная спецыфіка фарміравання краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў, што з’яўляецца ўмовай стварэння сукупнага краязнаўчага фонду рэгіёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні і заданні да тэмы 3.2

1. Дайце азначэнне паняццю «краязнаўчы фонд».
2. Якія дакументы ўключаюцца ў краязнаўчы фонд?
3. Што ўваходзіць у фонд мясцовых дакументаў?
4. Пералічыце ўласцівасці краязнаўчага фонду.
5. Ахарактарызуйце спецыфіку краязнаўчага фонду бібліятэк розных тыпаў.
6. Як фарміруецца сукупны краязнаўчы фонд рэгіёна?

## 3.3. Тэхналагічныя этапы фарміравання краязнаўчага фонду

Фарміраванне краязнаўчага фонду – гэта сукупнасць працэсаў і аперацый, ажыццёўленых у 4 асноўныя этапы: *мадэляванне, камплектаванне, арганізацыя і кіраванне*.

Першы этап – ***мадэляванне краязнаўчага фонду*** – акрэсленне з дапамогай мадэляў характарыстык гэтага фонду для вывучэння яго стану і вызначэння кірункаў далейшага развіцця. Мадэлі дазваляюць вырашаць пытанні адбору краязнаўчых дакументаў, арганізацыі іх захоўвання і інш. Пры стварэнні мадэлі КФ вывучаецца сацыяльна-эканамічны і культурны профіль рэгіёна, які абслугоўваецца бібліятэкай. Даследуюць інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў і паток краязнаўчых дакументаў. Выбар мадэлі краязнаўчага фонду залежыць ад тыпу бібліятэкі, складу і аб’ёму КФ. Да **іх відаў** належаць *апісальная (вербальная), матэматычная, структурная (тэматыка-тыпалагічная) і бібліяграфічная мадэлі*.

*Апісальная (вербальная) мадэль КФ*. Можа ствараццa як самастойны дакумент, калі КФ адасоблена захоўваецца ў краязнаўчым аддзеле або сектары або стаць састаўной часткай агульнай мадэлі фонду.

У апісальную мадэль уваходзяць: кароткая гісторыя стварэння КФ; склад, структура, аб’ём, крыніцы і спосабы набыцця дакументаў; прынятая схема расстаноўкі і размяшчэння фонду; рэжым захавання і выкарыстання КФ; магчымасці каардынацыі камплектавання і выкарыстоўвання ў межах краю; фіксуецца прынятае рашэнне па абмежаванні «свайго» краю, змястоўна-тэрытарыяльных меж КФ, прыярытэтныя краязнаўчыя тэмы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

храналагічная глыбіня фонду; прынцыпы адлюстравання ў краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце і інш.

У *матэматычнай мадэлі КФ* фіксуюцца асноўныя паказчыкі: аб'ём, склад, кнігавыдача, абарачальнасць фонду, чытальнасць, дакументазабяспечанасць, аб'ём паступленняў і выбыцця краязнаўчых дакументаў. Пры разліку асноўных паказчыкаў матэматычнай мадэлі КФ выкарыстоўваюць як агульныя, так і прыватныя метады: каэфіцыент укамплектаванасці галіновага падфонду; каэфіцыент выкарыстання гэтага падфонду, каэфіцыент адпаведнасці; вызначэнне аптымальнага аб'ёму краязнаўчага фонду і інш.

Найбольш распаўсюджана ў практыцы *структурная (тэматыка-тыпалагічная) мадэль КФ*. Яна рэгламентуе тэматычныя, тыпалагічныя, відавыя, моўныя параметры КФ; экзэмплярнасць набытых дакументаў; размеркаванне па структурных адзінках бібліятэкі.

У публічных бібліятэках краязнаўчая частка ўваходзіць у агульную структурную мадэль бібліятэчнага фонду, дзе выдзяляецца рубрыка «Краязнаўства», звязаная спасылкамі з іншымі рубрыкамі мадэлі.

У абласных універсальных бібліятэках ствараецца самастойная структурная мадэль краязнаўчага фонду. Для дэталізацыі краязнаўчых тэм выкарыстоўваюць класіфікацыйныя схемы. У структурнай мадэлі фіксуюцца краязнаўчыя дакументы, якія цалкам прысвечаны краю, або дакументы, комплексныя па змесце. Ствараюцца таксама і зводныя профілі камплектавання краязнаўчага фонду.

Дакументы, якія адносяцца да краю па фармальных прыметах (аўтарства, месца выдання і г. д.), у структурнай мадэлі не фіксуюцца. Прынятае рашэнне адлюстроўваецца ў тлумачальнай запісцы ці ў картатэцы метадычных рашэнняў.

Дадаткамі да структурнай мадэлі з'яўляюцца: картатэка мясцовых перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца; паказальнік назваў тэрыторый, якія ўваходзяць у склад азначанага краю; спіс юрыдычных асоб краю; пералік асноўных бібліяграфічных дапаможнікаў для камплектавання краязнаўчага фонду; картатэка крыніц папаўнення КФ; картатэка бібліятэк – удзельніц стварэння сукупнага КФ краю, зводнага краязнаўчага каталога.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Бібліяграфічная мадэль КФ* уключае пералік найбольш каштоўных і рэдкіх краязнаўчых дакументаў. Мадэль рэалізуецца ў форме бібліяграфічных паказальнікаў, спісаў ядра КФ, паказальнікаў (баз даных) мясцовых выданняў.

У сукупнасці пералічаныя мадэлі садзейнічаюць аб'яднанню асобных краязнаўчых дакументаў у сістэму «краязнаўчы фонд», бо яны ўзнаўляюць рэальную і прагнозную структуру фонду.

Другі этап – ***камплектаванне КФ*** – уключае:

– *першасны адбор* (адбор і планамернае набыццё дакументаў для стварэння і папаўнення фонду);

– *другасны адбор* (аналіз выкарыстання бібліятэчнага фонду, выключэнне незапатрабаванай літаратуры, якая не карыстаецца запытам чытачоў, не суадносіцца з тыпам (відам) бібліятэкі).

Камплектаванне КФ ажыццяўляецца ў суадносінах з агульнай методыкай аналізу патоку дакументаў, выяўлення, адбору і заказу краязнаўчых дакументаў з улікам крытэрыяў краязнаўчай каштоўнасці дакумента. Выкарыстоўваюцца наступныя віды камплектавання:

*1) пачатковае камплектаванне* – пры стварэнні новай бібліятэкі пачынаюць з фарміравання ядра фонду;

*2) бягучае камплектаванне* – папаўненне фонду дакументамі, якія былі выдадзены на працягу двух апошніх гадоў. Разнавіднасцю бягучага камплектавання з'яўляецца *дакамплектаванне* – папаўненне фонду дакументамі, якія адсутнічаюць у бібліятэцы або якіх недастаткова для карыстальнікаў;

*3) рэтраспектыўнае камплектаванне* – папаўненне фонду выданнямі, якія адсутнічаюць, або іх не хапае колькасна, і яны былі выдадзены тры і больш гадоў таму;

*4) рэкамплектаванне* – выключэнне з фонду выданняў, што страцілі сваю каштоўнасць і не выкарыстоўваюцца абанентамі.

Камплектаванне КФ вядзецца праз:

– падпіску на перыядычныя выданні праз РУП «Белпошта», «Белсаюздрук» і абласныя прадпрыемствы (РУП «Брэстсаюздрук» і інш.), «Кніга – поштай»;

– пакупку (з выдавецтваў, кнігарняў, на аўкцыёнах, у прыватных асоб, на кніжных кірмашах);

– дары ад чытачоў, аўтараў і інш.;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– кнігаабмен. Бібліятэкі краіны выкарыстоўваюць магчымасці ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў;

– капіраванне і рэпрадуцыраванне дакументаў, якіх не хапае, або яны адсутнічаюць у бібліятэцы;

– дыгіталізацыя каштоўных краязнаўчых дакументаў.

Ажыццяўляючы *бягучае камплектаванне*, бібліятэкар знаёміцца з прайс-лістамі, каталогамі і іншымі інфармацыйнымі матэрыяламі мясцовых і цэнтральных рэспубліканскіх (дзяржаўных і недзяржаўных) выдавецтваў, кнігагандлёвых арганізацый, паліграфічных прадпрыемстваў, іншых арганізацый, навучальных устаноў, музеяў, якія выдаюць краязнаўчыя дакументы. Карысным можа быць удзел у рабоце Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмаша. Мэтазгодна ўважліва азнаёміцца з анатацыямі на выданні. Напрыклад, анатацыя да шостага тома выдання «Гербоўнік беларускай шляхты» ўдакладняе, што адлюстраваны радаводы шляхты пераважна Мінскай губерні, і гэта робіць кнігу каштоўнай для бібліятэк Мінскай і шэрагу тэрыторый Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей, якія раней уваходзілі ў склад дадзенай губерні[30]. Даследуюцца краязнаўчыя рэсурсы ў інтэрнэце. Асаблівую ролю ў бягучым камплектаванні АУБ адыгрывае мясцовы абавязковы экзэмпляр выданняў. Ён забяспечвае паступленне малатыражных краязнаўчых дакументаў, якія вельмі цяжка набыць па іншых крыніцах камплектавання. Сярод стваральнікаў дакументнай прадукцыі прадпрыемствы, установы і арганізацыі, што публікуюць інфармацыю пра сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё рэгіёна. Такая фактаграфічная інфармацыя – каштоўная для краязнаўчых даследаванняў.

Для кантролю за бягучым камплектаваннем трэба знаёміцца:

– з матэрыяламі выдавецкай і кнігагандлёвай бібліяграфіі;

– з крыніцамі бягучай нацыянальнай (дзяржаўнай) бібліяграфіі, якія забяспечваюць рэгістрацыю выданняў: «Кніжны летапіс», «Летапіс картаграфічных выданняў», «Летапіс перыядычных выданняў», «Летапіс нотных выданняў», «Летапіс выяўленчых выданняў», «Летапіс аўтарэфератаў дысертацый»;

---

[30] Глінскі Я. С., Матвейчык Д. Ч., Снапкоўскі Ю. М. Гербоўнік беларускай шляхты : у 7 т. – Мінск : Беларусь, 2020. – Т. 6. – 543 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– бягучымі паказальнікамі, якія выпускаюцца бібліятэкамі УВА.

Рассейванне інфармацыі пра краязнаўчыя дакументы робіць дзейнасць камплектатара па выяўленні краязнаўчых дакументаў даволі складанай.

*Дакамплектаванне КФ* ажыццяўляецца праз выкарыстанне: абменна-рэзервовых фондаў бібліятэк; букіністычных магазінаў; аўкцыёнаў; прыватных збораў краязнаўцаў і кнігалюбаў; архіваў навуковых і навукова-даследчых устаноў і арганізацый, навучальных устаноў і прадпрыемстваў, алічбоўкі адсутных дакументаў з фондаў бібліятэк, музеяў, архіваў і іншых фондатрымальнікаў. Дакамплектаванню садзейнічае арганізацыя работы па выкарыстанні сукупнага фонду бібліятэк краіны шляхам абмену і пераразмеркавання празмерна дублетных і няпрофільных дакументаў паміж бібліятэкамі незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці.

Краязнаўчыя фонды дапаўняюцца копіямі краязнаўчых дакументаў на розных носьбітах: ксеракопіямі, мікрафільмамі, электроннымі копіямі (версіямі), шляхам выяўлення каштоўных сеткавых рэсурсаў. Напрыклад, Магілёўская АБ дзякуючы супрацоўніцтву з Віцебскай АБ у 2016 г. папоўніла свой КФ электроннымі копіямі 20 рэдкіх выданняў.

*Рэтраспектыўнага камплектавання* патрабуюць фонды мясцовых перыядычных выданняў. Фонды перыядычных выданняў у беларускіх бібліятэках маюць істотныя прабелы за значныя гістарычныя перыяды, таму іх алічбаванне з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных шляхоў узнаўлення. Для параўнання важна адзначыць, што для краязнаўчай работы заходніх краін вялікую карысць прыносіць наяўнасць багатых лічбавых архіваў рэгіянальнай і цэнтральнай прэсы за XIX–XX стст.

Сам тэхналагічны працэс камплектавання краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі ў большасці бібліятэк выконваецца ў АРМ «Камплектаванне» аўтаматызаванай бібліятэчнай сістэмы ALIS WEB.

Трэці этап фарміравання КФ – ***арганізацыя бібліятэчнага фонду*** – уключае:

– улік;

– бібліятэчную апрацоўку (навуковую і тэхналагічную);

– размяшчэнне і расстаноўку;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– захаванне;
– праверку.

Фарміраванне краязнаўчага фонду як часткі агульнага бібліятэчнага фонду ажыццяўляецца па такой жа тэхналогіі, як і ўсяго фонду, але мае свае асаблівасці.

Чацвёрты этап – ***улік і апрацоўка краязнаўчых дакументаў***. З імі ажыццяўляюць: інтэграваны (сумарны) улік – партыі кніг; дыферэнцыраваны (індывідуальны) улік. Тэхнічная і навуковая апрацоўка праводзіцца ў парадку, устаноўленым аддзелам камплектавання і апрацоўкі бібліятэкі.

*Інтэграваны (сумарны) улік.* У большасці бібліятэк сумарны ўлік КД не ажыццяўляецца, таму немагчыма дакладна ведаць велічыню фонду, яго састаў, паступленне і выбыццё КД, а гэта значыць, у такіх бібліятэках немагчыма навукова кіраваць фарміраваннем і выкарыстаннем фонду. Абласныя бібліятэкі і ЦБС у кнізе сумарнага ўліку ў свабодных графах выдзяляюць КД, што дазваляе ведаць агульны аб'ём КФ, колькасць паступленняў і выбыццё КД. У аддзелах (сектарах) краязнаўства або сектары дэпазітарнага захоўвання вядуцца спецыяльныя кнігі *сумарнага ўліку краязнаўчых і мясцовых выданняў,* дзе адбываецца рэгістрацыя дакументаў па прыметах: змесце, відах, мове выдання, крыніцы паступлення, месцазнаходжання ў бібліятэцы. Адасобленым сумарным улікам ахоплена толькі тая частка КФ, якая захоўваецца ў структурных падраздзяленнях краязнаўства.

*Дыферэнцыраваны (індывідуальны) улік* КД ажыццяўляецца ў агульных для ўсяго фонду бібліятэкі формах, але гэта не выключае вядзенне аддзеламі краязнаўства асобных уліковых форм.

Парадак *тэхнічнай апрацоўкі* КД той жа, што і іншых дакументаў, якія складаюць агульны фонд бібліятэкі.

*Навуковая апрацоўка краязнаўчых дакументаў.* У некаторых універсальных бібліятэках аналітыка-сінтэтычную апрацоўку КД ажыццяўляюць толькі ў аддзеле апрацоўкі; у іншых АУБ аддзелы краязнаўства робяць аналітыка-сінтэтычную даапрацоўку. Гэта робіцца, каб у розных аспектах адлюстраваць змест КД у краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для выдзялення краязнаўчых і мясцовых выданняў у працэсе іх апрацоўкі да шыфра дабаўляецца ўмоўнае абазначэнне «К» ці «Кр.», «М» (мясцовае выданне), або першая літара назвы рэгіёна. Дакументы, якія толькі часткова прысвечаны краю (главы, абзацы), замест «К» перад індэксам ставяць «ДП» (дэпазітарнае захоўванне), а прыналежнасць да краязнаўства вызначаецца праз «плюс» на тытульным лісце выдання.

Для нагляднага выдзялення КД выкарыстоўваюць каляровыя ярлыкі.

Пяты этап – ***размяшчэнне і захаванне*** краязнаўчага фонду. У практыцы назіраецца: шматварыянтнасць арганізацыйнай структуры КФ; мноства спосабаў размяшчэння і расстаноўкі КД; працэс драблення КФ.

Бібліятэкі па-рознаму вырашаюць пытанне *структуравання КФ:*

а) кніжны фонд асобна захоўваецца ў краязнаўчым аддзеле АУБ і ў краязнаўчых сектарах асобных ЦБ публічных бібліятэк; фонд мясцовых дакументаў – у кнігасховішчы;

б) у іншых спецыялізаваных падраздзяленнях АУБ бібліятэкі на пастаянным захоўванні могуць знаходзіцца:

– тэхнічныя нарматыўна-прававыя акты;

– рэдкія мясцовыя выданні, змест якіх не прысвечаны краю;

– рэдкія краязнаўчыя выданні і неапублікаваныя дакументы (пры адсутнасці неабходных умоў захоўвання ў краязнаўчым падраздзяленні);

– нотныя, выяўленчыя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы;

– выданні на замежных мовах;

в) рукапісы, фатаграфіі, лісты, дзённікі і іншыя неапублікаваныя матэрыялы захоўваюцца ў спецыяльных папках ці іншых сродках захоўвання. Мэтазгодна ўлічваць патрабаванні да захавання такога роду матэрыялаў у архівах;

д) пры адсутнасці структурнага краязнаўчага падраздзялення ў ЦБ, а таксама ў бібліятэках-філіялах, як правіла, актыўна запатрабаваная частка фонду краязнаўчых выданняў размяшчаецца ў чытальнай зале, а мясцовыя выданні – у аддзеле кнігазахавання пры яго наяўнасці. Іншыя КД размяшчаюцца на абанеменце. У сельскіх філіялах КФ выдзяляецца з асноўнага фонду і ўключаецца ў склад краязнаўчага кутка. У кутку прад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаўляецца і этнаграфічны раздзел, у якім паказаны старадаўнія прадметы працы, хатняга ўжытку, посуд і вопратка.

АУБ мэтанакіравана фарміруе ўласны дэпазітарны фонд, які ўключае ўсе мясцовыя і краязнаўчыя выданні, незалежна ад крыніцы паступлення, практычнай і навуковай каштоўнасці, актыўнасці выкарыстання, формы публікацыі і месца захоўвання ў бібліятэцы.

У якасці дэпазітарыя АУБ:

– выяўляе і вылучае мясцовыя выданні і краязнаўчыя дакументы ў сваім фондзе;

– пастаянна захоўвае 1–2 экз. мясцовых і 2–4 экз. краязнаўчых выданняў.

Прычынамі выключэння мясцовых і краязнаўчых выданняў з дэпазітарнага фонду могуць быць:

– залішняя колькасць асобнікаў;

– ветхасць выдання (пры наяўнасці дастатковай колькасці асобнікаў і немэтазгоднасці рэстаўрацыі).

Мясцовыя і краязнаўчыя выданні не могуць быць выключаны па прычыне маральнай састарэласці, наяўнасці пазнейшых перавыданняў ці нізкага попыту. Пры выключэнні краязнаўчага выдання з фонду публічнай бібліятэкі неабходна ўдакладніць яго наяўнасць у цэнтральнай бібліятэцы рэгіёна, каб пазбегнуць незаменнай страты.

Бібліятэка распрацоўвае і ажыццяўляе праграму забеспячэння захаванасці фондаў мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў, што прадугледжвае:

– рэгулярнае абследаванне фізічнага стану (з вылучэннем асобнікаў, якія патрабуюць тэрміновай кансервацыі або рэстаўрацыі, абмежавання выкарыстання, першачарговага капіравання і пераводу на іншыя носьбіты інфармацыі);

– кантроль умоў захоўвання і выкарыстання;

– рэгуляванне ўмоў прадстаўлення карыстальнікам унікальных мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў (неапублікаваных, рэдкіх і наяўных у бібліятэцы ў адзіным экзэмпляры);

– планамернае страхавое капіраванне мясцовых выданняў і краязнаўчых дакументаў.

Вызначыць аптымальную структуру КФ вельмі складана, бо фізічна немагчыма сканцэнтраваць у адным месцы ўсе КД (у кожным аддзеле ёсць КД, адпаведныя яго профілю), таму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходна мець комплекс прыёмаў і сродкаў забеспячэння ўзаемасувязі розных частак КФ, змешчаных у розных аддзелах бібліятэкі.

Краязнаўчы фонд структуруецца і па функцыянальным прызначэнні:

– *актыўны фонд* – гэта фонд аддзела (сектара) краязнаўства, што ўтрымлівае найбольш запатрабаваныя карыстальнікамі дакументы і КФ, размешчаны ў чытальных залах бібліятэк, якія не маюць асобных краязнаўчых падраздзяленняў;

– *аператыўны фонд* – зборы аддзелаў структурных падраздзяленняў краязнаўства і іншых аддзелаў АУБ, максімальна набліжае КД да месцаў абслугоўвання карыстальнікаў і па сваім напаўненні найбольш разлічаны на задавальненне іх інфармацыйных патрэбнасцей.

– *дэпазітарны фонд* фарміруецца на падставе мясцовага АЭ і пастаянна захоўваецца ў кнігасховішчы;

– *запасны фонд* ствараецца для захавання ўнікальных, рэдкіх дакументаў.

*Мясцовыя перыядычныя выданні* захоўваюцца па-рознаму: у аддзеле краязнаўства (апошніх гадоў выдання), у аддзеле асноўнага захоўвання (за мінулыя гады). Магчыма захаванне перыёдыкі ў адным з гэтых аддзелаў незалежна ад года выдання.

Размеркаванасць КФ па аддзелах бібліятэкі мае як станоўчыя, так і негатыўныя моманты. Станоўчай можна назваць набліжанасць пэўных КД да патэнцыяльных карыстальнікаў, напрыклад, нот, прысвечаных краю ці створаных кампазітарамі-землякамі, да прафесійных музыкантаў, да асоб, якія навучаюцца музычнаму мастацтву, і аматараў музыкі. Негатыўным можна лічыць парушэнне цэласнасці КФ. Гэты недахоп пераадольваецца на другасна-дакументальным узроўні дзякуючы поўнаму адлюстраванню КД у краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце (КДБА), асабліва ў базах даных краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Адмысловую ролю адыгрываюць зводныя каталогі, якія не толькі забяспечваюць змястоўныя сувязі КД, але і паказваюць іх месцазнаходжанне.

Размеркаванне КФ на адносна самастойныя структурныя часткі дае магчымасць свабодна манеўрыраваць зборамі КД для прадстаўлення іх карыстальнікам і гарантаванага захавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

КД размяркоўваюцца па паліцах згодна з прынцыпамі ўсяго фонду бібліятэкі: сістэматычная, тэматычная расстаноўка і інш. Для публічных і дзіцячых бібліятэк на стэлажах і кніжных паліцах магчыма выкарыстоўваць візуальную сімволіку, якая прыцягвае ўвагу чытачоў да краязнаўчай літаратуры. Гэта могуць быць гербы гарадоў, вёсак, раёнаў і абласцей, брэнды мясцовых прадпрыемстваў, іншыя мясцовыя сімвалы.

У памяшканнях, дзе захоўваецца КФ, падтрымліваецца аптымальная тэмпература, вільготнасць паветра, адпаведны санітарна-гігіенічны рэжым, забяспечваюцца процілажарныя і сацыяльныя мерапрыемствы аховы КД. Краязнаўчыя матэрыялы рэдка перавыдаюцца, і лепшыя з іх хутка фізічна зношваюцца, таму мэтазгодна ствараць іх копіі на мікра- і электронных носьбітах.

Аптымальнае фарміраванне краязнаўчага фонду дазволіць арганізаваць навукова абгрунтаванае кіраванне ім і забяспечыць максімальна поўнае задавальненне рэальных і патэнцыяльных запытаў карыстальнікаў.

Шосты этап фарміравання КФ – ***кіраванне бібліятэчным фондам.*** Працэс кіравання КФ заключаецца ў прывядзенні КФ у адпаведнасць з задачамі бібліятэкі і запытамі карыстальнікаў. Вырашаюцца пытанні складу, структуры фонду, патоку дакументаў унутры бібліятэкі, тэхналогіі фарміравання фонду супрацоўнікамі, якія вядуць краязнаўчую работу.

**Пытанні і заданні да тэмы 3.3**

1. Назавіце асноўныя тэхналагічныя этапы фарміравання краязнаўчага фонду.
2. Дзе захоўваецца краязнаўчы кніжны фонд у АУБ?
3. У якіх спецыялізаваных структурных падраздзяленнях АУБ захоўваюцца некаторыя віды краязнаўчых дакументаў?
4. Якія дакументы ўключаюцца ў дэпазітарны фонд АУБ?
5. Як размяшчаецца краязнаўчы фонд у цэнтралізаваных сістэмах публічных бібліятэк?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.4. Электронныя краязнаўчыя калекцыі і бібліятэкі

На сучасным этапе бібліятэкі актыўна ствараюць краязнаўчыя электронныя калекцыі. Яны з'яўляюцца сучаснай формай захавання і распаўсюджання каштоўнай і ўнікальнай краязнаўчай інфармацыі. Краязнаўчая калекцыя – гэта сістэматызаваная сукупнасць краязнаўчых электронных рэсурсаў, аб'яднаных на падставе пэўнай прыметы: зместу, формы дакументаў, карыстальніцкім прызначэнні. Калекцыі могуць быць тэматычнымі, храналагічнымі, па відах (тыпах) дакументаў. Адбор аб'ектаў адлюстравання абумоўлены іх каштоўнасцю, унікальнасцю, актуальнасцю, мае прававыя падставы. Гэта могуць быць кнігі, газеты, часопісы, карты, фатаграфіі, рукапісы, дысертацыі, бібліяграфічныя крыніцы, паштоўкі, аўдыявізуальныя матэрыялы (АВ-матэрыялы). У некаторых калекцыях аб'ядноўваюцца дакументы розных відаў, напрыклад у калекцыі, прысвечанай адметнай падзеі, могуць быць копіі кніг, улётак і інш. У межах калекцый лічбавыя копіі дакументаў нярэдка размяшчаюцца ў алфавітным парадку бібліяграфічных запісаў. Калекцыі для электронных бібліятэк з'яўляюцца сродкам прамоцыі краязнаўчай інфармацыі, даступнай бібліятэцы.

Акрамя электронных краязнаўчых калекцый збіраюць электронныя краязнаўчыя бібліятэкі (ЭКБ). ЭКБ – гэта ўпарадкаваная сукупнасць разнародных краязнаўчых электронных рэсурсаў (электронных выданняў, калекцый, асобных алічбаваных дакументаў, БД) са сродкамі навігацыі і пошуку, з адзіным інтэрфейсам доступу. У адрозненне ад электроннай калекцыі ЭКБ разумеецца як інфармацыйная сістэма, у складзе якой разам з электроннымі калекцыямі размяшчаюцца іншыя рэсурсы: краязнаўчыя календары, гістарычныя даведкі, базы даных, даведнікі персаналій, медыярэсурсы. Прыкладам ЭКБ, якая ахоплівае разнастайныя электронныя рэсурсы, маштабна прадстаўляе край, можа быць «Русский Север» Архангельскай АНБ імя М. А. Дабралюбава. Стварэнне калекцый краязнаўчых даведнікаў, фатаграфій, карт, гуказапісаў, перыядычных выданняў – важны і адметны кірунак дзейнасці заходніх бібліятэк.

Варта адзначыць, што дамініраванне ў ЭБ калекцый гісторыка-краязнаўчага характару не змяншае значнасці калекцый,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

створаных для інфармацыйнага забеспячэння буйных комплексных праграм/праектаў, актуальных праблем развіцця рэгіёнаў, для падтрымкі канкрэтных даследаванняў і распрацовак, напрыклад міждысцыплінарных. Пры фарміраванні ЭКБ бібліятэка ўзаемадзейнічае з іншымі партнёрамі: бібліятэкамі, архівамі, музеямі, навуковымі інстытутамі, адукацыйнымі ўстановамі.

ЭБ з’яўляецца інтэграванай інфармацыйнай сістэмай і ўключае:

– электронны фонд, прызначаны для захавання электронных дакументаў. Апошнія захоўваюцца ў файлавай сістэме, якая вядзецца сродкамі аперацыйнай сістэмы;

– каталог электроннай бібліятэкі, які ўтрымлівае бібліяграфічныя запісы ў пэўным фармаце і забяспечвае пошук інфармацыі па палях, імпарт/экспарт бібліяграфічных запісаў, вядзенне і захаванне ўліковых формаў;

– вэб-інтэрфейс карыстальніка, што дапамагае сфарміраваць пошукавы запыт (як па палях бібліяграфічнага запісу, так і па тэксце дакумента), прагляд дакумента, навігацыю па раздзелах і калекцыях электроннай бібліятэкі;

– сістэму адміністравання, якая забяспечвае падключэнне каталога да пошукавага механізму ЭБ, настройку параметраў электроннай бібліятэкі, кантроль функцыянавання сістэмы, збор статыстычных даных.

Асноўнымі крыніцамі камплектавання поўных тэкстаў дакументаў для ЭБ з’яўляюцца:

– сканіраванне тэкстаў з фонду бібліятэкі;

– атрыманне электронных дакументаў са знешніх крыніц (перадача поўных тэкстаў дакументаў у машыначытальнай форме аўтарамі/праваўладальнікамі), дары;

– стварэнне супрацоўнікамі бібліятэкі ўнікальных краязнаўчых электронных дакументаў, якія не маюць папяровых аналагаў;

– атрыманне электронных копій у межах дзейнасці бібліятэкі па партнёрскіх праектах.

Доступ да поўных тэкстаў ажыццяўляецца праз спасылкі на ЭД, якія захоўваюцца на ўдаленых серверах (серверах бібліятэкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пошук і прагляд дакументаў ЭБ з’яўляецца бясплатным для ўсіх карыстальнікаў. Абмежаванні для прагляду асобных калекцый і дакументаў уводзяцца для забеспячэння праў праваўладальнікаў. Аддаленыя карыстальнікі звычайна маюць доступ да лічбавых копій дакументаў і інфармацыі пра змест ЭКБ, лакальныя карыстальнікі могуць мець большыя магчымасці.

У многіх электронных бібліятэках краязнаўства прадстаўлена як самастойны раздзел у шэрагу іншых раздзелаў.

Электронная краязнаўчая бібліятэка ці краязнаўчы раздзел у электронных бібліятэках могуць быць арганізаваны як пералік паўнатэкставых краязнаўчых калекцый з доступам да алічбаваных дакументаў. Так, напрыклад, вядзецца «Самарика» ў электроннай бібліятэцы Самарскай АУНБ. Электронная краязнаўчая бібліятэка Дзяржаўнай універсальнай навуковай бібліятэкі Краснаярскага краю ахоплівае шэраг калекцый кніг і перыядычных выданняў XVIII–XX стст., іншых рэсурсаў, якія прадстаўляюць інтарэс для даследчыкаў, спецыялістаў розных галін ведаў. Па тэматычных раздзелах, ключавых словах, персонах і іншых прыметах магчымы пошук у ЭБ «Гродна – інфармацыя для ўсіх» на сайце ЦБС г. Гродна.

На сайтах многіх беларускіх бібліятэк пачалі размяшчаць каштоўныя крыніцы для азнаямлення з гістарычным мінулым краю, творы мясцовых аўтараў, выпускі мясцовых газет. Напрыклад, на сайце Горацкай раённай бібліятэчнай сеткі прадстаўлены рэсурс «Электронные книги горецких авторов», сярод якіх зборнікі членаў народнага літаратурнага аб’яднання «Роднае слова», 13 кніг вядомага краязнаўцы Уладзіміра Ліўшыца.

Краязнаўчая калекцыя «Витебщина: документальное наследие» прадстаўляе лічбавыя копіі каштоўных дакументаў пра край XIX – пачатку XX ст. Стварэнне калекцыі стала магчымым дзякуючы алічбоўцы выданняў не толькі абласной, але і Дзяржаўнай публічнай гістарычнай бібліятэкі Расіі.

У электроннай бібліятэцы Гродзенскай АНБ імя Я. Ф. Карскага першыя раздзелы краязнаўчыя: электронная калекцыя «Гродзеншчына ў XIX – пач. XX ст.» – лічбаваныя копіі рэдкіх выданняў на польскай і рускай мовах і БД «Гісторыка-культурныя каштоўнасці Прынёманскага краю». У цэлым назіраецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэндэнцыя стварэння электронных копій краязнаўчых дакументаў, прадстаўленне іх на сайтах. Важна ў ЭБ адлюстраваць бібліяграфічныя крыніцы краязнаўства: універсальныя бягучыя паказальнікі краязнаўчай літаратуры, календары і іншыя дапаможнікі, якія выпускаліся на паперы і захоўваюць каштоўныя пласты краязнаўчай інфармацыі.

Да рэалізацыі адмысловага праекта электроннага рэпазіторыя краязнаўчых дакументаў «Библиотека, доступная всем» прыступіла Магілёўская АБ. Мэта праекта – захаванне фонду рэдкіх дакументаў (5 тыс. адз.) і газет, і мясцовых газет, якія захоўваюцца з 1946 г. Стварэнне такой ЭКБ дасць доступ да каштоўных крыніц прадстаўнікам навукова-даследчых, адукацыйных устаноў і аматарам гісторыі.

Значны ўклад у алічбаванне крыніц высокай краязнаўчай каштоўнасці ўносіць НББ. Бібліятэка сфарміравала з іх відавыя і тэматычныя калекцыі, апублікавала ў асноўным у выглядзе мультымедыйных кампакт-дыскаў, якія бясплатна распаўсюджваюцца ў публічных бібліятэках. Развіццё электронных калекцый і бібліятэк, іх размяшчэнне, забеспячэнне належнай якасці, доступу карыстальнікаў, уключаючы даследнікаў – перспектыўны кірунак краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

Актыўнасць, праяўленая бібліятэкамі па алічбоўцы краязнаўчых дакументаў, стварэнне паўнатэкставых БД даюць падставы для фарміравання ЭКБ, напаўненне і даступнасць якіх адкрыюць беларускія рэгіёны ў розных ракурсах.

**Заданні да тэмы 3.4**

1. Дайце азначэнне паняццяў «электронная краязнаўчая калекцыя» і «электронная краязнаўчая бібліятэка».
2. Прывядзіце прыклады электронных краязнаўчых калекцый і бібліятэк.

## 3.5. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі – гэта інфармацыйна-пошукавая сістэма (ІПС), мэта якой – аптымізаваць пошук краязнаўчай бібліяграфічнай і фактаграфічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі, арыентацыю ў КІР. Функцыянальнае прызначэнне КДБА заключаецца ў тым, каб аператыўна і якасна забяспечыць доступ карыстальнікаў да паўнатэкставай, бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, прысвечанай рэгіёну ці населенаму пункту. У наш час разам з тэрмінам КДБА выкарыстоўваецца і паняцце КДПА – краязнаўчы даведачна-пошукавы апарат, – тым самым падкрэсліваюцца шырокія магчымасці дзейнасці бібліятэк з лічбавай краязнаўчай інфармацыяй.

КДБА мае ўласцівасці, характэрныя для ДБА бібліятэкі ў цэлым (сістэмнасць, пластычнасць, эканамічнасць), і асобна вызначаецца *ўнікальнасцю* з пункта гледжання адлюстравання ўніверсуму дакументна-фіксаваных ведаў пра рэгіён. Структура гэтых ведаў на бібліяграфічным узроўні ствараецца толькі ў канкрэтнай рэгіянальнай бібліятэцы і нават прыблізна не дубліруецца ў іншых бібліятэках. Унікальным КДБА з'яўляецца і па такіх прыметах, як аўтарскі корпус і рэгіянальная абмежаванасць стварэння дакументаў.

КДБА ўяўляе сабой арганізаваную сукупнасць, складаецца з некалькіх асноўных устойлівых (базавых) частак.

1) *Універсальныя краязнаўчыя БД і БД мясцовых дакументаў:*

– універсальныя БД пра рэгіён: бібліяграфічныя, фактаграфічныя каляндарнага (хранікальнага) або энцыклапедычнага тыпу, а таксама аўтарытэтныя файлы, створаныя цягам апрацоўкі ўваходнага дакументнага патоку; БД мясцовых дакументаў;

– картачныя і друкаваныя краязнаўчыя каталогі (КК) і каталогі мясцовых выданняў; універсальныя краязнаўчыя картатэкі;

– навігатары па інфармацыйных рэсурсах, прысвечаных рэгіёну.

2) *Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі, які ўключае:*

– фонд даведачных і бібліяграфічных краязнаўчых выданняў, афіцыйныя дакументы і іх электронныя версіі ці арыгінальныя электронныя дапаможнікі;

– фактаграфічныя БД актуальнай тэматыкі;

– бібліяграфічныя БД актуальнай тэматыкі;

– знешнія БД (выкарыстоўваюцца на дагаворнай аснове).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3) *Фонд неапублікаваных краязнаўчых дакументаў, электронныя архівы выкананых краязнаўчых даведак.*

Усе гэтыя кампаненты з найбольшай паўнатой адлюстроўваюць дакументаваныя веды пра вобласць.

Структура КДБА залежыць ад тыпу і віду бібліятэкі. Найбольш складаны КДБА вядуць АБ і ЦБС, асобныя яго элементы прысутнічаюць у спецыяльных бібліятэках.

АУБ генерыруюць:

– універсальныя бібліяграфічныя БД краязнаўчых і мясцовых дакументаў, у т. л. зводныя. Большасць АУБ прадаўжаюць папаўняць картачныя КК і каталогі мясцовых выданняў;

– публікуюць электронныя і друкаваныя электронныя краязнаўчыя дапаможнікі;

– фактаграфічныя БД;

– КДБФ;

– архіў выкананых даведак. У некаторых бібліятэках Расіі фарміруюцца асобныя электронныя архівы выкананых краязнаўчых даведак.

У элементах КДБА адлюстроўваецца інфармацыя як пра вобласць, так і пра асобныя яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя аб’екты, населеныя пункты і насельніцтва.

*Публічныя бібліятэкі* ствараюць:

– краязнаўчыя бібліяграфічныя БД і ўніверсальныя краязнаўчыя картатэкі;

– друкаваныя і электронныя бібліяграфічныя дапаможнікі;

– фактаграфічныя базы даных і картатэкі, тэматычныя падборкі копій краязнаўчых публікацый;

– КДБФ;

– архіў выкананых даведак.

*Дзіцячыя бібліятэкі* ў КДБА вядуць тэматычныя і біябібліяграфічныя БД, краязнаўчыя картатэкі, бібліяграфічныя і фактаграфічныя БД.

*Бібліятэкі ўніверсітэтаў і навуковых устаноў* у складзе ДБА вядуць базы даных публікацый супрацоўнікаў, біябібліяграфічныя слоўнікі выкладчыкаў і вучоных, персанальныя бібліяграфічныя паказальнікі выдатных вучоных гэтых устаноў; базы даных зместу перыядычных навуковых выданняў, якія выпускае ўстанова; базы даных тыпу «Універсітэт у друку».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

КДБА размяшчаецца ў краязнаўчых аддзелах/сектарах абласных бібліятэк і ў краязнаўчых сектарах (цэнтрах) у некаторых ЦБС, у краязнаўчых кутках сельскіх бібліятэк. У ЦБС, якія не маюць спецыялізаваных краязнаўчых падраздзяленняў, элементы КДБА, як правіла, знаходзяцца ў чытальных залах.

***Універсальныя краязнаўчыя БД і БД мясцовых дакументаў.*** *Краязнаўчыя базы даных.* Сістэма гэтых БД уяўляе сабой адносна самастойную частку электроннага ДБА бібліятэкі і звязаная з іншымі яго элементамі ў лакальнай сетцы. Гэтым забяспечваецца тэхналагічная магчымасць аднаразовай апрацоўкі краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, аператыўнага і камфортнага бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання чытачоў бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў.

Склад БД, іх размеркаванне па структурных падраздзяленнях, суадносіны паміж сабой і з агульным ДБА ў бібліятэках вызначаюцца самастойна. Па магчымасці выключаюцца: шматразовая апрацоўка адных і тых жа дакументаў, дубліраванне або размеркаванне інфармацыі па некалькіх аднатыпных БД.

*Бібліяграфічныя БД.* Асноўнымі бібліяграфічнымі БД з'яўляюцца:

– універсальныя БД пра рэгіён/населены пункт тыпу «Краязнаўства»;

– БД мясцовых дакументаў.

У беларускіх АУБ і ЦБС ствараюцца ўніверсальныя БД «Краязнаўства» («Краязнаўчая літаратура»). Яны з'яўляюцца найбольш поўнымі крыніцамі звестак па любым пытанні вывучэння краю, паколькі ўтрымліваюць глыбокія рэтраспектыўныя масівы і аператыўна папаўняюцца. Уключаюць бібліяграфічныя апісанні кніг, брашур, выяўленчых, картаграфічных выданняў, нот, артыкулаў з кніг, зборнікаў, перыядычных выданняў і ўсіх іншых краязнаўчых дакументаў незалежна ад формы, мовы і часу стварэння. З найбольшай паўнатой распісваецца мясцовы перыядычны друк (раённыя, гарадскія газеты). У гэтых БД могуць змяшчацца бібліяграфічныя запісы (БЗ), запазычаныя з іншых ІПС і не правераныя па самім дакуменце. У гэтых выпадках неабходна даць спасылку на выкарыстаную крыніцу інфармацыі і адзначыць, што дакумент не апісаны de visu (узровень кадзіравання ў маркёры БЗ).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На пачатак 2019 г. у Віцебскай АБ налічваўся 130 321 БЗ, у Брэсцкай АБ – 42 800 БЗ, у Магілёўскай АБ электронная база даных «Краязнаўства» ахоплівае 114 800 тыс. запісаў, у Гродзенскай АНБ – «Гродзенская вобласць» – 85 218 аналітычных БЗ разнастайных дакументаў краязнаўчай тэматыкі, у т. л. на замежных мовах. Напрыклад, на беларускай, рускай, польскай, англійскай, нямецкай і французскай мовах у Гродзенскай АНБ. Гэтыя бібліяграфічныя БД з'яўляюцца крыніцамі стварэння бягучых бібліяграфічных паказальнікаў тыпу «Новая літаратура аб вобласці» і іншых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі.

Стварэнне аналітычных бібліяграфічных запісаў у АУБ Беларусі вядзецца ў краязнаўчых аддзелах і сектарах, а на асобныя выданні – у аддзелах камплектавання і апрацоўкі.

*Немэтазгодна* ўключаць у БД «Краязнаўства» наступныя бібліяграфічныя запісы:

– распараджэнні мясцовых арганізацый тыпу графікаў ачысткі вуліц, зменаў у рабоце грамадскага транспарту і да т. п.;

– аператыўна-гаспадарчыя, інструктыўна-вытворчыя і іншыя матэрыялы, якія выдаюцца для службовага выкарыстання на прадпрыемствах і ва ўстановах;

– формы, бланкі і інструкцыі па ўліку і справаздачнасці, тэхнічныя ўказанні і патрабаванні, тарыфна-кваліфікацыйныя даведнікі, памяткі па тэхніцы бяспекі і да т. п.;

– рэкламныя і камерцыйныя аб'явы навучальных устаноў, культурна-адукацыйных устаноў, спартыўных і іншых арганізацый і ўстаноў;

– праграмна-метадычныя выданні (вучэбныя планы, праграмы, інструкцыі), падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, у якіх няма мясцовага матэрыялу.

Паслядоўна прытрымліваючыся пры адборы дакументаў асноўнага крытэрыю – іх краязнаўчага зместу, магчыма сканцэнтраваць у БД «Краязнаўства» звесткі пра тыя з іх, якія вызначаюцца навуковай і пазнавальнай каштоўнасцю.

БД «Краязнаўства» ў беларускіх бібліятэках з'яўляюцца часткай агульнага ЭК, што абумоўлівае яе функцыянальныя магчымасці і інструментарый. У некаторых бібліятэках Расіі вядуцца самастойныя ЭКК, якія з'яўляюцца рэгіянальнымі элементамі Зводнага каталога бібліятэк Расіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У межах рэалізацыі найбуйнейшых беларускіх праектаў: Зводнага электроннага каталога (ЗЭК) бібліятэк Беларусі і рэсурса нацыянальнай бібліяграфіі краіны вырашаецца задача па стварэнні Рэгіянальнага зводнага электроннага каталога (РЗЭК). Іх стварэнне дазволіць з найбольшай паўнатой прадставіць БЗ на краязнаўчыя дакументы і забяспечыць доступ да іх праз інтэрнэт. На бягучы час функцыянуюць РЗЭК Гродзенскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей, якія пакуль забяспечваюць доступ толькі да БЗ абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм гарадскіх бібліятэк абласных цэнтраў і па некалькіх раённых ЦБС. Тэхналогія карпаратыўнага ўзаемадзеяння грунтуецца на выкарыстанні фармату BelMARC і інфармацыйна-пошукавай мовы УДК. Тэхналагічная адпаведнасць стандартам, па якіх ствараюцца найбуйнейшыя нацыянальныя ІР, спрыяе бесперашкоднаму функцыянаванню БЗ на краязнаўчыя дакументы не толькі ў нацыянальным, але і ў міжнародным інфармацыйным асяроддзі.

Актуальным застаецца:

– пашырэнне аб'ектаў бібліяграфічнага адлюстравання, асабліва замежнамоўных, сеткавых, выяўленчых, неапублікаваных;

– актывізацыя ўдзелу ўсіх аддзелаў бібліятэкі, якія апісваюць бягучыя паступленні, уводзяць апісанні ў электронны каталог (ЭК), ажыццяўляюць сэнсавую апрацоўку дакументаў ці займаюцца стварэннем бібліяграфічных рэсурсаў у выяўленні краязнаўчага матэрыялу. Узаемадзеянне АУБ з ЦБС магло б заключацца ў тым, што ЦБ пастаўлялі б цалкам падрыхтаваныя БЗ у АУБ для агульнай БД «Краязнаўства» на дакументы абмежаванага лакальнага распаўсюджання.

Важна ўдасканальваць індэксаванне краязнаўчых дакументаў: пераходзіць са састарэлай «Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь» да індэксавання па УДК. Абласныя і публічныя бібліятэкі самастойна дапрацоўваюць «Тыпавую схему…», але гэта не эфектыўна і перашкаджае адлюстраванню зместу краязнаўчых дакументаў, а значыць, і іх пошуку ў сістэме карпаратыўнай каталагізацыі і ЗЭК бібліятэк Беларусі. Глебу для індэксавання краязнаўчых дакументаў па табліцах УДК стварылі практычны вопыт НББ (і яго абагульненне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў друку)[31], іншых навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Рэспублікі Беларусь, выпуск беларускамоўнага скарочанага выдання эталонных табліц УДК (2016), стварэнне адпаведнай трохмоўнай БД і падключэнне яе да электроннага інфармацыйнага рэсурса (ЭІР) «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі». У беларускамоўным выданні УДК упершыню прадстаўлены раздзелы па айчыннай гісторыі і геаграфіі. НББ працягвае даследаванне табліц УДК па дэталізацыі раздзелаў па гуманітарных і грамадскіх навуках, асабліва за кошт распрацоўкі сістэмы нацыянальных азначальнікаў месца з улікам сучасных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Беларусі. Гэтыя азначальнікі вельмі важныя для індэксавання краязнаўчых дакументаў, работа па іх распрацоўцы вядзецца НББ. У самой НББ рэалізуецца методыка індэксавання, калі максімальная паўната адлюстравання зместу дакументаў раскрываецца з дапамогай індэксаў УДК і аўтарытэтныя запісы на геаграфічныя аб'екты, імёны і інш.

Наогул індэксаванне краязнаўчых дакументаў з дапамогай прадметных рубрык, ключавых слоў і аўтарытэтны кантроль усіх абавязковых элементаў бібліяграфічнага апісання і элементаў прадметных рубрык разам з анатаваннем дазваляюць забяспечыць дакладнае адлюстраванне зместу, а таксама тэматычны і прадметны доступ да краязнаўчых дакументаў. Індэксаванне ключавымі словамі дапамагае паказаць *вузкія паняцці*, уласцівыя краязнаўчай літаратуры.

*БД мясцовых выданняў*. Максімальна поўна адлюстроўваюць бібліяграфічныя звесткі пра выдавецкую прадукцыю вобласці (горада), у т. л. пры адсутнасці асобных выданняў у бібліятэчных фондах. БД мясцовых выданняў ахопліваюць кнігі, перыядычныя, прадаўжальныя выданні, лістоўкі і іншыя самастойныя матэрыялы, што з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі звестак пра развіццё кнігавыдавецтва як часткі гісторыі рэгіянальнай культуры. Бібліяграфічны ўлік мясцовых выданняў мае крыніцазнаўчае і практычнае значэнне, садзейнічае вывучэнню друкаванай прадукцыі рэгіёна, дакамплектаванню бібліятэчнага фонду, выяўленню рэдкіх выданняў, папаўненню

[31] Пугачева С. А. Индексирование белорусских краеведческих документов: опыт Национальной библиотеки Беларуси // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зб. навук. арт. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; склад.: Т. В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С. 216–230.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

БД краязнаўчых дакументаў. БД мясцовых выданняў вядуцца ў Брэсцкай АБ, Магілёўскай АБ (з 2007 г., даступная праз электронны каталог, у пачатку 2019 г. утрымлівала каля 3 тыс. БЗ).

Максімальна поўная бягучая і рэтраспектыўная бібліяграфічная інфармацыя пра мясцовыя дакументы стане важнай часткай беларускай нацыянальнай бібліяграфіі (ЭІР «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі»).

*Зводныя краязнаўчыя каталогі (ЗвКК) і зводныя каталогі мясцовых выданняў (ЗвМВ).* Ствараюцца на падставе карпаратыўнага ўзаемадзеяння пэўнай групы бібліятэк, партнёрамі якіх таксама могуць быць музеі, архівы і інш. Мэтай іх вядзення з’яўляецца максімальна поўнае адлюстраванне краязнаўчых і мясцовых выданняў, інфармаванне пра іх месцазнаходжанне (утрымліваюць сіглы месцазнаходжання дакументаў). Самастойныя зводныя ЭКК і ЭКМВ вядуцца ў многіх рэгіёнах Расіі.

*Універсальныя фактаграфічныя БД* фарміруюцца па тыпе краязнаўчай электроннай энцыклапедыі ці календара (хронікі). У выглядзе шматузроўневых фактаграфічных запісаў падаюць усебаковую характарыстыку краю – яго геаграфічныя аб’екты, гістарычныя і сучасныя падзеі, персоны, калектывы, помнікі. Фактаграфічныя запісы ўтрымліваюць даведкі, бібліяграфічныя спісы, выяўленчыя матэрыялы, часам спасылкі на поўныя тэксты. Дазваляюць уключаць новыя факты, звесткі, выяўленыя даследчыкамі краю ці бібліятэкарамі на падставе дакументальных крыніц. Бібліяграфічныя спісы ўтрымліваюць даныя пра апублікаваныя, архіўныя, сеткавыя і іншыя крыніцы інфармацыі.

Базы даных энцыклапедычнага характару ствараюць на падставе пэўнага рубрыкатара (раздзелаў, рубрык). Артыкулы па вузкіх пытаннях часта пішуць галіновыя вучоныя і спецыялісты. Сумяшчаючы розныя віды інфармацыі, гэтыя БД дазваляюць глыбока і шматаспектна весці пошук неабходнай інфармацыі і з’яўляюцца перспектыўным і дынамічным ІР. Вялікае развіццё падобныя ІР атрымалі ў бібліятэках Расіі і даступныя ў інтэрнэце.

Найбуйнейшымі айчыннымі прыкладамі баз даных энцыклапедычнага характару (па шырыні зместу) з’яўляюцца *«Край мой, Магілёўшчына»* Магілёўскай АБ і *«Прыдзвінскі край:*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*гісторыя і сучаснасць»* Віцебскай АБ. У іх адлюстраваны звесткі пра гістарычныя падзеі розных перыядаў, геаграфію, прыродныя рэсурсы, эканоміку, культуру і мастацтва раёнаў, абласных цэнтраў і буйных гарадоў. Значныя пласты інфармацыі прысвечаны знакамітым землякам з розных галін дзейнасці. Генерыруюцца БД пры ўдзеле ЦБС абласцей і даступныя ў інтэрнэце. Кантэнт створаны на падставе дакументаў з бібліятэчных фондаў. БД актуалізуюцца па меры з'яўлення новай інфармацыі. Вызначаюцца ўніфікаванасцю артыкулаў, прысвечаных пэўнаму тыпу аб'ектаў: пасяленняў, прадпрыемстваў, цэнтраў спорту і турызму. Гэта дазволіла добра структураваць тэксты, забяспечыць нагляднасць інфармацыі, што вельмі паляпшае яе ўспрыманне. У параўнанні з некаторымі іншымі лічбавымі рэсурсамі гэтыя БД маюць якасную навігацыю і пошук. Зварот карыстальніка магчымы некалькімі спосабамі: па раёне, па вызначаных (аднолькавых) раздзелах і катэгорыях у межах раёна ці па пошукавым акне.

Энцыклапедычнасць закладзена і ў змест БД *«Памяць Гродзеншчыны»* Гродзенскай АНБ, якая апісвае найважнейшыя гістарычныя падзеі ў эканамічнай, грамадска-палітычнай, сацыякультурнай сферах жыцця Гродзеншчыны і звесткі пра гістарычных асоб, прадстаўнікоў знакамітых родаў, дзеячаў навукі, тэхнікі, эканомікі, а таксама культуры, мастацтва, літаратуры, спорту, грамадска-палітычных, ваенных, рэлігійных дзеячаў, якія адыгралі важную ролю ў гісторыі ці грамадскім жыцці Гродзеншчыны і былі звязаны з краем месцам нараджэння, жыццём і дзейнасцю. На аснове БД выходзіць традыцыйнае выданне «Краязнаўчы каляндар», аднак доступ да БД і пошук у ёй ажыццяўляецца толькі ў аддзеле краязнаўства абласной бібліятэкі.

*Фактаграфічныя БД універсальнага характару* вядуцца асобнымі публічнымі бібліятэкамі. Напрыклад, БД «Летапіс жыцця г. Горкі і Горацкага раёна» ахоплівае звесткі пра найважнейшыя падзеі ў гісторыі краю з 1933 г. Публічныя бібліятэкі супрацоўнічаюць з АУБ па стварэнні фактаграфічных БД шырокага тэматычнага зместу. Так, ЭБД «Зніклыя, але не забытыя» – карпаратыўны рэсурс Гомельскай АУБ і публічных бібліятэк вобласці, прысвечаны 270 афіцыйна адсяленым пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС вёскам Гомельшчыны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навігатары па краязнаўчых інтэрнэт-рэсурсах.* Неабходным этапам у інтэграванні краязнаўчых ІР інстытутаў памяці і іншых вытворцаў рэгіянальнай інфармацыі з’яўляюцца навігатары. Ствараюцца на падставе сістэматычнага маніторынгу інтэрнэту, выяўлення сеткавых краязнаўчых рэсурсаў і адлюстравання электронных выданняў на кампакт-дысках. Пры іх вядзенні важна забяспечыць якасны адбор рэсурсаў, асноўнымі крытэрыямі якога выступаюць: актуальнасць зместу, устойлівасць інтэрнэт-адрасу, прыналежнасць да аўтарытэтных вытворцаў. Навігатары маюць сістэматычную ці тэматычную структуру. Бібліяграфічныя апісанні электронных рэсурсаў важна дапоўніць анатацыямі. Навігатары атрымалі шырокае распаўсюджанне ў краязнаўчай дзейнасці паўночнаамерыканскіх і заходнееўрапейскіх бібліятэк. Напрыклад, навігатар па ІР публічнай бібліятэкі Ванкувера дае магчымасць свабодна звяртацца да алічбаваных мясцовых газет правінцыі Брытанская Калумбія за 150 гадоў, алічбаваных гарадскіх даведнікаў за 100 гадоў, базы даных гістарычных фатаграфій бібліятэкі (30 000 фотаздымкаў Ванкувера і Брытанскай Калумбіі з 1880 да 1980-х гг.) і шэрагу іншых каштоўных краязнаўчых рэсурсаў[32].

Буйным фактам маніторынгу інтэрнэт-рэсурсаў стаў бібліяграфічны паказальнік «Гродзеншчына ў інтэрнэце» Гродзенскай АНБ імя Я. Ф. Карскага (друкаваны і электронны), у якім адлюстравана звыш 400 сайтаў, цалкам ці часткова прысвечаных краю.

*Картачныя і друкаваныя краязнаўчыя каталогі і каталогі мясцовых дакументаў, краязнаўчыя картатэкі.* На сучасным этапе картачныя краязнаўчыя каталогі і картатэкі яшчэ распаўсюджаны ў АУБ і ЦБС. Яны поўна адлюстроўваюць дакументы пра вобласць, раён, горад (мікрараён), вёску. Аб’ектам адлюстравання ў краязнаўчым каталогу, як і ў базах даных, з’яўляюцца розныя віды дакументаў: самастойныя выданні, артыкулы са зборнікаў, часопісаў і газет, рэцэнзіі, друкаваныя творы выяўленчага мастацтва, картаграфічныя матэрыялы, ноты, апісанні частак выданняў – асобных глаў, раздзелаў, старонак, якія падаюць звесткі пра тэрыторыю, рукапісныя

[32] *Historical Photographs Collections:* official site Vancouver Public Library [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.vpl.ca/historical photo. – Date of access: 05.04.2021.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыялы, АВ-матэрыялы, CD-ROM, электронныя рэсурсы, у т. л. размешчаныя ў інтэрнэт. Асноўны крытэрый для ўключэння ў краязнаўчы каталог – гэта якасць – наяўнасць важных, фактаў, навуковых высноў, мастацкае ўвасабленне мясцовай рэчаіснасці. Малазначныя матэрыялы не ўключаюцца.

*Картачны* краязнаўчы каталог АУБ складаецца з трох частак: сістэматычнай, тапаграфічнай і біябібліяграфічнай (персаналій). У некаторых бібліятэках вядуцца алфавітныя каталогі краязнаўчых кніг.

*Сістэматычныя* часткі вядуцца па «Тыпавой схеме класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь». Матэрыял унутры рубрык падзяляецца на: 1) кнігі і іншыя асобныя выданні; 2) артыкулы з перыядычнага друку. Унутры гэтых груп рэкамендуецца адваротна-храналагічная групоўка картачак. Апісанні аднаго года ставяцца ў алфавітным парадку.

*Тапаграфічныя* часткі КК прызначаны для больш дакладнага раскрыцця зместу дакументаў у тэрытарыяльным аспекце, таму яны арганізуюцца на аснове адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу вобласці. Напрыклад, абласны цэнтр, вобласць, раёны, сельскія саветы ў алфавітным парадку. Унутры матэрыял размяшчаецца па тэматычным прынцыпе. Так, у каталогу Магілёўскай АБ пасля раздзелаў пра вобласць і горад Магілёў размешчаны раздзяляльнікі на 21 раён і горад абласнога падпарадкавання Бабруйск.

*Біябібліяграфічныя* часткі КК (ці персаналій) прызначаны для найбольш поўнага адлюстравання імён асоб, жыццё і дзейнасць якіх звязана з пэўным краем. Уключаюцца даныя пра мясцовых дзеячаў, вядомасць якіх абмяжоўваецца краем, і выдатных дзеячаў, часова ці пастаянна звязаных з ім. Матэрыял пра славутых асоб, вядомых у краіне і свеце, павінен адлюстроўвацца толькі ў аспекце сувязі «асоба – край». Пра знакамітых ураджэнцаў, якія працавалі за межамі краю, уключаюць матэрыялы, прысвечаныя іх паходжанню і пачатковаму перыяду жыцця. Матэрыялы пра знаходжанне ў краі вядомых грамадска-палітычных дзеячаў, вучоных, прадстаўнікоў сферы мастацтва і іншых знакамітасцей адлюстроўваюцца ў адпаведных раздзелах сістэматычнага КК, напрыклад «Літаратурнае жыццё». Ствараць персаналіі на такіх асоб немэтазгодна.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Групоўка персанальных рубрык у алфавітным парадку можа быць па прозвішчах або па родах дзейнасці асоб. Першы спосаб першапачаткова патрабуе некаторых дакладных звестак пра асоб. Пры другім рассейваецца інфармацыя пра асоб, дзейнасць якіх ахоплівае некалькі галін. Акрамя таго, карыстальнікі не заўсёды дакладна ведаюць профіль дзейнасці адшуканых асоб.

Краязнаўчыя каталогі павінны арганічна ўваходзіць у агульны ДБА бібліятэкі, таму яны звязваюцца з сістэматычнымі каталогамі, картатэкамі артыкулаў бібліятэкі ўзаемнымі спасылкамі.

Акрамя сістэматычных краязнаўчых каталогаў у АУБ вядуцца алфавітныя каталогі на фонд краязнаўчага аддзела, храналагічныя каталогі мясцовых выданняў і некаторыя іншыя.

*Картачны каталог мясцовых выданняў.* Адлюстроўваюцца ўсе віды дакументаў ад пачатку ўзнікнення кнігадрукавання ў населеным пункце ці адміністрацыйна-тэрытарыяльным аб'екце (вобласці, раёне), як і ў адпаведнай базе даных. З'яўляюцца зводнымі, паколькі поўнымі калекцыямі ўсіх мясцовых выданняў ніводная бібліятэка не валодае. Картачныя каталогі мясцовых дакументаў змяшчаюць два рады: 1) кніг і іншых самастойных выданняў; 2) перыядычных выданняў. БЗ кніг і самастойных выданняў арганізуюцца ў храналагічным парадку; перыядычных выданняў – у алфавіце.

*Друкаваныя каталогі* звычайна складаюцца з дзвюх частак: 1) даследаванне мясцовага кнігавыдання; 2) уласна зводны каталог мясцовых выданняў. Ахопліваюць значныя перыяды развіцця кнігадрукавання: ад пачатку з'яўлення першага выдання да ўстаноўленай верхняй даты, напрыклад да 1917 г. Выдатны ўзор – каталог «Мінскія выданні 1622–1917 гг.», падрыхтаваны Л. І. Доўнар[33]. Ён ахоплівае звыш 3000 бібліяграфічных запісаў, размеркаваных у храналагічным парадку з указаннем месца захавання. Падобныя выданні выходзяць і ў іншых краінах[34].

---

[33] Доўнар Л. І. Мінскія выданні 1622–1917 гг. : каталог // Кніжная справа ў Мінску (канец XVIII – пачатак XX стагоддзя) : манагр. / Л. І. Доўнар. – Мінск, 2015. – С. 237–541.

[34] Коновалова Е. Н. Книга Тобольской губернии. 1790–1917 гг. Сводный каталог местных изданий / Гос. публич. науч.-техн. б-ка Сиб. отд-ния Рос. акад. наук : отв. ред.: Е. И. Дергачева-Скоп, В. Н. Алексеев. – Новосибирск, 2006. – 528 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Бібліяграфічныя ўніверсальныя краязнаўчыя картатэкі* вядуцца пераважна публічнымі бібліятэкамі, найбольш сельскімі. З'яўляюцца буйнымі інфармацыйнымі рэсурсамі. Напрыклад, краязнаўчая картатэка Кобрынскай ЦРБ змяшчае звыш 30 000 бібліяграфічных запісаў, пачынаючы з 1948 г., Браслаўскай ЦРБ звыш 10 000. У краязнаўчых картатэках збольшага адлюстроўваюцца матэрыялы з рэгіянальнай і рэспубліканскай перыёдыкі і іншых выданняў.

Пры фарміраванні ўніверсальных бібліяграфічных краязнаўчых БД, каталогаў у любых формах вядуць наступную дакументацыю:

– пашпарты;

– палажэнні;

– інструкцыі на асобныя тэхналагічныя працэсы: аб парадку выяўлення краязнаўчых дакументаў, аб адборы дакументаў, аб парадку абследавання фондаў бібліятэк ... вобласці (краю), аб арганізацыі дапаможнага даведачнага апарата (паказальнік імёнаў, алфавітны прадметны паказальнік) для картачных формаў;

– картатэкі: прагледжаных крыніц, матэрыялаў для прагляду de visu, метадычных рашэнняў.

У якасці элементаў КДБА ўзрастае значэнне *фактаграфічных БД* рознай тэматыкі, якія актыўна фарміруюцца ў бібліятэках, асабліва публічных. Змяшчаюць пласты інфармацыі пра выдатных ураджэнцаў і дзеячаў, знакавыя падзеі, гістарычныя мясціны, мікратапонімы, выяўленчы і нярэдка бібліяграфічны матэрыял. Даступнасць гэтых БД для інтэрнэт-карыстальнікаў стварае ўмовы і для самастойнага задавальнення іх інтарэсаў і запытаў. Напрыклад, Быхаўская ЦРБ прапануе доступ да шасці баз даных: «Летапісцы Быхаўскага краю», «Их мужество и подвиг нам пример», «Быхаў: старажытная зямля на беразе Дняпра», «Бакулабава: гісторыя далёкая і блізкая», «Площадь героев – символ мужества и славы», «Биография памятника. Лудчицкая высота». Верагодна, фарміраванне падобных БД у перспектыве прывядзе да буйных энцыклапедычных праектаў.

*Фактаграфічныя картатэкі* адлюстроўваюць старанна сабраныя звесткі, якіх не хапае ў даведачных выданнях, напрыклад пра помнікі і памятныя мясціны краю, мікратапонімы, гістарычныя падзеі, выдатных землякоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі элементамі інфармацыйнага паведамлення ў іх з'яўляюцца фармалізаваныя фактаграфічныя даныя: звесткі біяграфічнага характару, апісанні падзей, даты і інш. Так, калі адлюстроўваюцца персаналіі, неабходна ўказаць поўнае імя, звесткі пра дзейнасць, у якой вызначыўся чалавек, магчыма, яго адрас (калі гэта лекар, майстар), узнагароды. У картатэцы «Слынныя імёны Гарадзеншчыны» Гродзенскай АНБ змешчаны звесткі пра больш за 2000 мясцовых дзеячаў і ўраджэнцаў вобласці. У СБ Іванаўскага раёна створаны картатэкі народных умельцаў і апісанняў народных гульняў.

У Пухавіцкай раённай дзіцячай бібліятэцы вядуцца картатэкі «Юныя таленты Пухаўшчыны» пра пераможцаў прадметных і спартыўных алімпіяд, юных пісьменнікаў і мастакоў.

Картачныя краязнаўчыя рэсурсы скарачаюцца, па меры ўкаранення сродкаў аўтаматызацыі бібліяграфічныя і фактаграфічныя картатэкі пераўтвараюцца ў БД.

*Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі*. Значнасць краязнаўчага ДБФ абумоўлена яго патэнцыялам для выканання фактаграфічных і бібліяграфічных даведак. Частка ДБФ, прызначаная пераважна для выканання фактаграфічных запытаў карыстальнікаў, фарміруецца з даведачных выданняў, якія змяшчаюць матэрыялы пра тэрыторыю ці населены пункт. Трэба адзначыць, што ў апошні час назіраецца павышэнне выпуску даведачнай літаратуры, прысвечанай невялікім тэрыторыям. Калі краязнаўчае даведачнае выданне маецца ў бібліятэцы ў адным экзэмпляры, яно ўключаецца ў краязнаўчы фонд, калі экзэмпляраў больш – адзін выдзяляецца ў КДБФ. У любым выпадку бібліёграф павінен добра ўяўляць, якія выданні маюць даведачны характар і адпаведна іх выкарыстоўваць. У даведачную частку КДБФ уключаюць наступныя выданні.

1) Універсальныя даведачныя выданні пра рэгіён/населены пункт. Да іх ліку адносяцца рэгіянальныя энцыклапедыі і даведнікі (сучасныя і рэтраспектыўныя). Сярод сучасных рэгіянальных энцыклапедый і даведнікаў распаўсюджаны выданні, прысвечаныя абласцям і гарадам. У ліку новых выданняў – энцыклапедыі «Регионы Беларуси» і «Гарады і вёскі Беларусі», якія змяшчаюць шмат новых фактаў з мінулага і сучаснасці канкрэтных тэрыторый і пасяленняў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З’явіліся падобныя даведнікі пра невялікія тэрыторыі. Гэтыя выданні ўключаюць кароткія звесткі пра мінулае, асабліва гісторыка-культурнага характару, і больш поўна прадстаўляюць сучасныя дасягненні рэгіёна, у т. л. у лічбах. Маюць добрае паліграфічнае афармленне. Выкарыстоўваюцца пераважна для задавальнення фактаграфічных запытаў навучэнцаў і студэнтаў, аматараў краязнаўства, журналістаў, настаўнікаў.

Да ліку ўніверсальных даведачных выданняў адносяцца гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць», прысвечаныя абласцям, раёнам і гарадам Беларусі. На 2015 г. выдадзена 151 кніга. У гэтых унікальных даведніках у комплексе прадстаўлены найважнейшыя гістарычныя дакументы, статыстычныя звесткі, сабраны матэрыялы з шырокага кола крыніц, якія характарызуюць гістарычны ход падзей, розныя бакі жыцця. Змешчана багатая персанальная інфармацыя, уключаючы фотадакументы і інш. Невыпадкова кнігі гісторыка-дакументальнай хронікі набылі значэнне найлепшага памочніка ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні ў ЦБС.

Падобнымі да гісторыка-дакументальных хронік серыі «Памяць» з’яўляюцца асобныя выданні, здзейсненыя сучаснымі краязнаўцамі па індывідуальнай задуме. Гэта «Хроніка Убарцкага Палесся» (Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці) краязнаўцы-аматара Анатоля Атнагулава[35]. Выданне прадстаўляе сабой сістэматызаваны ўнікальны збор гістарычных дакументаў, звестак і фактаў гісторыі краю. Да ліку выдатных гісторыка-дакументальных хронік адносіцца зборнік «Деревни и люди Мозырщины»[36].

Каштоўнымі элементамі для КДБФ сельскіх бібліятэк з’яўляюцца летапісы вёсак, падрыхтаваныя іх работнікамі. Яны змяшчаюць аўтэнтычныя матэрыялы пра гэтыя пасяленні.

Уключаюцца ў КДБФ і даведачныя выданні мінулага, у перавыданні і электронныя. Так, да ліку такіх каштоўных даведнікаў адносяцца перапрацаванае выданне «Весь Минск, или Спутник по г. Минску» (2017), «Памятныя кніжкі…» былых беларускіх губерняў, выдадзеныя НББ на CD-ROM.

[35] Атнагулаў А. Хроніка Убарцкага Палесся. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 496 с.

[36] Деревни и люди Мозырщины : историко-документальная хроника Мозырского района, всех сельсоветов и населенных пунктов региона (деревень, поселков, хуторов) / сост.: М. А. Копач. – 2-е изд. – Мозырь : Колор, 2005. – 151 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) Даведнікі рэгіянальных статыстычных упраўленняў (абласных, гарадскіх, раённых). Гэта ўніверсальныя даведнікі тыпу «Народная гаспадарка вобласці за перыяд, у годзе», «Вобласць у годзе» і галіновыя, тэматычныя даведнікі «Народная адукацыя вобласці ў годзе», «Медыцына і ахова здароўя вобласці ў годзе», «Жанчыны вобласці» і інш. Прадстаўляюць афіцыйныя статыстычныя даныя пра стан рэгіянальнага развіцця.

3) Даведачна-інфармацыйныя матэрыялы, выдаваныя раённымі і гарадскімі выканкамамі. Змяшчаюць пераважна даныя і статыстыку сучаснага развіцця рэгіёнаў, але адлюстроўваюць і найважнейшыя гісторыка-культурныя звесткі, прыгожа афармлены.

4) Календары знамянальных і памятных дат. Рыхтуюцца АУБ і ЦБС. Некаторыя з іх змяшчаюць толькі фактаграфічныя звесткі.

5) Тапанімічныя даведнікі. Дазваляюць выконваць шматлікія запыты, звязаныя з паходжаннем назваў. Гэта, напрыклад, вельмі папулярныя і зручныя ў выкарыстанні тапанімічныя «Слоўнікі назваў населеных пунктаў» Яўгена Рапановіча, якія выходзілі ў канцы 1970–80-х гг. Стан населеных пунктаў краіны зафіксаваны ў нарматыўным даведачным выданні «Назвы населеных пунктаў ... вобласці». Стваральнікі – Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі, Рэспубліканская тапанімічная камісія НАН Беларусі, сумесна з цэнтрамі картаграфіі і геадэзіі краіны. Асобныя бібліятэкі вядуць дасье мясцовай тапанімікі.

6) Дыялектныя слоўнікі. Гэта слоўнікі рэгіянальных гаворак, напрыклад «Краёвы слоўнік Лагойшчыны» (1970), «Матэрыялы для слоўніка Мінска-Маладзечанскіх гаворак» (1970, 1974, 1977), «Слоўнік Гродзенскай вобласці» (1983, 2018), «Тураўскі слоўнік» (1982–1987) і інш. Важна прадставіць у КДБФ як дыялектныя слоўнікі, што адлюстроўвалі мову рэгіёна ў мінулым, так і сучасныя. Фактычна мова ўсіх рэгіёнаў Беларусі адлюстравана ў дыялектных слоўніках, выдадзеных у той ці іншы час. Асобныя бібліятэкі самі выступаюць збіральнікамі сучаснага моўнага матэрыялу, якія ўяўляюць вялікую каштоўнасць і будуць служыць вывучэнню развіцця мовы на тэрыторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгіёна (Свіслацкая ЦБС). Гэтыя матэрыялы павінны быць прадстаўлены ў КДБФ.

7) Генеалагічныя даведнікі. Перш за ўсё бібліятэкі сочаць за з'яўленнем рэгіянальных даведнікаў, напрыклад, «Малы гербоўнік халопеніцкай шляхты»[37], «Гербоўнік Наваградскай шляхты»[38] і інш. Генеалагічныя даведнікі дапамагаюць вывучаць сямейную гісторыю, гісторыю мясцовых шляхецкіх родаў.

8) Навуковыя, навукова-папулярныя і вучэбныя выданні з вялікім фактаграфічным матэрыялам. Напрыклад, энцыклапедычны характар кнігі вядомага краязнаўцы В. Саяпіна «Гродно и гродненцы: 30 лет ХХ века, 1944–1974 гг.»[39], кнігі кірунку «вёсказнаўства», прысвечаныя гісторыі асобных вёсак і інш. Большасць гэтых выданняў падрыхтавана па ўнікальных крыніцах: архіўных дакументах, успамінах, змяшчае шмат новых фактаў і нярэдка пераасэнсоўвае падзеі гістарычнага мінулага.

9) Адрасныя і тэлефонныя рэгіянальныя даведнікі.

10) Бізнес-даведнікі. Прадстаўляюць даныя пра суб'екты гаспадарання розных формаў уласнасці, іх паслугі, тавары. Змяшчаюць юрыдычныя рэквізіты, кантактныя тэлефоны. Распаўсюджаны ўніверсальныя бягучыя, тэматычныя бізнес-даведнікі і інш.

Разам з даведачнымі выданнямі крыніцамі выканання фактаграфічных даведак з'яўляюцца БД, якія генерыруюцца бібліятэкамі з улікам грамадскай значнасці і інтэнсіўнасці патокаў краязнаўчых запытаў. Сярод найбольш распаўсюджаных тэм БД публічных бібліятэк – рэгіянальная тапаніміка тыпу «Помнікі і памятныя мясціны краю», «Вуліцы населенага пункта», літаратурныя карты, пісьменнікі краю, падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Так, Ляхавіцкая раённая бібліятэка прадставіла доступ да фактаграфічных БД «Сядзібна-паркавыя ансамблі Ляхавіцкага раёна», «Ляхавіцкая фартэцыя», «Літаратурная Ляхавіччына», «Мастакі, чый лёс з'яднаны з нашым краем», «Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі Ляхавіцкага раёна».

[37] Яцкевіч З. Малы гербоўнік Халопеніцкай шляхты. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1999. – 494 с.

[38] Малы гербоўнік Наваградскай шляхты / склад.: С. А. Рыбчонак. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – 161 с.

[39] Саяпин В. Гродно и гродненцы: 30 лет ХХ века, 1944–1974 гг. – Гродно : ЮрСаПринт, 2017. – 389 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічная частка КДБФ уключае галіновыя, тэматычныя, персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі, прысвечаныя пэўнай тэрыторыі, як новыя, так і створаныя ў ранейшыя часы. Сярод іх універсальныя бягучыя паказальнікі пра вобласці, гарады і раёны, тэматычныя і біябібліяграфічныя паказальнікі. Карысна выяўляць і ўключаць у ДБФ бібліяграфічныя матэрыялы пра тэрыторыю, асобныя населеныя пункты і выдатных асоб, якія змяшчаюцца ў бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку». Мэтазгодна выяўляць і адлюстроўваць у КДБФ замежныя бібліяграфічныя матэрыялы пра тэрыторыі. Яны дапамогуць задаволіць інфармацыйныя запыты даследчыкаў. Уключаюцца таксама паказальнікі мясцовага друку, з дапамогай выконваюцца разнастайныя краязнаўчыя запыты (пра паказчыкі мясцовага кнігадрукавання, яго асартымент, на творы мясцовых аўтараў).

Такім чынам, бібліёграфы бесперапынна выяўляюць новыя даведачныя і бібліяграфічныя дапаможнікі, вядуць пошукі даведачных выданняў мінулага. У перспектыве найбольш каштоўныя даведачныя выданні будуць алічбоўвацца, што зробіць даступнымі для бібліятэк і карыстальнікаў мноства фактаў і даных мінулага і сучаснасці любых тэрыторый Беларусі. Карысна выяўляць і выкарыстоўваць інтэрнэт-рэсурсы, якія прадстаўляюць масівы фактаграфічных бібліяграфічных даных пра край.

*Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (ФНБД), электронны архіў выкананых даведак.* Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў прызначаецца для захавання рукапісных (неапублікаваных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, копій найбольш складаных тэматычных краязнаўчых даведак з мэтамі паўторнага выкарыстання. Копіі краязнаўчых даведак арганізуюць як самастойны фонд, асабліва калі ў бібліятэцы ёсць структурнае падраздзяленне па краязнаўстве, або ўключаюць іх у агульны фонд выкананых даведак. ФНБД вядзецца ў выглядзе картатэкі, копіі даведак захоўваюцца ў канвертах, ці як камп'ютарны файл, ці ў спецыяльных папках. На канверце ўказваюцца метадычныя характарыстыкі выкананай даведкі (тэма, від, колькасць дакументаў, іх відавы, моўны склад). Пры паўторным выкарыстанні важнай з'яўляецца дапрацоўка спісу з карэкціроўкай мэтавага і чытац-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кага прызначэнняў, асаблівасцей зместу, пошуку новых дакументаў.

У Расіі (у Беларусі няма) некаторыя бібліятэкі ствараюць электронныя архівы краязнаўчых даведак, якія выконваюцца праз спецыялізаваныя віртуальныя даведачныя службы тыпу «Краязнаўчая даведачная служба».

### Пытанні і заданні да тэмы 3.5

1. Дайце азначэнне краязнаўчаму даведачна-бібліяграфічнаму апарату (КДБА), ахарактарызуйце яго структуру і найбольш устойлівыя (базавыя) часткі.
2. Якія адрозненні вы заўважылі ў складзе КДБА бібліятэк розных тыпаў і відаў?
3. Якія аб'екты бібліяграфічнага адлюстравання ў БД тыпу «Краязнаўчая літаратура» («Краязнаўства») і «Мясцовыя выданні»?
4. Якая роля блоку краязнаўчых дакументаў у Рэгіянальным зводным электронным каталогу (РЗЭК)?
5. Ці мэтазгодна прымяняць для індэксавання краязнаўчых дакументаў УДК?
6. Чым тлумачыцца хуткае развіццё ў бібліятэках фактаграфічных БД? Првядзіце іх прыклады.
7. З якіх частак складаецца картачны краязнаўчы каталог?
8. Ахарактарызуйце прызначэнне і склад краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага фонду (КДБФ).

## 3.6. Падрыхтоўка краязнаўчай бібліяграфічнай і фактаграфічнай прадукцыі

На сучасным этапе бібліятэкі актыўна займаюцца падрыхтоўкай электронных і/ці друкаваных краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў. Сярод іх дамінуюць бібліяграфічныя друкаваныя і электронныя дапаможнікі, фактаграфічныя матэрыялы і мультымедыйныя рэсурсы.

Тэхналогія падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў абапіраецца на агульную тэхналогію, але існуюць пэўныя метадычныя асаблівасці, абумоўленыя спецыфікай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўства як галіновага комплексу і адметнасцямі дамінуючага віду інфармацыі (бібліяграфічнай, фактаграфічнай).

Улічваючы сучасныя ўмовы бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, неабходна звярнуць увагу на змяненні ў падрыхтоўцы краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі. Калі раней пераважалі бібліяграфічныя дапаможнікі, то ў наш час большасць бібліятэк перайшла да стварэння ЭІР з выкарыстаннем шматузроўневага структуравання інфармацыі: фактаграфічнай, бібліяграфічнай, паўнатэкставай, візуальнай, гукавой, узаемазвязанай праз гіперспасылкі. Павялічваецца колькасць КІР, якія характарызуюцца інтэрактыўнасцю і мультымедыйнасцю, даступныя праз сайты бібліятэк. У першую чаргу гэта адносіцца да сегменту КІР, прадстаўленага рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыяй. Змяненні праявіліся і ў КІР, прызначаных для задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей спецыялістаў і даследчыкаў краязнаўства. Пашыраецца падрыхтоўка БД, у т. л. паўнатэкставых, а таксама мультымедыйных выданняў, якія грунтоўна адлюстроўваюць мясцовы друк, літаратурную і навуковую спадчыну выдатных дзеячаў і інш. Пры гэтым варта адзначыць, што ў складзе інфармацыйных рэсурсаў, накіраваных на забеспячэнне прафесійнай і навукова-даследчай дзейнасці, нямала друкаваных бібліяграфічных дапаможнікаў.

Большасць КІП ствараецца ў аўтаматызаваным рэжыме.

Спачатку мэтазгодна ахарактарызаваць агульную тэхналогію падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, якая ляжыць у аснове вытворчасці бібліяграфічных КІР, а таксама тых, дзе прэваліруюць іншыя віды сацыяльнай інфармацыі.

***Метадычныя асаблівасці асноўных тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі***

На *падрыхтоўчым этапе* выбіраецца актуальная і грамадска значная для рэгёна (населенага пункта) тэма. Неабходныя ўмовы – яе недастатковая бібліяграфічная забяспечанасць і наяўнасць краязнаўчага дакументнага патоку адпаведнай тэматыкі.

Важным працэсам з’яўляецца вызначэнне *геаграфічных межаў* краю. Асноўная частка бібліяграфічных дапаможнікаў ахоплівае сучасныя адміністрацыйна-тэрытарыльныя межы, але ў дапаможніках гістарычнай тэматыкі (ці гістарычных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раздзелах паказальнікаў) улічваюць і мінулы адміністрацыйна-тэрытарыяльны, канфесіянальны, судова-адміністрацыйны падзел, эканамічныя і іншыя сувязі.

Тэма вывучаецца з выкарыстаннем дакументных крыніц. Пры неабходнасці праводзяцца кансультацыі са спецыялістамі-краязнаўцамі.

План-праспект адлюстроўвае ўсе параметры будучага дапаможніка. Яго структура адпавядае агульным метадычным патрабаванням і фіксуе метадычныя асаблівасці.

Крыніцы выяўлення дакументаў падзяляюцца на першасныя і другасныя, асноўныя і дадатковыя. Пошук дакументаў пачынаецца з прагляду асноўных бібліяграфічных крыніц. У склад *асноўных крыніц* уключаюцца краязнаўчыя базы даных, каталогі, картатэкі, грунтоўныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Важнае значэнне надаецца несамастойным бібліяграфічным матэрыялам (прыкніжным, прыартыкульным спісам літаратуры і інш.). Да ліку асноўных крыніц могуць быць аднесены «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», паказальнікі бягучай і рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі. У склад асноўных крыніц уключаюцца першасныя дакументы, якія патрабуюць уважлівага прагляду. Асаблівасцю методыкі бібліяграфавання краязнаўчай літаратуры з'яўляецца тое, што часта неабходна адшукваць раздзелы, параграфы і нявызначаныя тэкставыя фрагменты, прысвечаныя краю, у беларусазнаўчых манаграфіях, зборніках, а таксама выяўляць артыкулы ў мясцовых часопісах і газетах.

Да *дадатковых крыніц* адносяцца рэспубліканскія і замежныя перыядычныя выданні, навукова-дапаможныя галіновыя і тэматычныя бібліяграфічныя дапаможнікі, для якіх уласцівы рэгіянальны аспект даследаванняў.

У працэсе выяўлення дакументаў ствараюцца рабочыя картатэкі ўсіх прагледжаных крыніц і рэлевантных дакументаў на аснове прагледжаных другасных і першасных крыніц. У картатэцы рэлевантных дакументаў бібліяграфічныя апісанні павінны адпавядаць стандарту 7.1-2003 «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне», і справа ўнізе карткі прастаўляецца яе ідэнтыфікацыйны індэкс, які замацоўвае той ці іншы дакумент за пэўным раздзелам дапаможніка паводле структуры, вызначанай у плане-праспекце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падчас *аналітычнага этапу* выконваецца агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў, цягам якога высвятляецца значэнне кожнага з іх для будучага дапаможніка. Складаецца ці ўдасканальваецца іх бібліяграфічнае апісанне, асаблівасць – шырокае выкарыстанне аналітычных апісанняў і апісанняў па форме «Са зместу:».

Пры падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў гістарычнай тэматыкі ці прысвечаных уліку мясцовых выданняў часам неабходна выкарыстаць бібліяграфічныя спасылкі ў выданнях лацінскага шрыфту да XIX ст. Тады ўжывалі словы-маркеры на лацінскай мове, якія ўказвалі на пэўныя бібліяграфічныя элементы. Напрыклад, назве кнігі папярэднічалі маркеры: Title, Tit, году выдання – An, Anno, Anni, колькасці старонак – Fol, Folio, F.

Пры анатаванні дакументаў для краязнаўчых дапаможнікаў выкарыстоўваюцца ўсе віды анатацый. Тэхналогія іх падрыхтоўкі абапіраецца на напрацоўкі ў галіне анатавання ў цэлым. Шырока прымяняюцца кароткія і пашыраныя даведачныя анатацыі. Кароткія даведачныя анатацыі ствараюцца для ўдакладнення зместу ў тых выпадках, калі назвы дакументаў не адлюстроўваюць іх краязнаўчы змест. Адкрываюцца квадратныя дужкі [], куды ўпісваюць удакладняльныя звесткі, што раскрываюць краязнаўчы змест дакументаў. Такія анатацыі выкарыстоўваюцца нават пры наяўнасці назвы краю ў загалоўку. У рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможніках ужываюцца рэкамендацыйныя анатацыі.

Анатацыі патрэбны:

– калі назвы дакументаў не адлюстроўваюць іх краязнаўчы змест (маюць сімвалічны (вобразны), публіцыстычны, прапагандысцкі характар). Яны найбольш распаўсюджаны ў публіцыстыцы, мастацкай літаратуры, сярод матэрыялаў перыядычных выданняў;

– пры неабходнасці ўдакладніць аспект краязнаўчага зместу, адлюстраваны ў дакуменце.

Анатацыі неабходны для больш дасканалага мадэліравання зместу, што вельмі важна для ідэнтыфікацыі дакументна фіксаваных краязнаўчых ведаў і іх пошуку. Анатацыі лепш забяспечваюць інтэлектуальны доступ да ведаў, неабходных асобе, калектыву ці супольнасці людзей у параўнанні з дапамож-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікамі, абмежаванымі толькі бібліяграфічнымі апісаннямі. Без анатацый немагчымы некаторыя тыпы і жанры бібліяграфічных дапаможнікаў.

Разам з тым існуюць пэўныя асаблівасці падрыхтоўкі анатацый для краязнаўчых дапаможнікаў, абумоўленыя менавіта спецыфікай самога віду – краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

1) Неабходна дакладна вызначыць тэрыторыю (населены пункт), пра які ідзе гаворка ў першасным дакуменце. Пералічаюцца фізіка-геаграфічныя, эканамічныя, гістарычныя, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя аб’екты, населеныя пункты, згаданыя ў тэксце. Калі аб’ектаў шмат, то адлюстроўваюць толькі тыя, пра якія ёсць больш поўныя і значныя звесткі, і варта зрабіць спасылку: «Матэрыялы пра край гл. таксама ў “Паказальніку геаграфічных назваў”».

2) Указаць час, да якога адносяцца падзеі, з’явы і факты. Выключэннем становяцца тыя выпадкі, калі час дакладна адлюстраваны ў назве дакумента.

*Барысаў, І. Снайпер Надзея Кір’ян [1923–1944, г. Скідзель Гродзен. р-на] / І. Барысаў // Аркуш (Гродна). – 2004. – 23–29 чэрвеня. – С. 1.*

3) Пералічыць асоб і звесткі пра іх, іх адносіны да краю. Выключэннем з’яўляюцца тыя выпадкі, калі імя асобы дакладна адлюстравана ў назве дакумента.

*Бараноўскі, Я. Трагедыя забыцця: жыццё і смерць падпольшчыка [аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага антыфашысцкага падполля Івана Кірылавіча Кавалёва] / Я. Бараноўскі // Звязда. – 1995. – 6 мая.*

4) Даць канкрэтную характарыстыку ілюстрацыйнага матэрыялу (карт, схем, фотаздымкаў, партрэтаў, малюнкаў). Прывесці назвы карт, іх масштаб. Адзначыць першыя публікацыі фатаграфій асоб або аб’ектаў, важных для краязнаўчага вывучэння.

5) Цытаванне, перадрукоўка невялікіх тэкстаў з рэдкіх і цяжкадаступных дакументных крыніц.

Гэтыя элементы найбольш важныя для бібліёграфаў, яны павінны прысутнічаць у анатацыях розных відаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найважнейшымі працэсамі *сінтэтычнага этапу* з'яўляюцца: канчатковы адбор дакументаў, групоўка бібліяграфічных запісаў і падрыхтоўка дапаможных паказальнікаў.

Пры складанні краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў выкарыстоўваюць *фармальны, зместавы і якасны адбор.* Вызначэнне крытэрыяў адбору дакументаў абумоўлена функцыянальнымі асаблівасцямі будучага дапаможніка. Фармальны адбор ажыццяўляецца па знешніх прыметах (храналагічнай, відавой, па месцы выдання, аўтарства і інш.). Крытэрыі фармальнага адбору звычайна спадарожнічаюць яго іншым відам. З'яўляецца асноўным для паказальнікаў мясцовага друку і паказальнікаў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, а таксама некаторых персанальных бібліяграфічных рэсурсаў.

Зместавы адбор дазваляе ўключыць дакументы, адпаведныя тэме дапаможніка. Шырока прымяняецца ў навукова-дапаможных і рэкамендацыйных краязнаўчых дапаможніках. Якасны адбор таксама выкарыстоўваецца ў рэкамендацыйных (папулярных) і навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных прадуктах.

Асаблівасцю з'яўляецца ўлік зместавай сувязі дакумента з рэгіёнам. Звяртаецца ўвага на важнасць тэмы дакумента, наяўнасць у ім значных статыстычных і іншых фактычных звестак. Для ацэнкі навізны звестак могуць выкарыстоўвацца наступныя крытэрыі: час публікацыі і атрыманых вынікаў; актуальнасць тэмы даследавання; унікальнасць прыменeных аўтарам крыніц і метадаў; адрозненне прадстаўленых вывадаў ад ужо вядомых; адлюстраванне новых сувязей паміж вядомымі фактамі і інш. Для адлюстравання даставерных дакументаў улічваюць навуковую рэпутацыю аўтара, наяўнасць і характар спасылак на разгледжаныя дакументы, параўнальныя перавагі і недахопы выкарыстаных метадаў. Вялікую каштоўнасць прадстаўляюць гістарычныя першакрыніцы: тэксты нарматыўна-прававых актаў, мемуары.

Складальнікам краязнаўчых дапаможнікаў неабходна ажыццяўляць адбор шматлікіх газетных публікацый. Акрамя агульных падыходаў, неабходна ўлічваць значнасць тэмы артыкула, наяўнасць цікавых фактаў, адлюстраванне мясцовых асаблівасцей і інш. Не ўключаюцца матэрыялы, якія змяшчаюць агульнавядомыя звесткі, бягучыя інфармацыйныя паведамленні, ка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роткія замалёўкі і рэпартажы. Адрозніваецца падыход да адбору новых газетных публікацый і рэтраспектыўнага адбору. Новыя публікацыі ўлічваюцца з большай паўнатой, тады як матэрыялы мінулых гадоў ацэньваюцца з пункта гледжання паўнаты, дакладнасці, значнасці.

Для групоўкі бібліяграфічных запісаў прымяняюць *фармальныя, змястоўныя і рэкамендацыйныя спосабы*. На іх выбар уплываюць від, тып, жанр будучага бібліяграфічнага дапаможніка.

*Фармальныя:* алфавітная, храналагічная/адваротна-храналагічная, тапаграфічная групоўкі.

*Змястоўныя:* сістэматычная (на падставе класіфікацыйных схем), тэматычная.

*Рэкамендацыйныя:* ад простага да складанага, ад агульнага да прыватнага і ад прыватнага да агульнага.

Нярэдка на практыцы ўжываюцца фармальны і змястоўны спосабы ў адным бібліяграфічным дапаможніку. Так, у краязнаўчых календарах і хроніках даты размяшчаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці, а БЗ у спісах да падзей могуць размяшчацца ў лагічным ці іншым парадку. У многіх універсальных і галіновых паказальніках выкарыстоўваецца з пэўнай дапрацоўкай «Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь».

У адпаведнасці з тыпам і жанрам краязнаўчыя дапаможнікі могуць мець простую ці складаную структуру.

Жанрава-тыпалагічная разнастайнасць краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі абумоўлівае шырокі склад дапаможных паказальнікаў, якія дазваляюць аптымізаваць бібліяграфічны пошук па іх. Да краязнаўчых дапаможнікаў складаюць імянныя, персанальныя, геаграфічныя, тэматычныя, прадметныя, аўтараў і назваў дакументаў і іншыя дапаможныя паказальнікі. Яны будуюцца найчасцей на аснове такіх інфармацыйных аб’ектаў, як уласныя імёны, тапанімічныя назвы, назвы геаграфічных аб’ектаў, калектываў і арганізацый.

Групоўка матэрыялу ў дапаможных паказальніках можа быць алфавітнай, сістэматычнай, тэматычнай, храналагічнай і інш.

Найбольш запатрабаваныя *геаграфічны і персанальны (імянны)* дапаможныя паказальнікі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У геаграфічным дапаможным паказальніку адлюстраваны назвы разнастайных аб'ектаў, пераважна зямной прасторы. Асновай пабудовы геаграфічных дапаможных паказальнікаў з'яўляюцца геаграфічныя рубрыкі – найменні адміністрацыйна-тэрытарыяльных, дзяржаўных, фізіка-геаграфічных, геалагічных (рудаўпраўленне), эканамічных аб'ектаў («Шабаны» (Мінск), СЭЗ «Гродноинвест»); аб'ектаў, звязаных з рознымі відамі транспарту: чыгункай, воднымі шляхамі, аўтамагістралямі. Уключаны найменні гісторыка-геаграфічных аб'ектаў (Юравіцкая стаянка), ваенна-геаграфічныя аб'екты (тэатры ваенных дзеянняў, месцы асобных баёў); назвы навуковых станцый, абсерваторый, запаведнікаў, метэастанцый і інш.); часовыя пасяленні рознага прызначэння (палявы лагер вытворчай практыкі, геалагічнай экспедыцыі).

Пры ўключэнні назваў геаграфічных аб'ектаў трэба ўлічваць асаблівасці функцыянавання тэрмінаў. Нельга пераўтвараць пастаянна прымяняемыя тэрміны, якія сталі звыклымі, шырока вядомымі ў навуцы і ў грамадскай практыцы, у тэрміны нязвыклыя: напрыклад, Рудабельскую Рэспубліку не варта змяняць на Рудабель, калі ў дакуменце асвятляюцца падзеі станаўлення савецкай улады. Неабходнасць дакладнай ідэнтыфікацыі і лакалізацыі населеных пунктаў у некаторых выпадках патрабуе ўдакладненняў гістарычных назваў, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці аб'ектаў. Бібліёграфу-складальніку ў неадназначных сітуацыях мэтазгодна кіравацца наступнымі рэкамендацыямі:

– выкарыстоўваць *сучасныя назвы* ў якасці рубрык. Пры гэтым галоўная рубрыка павінна дапаўняцца ўсімі варыянтамі гістарычных назваў, якія таксама павінны адлюстроўвацца ў рубрыках-спасылках;

– прымяняць *гістарычныя назвы* ў якасці самастойных рубрык мэтазгодна ў тых выпадках, калі немагчыма ідэнтыфікаваць населеныя пункты, што сустракаюцца ў гістарычных дакументах, у гістарычнай літаратуры, з сучаснымі;

– абавязкова ўказваць *тып* населенага пункта: горад, фальварак і інш. Дазваляе пазбегнуць хібаў аманіміі (Свіслач, рака; Свіслач, гарадскі пасёлак);

– пазначаць *адміністрацыйна-тэрытарыяльную функцыю* аб'екта: цэнтр ваяводства, павета, раёна, сельсавета;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– апісваць *адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць* да пэўнай дзяржаўнай тэрытарыяльнай адзінкі (ваяводства, павета, губерні, акругі, раёна, вобласці);

– даваць *спасылкі* пры наяўнасці сінанімічных назваў (Прапойск, гл. Слаўгарад).

У геаграфічным дапаможным паказальніку мэтазгодна змяшчаць храналагічныя і тэматычныя падрубрыкі і падрубрыкі, якія характарызуюць мэтавае і чытацкае прызначэнне, форму дакумента.

У *персанальны* дапаможны паказальнік уключаюць звесткі пра ўсіх асоб, узгаданых у назвах дакументаў і анатацыях, і яшчэ лепш – у тэкстах дакументаў. Інфарматыўнасць іх рубрык павялічваецца праз указанне поўных імён, дат жыцця, прафесіі, віду дзейнасці, роду заняткаў, тытулу і інш. Нярэдка персанальныя рубрыкі ўключаюць у імянныя паказальнікі, дзе асобна выдзяляюць (маркёрамі *аб ім*, *аб ёй*; круглымі дужкамі, у якія ўключаны нумары адпаведных БЗ).

На *заключным этапе* рыхтуюць даведачна-метадычны апарат краязнаўчага бібліяграфічнага дапаможніка. У яго склад уваходзяць прадмова, уводны артыкул, змест, дапаможныя паказальнікі, разнастайныя дадаткі. Склад элементаў метадычнага апарату залежыць ад тыпу і жанру бібліяграфічнага дапаможніка.

Да буйных універсальных папулярных і навукова-дапаможных краязнаўчых дапаможнікаў у складзе прадмовы або ў асобных уводных артыкулах мэтазгодна прадставіць абагуленую ўсебаковую характарыстыку рэгіёна. Ва ўводзінах, напісаных навуковымі рэдактарамі ці кансультантамі, асвятляюць асаблівасці дакументнага патоку (масіву), ацэньваюць найважнейшыя выданні і ўклад найбуйнейшых аўтараў. У складзе дадаткаў важнае значэнне маюць спіс выкарыстаных крыніц, картаграфічныя і фотаматэрыялы. У большасці дапаможнікаў мэтазгодна размяшчаць карту сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ці іншыя сучасныя карты. У паказальнікі з гістарычным аспектам карысна ўключыць гістарычныя карты рэгіёна. Цяпер выкарыстоўваюць методыку пазначэння на картах важных аб’ектаў, якія ўзгадваюцца ў бібліяграфаваных дакументах (напрыклад, мясцін лакалізацыі помнікаў, калі дапаможнік прысвечаны помнікам, культуры краю).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падрыхтаваны краязнаўчы бібліяграфічны дапаможнік праходзіць рэдагаванне, афармленне і падрыхтоўку да друку. Навуковае, літаратурнае і бібліяграфічнае рэдагаванне выконваюць навуковыя рэдактары – краязнаўцы-даследчыкі і спецыялісты, краязнаўцы-бібліятэкары-бібліёграфы.

***Метадычныя асаблівасці асобных жанраў***

Мэтавае прызначэнне рэкамендацыйных дапаможнікаў скіравана на пашырэнне і паглыбленне ведаў пра край шляхам дасугавага чытання, задавальнне захапленняў, звязаных з пазнаннем краю, чытання як элемента самаадукацыі і адукацыі. Цяпер шырока распаўсюджаны паказальнікі, спісы, календары знамянальных і памятных дат, даведнікі, віртуальныя выставы, буктрэйлеры, базы даных, літаратурныя карты, памяткі, лістоўкі і іншыя формы і жанры рэкамендацыйных бібліяграфічных рэсурсаў. Большасць сучасных рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў адрасавана шырокаму колу карыстальнікаў і аматарам краязнаўства. Складальнікі імкнуцца забяспечыць карыстальніку магчымасць свабодна арыентавацца ў літаратурнай прасторы і фактаграфічным матэрыяле, надаюць значную ўвагу яго візуалізацыі. Больш увагі адводзяць раскрыццю *зместу* дакументаў і выкарыстанню *фактаграфічных* звестак для характарыстыкі кола адлюстраваных пытанняў. Развіваюцца жанры, у якіх фактаграфічныя даныя выконваюць не меншую ролю, чым бібліяграфічныя, напрыклад бібліяграфічныя даведнікі, нарысы, календары знамянальных і памятных дат, літаратурныя карты. Фактаграфічныя звесткі часта афармляюцца ў выглядзе ўводных тэкстаў (даведак) да раздзелаў, уводных артыкулаў, хронік і іншых структурных элементаў дапаможнікаў. Фактаграфічныя фрагменты тэкстаў пішуць папулярна, што забяспечвае іх даступнасць, рыхтуе чытача да ўспрымання бібліяграфічнага матэрыялу. Гэтыя тэксты апасрэдуюць функцыю бібліёграфа-дарадчыка, акрэсліваючы змест у цэлым і самыя важныя пытанні. Фактаграфічны матэрыял у папулярных дапаможніках прадстаўляе сабой:

1) даныя (імёны, даты, апісанні падзей, аб'ектаў і інш.), якія могуць быць узяты з бібліяграфаваных дакументаў ці з іншых крыніц;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) тэксты бібліяграфаваных дакументаў: фрагменты мастацкіх твораў, гістарычных дакументаў (невялікія могуць быць прыведзены цалкам), цытаты, выказванні крытыкаў, вядомых людзей, нарысы па гісторыі напісання твораў, пра прататыпы герояў. Пры адсутнасці падобных тэкстаў іх рыхтуе бібліёграф-складальнік.

Візуалізацыя – аснашчэнне рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў разнастайнымі выяўленчымі матэрыяламі, якія канкрэтызуюць і ўзмацняюць эмацыянальнае і пазнавальнае ўздзеянне рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі.

Важнай метадычнай задачай, вырашальнай бібліёграфам-складальнікам, з'яўляецца стымуляванне чытання з прымяненнем розных пазнавальных і інструкцыйна-метадычных звестак. З дапамогай пазнавальных звестак чытач атрымлівае веды пра тэму чытання, пра змест бібліяграфаванай літаратуры. Пры бібліяграфаванні навукова-папулярнай літаратуры мэтазгодна звяртаць увагу на асаблівасці зместу дакументаў: навуковыя факты, навуковыя і светапоглядныя падыходы, дакладнасць апісання гістарычных, прыродных і іншых з'яў і падзей, біяграфічных звестак, даныя пра прыкладныя значэнні матэрыялу. Пры бібліяграфаванні твораў мастацкай літаратуры важна адлюстраваць сюжэт, час і месца падзей, прататыпаў персанажаў, гістарычныя ўмовы перыяду, што паўплывалі як на падзеі, так і на светапогляд аўтара.

У рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможніках важна выкарыстоўваць разнастайныя метадычныя прыёмы, якія прыцягваюць увагу чытача да прапанаванай тэматыкі і дакументаў, абуджаюць яго пазнавальныя інтарэсы і ствараюць станоўчы эмацыянальны настрой на чытанне рэкамендаванай літаратуры, прагляд АВ-матэрыялаў. Складальніку рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфічных жанраў уласціва схільнасць да літаратурнай працы і папулярызацыі ведаў.

*Календары знамянальных і памятных дат.* Атрымалі самае шырокае распаўсюджанне ў бібліятэках розных тыпаў і відаў. У перадавой практыцы календары выходзяць пераважна ў лічбавай форме, у нашай краіне яны ствараюцца ў друкаванай і электроннай формах. Асноўная задача гэтых дапаможнікаў –



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

давесці фактаграфічныя і бібліяграфічныя звесткі пра значныя рэгіянальныя падзеі, юбілеі, якія святкуюцца ў бягучым годзе.

Пры іх падрыхтоўцы неабходна ўлічваць:

– крытэрыі адбору знамянальных і памятных дат;

– аб’ём і змест фактаграфічнага запісу;

– аб’ём і каштоўнасць рэкамендаванай літаратуры.

Падрыхтоўка дапаможнікаў пачынаецца з вызначэння юбілейных дат. Фармальна гэта даты, кратныя 5, але абавязкова ўлічваецца іх грамадская значнасць. Бібліёграфы вядуць пошук, абапіраючыся на асноўныя тыповыя катэгорыі: «падзея», «персона», «факт», «месца», «аб’ект».

Па меры выяўлення дат на будучы год вядуць картатэку. У картатэцы зручна выдзеліць пяць буйных раздзелаў: «…0 і …5», «…1 і …6», «…2 і …7», «…3 і …8», «…4 і …9». За першым размесцяцца бібліяграфічныя запісы на падзеі гадоў, якія заканчваюцца на 0 і 5, у другім на 1 і 6 і г. д. Размеркаванне картак унутры дзяленняў – прамая храналогія. Фактаграфічныя запісы на падзеі, якія адбываліся на працягу месяца ці пра якія вядомы толькі месяц ці год, размяркоўваюцца ў канцы месяцаў ці года.

Калі падзея адбывалася на працягу месяца/года, тады запіс пра гэту падзею ставіцца ў канцы месяца або года.

Пры выкарыстанні Microsoft Office Word магчыма зрабіць папку з пяццю файламі «…0 і …5», «…1 і …6», «…2 і …7», «…3 і …8», «…4 і …9» і весці іх як табліцы. У адзін слупок заносіць даты, у другі – апісанне падзей і ў трэці – крыніцы інфармацыі. Распалажэнне запісаў у межах аднаго файла – храналагічнае. Выкарыстоўваючы сістэму маркераў і пошукавыя магчымасці праграмы, магчыма падбіраць даты па годзе, тэме, геаграфічнай назве, імені асобы і інш.

Асноўнымі крыніцамі выяўлення такіх дат з’яўляюцца:

– картатэкі/БД мясцовых знамянальных і памятных дат, картатэкі/БД хронікі;

– даведачныя выданні (рэгіянальныя і нацыянальныя энцыклапедыі, даведнікі); афіцыйныя дакументы (рэгіянальных і цэнтральных органаў улады і кіравання); гістарычная літаратура пра краіну і рэгіён;

– экспазіцыі мясцовых музеяў і інфармацыя ад краязнаўцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На адбор дат уплываюць такія фактары, як іх грамадская значнасць, актуальнасць, адпаведнасць сучасным грамадскім каштоўнасцям. Пасля выяўлення дат пачынаецца працэс іх удакладнення і вывучэння. Для ўдакладнення дат выкарыстоўваецца шырокае кола крыніц, сярод якіх:

– картатэкі/БД тыпу хронікі падзей, апублікаваныя гістарычныя хронікі;

– пастанаўленні і рашэнні мясцовых, а часам і цэнтральных органаў улады аб святкаванні падзей;

– даведачныя, навуковыя і іншыя даставерныя крыніцы і матэрыялы архіваў і музеяў.

Падчас удакладнення дат мінулага важна звярнуць увагу на іх адпаведнасць сучаснаму календару. Трэба вырашыць пытанні з дакладнасцю дат, месцам падзей, удзельнікамі, калі існуюць спрэчныя погляды. Да ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі выкарыстоўваўся грыгарыянскі стыль, а пасля інкарпарацыі – юліянскі. Бібліёграф павінен удакладняць даты па асобных беларускіх тэрыторыях, якія сустракаюцца ў крыніцах за перыяд з 1772, 1793, 1795 да 14 лютага 1918 г. паводле грыгарыянскага стылю. Існуюць правілы пераводу дат са старога на новы стыль, анлайн-канвертары.

Асноўныя крыніцы выяўлення літаратуры да дат:

– краязнаўчыя каталогі і картатэкі, бібліяграфічныя БД;

– бягучыя і рэтраспектыўныя ўніверсальныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі;

– персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі і інш.

У структуру календара ўваходзяць прадмова, спіс дат, асноўная частка, дапаможныя паказальнікі. У прадмове даецца яго характарыстыка і рэкамендацыі па выкарыстанні. Затым можа быць спіс дат года са спасылкамі на старонкі, дзе яны характарызуюцца больш падрабязна. Калі дата не зусім дакладная, напрыклад невядомы дзень ці месяц, то такія даты ў спісе і ў асноўнай частцы паказваюцца ў канцы. Асноўная частка змяшчае тэкставыя даведкі па датах, а таксама фактаграфічныя, статыстычныя, бібліяграфічныя і іншыя матэрыялы. Тэкставыя характарыстыкі размяшчаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці: дата, месяц, год. Пасля даты даецца канкрэтная і інфарматыўная яе назва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнай з’яўляецца падрыхтоўка тэкставай (фактаграфічнай) даведкі. Яна павінна адпавядаць патрабаванням навуковасці, даставернасці, дакладнасці, таму пішуць яе на аснове выяўлення і вывучэння першакрыніц, новай навуковай літаратуры, крытычных матэрыялаў, уключаючы даныя з энцыклапедый, замежнамоўных крыніц. Для напісання даведак могуць быць запрошаны краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў, журналісты, выкладчыкі.

Да дат календароў прыкладаюць разгорнутыя і кароткія даведкі і ў некаторых выпадках – артыкулы.

*Разгорнутая фактаграфічная даведка падаецца, калі:*

1) крыніцы малатыражныя, старыя ці адсутнічаюць у бібліятэках рэгіёна;

2) гістарычная тэма мала знаёмая сучаснікам;

3) неабходна адлюстраваць новыя погляды на падзею.

Калі прыкладна 5 год назад да даты змяшчалася разгорнутая фактаграфічная даведка, то пры яе асвятленні ў новым выпуску календара не трэба паўтараць папярэдні матэрыял, а шукаць новыя звесткі. Напрыклад, рэгулярна адлюстроўваюцца юбілеі Вялікай Айчыннай вайны і таму важна па магчымасці раскрыць новыя аспекты гэтай тэмы.

*Кароткія (невялікія)* фактаграфічныя даведкі ствараць на даты заснавання прадпрыемстваў, арганізацый, навучальных устаноў, дні нараджэння вядомых асоб.

*Артыкулы* пішуць пры ўмове недастатковай забяспечанасці пэўнай тэмы дакументальнымі крыніцамі. Часцей за ўсё, гэта гісторыя невялікіх населеных пунктаў. Як правіла, для стварэння артыкулаў неабходна выкарыстоўваць не толькі бібліятэчныя, але і архіўныя фонды, матэрыялы музеяў.

У некаторых выпадках у календары ўключаюць не арыгінальныя артыкулы, а матэрыялы з іншых маладаступных, малатыражных выданняў (са спасылкай на крыніцу). Неабходна прытрымлівацца наступнага правіла: суадносіць аб’ём даведкі з датай. Напрыклад, дата пра невялікае пасяленне, якому 50 гадоў, не павінна быць большай, чым даведка пра 200-гадовую вёску.

Нельга ўказваць толькі даты заснавання. У даведках трэба адлюстроўваць звесткі пра дасягненні прадпрыемстваў і арганізацый, жыццё і дзейнасць асоб.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Даведкі, прысвечаныя прадпрыемствам, установам, арганізацыям.* Датай заснавання прадпрыемства можа быць прызнаны дзень прыняцця афіцыйнага дакумента аб яго стварэнні, пачатак ці завяршэнне будаўніцтва, пачатак работы, дзень правядзення мітынга з нагоды адкрыцця ці выпуску першай прадукцыі.

У даведцы аб прадпрыемстве, арганізацыі, навучальнай установе абавязкова павінны быць адзначаны яго першапачатковы статус і назва, а таксама сучасныя; у некаторых выпадках указваюцца і прамежкавыя назвы.

У тэкстах аб прадпрыемствах і арганізацыях патрэбна ўказаць іх асноўныя задачы і кірункі дзейнасці. Акрамя таго, пажадана даць звесткі пра канкрэтныя вынікі дзейнасці. Напрыклад, калі разглядаюцца прадпрыемствы будаўнічай галіны, пазначаюцца найбольш вядомыя праекты і будынкі. Калі характарызуюцца адукацыйныя ўстановы, паказваюцца дасягненні і найлепшыя вучні. Важна напісаць пра замежныя сувязі прадпрыемства/установы, каб паказаць міжнароднае прызнанне іх дзейнасці.

Калі аб прадпрыемстве/установе, што існавала ў мінулым, вядома мала звестак, напрыклад толькі факт стварэння ў пэўным годзе, то гэтыя звесткі можна ўключыць у даведку, прысвечаную, напрыклад, развіццю галіны ў рэгіёне, да якой адносіцца ўстанова. І наадварот, дата заснавання сучаснай установы можа быць прычынай для кароткага ўпамінання іншых устаноў галіны.

*Персанальныя даведкі.* Даведкі персанальнага характару складаюцца да дат нараджэння, у сувязі з прысваеннямі земляку ганаровага звання, гастролямі вядомага артыста ў населеных пунктах, візітам у рэгіён айчыннага ці замежнага дзеяча.

У гэтых даведках прыводзяцца наступныя звесткі:

1) дата нараджэння асобы; пры неабходнасці адзначаць указанне розных дат у крыніцах. Па магчымасці звяртацца да самога юбіляра ці яго родных, каб высветліць правільную дату і зразумець прычыну ўзнікнення розных дат;

2) поўнае імя персоны павінна суправаджацца звесткамі пра год і месца нараджэння, ці пра гады жыцця, месц нараджэння і скону.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі ў матэрыялах пра персону месцы нараджэння і скону названы па-старому, у адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам мінулага, неабходна ўдакладняць сучасныя назвы, статус і адміністрацыйную прыналежнасць населеных пунктаў.

У даведцы неабходна называць прафесію і сферы дзейнасці персоны: кім, на якім прадпрыемстве, у якія гады працаваў/служыў чалавек.

У тэкстах пра прадстаўнікоў розных прафесій павінны быць спецыфічныя, характэрныя для гэтых прафесій даныя, напрыклад звесткі пра голас у спевака, у пісьменніка – галоўныя творы, пра вучонага – у якіх навуковых галінах спецыялізуецца. Варта звяртаць увагу на падзеі, што адбываліся на гэтай тэрыторыі.

Неабходна паказаць, якую ролю адыграла асоба ў сваёй галіне. Для гэтага апісаць вынікі дзейнасці, напрыклад яго перамогі на спартыўных спаборніцтвах; асноўныя дасягненні прадпрыемства ў перыяд кіраўніцтва пэўнай асобы.

Пры складанні даведак пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, вядомых сваёй даваеннай ці пасляваеннай дзейнасцю, трэба ўказаць пра іх удзел у вайне і ваенныя ўзнагароды.

У некаторых выпадках складальнік у персанальнай даведцы дае кароткія звесткі пра гістарычную сітуацыю, у якой чалавек дзейнічаў.

Заўсёды прыводзяцца звесткі пра мемарыялізацыю асобы: названыя ў яго гонар вуліцы, іншыя аб’екты, устаноўленыя бюсты, мемарыяльныя знакі.

З улікам мэтазгоднасці ў даведках прымяняецца цытаванне. Аб’ём персанальнай даведкі павялічваецца, калі ідзе гаворка пра ўнікальных асоб з markdown рознабаковымі інтарэсамі. Аб’ёмнымі, як правіла, з’яўляюцца даведкі пра дзеячаў мастацтва.

Пасля кожнай тэкставай даведкі даецца спіс літаратуры – 5–10 назваў найбольш значных і новых публікацый, а таксама архіўных дакументаў, матэрыялаў з музейных калекцый, АВ-дакументаў, ілюстрацый і інш. Цяпер усё больш ствараецца календароў, якія не маюць спісаў літаратуры, а змяшчаюць толькі фактаграфічныя звесткі.

Да календароў складаюць імянны (персаналій) і геаграфічны дапаможныя паказальнікі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Электронныя календары рыхтуюць у фарматах базы даных і html-старонкі, pdf-файла і html. Выкарыстоўваюцца сэрвісы Calameo і Issuu, якія надаюць кантэнту падабенства кнігі, з магчымасцю прагляду зместу, раздзелаў, паказальнікаў. Фактаграфічная база даных каляндар знамянальных дат ствараецца як падпраграма АБІС (напрыклад у расійскіх бібліятэках АБИС ИРБИС, OPAC-Global). Спецыяльна напісаныя праграмы – модуль «Каляндар знамянальных дат» дае магчымасць групоўкі матэрыялаў па наступных тыпах знамянальных дат:

– персаналія;
– арганізацыя;
– мерапрыемства;
– геаграфічны аб’ект;
– тэма.

Тэхнічныя магчымасці, на якіх створаны сайт, дазваляюць выкарыстоўваць інтэрактыўныя і мультымедыйныя тэхналогіі, пераходзіць да электронных каталогаў і БД праз сістэму гіперспасылак, каб даведацца пра наяўнасць публікацыі ў бібліятэцы, забраніраваць выданне ці нават звярнуцца да яго поўнага тэксту. Календары як БД не толькі з’яўляюцца ўніверсальным па змесце сеткавым электронным рэсурсам пра рэгіён, але і дазваляюць ствараць самастойныя тэматычныя рэсурсы (калекцыі). БД – зручны рэсурс для выканання фактаграфічных і бібліяграфічных запытаў па накопленых датах (падзеях), яны скарачаюць час на выяўленне юбілейных дат, даступныя для карыстальнікаў праз сайты і сацыяльныя сеткі.

*Бібліяграфічная хроніка.* Віды хронік: агульная, калі адлюстроўваюцца падзеі за ўвесь гістарычны перыяд існавання краю (населенага пункта), за пэўны гістарычны перыяд, хроніка ўстановы, персанальная хроніка, хроніка падзеі. Выбіраюцца падзеі і факты, важныя для вывучэння гэтага рэгіёна ці населенага пункта (юбілейнасць дат не мае значэння, у адрозненне ад жанру календара). Аб’ектам адлюстравання могуць быць факты і падзеі любога паходжання, у т. л. тыя, якія не святкуюцца, але памяць пра іх важная для мясцовай гісторыі (даты вялікіх пажараў і інш.)

Рубрыкі (даты) у хроніцы групуюць у прамой паслядоўнасці. Для загалоўкаў выкарыстоўваюць дату і найменне падзеі ці факта. Пажадана ўказваць поўную дату (дні, месяцы, гады),



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часам да некаторых падзей вядомы нават гадзіны. Пасля загалоўка змяшчаюць фактаграфічную даведку або выкарыстоўваюць тэкст – фрагмент з дакументаў. Калі даведка створана бібліёграфам, важна ўключаць цытаты з твораў асоб, якія пакінулі след у гісторыі краю, вытрымкі з афіцыйных дакументаў, справаздач, мемуараў, літаратурна-мастацкіх твораў гістарычнай тэматыкі, якія «ажыўляюць» дату, ствараюць вобраз падзеі, што аказвае эмацыянальны ўплыў на чытача. Магчыма падабраць фрагмент тэксту ці з некалькіх тэкстаў, звязаўшы іх паміж сабою. Гэта могуць быць вытрымкі з рэдкіх крыніц, напрыклад кніг XIX ст., даступныя шырокаму колу чытачоў. Асобае значэнне мае цытаванне ўспамінаў, якія перадаюць непаўторнае ўспрыманне падзеі. У канцы даведкі прыводзяць спіс літаратуры. Пры недахопе крыніц па вузкіх пытаннях можна змяшчаць спісы літаратуры ў канцы асобных гістарычных адрэзкаў.

Матэрыялы асноўнай часткі ў бібліяграфічнай хроніцы групуюць у храналагічнай паслядоўнасці падзей.

*Папулярная краязнаўчая бібліяграфічная энцыклапедыя* прадстаўляе найбольш поўнае кола звестак пра рэгіён (прадмет ці чалавека), апрацаваных на папулярным узроўні. Асаблівасці краязнаўчай бібліяграфічнай энцыклапедыі наступныя:

– шырокі ахоп жыцця краю, яго гісторыі, гісторыка-культурных і гісторыка-літаратурных сюжэтаў і праблем;

– адлюстраванне тэкставых, фактаграфічных і бібліяграфічных матэрыялаў. Тэкставыя і фактаграфічныя матэрыялы размяшчаюць у пачатку раздзелаў і глаў;

– тэкст энцыклапедыі ўяўляе сабой звязанае паведамленне, створанае праз пераказ, цытаванне, рэкамендацыйнае анатаванне найважнейшых дакументаў розных відаў. Бібліёграф дае магчымасць карыстальніку пашырыць свае веды з дапамогай энцыклапедыі без звяртання да рэкамендаванай літаратуры, але на яе аснове. Спісы літаратуры ў канцы раздзелаў (структурных падраздзяленняў) не анатуюць, бо ў саміх тэкстах раздзелаў ідуць спасылкі на літаратуру.

Бібліяграфічная энцыклапедыя можа мець тэматычную структуру: выдзяляюць раздзелы па пэўнай тэматыцы, якія групуюць у лагічнай паслядоўнасці. Групоўка матэрыялу можа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быць і ў алфавітнай паслядоўнасці вызначаных для адлюстравання фактаў.

Асноўнымі элементамі даведачна-пошукавага апарату з'яўляюцца прадмова, уводзіны, дапаможныя паказальнікі (геаграфічны, персаналій і інш.). У афармленні друкаваных і электронных энцыклапедый шырока выкарыстоўваюць карты, фатаграфіі, рэпрадукцыі карцін.

*Бібліяграфічная анталогія* прысвячаецца паэтычным творам пра край або паэзіі аўтараў пэўнага рэгіёна (населенага пункта), таму адрасуецца найперш аматарам гэтага жанру мастацкай літаратуры. У анталогіі змяшчаюць вершы, фрагменты твораў, біяграфіі паэтаў, выказванні крытыкаў. Прынята адлюстроўваць вялікі перыяд часу. Па структуры бібліяграфічная анталогія складаецца з прадмовы, уводзінаў, асноўнага тэксту (у аснове якога могуць быць персаналіі ці назвы геаграфічных аб'ектаў краю ці падзеі), дапаможных паказальнікаў (геаграфічнага, персаналій і інш.) Склад даведачна-пошукавага апарату і афармленне краязнаўчых бібліяграфічных анталогій падобныя да энцыклапедый.

*Бібліяграфічны нарыс* прысвячаецца важнай гістарычнай з'яве, падзеі, лёсу канкрэтнага чалавека. Нарыс дапамагае поўна і ўсебакова пазнаёміцца з пэўнымі падзеямі мясцовага жыцця і самастойна асэнсаваць іх. Нарыс прадстаўляе сабой сукупнасць рэфератыўна выкладзеных розных матэрыялаў: крытычных артыкулаў, рэцэнзій, успамінаў, навуковых, навукова-папулярных прац, літаратурна-мастацкіх твораў. Уключаюцца творы аўтараў, што стаяць на розных ідэйных пазіцыях ці маюць розныя эстэтычныя, палітычныя ці іншыя погляды. Колькасць крыніц залежыць ад тэмы нарыса, але для яго стварэння трэба адабраць найбольш істотныя, пажадана 7–10 кніг, артыкулаў. Кожную крыніцу вывучаюць, вылучаюць з яе цытаты, факты, думкі, фрагменты. На іх падставе пішуць звязаны тэкставы пераказ, у якім згадваюцца выбраныя дакументы.

У нарысе галоўнае – паказаць шлях чытання, даць штуршок да разважання, развіцця думкі, погляду. На этапе вывучэння тэмы важна, каб у складальніка сфарміраваліся свае погляды на падзею, але ён не падводзіць вынікі дыскусій аб той ці іншай падзеі, аб прапанаванай тэме, не прапануе бясспрэчную ісціну. Кожны чытач можа пагадзіцца ці не пагадзіцца з вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

казанай думкай. Асноўная задача нарыса – абудзіць у чытача імкненне разабрацца ў матэрыяле, дапамагчы яму знайсці найбольш правільны, аб'ектыўны адказ на хвалюючыя пытанні.

Па *структуры* нарыс можа складацца з некалькіх частак.

*Прадмова* можа пачынацца роздумам па яго тэме ці цытатай з кнігі, успамінамі, гістарычнымі звесткамі.

*Асноўная частка* – звязаны пераказ адабраных матэрыялаў (агляд), у якім звесткі пра крыніцы спалучаюцца з роздумамі складальніка нарыса па тэме, ставяцца пытанні, праблемы, паказваюцца розныя погляды на іх, адказы, выказаныя ў кнігах і артыкулах, з указаннем канкрэтных старонак, цытаваннем пэўных матэрыялаў. Калі нарыс прысвечаны асобе, то неабходна пазнаёміцца з біяграфічнай, крытычнай, мемуарнай літаратурай, творамі асобы (калі чалавек пісаў). Апісваюцца ўмовы, абставіны жыцця грамадства, асобнага чалавека, што маюць дачыненне да асноўнага факта, падзеі і заканчваюцца роздумам аўтара пра іх.

Бібліяграфічнае апісанне кніг у тэксце нарыса не прыводзіцца, даюцца толькі спасылкі на аўтара, назвы кніг.

*Спіс літаратуры,* на аснове якога рыхтуецца бібліяграфічны нарыс, можа мець назву «Кнігі нарыса» ці інш. Пералік кніг без анатацый падаецца ў алфавітным парадку ці адпаведна з упамінаннем іх у тэксце.

*Універсальныя і комплексныя паказальнікі тыпу «Што чытаць аб краі»*. Гэтыя паказальнікі прысвячаюцца населеным пунктам ці адміністрацыйна-тэрытарыяльным аб'ектам, атрымліваюць розныя назвы («Край (горад, вёска) на гістарычных скрыжаваннях» і інш.). У гэтыя дапаможнікі ўключаецца папулярная, даведачная, мастацкая, даступная навуковая літаратура пераважна апошняга дзесяцігоддзя. Мэтазгодна ўключаць каштоўную літаратуру, выдадзеную значна раней, калі яна мае крыніцазнаўчае значэнне. Калі такія творы на замежных мовах, неабходна змясціць разгорнутыя анатацыі, цытаты; апісваюць таксама матэрыялы з архіваў. Больш абмежавана падыходзяць да ўключэння артыкулаў з часопісаў і газет.

Асноўная частка мае тэматычную групоўку (можа адаптавацца да «Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь»). Бібліяграфічныя запісы ў межах апошніх структурных дзялен-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няў групуюцца, як правіла, у лагічнай паслядоўнасці і туды ўключаюцца рэкамендацыйныя і даведачныя анатацыі. У асобных раздзелах, напрыклад персаналій, можа быць выкарыстана алфавітная ці храналагічная паслядоўнасць імёнаў знакамітых людзей краю.

Да гэтых паказальнікаў абавязковымі з'яўляюцца прадмова, дапаможныя геаграфічны, персанальны і іншыя паказальнікі.

*Буктрэйлеры* – прывабліваюць да чытання выдатных краязнаўчых кніг. Аб'ектам могуць быць як новыя выданні, так і тыя выдатныя творы, якія варта не забываць і прапагандаваць. Сама кніга, цытаты з яе, выяўленчыя матэрыялы, гукавое аснашчэнне надаюць буктрэйлеру рысы мастацкасці, што спрыяе іх распаўсюджанню ў інтэрнэце.

*Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паведамленні аб новых выданнях,* прысвечаных краю, ствараюцца многімі бібліятэкамі. Усё часцей прадстаўляюцца анлайн на сайтах бібліятэк. Могуць адлюстроўваць асобную кнігу ці некалькі выданняў, змяшчаюць фатаграфію вокладкі і рэкамендацыйную анатацыю. Такія яркія і простыя элементы прыцягваюць увагу карыстальнікаў. Пажадана спасылка на электронны каталог, каб магчыма было заказаць выданне і атрымаць іншыя паслугі. Прывабным з'яўляецца вопыт Дзяржаўнай універсальнай навуковай бібліятэкі Краснаярскага краю, якая ў краязнаўчым раздзеле прэзентуе новыя мясцовыя выданні, якія магчыма не толькі забраніраваць, заказаць электронную копію, раздрукаваць (згодна з дзеючымі нарматывамі), але таксама падзяліцца з сябрамі ў «Фэйсбуку» і іншых сацыяльных сетках, што пашырае поле рэкамендацыйнай бібліякамунікацыі.

### ***Метадычныя асаблівасці асобных жанраў навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў***

Навукова-дапаможныя краязнаўчыя дапаможнікі адрасаваны спецыялістам, даследчыкам, кіраўнікам, студэнтам старэйшых курсаў УВА, чые прафесійныя і навуковыя інтарэсы непасрэдна звязаны з канкрэтнай мясцовасцю. У большасці гэтых выданняў выкарыстоўваецца адбор дакументаў, заснаваны на ацэнцы наяўнасці важных звестак, арыгінальных трактовак матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод навукова-дапаможных паказальнікаў доўгі час стабільнасцю вызначаліся ўніверсальныя бягучыя тыпу «Новая літаратура аб вобласці (раёне, горадзе)». Яны прызначаны для аператыўнага інфармавання пра з’яўленне новых дакументаў і мадэлююць краязнаўчыя дакументныя патокі за невялікія адрэзкі часу – квартал, паўгоддзе. Змяшчаюць бібліяграфічныя запісы на кнігі, фрагменты кніг, артыкулы з мясцовага і цэнтральнага друку, фотадакументы, ілюстрацыі, картаграфічныя матэрыялы. Не адлюстроўваюцца, на жаль, відэастужкі, гуказапісы, дакументы на замежных мовах, прысвечаныя тэрыторыі.

Адметнасць паказальнікаў – шырокае адлюстраванне *артыкулаў з мясцовага перыядычнага друку*. У сучасным дакументным краязнаўчым патоку такія матэрыялы займаюць да 90 %, і гэта асаблівасць цалкам мадэлюецца ў паказальніках новай літаратуры. Пры адборы газетных матэрыялаў неабходна аддаваць перавагу новым фактам і з’явам у жыцці краю, напрыклад новым установам, тэхналогіям, формам гаспадарання, адукацыйным і сацыяльным рэформам, навуковым дасягненням, мясцовым вынаходніцтвам, а таксама матэрыялам краязнаўчых даследаванняў. У іх падаюцца малавядомыя факты і падзеі, па-новаму пераасэнсоўваюцца вядомыя эпізоды жыцця рэгіёна. Пераважна адлюстроўваюцца такія газетныя жанры, як аналітычныя і інфармацыйныя карэспандэнцыі, рэпартажы, справаздачы, тэматычныя і агульныя агляды; навуковыя артыкулы, артыкулы-расследаванні, дакументальныя, партрэтныя і іншыя нарысы.

У складзе бібліяграфічных запісаў пераважаюць аналітычныя. Шырока ўжываюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Для размеркавання матэрыялу ў паказальніках выкарыстоўваюцца сістэматычныя групоўкі.

У паказальніках змяшчаюць кароткія прадмовы, у якіх характарызуюць мэтавае і чытацкае прызначэнне, аб’екты ўліку, склад даведачна-метадычнага апарату. Іх пошукавыя магчымасці пашыраюцца праз сістэмы спасылак і дапаможныя паказальнікі. Да іх складаюць імянныя, персаналій, геаграфічныя паказальнікі; спісы перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх былі адлюстраваны ў паказальніках.

У апошнія гады выпуск універсальных бягучых краязнаўчых паказальнікаў прыпыняецца, асабліва ў АУБ. Прычыны розныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– недахоп сродкаў, меркаванні пра замену гэтых паказальнікаў на базу даных краязнаўчай літаратуры. Аднак практыка выкарыстання паказвае, што ў паказальніках бібліяграфічныя масівы былі якасна і дэталёва арганізаваны, адсутнічае «інфармацыйны шум», уласцівы пошуку ў вышэйназваных БД. Таму масівы ўніверсальных бягучых паказальнікаў за ўвесь перыяд іх выпуску важна адлюстраваць у выглядзе электроннага рэсурсу бібліятэкі.

Шырока распаўсюджана падрыхтоўка ў бібліятэках *аглядаў* краязнаўчых дакументаў. Гэта *бібліяграфічныя* агляды, створаныя ў выніку дакументаграфічнага аналізу крыніц, а таксама *рэфератыўныя* і *аналітычныя*, што рыхтуюцца на аснове іх фактаграфічнага аналізу.

Бібліяграфічныя агляды арыентуюць спажыўцоў інфармацыі ў дакументных патоках у межах абранай тэматыкі. Рэфератыўныя і аналітычныя агляды ствараюцца шляхам аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі сукупнасці дакументаў па пэўных пытаннях (праблемах, кірунках) і змяшчаюць сістэматызаваныя, абагульненыя і крытычна ацэненыя звесткі.

Для задавальнення прафесійных і навукова-даследчых інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў найчасцей рыхтуюцца *бібліяграфічныя агляды:* 1) новых краязнаўчых дакументаў; 2) крыніцазнаўчыя агляды, у якіх апісаны характар, прызначэнне і тэматыка твораў па пэўнай праблематыцы; 3) краязнаўчых інфармацыйных выданняў; 4) тэматычныя, прысвечаныя гістарычным падзеям і датам, напрыклад экалогіі краю, эканамічным пытанням; 5) персанальныя.

Асноўнымі часткамі бібліяграфічнага агляду з'яўляюцца прадмова, асноўны тэкст, спіс крыніц.

Пры падрыхтоўцы *рэфератыўных аглядаў* важна раскрыць актуальныя тэмы, дастаткова поўна зарыентаваць карыстальнікаў у сукупнасці фактаў, звестак пра падзеі, у падыходах да іх трактоўкі незалежна ад таго, па якіх дакументах яны выяўлены. Іншая інфармацыя, што можа быць змешчана ў вывучаных крыніцах, але не закранае тэмы агляду, не асвятляецца. Бібліяграфічныя звесткі прадстаўлены ў рэфератыўным аглядзе спісам літаратуры і спасылкамі, цытаваннем.

*Аналітычны агляд* – вынік не толькі фактаграфічнага аналізу першасных дакументаў, але і канцэптаграфічнага аналізу адлю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страваных фактаў, падзей, ідэй. Гэта значыць, што пры стварэнні гэтага віду агляду ажыццяўляецца інфармацыйнае згортванне і разгортванне.

Аналітычныя агляды ў залежнасці ад функцыі, якую яны выконваюць, падзяляюцца на:

1) агляды-абгрунтаванні, у якіх ацэньваецца неабходнасць вырашэння праблемы і прапануюцца для гэтага шляхі і метады. Напрыклад, тэма агляду «Кансервацыя Крэўскага замка» патрабуе абаснавання не толькі гістарычнай і культурнай значнасці аб’екта, яго турыстычнага значэння, але і плана рэалізацыі кансервацыі. Агляды-абгрунтаванні могуць быць адрасаваны мясцоваму кіраўніцтву;

2) выніковыя агляды сумяшчаюць ацэнку пытання з характарыстыкай дасягнутага ўзроўню, а таксама паказваюць актуальныя праблемы. Такія агляды фіксуюць пэўны этап даследавання ці стану аб’екта, засяроджваюць увагу на нявырашаных праблемах;

3) прагнастычныя агляды. У іх даецца ацэнка стану і вызначаюцца перспектыўныя шляхі павелічэння краязнаўчых пошукаў, напрамкаў сучаснага развіцця рэгіёнаў. Арыентаваны на перспектыўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў, могуць быць адрасаваны плануючым мясцовым органам і выконваюць ролю элементаў праграм рэгіянальнага развіцця.

Структура рэфератыўнага і аналітычнага аглядаў:

1) уводзіны – абгрунтаванне агляду, чытацкае прызначэнне, храналагічныя і іншыя межы адлюстравання дакументаў;

2) асноўная тэкставая частка;

3) заключэнне (вывады);

4) спіс літаратуры, прадметны і імянны паказальнік, змест і анатацыя.

Падрыхтоўка рэфератыўных і аналітычных аглядаў адбываецца згодна з адпаведнай методыкай, але варта падкрэсліць асобныя моманты. Пры распрацоўцы тэматычнага плана (зместу, задання) для складання рэфератыўнага ці аналітычнага агляду неабходна вылучыць геаграфічныя, храналагічныя, відавыя, моўныя і семантычныя межы адбору дакументных крыніц інфармацыі. Семантычныя межы – гэта пералік тэрмінаў (ключавых слоў), што раскрываюць сэнсавае значэнне тэмы агляду і вызначаюць склад асноўных пытанняў, якія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трэба разглядзець. У якасці ключавых слоў могуць быць выкарыстаны назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, за выключэннем дзеясловаў, дзеепрыметнікаў і некаторых інш. Ужываюцца словазлучэнні тыпу *назоўнік + назоўнік* (гісторыя фальварка), *прыметнік + назоўнік* (рэгіянальная лексіка), словазлучэнні, якія ўключаюць уласныя імёны, тытулы, пасады (князь Геранім Любамірскі). Для выканання семантычнага аналізу карыснымі будуць выданні, якія змяшчаюць адпаведныя паняцці (слоўнікі, даведнікі і інш.), аўтарытэтныя запісы на асобныя энтытэты з нацыянальнай базы даных аўтарытэтных запісаў (НБДАЗ). Створаны рубрыкатар агляду – гэта сістэматызаваная сукупнасць ключавых слоў, якія характарызуюць яго змест з указаннем класіфікацыйных індэксаў і назваў тэматычных рубрык, да якіх яны адносяцца. Рубрыкатар у значнай ступені акрэслівае лагічную пабудову агляду і паўнату адлюстравання ў ім асобных пытанняў, сувязь тэмы агляду з іншымі галінамі ведаў. Вызначаныя тэрміны выкарыстоўваюцца для пошуку адпаведных дакументаў, які вядзецца па розных крыніцах (краязнаўчых каталогах, БД, краязнаўчых і беларусазнаўчых бібліяграфічных дапаможніках). Для вышэйназваных аглядаў важна лагічна і паслядоўна раскрываць тэму.

Тэматыка галіновых і тэматычных бібліяграфічных паказальнікаў непасрэдна звязана з сучаснымі кірункамі рэгіёназнаўчых даследаванняў, з задачамі эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця асобных тэрыторый. У Беларусі ў апошнія дзесяцігоддзі істотна знізілася падрыхтоўка краязнаўчых галіновых бібліяграфічных дапаможнікаў, што тлумачыцца шырокай даступнасцю ўніверсальных бібліяграфічных БД, якія прадстаўляюць усе галіны краязнаўства. Трэба адзначыць, што асобныя бібліятэкі, як Магілёўская АБ, выпусцілі паказальнікі па многіх галінах краязнаўства. Тэматычныя бібліяграфічныя дапаможнікі звязваюцца з актуальнай гістарычнай і сучаснай праблематыкай. Змест галіновых паказальнікаў фарміруецца на аснове вывучэння тэматыкі дакументнага масіву і з улікам структуры галіны краязнаўства. Для тэматычных паказальнікаў змест фарміруецца на аснове створанага паняційнага рубрыкатара.

Крытэрыі адбору павінны забяспечыць дастатковую паўнату адлюстравання дакументаў, але адмежаваць уключэнне мала-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфарматыўных, нязначных і папулярных матэрыялаў. Важна забяспечыць поўнае адлюстраванне нарматыўных дакументаў, гістарычных першакрыніц, мемуараў, бібліяграфічных дапаможнікаў, навуковых публікацый. Не меншае значэнне мае ўключэнне замежнамоўных дакументаў. У галіновых краязнаўчых дапаможніках адбор дакументаў можа пачынацца са з'яўлення першых публікацый або з устаноўленай храналагічнай мяжы.

Бібліяграфічныя запісы ў краязнаўчых навукова-дапаможных паказальніках пры неабходнасці анатуюцца, для чаго выкарыстоўваюцца пераважна даведачныя анатацыі.

Групоўка бібліяграфічных запісаў у апошніх структурных дзяленнях, як правіла, алфавітная.

Неабходнымі складнікамі дапаможнікаў з'яўляюцца ўводзіны, у якіх аналізуюцца развіццё галіны і яе дакументальнае забеспячэнне, сістэма дапаможных паказальнікаў.

*Персанальныя/біябібліяграфічныя дапаможнікі.* Біяграфічнае вывучэнне і вывучэнне ўнёску асобы ў навуку, грамадскую практыку з'яўляюцца спосабам атрымання новых краязнаўчых ведаў. Дыяпазон краязнаўчых навукова-дапаможных персанальных (біябібліяграфічных) дапаможнікаў па тыпах і тэматыцы дастаткова шырокі. Гэта паказальнікі, спісы, агляды, даведнікі, біябібліяграфічныя слоўнікі. Прысвячаюцца яны адной асобе ці групе ўраджэнцаў/дзеячаў краю, напрыклад, гістарычным, грамадска-палітычным і ваенным дзеячам, прадстаўнікам навукі, асветы, мастацтва.

Асноўнымі структурнымі элементамі персанальных дапаможнікаў з'яўляюцца прадмова, уводзіны, біяграфічная даведка (або аўтабіяграфія ці хроніка), спіс літаратуры, які складаецца са спісаў літаратуры пра асобу, спіса твораў асобы, калі такія існуюць, дапаможныя паказальнікі. У біябібліяграфічных дапаможніках асноўны тэкст складаецца з персанальных глаў, а іх групоўка можа быць здзейснена па алфавіце, у храналагічнай паслядоўнасці, па відах дзейнасці.

Загалоўкам кожнай персанальнай главы з'яўляецца поўнае імя дзеяча. Гэтым элементам загаловак можа быць абмежаваны, але нярэдка яго пашыраюць, уключаючы псеўданімы, мянушкі. Прыводзяцца даты жыцця, часам указваюцца род дзей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці, прафесія. Недапушчальна ў загалоўку (а гэта рубрыка персанальнай главы) указваць толькі ініцыялы асобы.

У сучасных персанальных бібліяграфічных дапаможніках адбор імён ажыццяўляецца па наступных прынцыпах:

– ураджэнцы краю (у неабходных выпадках з улікам гістарычных змяненняў адміністрацыйна-тэрытарыяльных межаў);

– асобы, пэўныя перыяды жыцця якіх прайшлі ў гэтым краі;

– асобы, якія прызнаюць, што гэты край аказаў уплыў на іх жыццё і дзейнасць;

– дзеячы, наведванне якімі населенага пункта ці рэгіёна аказала прыметны ўплыў на яго развіццё.

Пошук імён вядзецца па краязнаўчых каталогах, картатэках знакамітых людзей краю, фактаграфічных БД, даведачных выданнях, мясцовых перыядычных выданнях і іншых крыніцах.

Вельмі важным структурным элементам з'яўляюцца біяграфічныя звесткі. Яны набываюць у дапаможніках розныя формы: ад кароткіх біяграфічных даведак да разгорнутых біяграфічных артыкулаў. Іх пішуць па распрацаваным плане. Не пажадана без апрацоўкі выкарыстоўваць даведкі з энцыклапедычных і іншых выданняў, паколькі ў дапаможніку атрымліваецца кангламерат даведак розных па структуры, а сувязь «чалавек – край» не знаходзіць адлюстравання. Часам біяграфічныя даведкі, падрыхтаваныя бібліёграфамі па цяжкадаступных матэрыялах, па драбніцах, становяцца амаль адзінай даступнай крыніцай.

Бібліяграфічныя апісанні ў персанальных дапаможніках, як правіла, не анатуюцца. Такая методыка апраўдана тады, калі біяграфічныя даведкі насычаны звесткамі, раскрыта сувязь «чалавек – край», а ў спісах літаратуры прадстаўлены творы, змест якіх дубліруецца (напрыклад юбілейнага характару), спецыфічныя дакументы (каталогі выстаў мастакоў). Калі ж біяграфічныя даведкі мінімальныя, а спісы літаратуры аб'ёмныя, то неабходна анатаваць хаця б найважнейшыя публікацыі.

У персанальных дапаможніках нярэдка прысутнічае метадычны недахоп: у біяграфічных даведках складальнікі імкнуцца раскрыць значэнне дзеяча для Беларусі ці свету, але выпускаюць такі аспект, як роля чалавека ў жыцці краю, ці ўплыў краю на чалавека, адлюстраванне сувязяў чалавека з яго малой радзімай; уплыў сям'і, блізкіх людзей, якія жылі разам з ім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у дадзенай мясцовасці, на жыццёвы і творчы лёс дзеяча. Зразумела, раскрыць сувязі чалавека з краем бывае вельмі няпроста, асабліва калі яна мала адлюстравана ў біяграфічнай літаратуры. Аднак чым менш звестак, тым больш глыбока неабходна вывучаць крыніцы, звязаныя з дзеячам, бо менавіта аспект сувязі «чалавек – край» з'яўляецца найбольш каштоўным у плане рэалізацый функцыянальнага патэнцыялу персанальнай краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі.

Пры адборы літаратуры пра дзеячаў, сувязь якіх з краем была эпізодам іх жыцця, непажадана поўна адлюстроўваць усе творы гэтых людзей, тэксты, ніякім чынам не звязаныя з гэтым краем (калі асобы з'яўляюцца аўтарамі).

**Фактаграфічная інфармацыйная прадукцыя**

Інтэнсіўна ўзрастае ў бібліятэках роля фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі. Гэта тэндэнцыя адпавядае спецыфіцы самога краязнаўства, скіраванага на пошук падзей, звестак. Да папулярных аб'ектаў адлюстравання адносяцца: падзеі, даты, гістарычныя перыяды, геаграфічныя назвы і распалажэнне аб'ектаў, персаналіі, арганізацыі, установы, прадпрыемствы, статыстычныя даныя, адрасныя (кантактныя) звесткі, паказчыкі, лічбы, рэквізіты, тэрміны, абрэвіятуры, геральдычныя сімвалы і інш. У аснове фактаграфічнай прадукцыі – стварэнне фактаграфічнага запісу (ФЗ) на любы характарызаваны аб'ект. Фактаграфічны запіс уяўляе сабой апісанне/даведку – набор звестак, якія дазваляюць даць характарыстыку пэўнага аб'екта.

Фактаграфічныя запісы ствараюцца з рознай колькасці даных ці некалькіх звестак і маюць некалькі структурных узроўняў (відаў):

1) аднаўзроўневы – прадстаўляе толькі ўніфікаваныя фактаграфічныя апісанні падзей, асоб, устаноў і іншых даных.

2) двухузроўневы – фактаграфічныя апісанні дапаўняюцца бібліяграфічнымі апісаннямі. Фактаграфічныя звесткі размяшчаюцца першымі, а БЗ указваюцца як крыніцы звестак.

3) трохузроўневы, ці шматузроўневы – фактаграфічныя і бібліяграфічныя апісанні дапаўняюцца тэкставымі матэрыяламі (вершамі, урыўкамі з прозы, тэкстамі гістарычных першакрыніц, выяўленчымі матэрыяламі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усе гэтыя віды ФЗ маюць месца ў шматлікай краязнаўчай фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі айчынных і замежных бібліятэк.

Фактаграфічныя рэсурсы бібліятэк прадстаўлены бягучымі навінамі пра падзеі, даведкамі пра край/бібліятэку, даведнікамі, літаратурнымі картамі. Многія з іх рэалізуюцца як базы даных.

*Бягучыя навіны аб падзеях у краі і бібліятэцы.* У бібліятэках пашыраецца асвятленне фактаграфічнай інфармацыі аб падзеях у краі і ў саміх бібліятэках. Бібліятэчныя тэхналогіі дазваляюць прадстаўляць навіны для карыстальнікаў праз RSS-стужкі[40], а таксама выкарыстоўваць знешнія Newswires[41] для выканання іх запытаў (у буйных бібліятэках).

Навіны прысвячаюцца значным грамадскім, эканамічным і сацыяльна-культурным падзеям у краі, а таксама правядзенню масавых мерапрыемстваў у бібліятэцы, новым паступленням краязнаўчых выданняў, удзелу бібліятэкі ў новых праектах. Падрыхтоўка тэксту навіны нагадвае анатаванне дакументаў. Ён павінен адпавядаць патрабаванням актуальнасці паведамлення, аператыўнасці і лаканічнасці. Крыніцамі інфармацыі для стварэння навіны з'яўляюцца: перыядычны друк, навіны ў Сетцы, сайты ўстаноў і арганізацый рэгіёна і інш. Выходныя стужкі ствараюць інфармацыйныя агенцтвы, сярод іх у Беларусі БелаПАН, БелТА, TUT.BY, «Минск–новости». Пры пошуку актуальнай інфармацыі ў Сетцы бібліёграф адзначае для сябе найбольш карысныя рэсурсы і дадае іх у закладкі. Ён можа адбіраць профільныя паведамленні, сістэматызаваць іх па тэматыцы, рэдагаваць. Тэкст асобнага паведамлення ўключае загаловак, дату і дакладны час публікацыі навіны, кароткую анатацыю зместу, а таксама прымацаваныя медыяфайлы. Да асноўнага тэксту навіны магчыма перайсці, націснуўшы загаловак, які з'яўляецца гіперспасылкай. Стужка змяшчае не больш за 10–20 паведамленняў. Тэксты асобных паведамленняў групуюцца ў храналагічнай паслядоўнасці.

*Даведкі аб краі.* Фактаграфічныя даведкі аб краі прэзентуюць тэрыторыю, населеныя пункты. Для іх адбіраюцца звесткі,

[40] RSS (Really Simple Syndication) – стандарт для экспарту стужак навін.

[41] Newswires – машыначытальны масіў тэкстаў паведамленняў навін, якія прадстаўляюцца ў храналагічнай паслядоўнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія паведамляюць пра першыя вядомыя факты пра тэрыторыю (населены пункт), знакавыя падзеі і даты далейшага развіцця, адміністрацыйна-тэрытарыяльную, гаспадарчую прыналежнасць і статус, выдатных ураджэнцаў і дзеячаў, культурныя дасягненні, сучасны стан. Даведка пра рэгіён можа ўтрымліваць агульны раздзел і некалькі галіновых раздзелаў: гісторыя, эканоміка, культура, турызм і інш.

Тэкст даведкі можа быць кампактным ці пашыраным. Асобныя бібліятэкі дэталізуюць пашыраныя даведкі да біяграфічных звестак аб славутых асобах, назвах вуліц у аграгарадку (вёсцы) і да т. п. Уключаюць ілюстрацыйныя матэрыялы і гіперспасылкі.

*Даведнікі.* Практычна ўсе бібліятэкі, якія прымяняюць камп'ютарныя тэхналогіі, ствараюць БД, мультымедыйныя рэсурсы, друкаваныя дапаможнікі, прысвечаныя знакамітым землякам. Фактаграфічныя даведнікі характарызуюцца тэматычнай разнастайнасцю, прэваліраваннем фактаграфічнай інфармацыі, якая можа спалучацца з бібліяграфічнай, выяўленчай і інш. Частка фактаграфічных даведнікаў не змяшчае бібліяграфічных матэрыялаў, на жаль, нават на выкарыстаныя крыніцы.

Значная колькасць фактаграфічных даведнікаў прысвечана *знакамітым землякам*. Па тэматыцы і методыцы набліжаецца да падрыхтоўкі бібліяграфічных персанальных (біябібліяграфічных) дапаможнікаў. Прадстаўляе вучоных, супрацоўнікаў навуковых і навучальных устаноў, дзеячаў літаратуры і мастацтва. Выдатны даведнік «Землякі»[42], падрыхтаваны Светлагорскай ЦРБ, ахапіў звесткі, выяўленыя не толькі па апублікаваных крыніцах, але і па перапісцы з прыватнымі асобамі з архіваў і аддзелаў кадраў прадпрыемстваў і ўстаноў горада.

У аснове любога персанальнага фактаграфічнага прадукту – даведка або артыкул, якія змяшчаюць асноўныя біяграфічныя звесткі і з'яўляюцца асноўным элементам фактаграфічнага запісу любога ўзроўню. Фактаграфічныя даведкі аб персонах характарызуюцца варыятыўнасцю – г. зн. яны могуць быць як зусім кароткімі, сціслымі, уключаць мінімум звестак: імя, даты жыцця, род дзейнасці. У залежнасці ад мэты і задач, змест

[42] Земляки. История Светлогорска в лицах : биогр. словарь ; сост. Г. И. Захаренко. – Мозырь : Калор, 2001. – 152 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даведкі можа быць пашыраны. Абавязковым патрабаваннем з'яўляецца вызначэнне мадэлі даведкі/артыкула – г. зн. пераліку істотных прымет, якія трэба адлюстраваць у фактаграфічным запісе. Адступленне ад макету паніжае якасць рэсурсу.

Максімальна фармалізуецца адлюстраванне персанальных даных пры стварэнні БД. Эфектыўным інструментам збору звестак пра асоб, дзейнасць якіх ажыццяўляецца ў сучаснасці, з'яўляецца іх персанальнае анкетаванне, паводле якога будзе створана БД.

У аснове БД персаналій знаходзяцца наступныя звесткі:

– амаль нязменныя, або статычныя (дата нараджэння, пасады, асноўныя біяграфічныя звесткі);

– дынамічныя, якія змяняюцца (аб званнях, аб атрыманні вучоных ступеняў, узнагародах).

Сабраную інфармацыю падзяляюць на тры групы:

– біяграфічныя (даты жыцця, навучанне, праца, сямейнае становішча, узнагароды);

– даты розных падзей у жыцці чалавека;

– бібліяграфічныя даныя.

Праграмы персанальных БД дазваляюць ствараць некалькі падбаз, прадстаўляць АВ-матэрыялы, выкарыстоўваць гіперспасылкі.

Для фактаграфічных дапаможнікаў, зробленых публічнымі бібліятэкамі, уласціва менш жорсткая структураванасць тэксту, як правіла, яны напісаны ў папулярным стылі. Друкаваныя персанальныя фактаграфічныя рэсурсы структурна нагадваюць персанальныя (біябібліяграфічныя) бібліяграфічныя дапаможнікі.

Акрамя самастойных рэсурсаў краязнаўчая фактаграфічная інфармацыя прадстаўляецца ў многіх іншых БД (тэматычных, камбінаваных і інш.), напрыклад, «Край мой, Магілёўшчына», «Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць».

Распаўсюджана падрыхтоўка даведнікаў па актуальных тэмах: падзеі Вялікай Айчыннай вайны, рэгіянальная тапаніміка, турызм, эканоміка, прырода і экалогія, мастацтва, помнікі гісторыі і архітэктуры. Многія з іх выконваюцца ў жанры *відэагіда* – вялікі аб'ём візуальнай інфармацыі спадарожнічае звесткам пра ахарактарызаваныя аб'екты і з'явы. Бібліяграфічнае аснашчэнне дае магчымасць паглыбіцца ў тэматыку рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратурная карта.* Літаратурныя карты атрымалі вельмі шырокае распаўсюджанне ў расійскіх бібліятэках і выклікаюць значны інтарэс у айчынных вытворцаў краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў. Аднак стварэнне гэтых рэсурсаў яшчэ знаходзіцца на пачатковым узроўні.

Мэта літаратурнай карты – найбольш поўнае адлюстраванне жыцця і творчасці пісьменнікаў вобласці, раёна, горада, а таксама літаратурнага працэсу ў межах выбранай тэрыторыі. Адрасаваны шырокім колам аматараў мастацкай літаратуры, спецыялістам і даследчыкам у галіне мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, студэнтам, выкладчыкам, краязнаўцам, літаратурным арганізацыям.

Найлепшая рэалізацыя літаратурнай карты – база даных.

На галоўных старонках размяшчаюць інтэрактыўныя карты абласцей/раёнаў. Нанесеныя геаграфічныя аб'екты з'яўляюцца пунктамі ўваходу да азнаямлення з лакальнымі літаратурнымі падзеямі.

На галоўных старонках прадстаўлены раздзелы: літаратурныя альманахі, часопісы; літаратурныя прэміі, конкурсы, узнагароды; літаратурныя аб'яднанні; літаратурныя святы; літаратурныя чытанні, чытальная зала, а таксама паказальнікі: персаналіі, памятных мясцін, геаграфічны. Розным колерам адзначаны раздзелы, рубрыкі, асобныя аб'екты, на якія створаны фактаграфічныя запісы (ФЗ) і на тыя, якія яшчэ не напоўнены звесткамі.

Аб'ектамі адлюстравання з'яўляюцца:

– сам рэгіён і асобныя населеныя пункты, звязаныя з літаратурным працэсам;

– дзеячы літаратуры: пісьменнікі, літаратурныя крытыкі, літаратуразнаўцы, арганізатары (рэдактары, выдаўцы) літаратурна-мастацкіх выданняў, літаратурных прэмій, кіраўнікі літаратурных арганізацый і іншыя асобы;

– помнікі, якія ўвасобілі памяць пра выдатныя літаратурныя з'явы;

– літаратурныя творы.

У літаратурных картах выкарыстоўваюцца шматузроўневыя фактаграфічныя запісы.

Аб раёнах даюцца агульныя гістарычныя звесткі: дата ўтварэння раёна, колькасць насельніцтва, плошча, галіны эканомікі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на сучасны момант. Прыведзены імёны дзеячаў літаратуры, звязаных з раёнам. У якасці ілюстрацыі ў даведцы паказаны герб раёна.

Пасля даведкі пра раён даецца пералік населеных пунктаў, дзе адбываліся літаратурныя з’явы. Пераход на назвы гэтых аб’ектаў адкрывае фактаграфічныя запісы пра іх. У даведцы прыводзяць звесткі пра тып кожнага пасялення і яго назвы сёння і ў мінулым, развіццё ў гістарычным ракурсе. Характарыстыка самога пасялення даецца пераважна па стане на час, звязаны з асобай пісьменніка ці з іншай літаратурнай з’явай. Заключаюць даведку бібліяграфічным спісам, які можа быць анатаваным. У даведачных анатацыях мэтазгодна адзначыць выкарыстанне архіўных дакументаў. Гіперспасылкі дазваляюць карыстальніку паглыбляць веды пра персон і іншыя адлюстраваныя з’явы.

Паказальнік персаналій, ці імянны, утрымлівае пералік імён дзеячаў літаратуры. Па спасылцы ёсць пераход да разгорнутай біяграфічнай даведкі ды іншых узгаданых у ёй аб’ектаў, у т. л. да тэкстаў твораў пісьменнікаў ці іх урыўкаў. Акцэнт у біяграфічнай даведцы робіцца на характарыстыцы творчай дзейнасці. Прыводзяцца бібліяграфічныя спісы, якія дазваляюць пазнаёміцца з публікацыямі пра пісьменнікаў.

Геаграфічны паказальнік змяшчае пералік назваў населеных пунктаў рэгіёна, пераход па спасылцы прадстаўляе фактаграфічныя даведкі аб кожным з іх, з указаннем імён дзеячаў літаратуры. Імянны і геаграфічны паказальнікі ўзаемазвязаны гіперспасылкамі.

Літаратурная карта пастаянна папаўняецца даведачнай інфармацыяй, фотаматэрыяламі, бібліяграфічнымі звесткамі і інш. Вельмі добра, калі рэсурс забяспечвае зручны пошук, у т. л. і па вольнай камбінацыі ключавых слоў.

Для афармлення карты патрэбны ўступ, дзе будзе раскрыта прызначэнне рэсурсу, яго метадычныя асаблівасці: характарыстыка асноўных раздзелаў, групоўка і апісанне біяграфічных даведак, звесткі пра кансультантаў праекта і распрацоўшчыкаў, сродкі, за якія ён рэалізаваны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні і заданні да тэмы 3.6

1. Ахарактарызуйце метадычныя асаблівасці асноўных тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

2. Параўнайце мэтавае і карыстальніцкае прызначэнне рэкамендацыйных і навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

3. Апішыце методыку асобных жанраў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў.

4. Акрэсліце метадычныя асаблівасці асобных жанраў навукова-дапаможных бібліяграфічных дапаможнікаў.

5. Раскрыйце спецыфіку фактаграфічнага запісу.

6. Якія жанры краязнаўчай фактаграфічнай прадукцыі цяпер атрымалі распаўсюджанне ў бібліятэках?

7. Суаднясіце метадычныя характарыстыкі, змешчаныя ў тэме 3.6, з методыкай рэальных бібліяграфічных і фактаграфічных рэсурсаў, выяўленых пры выкананні практычных работ.

## 3.7. Краязнаўчая інфармацыя на вэб-сайтах бібліятэк

Краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы адкрытыя і агульна даступныя. Прамоцыя краязнаўчай інфармацыі сістэматычна ажыццяўляецца праз сайты/парталы бібліятэк, а ў некаторых бібліятэках – праз спецыяльныя краязнаўчыя сайты/парталы. Самастойныя краязнаўчыя сайты/парталы часта робяць бібліятэкі ЗША, Канады, Францыі, Расіі і іншых краін. Нярэдка навуковыя і публічныя бібліятэкі ствараюць некалькі краязнаўчых сайтаў для забеспячэння даступнасці да багатых інфармацыйных рэсурсаў. Кантэнт добра структураваны і лагічна ўзаемазвязаны. Прыкладам можа быць партал «Даведачная служба Аддзела краязнаўства і генеалогіі» Бібліятэкі Кангрэса[43]. Гэта тэндэнцыя прасочваецца ў многіх бібліятэках Расіі. Напрыклад, партал «Весь Алтай» Алтайскай краявой універсальнай навуковай бібліятэкі адкрывае доступ да электронных краязнаўчых рэсурсаў, у т. л. электроннай бібліятэкі, віртуальнай даведкі, шматлікіх фактаграфічных, фундаментальных бібліяграфічных

[43] Local History & Genealogy Reference Services [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.loc.gov/rr/genealogy/. – Date of access: 22.08.2019.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графічных і іншых матэрыялаў. Такім чынам, назіраецца тэндэнцыя пераўтварэння сайтаў у каштоўныя краязнаўчыя рэсурсы з фондамі электронных копій дакументаў (ЭКД), сваім пошукавым апаратам і даведачнай службай.

У беларускіх бібліятэках самастойных краязнаўчых сайтаў яшчэ не шмат, напрыклад сайт «Краязнаўства Берасцейшчыны» ў Брэсцкай АБ.

Цікавы і рэдкі ўзор краязнаўчага партала «Мозырский край» прапануе Мозырская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма. Праз інтэрактыўную карту наведвальнікі могуць шукаць па любым населеным пункце раёна і атрымліваць фактаграфічную інфармацыю па гісторыі і сучаснасці, пра людзей краю. Аднак доступ да партала пажадана ўдасканаліць і звязаць з раздзелам «Краязнаўства».

Прадстаўленне калекцый электронных дакументаў і работа па стварэнні ЭКД у нашай краіне асвятлялася ў тэме 3.4. Электронныя краязнаўчыя калекцыі і бібліятэкі.

У большасці айчынных бібліятэк на галоўных старонках сайтаў ёсць раздзелы «Краязнаўства». Яны ўтрымліваюць значную частку КІР, створаных бібліятэкамі: БД, фактаграфічных ІР, паўнатэкставыя бібліяграфічныя матэрыялы. Напрыклад, на сайце Глыбоцкай ЦБС у раздзеле краязнаўства прадстаўлены БД «Глыбоччына», «Глыбачане», «Воіны-інтэрнацыяналісты», «Помнікі Вялікай Айчыннай вайны».

Наяўнасць самастойнага краязнаўчага раздзела – лепшы ўзор для прадстаўлення краязнаўчага кантэнту. Пакуль, на жаль, нярэдка з раздзела «Краязнаўства» магчыма вярнуцца толькі на галоўную старонку сайта, не хапае звязанасці рэсурсаў, навігатараў па адкрытых знешніх рэсурсах, важных для атрымання інфармацыі аб краі.

У асобных бібліятэках краязнаўчых раздзелаў няма, і адпаведная інфармацыя размяркоўваецца па іншых згодна са зместам. Яна прадстаўлена ў раздзелах «Інфармацыйныя рэсурсы», «Нашы выданні», «Аб нас» (звесткі па гісторыі бібліятэк і сучаснай структуры бібліятэчнай справы ў рэгіёне), «Чытачам». Але рассеянасць краязнаўчых рэсурсаў перашкаджае наведвальнікам сайтаў іх пабачыць. Размяшчэнне краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў у раздзеле «Выданні бібліятэкі» або краязнаўчых календароў у раздзеле «Калегам», па-першае, не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заўсёды можа падштурхнуць карыстальніка да іх наведвання ў пошуках краязнаўчых матэрыялаў, па-другое, няма сувязі з іншымі краязнаўчымі рэсурсамі бібліятэкі.

Актуальная задача для часткі публічных бібліятэк – паляпшэнне арганізацыі кантэнту і ўдасканаленне якасці краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў.

Універсальная бібліяграфічная БД «Краязнаўства» ва ўсіх бібліятэках з’яўляецца часткай электроннага каталога.

Найбольш значныя КІР незалежна ад наяўнасці ці адсутнасці краязнаўчага раздзела могуць размяшчацца на галоўнай старонцы сайта.

Кантэнт краязнаўчай інфармацыі пераважна цэнтруецца вакол наступных тэм:

– выдатныя землякі: удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, воіны-інтэрнацыяналісты, пісьменнікі, вучоныя, дзеячы мастацтва, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы і інш.;

– гістарычныя звесткі;

– знакавыя падзеі;

– помнікі, памятныя мясціны;

– рэгіянальная тапаніміка.

Прадстаўленне БД, віртуальных выстаў і іншых жанраў, створаных з выкарыстаннем свабоднага праграмнага забеспячэння, належыць да лепшых узораў сучаснай краязнаўчай прадукцыі. Аднак частка матэрыялаў мае аднастайны і невыразны характар: гэта кароткія фактаграфічныя даведкі з ілюстрацыямі ці без. Пажадана аб’яднанне дробных па тэматыцы і аб’ёме матэрыялаў у буйныя рэсурсы, з абгрунтаванымі раздзеламі і палепшанымі інструментамі навігацыі і пошуку. Так, «Календары знамянальных і памятных дат» звычайна размешчаны ў выглядзе пераліку па гадах. Аднак яны пазбаўлены магчымасці скразнога пошуку і іх прагляд па гадах не адносіцца да зручных спосабаў інфармацыйна-спажывецкай дзейнасці карыстальнікаў. Масіў краязнаўчых даных, назапашаны ў календарах, – выдатная падстава для фарміраванння ўніверсальнай фактаграфічнай БД з развітым пошукавым інструментарыем. Для карыстальнікаў звычайна захоўвае актуальнасць каляндар на бягучы год, але трэба ўлічваць і важнасць правядзення рэтраспектыўнага пошуку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Якасныя краязнаўчыя прадукты, створаныя бібліятэкарамі, не заўсёды змяшчаюць звесткі пра іх аўтараў, пра выкарыстанне неапублікаваных, замежнамоўных ці іншых важных і цяжкадаступных крыніц, матэрыялаў, сабраных у выніку праведзеных даследаванняў. Прывядзенне падобных звестак узвышае значнасць інфармацыйнай прадукцыі бібліятэкі сярод карыстальнікаў і спрыяе рэкламе краязнаўчай працы бібліятэчных спецыялістаў.

### Пытанні па тэме 3.7

1. Як арганізуецца краязнаўчы кантэнт у перадавых бібліятэках?
2. Якім чынам прадстаўлены краязнаўчыя рэсурсы на сайтах бібліятэк Беларусі?
3. Чаму неабходна забяспечыць звязанасць КІР на сайтах (парталах) бібліятэк?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГЛАВА 4
# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ

## 4.1. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі

Краязнаўчая дзейнасць сучаснай бібліятэкі разлічана на рэальных і ўдаленых карыстальнікаў рэгіёна, краіны і свету, што забяспечваецца выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій. Далёка за межамі краю ў людзей могуць узнікаць і фаміравацца пад уздзеяннем розных фактараў, у т. л. і мэтанакіраванай краязнаўчай работы бібліятэкі, інтарэсы да пэўнай мясцовасці: дзелавыя, навуковыя, турыстычныя. Шырокае сацыяльнае прызначэнне краязнаўчых ведаў не змяншае важнасці вывучэння краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей (КІП) насельніцтва – падставы дыферэнцыраванага падыходу да абслугоўвання абанентаў бібліятэкі і задавальнення запытаў віртуальных наведвальнікаў.

На краязнаўчыя інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў, на выбар імі рэсурсаў і паслуг бібліятэкі па краязнаўстве ўплываюць:

– сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі;

– прыналежнасць да ўзроставай, прафесіянальнай, адукацыйнай і этнічнай групы;

– наяўнасць асэнсаванай краязнаўчай інфармацыйнай патрэбнасці;

– сістэма каштоўнасных арыентацый;

– жыццёвы вопыт;

– псіхалагічныя асаблівасці;

– працягласць пражывання карыстальніка ў гэтай мясцовасці;

– мэты, матывы, узровень начытанасці, накіраванасці краязнаўчых інтарэсаў;

– узровень інфармацыйнай культуры.

У бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве распрацавана *тыпалогія* карыстальнікаў КІП і паслуг у залежнасці ад *відаў іх дзейнасці*. У яе аснове ляжыць *сувязь асобы з краем*. Вызначаюцца наступныя віды дзейнасці чалавека:

– кіраўнічая – інфармацыйныя патрэбнасці кіраўнікоў спалучаюць канкрэтнасць і тэматычную шырыню. Чым вышэй ранг кіраўніка, тым больш шматаспектнымі з'яўляюцца яго інфармацыйныя патрэбнасці;

– прафесійная/дзелавая дзейнасць спецыялістаў у краі: педагагічная, вытворчая, мастацкая творчая, інфармацыйная і інш. Краязнаўчыя інфармацыйныя патрэбнасці спецыялістаў адпавядаюць іх асноўнай прафесійнай дзейнасці;

– вучэбная дзейнасць – згодна з выкладаннем і вывучэннем краязнаўчых дысцыплін фарміруюцца інфармацыйныя патрэбнасці па галінах краязнаўства;

– навукова-даследчая дзейнасць – для інфармацыйных патрэбнасцей даследчыкаў уласцівы вузкія тэмы, якія ў ракурсе дакументнага забеспячэння могуць уяўляць сабой «белыя плямы», разам з тым ёсць глыбокая цікавасць да розных аспектаў гістарычнага мінулага і сучаснасці краю;

– разнастайныя аматарствы і грамадскія абавязкі – інфармацыйныя патрэбнасці асоб, звычайна звязаны з іх захапленнямі;

– правядзенне вольнага часу – несістэматычныя інтарэсы да пэўных падзей, з'яў, жыцця выдатных землякоў праяўляюць шырокія колы насельніцтва.

На падставе вышэйадзначанага КІП карыстальнікаў дыферэнцыруюцца на дзелавыя (прафесіянальныя), навуковыя і аматарскія інфармацыйныя патрэбнасці.

У склад карыстальнікаў *носьбітаў дзелавых (прафесіянальных) КІП* уваходзяць:

– супрацоўнікі мясцовых органаў дзяржаўнай улады;

– дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў;

– спецыялісты профільных для краю галін і сфер дзейнасці;

– настаўнікі сярэдніх школ, выкладчыкі гуманітарных вучылішчаў, каледжаў, інстытутаў, універсітэтаў і іншыя педагагічныя работнікі;

– спецыялісты бібліятэк, органаў нацыянальнай тэхналагічнай ініцыятывы (НТІ);

– работнікі экскурсійна-турысцкіх бюро;

– супрацоўнікі мясцовых выдавецтваў, рэдакцый мясцовых газет і часопісаў, радыё і тэлебачання, кнігарняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– творчая інтэлігенцыя (мастакі, кампазітары, музыканты, пісьменнікі, паэты, драматургі, фатографы);

– студэнты і навучэнцы (яны звяртаюцца да КД і паслуг бібліятэк з вучэбнымі мэтамі).

Для гэтых карыстальнікаў характэрны даволі поўныя і глыбокія веды пра край, чаго патрабуе іх прафесіянальная або вучэбная дзейнаць.

*Краязнаўцы-даследчыкі*:

– навуковыя супрацоўнікі музеяў, архіваў, кадры навуковых установ і УВА, дзе даследуюцца рэгіёны і выкладаюцца краязнаўчыя дысцыпліны;

– даследчыкі-аматары (сярод іх шмат настаўнікаў і журналістаў, ёсць інжынеры, святары і інш.);

– удзельнікі клубаў ваеннай рэканструкцыі;

– калекцыянеры (краязнаўчых фатаграфій, мясцовых вырабаў, мясцовых выданняў). Гэтыя асобы маюць глыбокія веды пра гісторыю, насельніцтва, прыроду, культуру краю, ваенныя падзеі, валодаюць пошукавымі і даследчымі метадамі, тэхналогіямі, нярэдка мовамі, якія дамінавалі на пэўных гістарычных этапах, ведаюць крыніцы і вядуць пошук матэрыялаў і звестак. Краязнаўцы-даследчыкі і аматары нярэдка аб’ядноўваюцца ў краязнаўчыя таварыствы. Напрыклад, вядомы беларускі вучоны-лінгвіст Ф. Д. Клімчук быў старшынём грамадскага аб’яднання «Заходнепалескае навукова-краязнаўчае таварыства “Загароддзе”». Бібліятэка павінна спрыяць такім карыстальнікам у атрыманні новых краязнаўчых ведаў, прадстаўляць інфармацыю аб новых КД па тэмах даследаванняў.

Карыстальнікі, якія выконваюць грамадскія абавязкі ў розных арганізацыях і ўстановах, займаюцца валанцёрствам. Многае робяць члены БРСМ – арганізацыі, якой належыць мноства ініцыятыў і рэалізаваных праектаў краязнаўчага характару. Так, у Год малой радзімы на рэспубліканскім узроўні сябры арганізацыі ўдзельнічалі ў праектах «Собери Беларусь в своем сердце», «Украсим Беларусь цветами», «Заповедная Беларусь». Праекты патрабавалі вывучэння турыстычнага патэнцыялу, прыроднага асяроддзя і іншых ракурсаў рэгіёнаў, прымянення разнастайнага інструментарыя для дасягнення мэт праектаў. Таму лідары і сябры БРСМ супрацоўнічаюць з мясцовымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўцамі, спецыялістамі і даследчыкамі, самі набываюць адпаведны вопыт.

Самую вялікую групу складаюць карыстальнікі – носьбіты сацыякультурнай краязнаўчай патрэбнасці, звязанай з уласцівымі чалавеку па прыродзе цёплымі пачуццямі і цікавасцю да мінулага родных мясцін. Гэтыя пачуцці сотні гадоў таму трапна выказаў Ф. Скарына: «…Людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць». Свае пачуцці і веды аб малой радзіме мноства людзей выражаюць у сацыяльных сетках і з дапамогай іншых камунікацыйных сродкаў. Акрамя таго, высокая мабільнасць сучаснага насельніцтва, з'яўленне ў краі перасяленцаў патрабуе іх адаптацыі да новых умоў і адпаведных ведаў пра край.

Інтарэс да краю ў значнай ступені залежыць *ад характару сувязі чалавека з рэгіёнам (пасяленнем):*

– асобам, якія *нарадзіліся і стала жывуць* у краі, бібліятэка дапамагае ў вывучэнні і асэнсаванні яго асаблівасцей, падзей яго мінулага, пазнанні сямейна-родавай гісторыі, гісторыі пасяленняў, сучасных эканамічных і культурных праблем і інш.;

– для *тых, хто прыехаў у мясцовасць на некаторы час,* бібліятэка можа забяспечыць агульнае азнаямленне з краем, яго славутасцямі і «кропкамі росту» – эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі з'явамі, аб'ектамі, якія могуць узмацніць сувязь «чалавек – край» і надаць перспектыву. Такая ж задача стаіць перад бібліятэкай і ў адносінах да асоб, *якія нядаўна пераехалі* ў рэгіён на пастаяннае месца жыхарства. Бібліятэка таксама можа дапамагчы ім у адаптацыі ў новых умовах;

– калі чалавек вярнуўся на радзіму продкаў пасля доўгай адсутнасці, бібліятэка можа станоўча паўплываць на развіццё імкнення да аднаўлення ведаў аб краі і сваіх продкаў;

– асобы, якія пражываюць за межамі краю/краіны і з'яўляюцца віртуальнымі карыстальнікамі бібліятэкі. Могуць кіравацца настальгічнымі пачуццямі, імкненнем аднавіць сямейную гісторыю.

Да калектыўных карыстальнікаў бібліятэк адносяцца:

– органы дзяржаўнай улады ў рэгіёне (населеным пункце);

– мясцовыя Саветы дэпутатаў;

– прадпрыемствы і ўстановы, дзейнасць якіх звязана з профільнымі для краю галінамі або непасрэдна з краязнаўствам;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вучэбныя ўстановы (школы, гімназіі, ліцэі, вучылішчы, тэхнікумы, каледжы, інстытуты, універсітэты);

– архівы, музеі, выдавецтвы, рэдакцыі мясцовых газет, тэлерадыёкампаніі, клубы, органы НТІ, кнігарні;

– творчыя (фальклорныя, этнаграфічныя) калектывы;

– клубы ваеннай рэканструкцыі.

Гэтыя калектыўныя спажыўцы інфармацыі выкарыстоўваюць краязнаўчыя веды ў навукова-даследчых, вучэбных, вытворчых і іншых мэтах.

*Групавыя карыстальнікі* бібліятэк – гэта грамадскія арганізацыі, даследчыя групы, удзельнікі краязнаўчых канферэнцый, экспедыцый. Сярод іх:

– члены аматарскіх краязнаўчых арганізацый;

– удзельнікі грамадскіх аб'яднанняў, якія вядуць даследаванні і папулярызацыю гісторыі, прыроды, навукі, культуры краю: суполкі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускага фонду культуры, Беларускага таварыства аховы прыроды, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, нацыянальна-культурных таварыстваў, зямляцтваў;

– творчыя калектывы, члены гурткоў і дамоў рамёстваў;

– спецыялісты адной прафесіі (настаўнікі гісторыі і інш.);

– карыстальнікі дзіцячага ўзросту і г. д.

Сярод інфармацыйных паслуг, якія прадстаўляюць бібліятэкі і інфармацыйныя цэнтры калектыўным і групавым карыстальнікам, пераважаюць формы і метады інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання, у т. л. выбарчага распаўсюджання інфармацыі.

*Індывідуальнае абслугоўванне па краязнаўстве* вядзецца праз персанальныя гутаркі, планаванне чытання карыстальніка і асабістае інфармаванне.

Складана выяўляць інфармацыйныя патрэбнасці і інтарэсы *аддаленых (віртуальных) наведвальнікаў*. Звычайна ёсць магчымасць колькасных падлікаў наведванняў, а не вывучэння суб'ектаў, зацікаўленых краязнаўствам, і мэт зваротаў. Часам віртуальным наведвальнікам прапануюцца анкеты, прызначаныя для ўдасканалення бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчыя патрэбнасці карыстальнікаў падзяляюцца на выяўленыя і нявыяўленыя. Краязнаўчая патрэбнасць, якая чотка выражаецца яе носьбітам, адносіцца да *выяўленых*. *Нявыяўленыя* краязнаўчыя патрэбнасці вызначаюцца бібліятэкарамі шляхам спецыяльных сацыялагічных даследаванняў (назіранне, інтэрв'ю), а таксама на падставе вывучэння профілю рэгіёна, складу і структуры яго насельніцтва. Трансфармаванне нявыяўленых КІП у выяўленыя дазваляе бібліятэцы мэтанакіравана развіваць паспяховае ўзаемадзеянне з карыстальнікамі розных катэгорый, вызначаць прыярытэтныя кірункі работы, прапанаваць пералік паслуг, ажыццяўляць апярэджвальнае абслугоўванне па краязнаўстве.

**Пытанні і заданні да тэмы 4.1**

1. Як уплывае дзейнасць карыстальніка на характар і змест яго інфармацыйных патрэбнасцей? Прывядзіце прыклады з назіранняў падчас вытворчай практыкі.
2. Хто з'яўляецца носьбітам дзелавых (прафесіянальных) КІП?
3. Якія катэгорыі спецыялістаў адносяцца да краязнаўцаў-даследчыкаў?
4. Каго можна прылічыць да групавых карыстальнікаў краязнаўчай інфармацыі?
5. Як уплываюць на інтарэс да краю сувязі чалавека з рэгіёнам (пасяленнем)?
6. Чаму ўскладняецца выяўленне і вывучэнне інфармацыйных патрэбнасцей і інтарэсаў віртуальных карыстальнікаў?
7. Якія метады выкарыстоўваюць бібліятэкі для ўстанаўлення кантактаў з віртуальнымі карыстальнікамі?

## 4.2. Дзейнасць бібліятэкі па распаўсюджанні краязнаўчых ведаў

Распаўсюджанне (прамоцыя) краязнаўчых ведаў – адзін з найважнейшых кірункаў дзейнасці бібліятэк, што мэтанакіравана і планамерна праводзіцца сярод рэальных і аддаленых карыстальнікаў бібліятэкі, а таксама сярод усяго насельніцтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгіёна. Распаўсюджанне краязнаўчых ведаў мае наступныя мэты:

– асветніцтва, папулярызацыя ведаў пра край сярод усяго насельніцтва і пэўных груп;

– падтрымка вывучэння краязнаўства ў сістэме адукацыі;

– распаўсюджанне навуковых краязнаўчых ведаў.

У практычнай дзейнасці мэты могуць спалучацца.

Па мэтах трансляцыі краязнаўчых ведаў і спосабах арганізацыі камунікатыўнага ўзаемадзення бібліятэкі з насельніцтвам і любымі групамі спажыўцоў інфармацыі магчыма выдзеліць наступныя кампаненты дзейнасці:

– франтальны (масавыя формы);
– гульнёвы;
– прэзентацыйны;
– праектны;
– конкурсны;
– лекцыйны.

Выдзяленне кампанентаў зручна для асэнсавання кансалідацыйнага функцыяналу пэўных форм краязнаўчай дзейнасці, а ў рэчаіснасці іх выбар ажыццяўляюць бібліятэчныя спецыялісты згодна з мэтамі, карыстальніцкай аўдыторыяй, зместам і іншымі ўмовамі. Практычна любыя формы бібліятэчнай работы, актуальныя для пэўнага перыяду, могуць быць выкарыстаны для папулярызацыі краязнаўчых ведаў. Пры гэтым многія з іх праводзяцца і ў віртуальным асяроддзі, праз сацыяльныя сеткі.

Бібліятэкі супрацоўнічаюць з партнёрамі: дзяржаўнымі ўстановамі і грамадскімі арганізацыямі, такімі як рэгіянальная адміністрацыя, установы сістэмы адукацыі, музеі, архівы, аддзяленні творчых саюзаў пісьменнікаў, мастакоў, аддзяленні БРСМ, Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Белая Русь», сродкі масавай інфармацыі і інш. Для рэалізацыі некаторых мерапрыемстваў бібліятэкі звязваюцца з замежнымі партнёрамі.

Важна падкрэсліць наступную тэндэнцыю: разам з раскрыццём зместу дакументальных КІР, якія маюцца ў бібліятэцы ці даступны для прадстаўлення карыстальнікам, усё больш актыўна бібліятэкары імкнуцца забяспечваць доступ да славутасцей рэгіёна, што адносяцца да небібліятэчных рэсурсаў. Гэта тэндэнцыя праяўляецца ў розных кампанентах і краінах свету.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Франтальны кампанент (масавыя формы)***

Ахоплівае падрыхтоўку і правядзенне масавых мерапрыемстваў. Гэта краязнаўчыя канферэнцыі, чытанні, семінары, выставы краязнаўчай літаратуры, прэзентацыі, сустрэчы з краязнаўцамі і аўтарамі кніг, вечарыны, дні краязнаўчых ведаў, святы вёсак, вуліц, бібліятэчныя праменады, батлы. Падрыхтоўка праходзіць у наступныя этапы:

– выбар тэмы, вызначэнне мэтавага і чытацкага прызначэння;

– вывучэнне матэрыялаў па тэме;

– выбар неабходных дакументаў па розных крыніцах, у тым ліку ў інтэрнэце;

– вызначэнне кола зацікаўленых асобаў, арганізацый і ўстаноў, перамовы з імі;

– рэклама, рэкламная кампанія;

– распрацоўка структуры мерапрыемства, складанне сцэнарыя;

– падбор ілюстрацыйнага матэрыялу;

– падрыхтоўка ўдзельнікаў мерапрыемства;

– афармленне аўдыторыі;

– правядзенне мерапрыемства, яго фіксаванне;

– вывучэнне эфектыўнасці;

– аналіз мерапрыемства, выяўленне яго вартасцей і недахопаў;

– прамоцыя праведзенага мерапрыемства.

Буйныя мерапрыемствы бібліятэкі праводзяць разам з адукацыйнымі ўстановамі, архівамі, музеямі, адміністрацыяй мясцовых органаў улады, краязнаўцамі, мясцовымі СМІ.

***Дні, тыдні, дэкады краязнаўства (краязнаўчай кнігі).*** У бібліятэках атрымалі распаўсюджанне краязнаўчыя серады і чацвяргі, падчас якіх рэалізуюцца многія мерапрыемствы. Напрыклад, плануецца правядзенне выстаў, экскурсій, урокаў краязнаўства, рыхтуюцца дайджэсты, зборнікі, бібліяграфічныя дапаможнікі, вечарыны, праводзяцца гульні, акцыі. Калі дню краязнаўства надаецца больш спецыялізаваны характар, напрыклад дзень рамёстваў, тады бібліятэка запрашае спецыялістаў, якія валодаюць тэхналогіямі традыцыйнай мясцовай культуры, могуць правесці майстар-класы. Напрыклад, такі вопыт маюць гарадскія бібліятэкі Мазыра. Мастоўская ЦРБ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адкрыла тыдзень краязнаўства «Знакамітыя землякі», які праходзіў у раёне ў кастрычніку 2018 г. і ахапіў сустрэчы і выстаўкі, літаратурныя вечары і канцэрты, краязнаўчыя падарожжы, гадзіны паэзіі, прысвечаныя творчасці і памяці славутых людзей краю.

***Святы вёсак, дні вёсак, аграгарадкоў, вуліц*** – буйныя, насычаныя рознымі формамі мерапрыемствы, якія праводзяцца бібліятэкай з шэрагам партнёраў: адміністрацыяй рэгіёна, населенага пункта, краязнаўцамі, даследчыкамі, музеямі, пісьменнікамі, творчымі калектывамі, СМІ. Гэтыя комплексныя мерапрыемствы з шырокім удзелам партнёраў бібліятэкі: адміністрацыі пасялення, навучальных устаноў, клубаў, прадстаўнікоў прадпрыемстваў, СМІ. Бібліятэка, як правіла, актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы сцэнарыя свята, афармляе выставу па гісторыі населенага пункта, ладзіць вечары-сустрэчы са знакамітымі землякамі, вечары, прысвечаныя знакавым падзеям мінулага ці сучаснасці, конкурсы, віктарыны на веданне свайго краю. Напрыклад, святы «Вёска мая – гонар мой», «Вёска родная» арганізуюць сельскія бібліятэкі Горацкага раёна Магілёўскай вобласці.

***Краязнаўчыя канферэнцыі*** прысвечаны актуальным пытанням мясцовага жыцця, выдатным людзям краю, знамянальным і памятным датам, краязнаўчым кнігам і мясцовым выданням. Нярэдка краязнаўчыя навуковыя канферэнцыі называюць *Краязнаўчыя чытанні*, пры гэтым у назву ўключаецца ці прозвішча знакамітага земляка, ці назва рэгіёна, дзе адбываецца канферэнцыя, або чытанні маюць тэматычны характар (гістарычныя, літаратурныя і г. д.). Канферэнцыі бываюць навуковымі і адукацыйнымі.

Спецыяльна створаная рабочая група курыруе ўвесь комплекс работ ад іх пачатку да падвядзення вынікаў, выдання матэрыялаў канферэнцыі. Інфармацыйнае пісьмо і праграма адлюстроўваюць яе праблемнае поле, тэматыку выступленняў, умовы ўдзелу. Плануецца культурная частка праграмы – наведванне гасцямі канцэртаў, выстаў, правядзенне для іх экскурсій, знаёмства з мясцовымі славутасцямі. Якасная рэкламная кампанія забяспечвае поспех правядзення канферэнцыі. Краязнаўчыя канферэнцыі як буйныя масавыя навуковыя ці адукацыйныя мерапрыемствы патрабуюць дакладнага вызна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэння кола партнёраў, як правіла, гэта краязнаўчыя музеі, УВА, краязнаўчыя таварыствы, мясцовыя ўлады. Вялікую папулярнасць атрымалі міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі Асіповіцкія, Гарадзенскія, Каладзееўскія чытанні (Барысаўская ЦРБ), Карэліцкія, Лідскія. У абласных бібліятэках міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі праводзяцца пастаянна: «Берасцейскія кнігазборы» – у Брэсцкай АБ з 2008 г., Гродзенскія навуковыя чытанні – у Гродзенскай АНБ, «Віцебскі край» – у Віцебскай АБ, «Пысінскія чытанні» – у Магілёўскай АБ і інш. Навукова-практычныя канферэнцыі і чытанні дазваляюць прадэманстраваць вынікі пошукава-даследчай дзейнасці бібліятэкараў і іншых краязнаўцаў-даследчыкаў канкрэтнага рэгіёна. Напрыклад, VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край» (лістапад 2020 г.) прагучалі даклады, прысвечаныя розным гістарычным перыядам Віцебшчыны, асабліва падзеям Вялікай Айчыннай вайны і вяртання з нябыту імён забытых герояў землякоў.

Суправаджаюцца апублікаваннем зборнікаў матэрыялаў і шырока асвятляюцца ў СМІ.

***Краязнаўчыя вечарыны, сустрэчы.*** Характарызуюцца разнастайнасцю тэматыкі і шырынёй карыстальніцкай аўдыторыі. Да ліку найбольш распаўсюджаных адносяцца *літаратурныя вечарыны*, вечары-партрэты, вечары гістарычнай тэматыкі, у т. л. звязаныя з юбілейнымі датамі, знакавымі падзеямі, прысвечаныя прыродзе і экалогіі, помнікам архітэктуры і інш. Падчас літаратурных вечарын адбываюцца сустрэчы з пісьменнікамі-землякамі, гучаць іх творы, выступленні літаратуразнаўцаў і крытыкаў, сяброў, выдаўцоў, праходзяць прэзентацыі новых кніг, выставы, выступаюць творчыя калектывы (выконваюцца песні на вершы паэта, паказваюцца тэатралізаваныя інсцэніроўкі і інш.). Так, у Брэсцкай АБ прайшла літаратурная вечарына, прысвечаная юбілею вядомага паэта і тэлежурналіста, Ганаровага чытача бібліятэкі Міколы Пракаповіча (лістапад 2018 г.). На літаратурнай вечарыне ў гонар знакамітага земляка, члена саюзаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі Валерыя Фёдаравіча Грышкаўца ў Пінскай ЦРБ імя Я. Янішчыц (снежань 2018) гучалі аповеды пра жыццёвы і творчы шлях, выступленні пісьменнікаў, вершы ў аўтарскім выкананні і ўдзельнікаў вечарыны, гучалі песні на словы В. Ф. Грышкаўца. У цэнт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры ўвагі былі аўтарскія кнігі паэзіі і прозы. Вызначаюцца папулярнасцю і ***фальклорныя вечарыны*** тыпу «Песні, танцы нашай мясцовасці», «Бабулі ўмелі рабіць цуды», «З бабулінага куфэрка», «Легенды нашага краю…», «А ў нас гавораць так…», якія мэтанакіравана раскрываюць пласты культурнай спадчыны. Такія вечарыны могуць ладзіцца да каляндарных свят (Калядаў, Масленіцы і інш.). Для краязнаўчых вечарын любой тэматыкі важна дакладна падбіраць і выкарыстоўваць публікацыі, запрашаць цікавых гасцей, ствараць ці падбіраць АВ-матэрыялы, электронныя прэзентацыі, забяспечыць адпаведную атмасферу і настрой.

Блізкімі па методыцы падрыхтоўкі да вечарын з’яўляюцца ***краязнаўчыя сустрэчы.*** Так, Віцебская АБ у рамках цыкла «Краязнаўчыя сустрэчы» арганізоўвала правядзенне сустрэч з краязнаўцамі, гісторыкамі, даследчыкамі Віцебшчыны. Сярод іх былі краязнавец Мікалай Півавар, фотамастак Віктар Барысенкаў і іншыя вядомыя людзі-ўраджэнцы Віцебшчыны.

***Краязнаўчы сторытэлінг*** – перадача краязнаўчай інфармацыі праз аповеды ўдзельнікаў ці знаўцаў падзей, родных і сяброў выдатных людзей, работнікаў мясцовых прадпрыемстваў, устаноў, членаў творчых калектываў і інш. Асабліва падыходзіць для маладзёжнай аўдыторыі. Краязнаўчыя вечарыны тыпу «Малая радзіма ва ўспамінах старажылаў» больш адпавядаюць дарослай аўдыторыі.

***Гульнёвы кампанент***

Гульнёвыя формы характарызуюцца мноствам форм і ўмоў правядзення, шырокай варыятыўнасцю зместу. Гульні магчыма выкарыстоўваць з рознымі групамі карыстальнікаў, але асабліва гэтыя формы адпавядаюць дзіцячаму і падлеткаваму ўзросту. Шырокае распаўсюджанне атрымалі ***краязнаўчыя віктарыны, дні краязнаўчай казкі (легенд, паданняў), гульні-падарожжы і інш.*** Краязнаўчая гульня – гэта форма дзейнасці, якая імітуе пазнавальныя сітуацыі і спрыяе развіццю актыўнасці ўдзельнікаў, пашырэнню кругагляду і абуджэнню цікавасці да вытокаў роднай культуры і мясцовай гісторыі. Цэніцца арыгінальная форма гульні, камандная работа, сяброўская атмасфера. Пры распрацоўцы любой краязнаўчай гульні важна выбраць краязнаўчы твор (творы), які будзе не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі крыніцай звестак, але і патэнцыяльна – пажаданай для чытання кнігай. Трэба ўлічваць узрост: 7–12-гадовыя дзеці актыўна ўдзельнічаюць у гульні, а таксама з задавальненнем працуюць самастойна. Падлеткам падабаюцца тэатралізаваныя прадстаўленні з удзелам іх аднагодкаў.

З задавальненнем юныя чытачы ўдзельнічаюць у інтэрактыўных гульнях, напрыклад «Хто мы, адкуль мы» ці «Азбука краю», калі неабходна паказаць веданне аб'ектаў, падзей, імён згодна з алфавітнай паслядоўнасцю.

Сярод гульнёвых формаў ***віктарына***, напэўна, адна з самых распаўсюджаных. Віктарыны тыпу «Ці ведаеш ты свой край?», «Вёска, у якой ты жывеш» праводзяцца для розных мэтавых груп карыстальнікаў, што ўплывае на складанасць пытанняў і як правіла ўключаюцца ў сцэнарыі розных краязнаўчых мерапрыемстваў.

***Краязнаўчыя падарожжы.*** Для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту магчыма распрацаваць вясёлае падарожжа, калі бібліятэка выступае ў ролі экскурсавода рэальнага ці віртуальнага маршруту, які дапускае памылкі і накіроўвае дзяцей на іх выпраўленне. Улічваецца назіральнасць і дапытлівасць дзяцей гэтага ўзросту.

Шырокае распаўсюджанне атрымалі ***краязнаўчыя дыліжансы*** – гульнёвыя мерапрыемствы, стылізаваныя пад падарожжа з абавязковымі прыпынкамі – станцыямі на важных кропках для пазнання краю. Так, Зяньковіцкая СБ (Уздзенскі раён) арганізавала краязнаўчы дыліжанс «Адсюль мы родам». Гісторыка-краязнаўчы дыліжанс «Нясвіж. Кола гісторыі» «прывёз» несвіжан, аматараў гісторыі і гасцей з Польшчы, удзельнікаў грамадскага аб'яднання «Несвіжане» (Рэспубліка Польшча) у прыфрантавы Нясвіж напярэдадні Першай сусветнай вайны.

***Краязнаўчыя батлы*** – бібліятэкі арганізуюць тэматычныя спаборніцтвы сярод мясцовага насельніцтва ці мэтавых груп, прысвечаныя веданню рэгіёна. Батлы надзвычай варыятыўныя па ідэі і тэматыцы, але заўжды патрабуюць вызначэння этапаў (рынгаў) і пераможцаў. Акрамя дыскусій, віктарын і іншых формаў «жывых» спаборніцтваў шырока выкарыстоўваюцца віртуальныя формы: відэапрэзентацыі, ролікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Краязнаўчыя флэшмобы*** нярэдка адбываюцца па-за сценамі бібліятэк. Могуць быць выкарыстаны для пазнання архітэктурных і гістарычных помнікаў, знакавых падзей.

***Краязнаўчыя квэсты*** дазваляюць ахапіць мноства пазнавальных заданняў, знайсці адказы на няпростыя пытанні, вызначыцца ў конкурсах. Хаця ўдзельнікі каманд атрымліваюць няпоўную інфармацыю, але праявіўшы эрудыцыю, логіку, уважлівасць, знаходлівасць, яны дойдуць да развязання таямніц роднага краю. Квэсты прыцягваюць увагу да цікавых і важных краязнаўчых кніг, дапамагаюць глыбей спазнаць гісторыю роднага краю, звязаць мінулае з сучаснасцю, вучаць працаваць з краязнаўчымі інфармацыйнымі рэсурсамі. З поспехам бібліятэкі прымяняюць фотаквэсты, велаквэсты і пешаходныя квэсты. Напрыклад, падчас фотаквэста ўдзельнікі каманд атрымліваюць заданні з фрагментамі фатаграфій, якія трэба разгадаць і зрабіць на месцы развязанай таямніцы крэатыўнае каманднае фота. Так, бібліятэка № 6 Магілёўскай ГЦБС на беразе Дняпра правяла фотаквэст «Горад з іншага боку», на які былі запрошаны магіляўчане з сем'ямі. Заданні і фатаграфіі былі звязаны з аб'ектамі культурнай і гістарычнай спадчыны Магілёва.

***Прэзентацыйны кампанент***

***Выставачная работа.*** У сістэме выстаў, фарміраванай бібліятэкамі, галоўнае месца займаюць кніжныя выставы краязнаўчых дакументаў і выставы прадметаў, якія належаць да культурных каштоўнасцей рэгіёна. Ствараюцца самастойныя кніжныя выставы і выставы ў кантэксце масавых мерапрыемстваў; па змесце – універсальныя, тэматычныя, персанальныя; па мэтавым прызначэнні – у дапамогу папулярызацыі краязнаўчых ведаў, навукова-даследчай дзейнасці і адукацыйнай дзейнасці. Для папулярызацыі краязнаўчых дакументаў часцей за ўсё выкарыстоўваюць выставы новых паступленняў, тэматычныя і персанальныя выставы. Сярод тэматычных выстаў распаўсюджаны выставы да знамянальных дат. У многіх бібліятэках арганізуюць комплексныя доўгатэрміновыя выставы, прысвечаныя рэгіёну: «Ведай свой край», «Край мой, ты – часціца Радзімы», «Ці ведаеце вы свой горад?» і інш. Папуляр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нымі з'яўляюцца выставы-прэм'еры, выставы-прэзентацыі адной краязнаўчай кнігі, выставы «Лепшыя кнігі аб краі» і інш.

Часам бібліятэкі рэалізуюць выставачныя праекты, калі сацыяльна-значная тэма прэзентуецца ў некалькі этапаў, як, напрыклад, выставачны праект НББ «Малая радзіма – аповесць часоў», дзе ў серыі мастацкіх і інфармацыйна-дакументальных выстаў былі прадстаўлены багатыя калекцыі паштовак, кніг і фатаграфій вядомых калекцыянераў У. Ліхадзедава, С. Плыткевіча.

Усё часцей выставы праводзяцца за сценамі бібліятэк, бо ўключаюцца ў склад розных культурных мерапрыемстваў. Так, усе бібліятэкі краіны актыўна ўдзельнічаюць у святкаванні Дня Перамогі 9 мая – з самых вялікіх дат у гісторыі беларускага народа. Сярод разнастайных форм ушанавання гэтай даты бібліятэкі прапануюць выставы. Напрыклад, у 2017 г. на літаратурна-краязнаўчай пляцоўцы «Наш горад Бабруйск дарогай Перамогі» раённая бібліятэка арганізавала кніжна-ілюстрацыйную і фотавыставу. Яны сталі арганічнымі элементамі літаратурна-музычнай кампазіцыі «Вясна Перамогі» з удзелам бабруйскіх паэтаў, іншых мерапрыемстваў.

Сёння бібліятэкі актыўна ствараюць віртуальныя краязнаўчыя выставы, якія не толькі выдатна адлюстроўваюць дакументы з фондаў, але і змяшчаюць інтэрнэт-спасылкі, звязаныя з тэматыкай выставы. Гэта дэманструюць, напрыклад, віртуальныя выставы Магілёўскай АБ: «Магілёўшчына ў гады Першай сусветнай вайны», «Беларусы свету з Магілёўшчыны», «Могилёвская губерния на страницах периодических изданий» і інш.

Вялікая ўвага надаецца арганізацыі выстаў мясцовага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, экспазіцыі аўтарскіх работ. Напрыклад, Маларыцкая ЦРБ звыш 5 гадоў здзяйсняе артпраект «Свет хобі», у межах якога рэалізуюцца выставы аматараў мастакоў і майстроў рэгіёна. Былі праведзены выставы эксклюзіўных лялек, кавальскіх работ, вышытых карцін, вырабаў з паперы, бісеру, гліны.

Цікавасць чытачоў выклікаюць ***прэзентацыі*** (у т. л. мультымедыйныя) і ***прэм'еры*** краязнаўчых кніг. Нярэдка на іх прысутнічаюць аўтары.

***Музеі, галерэі ў бібліятэках.*** Культуратворчая дзейнасць бібліятэкі заключаецца ў падтрымцы і папулярызацыі дакумен-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тальных і рэчавых помнікаў, традыцый рэгіянальнай культуры, мясцовых талентаў: мастакоў, фатографаў, літаратурных творцаў, музыкантаў, акцёраў, народных майстроў. Гэта дзейнасць праяўляецца ў арганізацыі музеяў, музейных залаў (сектараў, аддзелаў), музейных экспазіцый на абанеменце ці ў чытальнай зале, у бібліятэчных холах, бібліятэк-музеяў, галерэй, літаратурна-мастацкіх салонаў. Музеі і галерэі ў бібліятэках ствараюць арт-прастору і прываблiваюць людзей сваёй даступнасцю, магчымасцю паглыбіць веды, звярнуўшыся да крыніц бібліятэчнага фонду. Усе яны створаны па ініцыятыве бібліятэкараў, нярэдка з дапамогай партнёраў. У склад прадметаў музейных фондаў уваходзяць прадметы побыту, працы, вопраткі, характэрныя для рэгіёна, экзэмпляры раслiннага свету і іншыя рэчавыя крыніцы, а таксама пісьмы, дзённікі, альбомы, фотадакументы, выданні, гука- і відэазапісы размоў са старажыламі, знакамітымі землякамі, песні мясцовых музычных калектываў.

Многія краязнаўчыя музеі захоўваюць і папулярызуюць комплексную інфармацыю пра мінулае і сучаснасць рэгіёна, населенага пункта. Цікавым прыкладам этнаграфічнага музея з'яўляецца «Ельскі фартушок» у Ельскай РЦБ. Пастаянная этнаграфічная экспазіцыя налічвае зараз звыш 400 вышытых прадметаў народнага побыту і элементаў народнага касцюма.

У Барысаўскай ЦРБ адкрыта мемарыяльна-выставачная зала І. Х. Каладзеева і гісторыі вайны 1812 года. Прадстаўлены планы, карты, дакументы і матэрыяльныя прадметы па гісторыі пасялення другой паловы XIX – пачатку XX ст. Асобны раздзел прысвечаны дзейнасці барысаўскіх клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі па перыядзе напалеонаўскіх войнаў. Наведвальнікам магчыма прымерыць элементы ўніформы, зрабіць фотаздымкі.

У Бярозаўскай раённай бібліятэчнай сістэме плённа дзейнічае грамадскі музей этнаграфіі і сялянскага побыту пры Вайцяшынскай СБ, які мае званне народнага. Музейныя фонды ўстановы налічваюць звыш 1000 экспанатаў, сярод якіх прадметы сялянскай працы, хатняга ўжытку, нумізматыкі, рэліквіі франтавой і партызанскай славы, ручнікі, выцінанка, вышыўка. Папулярызацыя гісторыі, культуры і традыцый рэгіянальнай супольнасці садзейнічала ўзнікненню свята ручніка, якое што-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

год праводзіцца бібліятэкай. Увогуле ў публічных бібліятэках пашыраецца стварэнне музеяў мясцовай культурнай спадчыны.

Асобным кірункам з'яўляецца заснаванне віртуальных музеяў, такіх як «Літаратурны музей пісьменнікаў Гомельшчыны», створаны супрацоўнікамі аддзела краязнаўства Гомельскай АУБ, «Музей асобы» ЦБС г. Гродна, музейныя пакоі і праекты Магілёўскай АУБ і іншых бібліятэк.

Адкрыццё мастацкіх галерэй стала трэндам бібліятэчнага краязнаўства. Праз выставачна-галерэйную дзейнасць рэалізуюцца арт-праекты, прысвечаныя творчасці таленавітых землякоў. Праходзяць сустрэчы з творцамі, мастацтвазнаўцамі, выдаўцамі, адбываюцца майстар-класы. Шырокую вядомасць набылі галерэя імя Марыі і Валянціна Ягоравых у Гомельскай АУБ, мастацкія галерэі Барысаўскай ЦРБ, якія сталі месцамі экспаніравання твораў розных відаў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фатаграфіі і дызайну. Экстраардынарны факт дарэння Барысаўскай ЦРБ 32 карцін Валерыем Шкарубам, заслужаным дзеячам мастацтваў Рэспублікі Беларусь, сусветна прызнаным мастаком, дазволіў адкрыць выдатную імянную галерэю. Мастацкая творчасць таленавітых землякоў прадстаўлена на выставах у арт-прасторы ЦБС ім. А. С. Пушкіна. Пры падрыхтоўцы выстаў вядуцца перамовы з мастакамі для вырашэння арганізацыйных пытанняў: аб перыядзе і ўмовах дэманстрацыі, рэкламных мерапрыемствах. Для прамоцыі арт-пляцовак і пашырэння кола інтэрэсантаў выкарыстоўваюцца відэатрансляцыі, матэрыялы на сайтах і ў сацыяльных сетках.

***Праектны кампанент***

*Праектная дзейнасць* атрымала самае шырокае прымяненне ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, вызначаецца высокай сацыяльнай значнасцю. Праектная дзейнасць, па меркаванні многіх бібліятэчных спецыялістаў, з'яўляецца найбольш эфектыўным спосабам прамоцыі краязнаўчых ведаў і вынікаў пошукава-даследчай работы бібліятэкараў і краязнаўцаў рэгіёна. На пачатковай фазе распрацоўкі краязнаўчага праекта вельмі важна вызначыць асноўную ідэю, якую неабходна абгрунтаваць, паказаць яе значэнне для сучаснасці. Нярэдка такая ідэя звязана з актуалізацыяй гістарычнай падзеі, знакавай для



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўнай мясцовасці. Вядома, што асобныя лакальныя падзеі набываюць міжнароднае значэнне. Па характары мэт і задач, кірунках дзейнасці краязнаўчыя праекты могуць быць культурна-дасугавымі, адукацыйнымі, сацыяльнымі.

Сярод вядомых праектаў, рэалізаваных айчыннымі бібліятэкамі ў сувязі са значнымі гістарычнымі падзеямі, важна адзначыць Ляснянскую бібліятэку-музей у складзе Цэнтралізаванай сеткі публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна, Барысаўскую цэнтральную раённую бібліятэку імя І. Х. Каладзеева.

Экспазіцыі і праграмы Ляснянскай бібліятэкі-музея прысвечаны знакамітай перамозе рускага войска над шведамі пад вёскай Лясная ў 1708 г. падчас Паўночнай вайны. Наведвальнікам прапануецца зала з унікальнымі экспанатамі, экскурсія, у межах якой ёсць анімацыйная праграма «Па слядах Паўночнай вайны», дзе гледачы становяцца ўдзельнікамі ваенных падзей.

Праект, які дазваляе ўсебакова прэзентаваць рэгіён, выдатна рэалізуе Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка. З 2016 г. ажыццяўляецца праект «Культурны код Салігорска», рэалізаваны Салігорскай РЦБ і Салігорскім дзяржаўным каледжам. Навучэнцы каледжа рыхтуюцца бібліятэкай як «культурныя навігатары». Мэта праекта – знаёмства гараджан і гасцей горада з аб’ектамі яго культурнай і прыроднай спадчыны з выкарыстаннем тэхналогіі QR-кода. Па QR-коду на інфармацыйных таблічках аб’ектаў мабільная прылада адкрывае старонкі інтэрнэт-рэсурсаў, прысвечаных выдатным мясцінам горада. У праект уключаны распрацоўкі трэнінгаў, гарадскіх маршрутаў. Максімальна выкарыстаны сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі: так, элементамі праекта сталі «Museum-экскурс “Завод, які пабудаваў горад”», GAME TIME «Разам», тапанімічны відэамаршрут «ВО!кругСолигорск».

Магілёўская АБ у Год малой радзімы распачала праект «Малая радзіма. Вёсачкі з вялікай гісторыяй».

Многія бібліятэкі прысвячаюць краязнаўчыя праекты мастацкай творчасці, арганізуюць работу мастацкіх галерэй, дзе праводзяцца сустрэчы з мастакамі, фатографамі, майстрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Так, праект «Мастацкая галерэя «Зачараваныя родным краем» рэалізаваны ў Мазырскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме. У дзіцячай бібліятэцы Уздзенскай ЦБС ажыццёўлены праекты «Пазнаём



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міншчыну разам», «І родны край, і мову не разлюбім», «У пісьменніка – дзень нараджэння».

Краязнаўчыя праекты пасляхова рэалізуюцца замежнымі бібліятэкамі. Напрыклад, у Расіі выдатныя вынікі прынесла рэалізацыя інтэрнэт-праекта «Литературная карта…»[44].

***Конкурсны кампанент***

Конкурсы характарызуюцца значнай варыятыўнасцю з пункта гледжання мэтавай скіраванасці, формаў і зместу. Яны могуць дэманстраваць прафесійныя дасягненні бібліятэчных спецыялістаў па краязнаўчай дзейнасці, павышэнне іх прафесійнага ўзроўню, адрасавацца карыстальнікам бібліятэкі, насельніцтву пэўнага рэгіёна і віртуальным наведвальнікам бібліятэчнага сайта, іншых інтэрнэт-пляцовак бібліятэкі. Часта конкурсы ўваходзяць у склад масавых мерапрыемстваў, праектаў, краязнаўчых урокаў. Для буйных конкурсаў распрацоўваюцца палажэнні, дзе вызначаюцца іх мэты, удзельнікі, умовы правядзення, крытэрыі ацэнкі конкурсу і ўзнагароджання лепшых.

Прыкладам можа быць міжнародны конкурс «Нескучное краеведение» (Расія, 2018), які праводзіўся ў мэтах падтрымкі практычнай і творчай дзейнасці бібліятэкараў па забеспячэнні традыцый, захаванні гісторыі роднага краю, развіццю ў сельскіх жыхароў пачуцця прыналежнасці да гісторыі малой радзімы.

Беларуская Праваслаўная Царква штогод праводзіць конкурс «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання» з мэтай удасканаліць дзейнасць царкоўных і свецкіх бібліятэк, прафесіяналізаваць бібліятэчныя кадры, актывізаваць работу па выхаванні патрыятызму дзяцей і моладзі на аснове праваслаўных традыцый. У ліку намінацый конкурса – «Гісторыя Праваслаўя роднага краю». Конкурс па падрыхтоўцы лепшага краязнаўчага бібліяграфічнага рэсурса «Краязнаўчая бібліяграфія як сродак захавання гісторыка-культурнай спадчыны» праводзіўся сярод публічных бібліятэк Магілёўскай вобласці. Штогод лепшыя работы па напрамках краязнаўчай сацыякультурнай, навукова-даследчай дзейнасці беларускіх бібліятэк наміні-

[44] Борохина О. В. Опыт создания литературных карт в муниципальных библиотеках // Библиосфера. – 2019. – № 2. – С. 83–87.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руюцца на Рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Так, у 2018–2020 гг., якія праходзілі пад знакам Года малой радзімы, дыпломамі былі адзначаны Шаркаўшчынскія ЦРБ, Ляхавіцкая ЦРБС, Поразаўская бібліятэка – цэнтр краязнаўства (Свіслацкая раённая бібліятэка), Салігорская РЦБ, Сялецкая СБ (Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма), Смаргонская раённая бібліятэка і інш.

З дапамогай конкурсаў можна актуалізаваць у асяроддзі рэгіянальнай супольнасці вельмі важныя грамадскія пытанні. Так, публічныя бібліятэкі г. Гомеля арганізавалі сярод жыхароў горада конкурс «Мой род – мой гонар» па складанні радаводу. Конкурс праводзіўся па дзвюх намінацыях: мастацкае афармленне генеалагічнага дрэва з пакаленным роспісам і напісанне сямейнай гісторыі па тэме «Ваенныя старонкі майго радаводу». Мэта конкурсу – адраджаць традыцыі гісторыка-радаводных даследаванняў, далучаць моладзь да вывучэння гісторыі свайго роду, умацоўваць сямейна-родавыя сувязі і патрыятычныя пачуцці. Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска разам з партнёрамі праводзіць літаратурны конкурс «Табой ганаруся, сталіца!» на найлепшы твор, прысвечаны 75-годдзю вызвалення г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Атрымалі распаўсюджанне конкурсы відэаролікаў па краязнаўчых кнігах. Сярод чытачоў дзіцячага ўзросту з поспехам праходзяць конкурсы малюнкаў, прысвечаных роднаму краю.

***Лекцыйны кампанент***

У формы адукацыйнага прызначэння ў бібліятэчным краязнаўстве трывала ўвайшлі ***лекцыі*** і ***ўрокі***.

Абласныя і публічныя бібліятэкі Беларусі актыўна рэалізуюць гэтыя формы. Лекцыі і ўрокі характарызуюцца навуковай абгрунтаванасцю, паслядоўнасцю выкладання матэрыялу, выкарыстаннем нагляднага матэрыялу (аўдыя, відэа, электронных прэзентацый). Яны могуць быць эпізадычнымі і цыклавымі, цяпер некаторыя бібліятэкі прадстаўляюць доступ да іх праз сайты. Актуальнасць лекцый і ўрокаў звязана і з наяўнасцю краязнаўчых вучэбных дысцыплін у праграмах устаноў адукацыі. Комплекснае краязнаўства і галіновыя дысцыпліны вывучаюцца ва ўніверсітэтах, установах сярэдняй спецыяльнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі, школах і гімназіях. У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі вучэбная дысцыпліна «Краязнаўства» і галіновыя сумежныя прадметы штогод зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці факультатыўнага кампанента. Па іх ствараюцца і зацвярджаюцца вучэбна-метадычныя комплексы і вучэбныя праграмы. Штогод Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прымае «Перечень УМК, программ факультативных занятий, рекомендованные Министерством образования»[45]. Выдатным прыкладам арганізацыі лекцый з'яўляецца праект – бясплатныя курсы «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада», рэалізаваны Віцебскай АБ і кафедрай гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, сумесна з клубам гістарычнай рэканструкцыі «Vargentorn» і Віцебскім гарадскім парталам. Курсы праходзяць на базе Віцебскай АБ двойчы ў месяц для ўсіх жадаючых. Удзельнікам прапанаваны тэматычныя лекцыі, кансультацыі запрошаных экспертаў, фота- і відэаматэрыялы, дыскусіі па асноўных этапах гісторыі горада. Да кожнай з 20 тэм лекцый дадаюцца спісы рэкамендаванай літаратуры. Матэрыялы лекцый і бібліяграфічныя спісы размешчаны на сайце і старонцы бібліятэкі «В Контакте».

***Краязнаўчыя ўрокі*** праводзяцца ў школах, гімназіях, каледжах. Іх мэта – сістэматычна і рэгулярна асвятляць веды пра край, пра цікавых і вядомых людзях, па магчымасці звязваць матэрыял з факультатыўнымі краязнаўчымі дысцыплінамі, садзейнічаць выхаванню патрыятызму. Абласныя бібліятэкі Расіі шырока практыкуюць краязнаўчыя ўрокі для студэнтаў. Тэмы краязнаўчых урокаў, праведзеных у беларускіх бібліятэках: «Сэрца Беларусі – Міншчына» (Нёманская СБ Уздзенскага раёна), «Маё Паазер'е – мой край дарагі» (Шаркаўшчынская дзіцячая бібліятэка), «Да болю любячы свой край…» (Макранская СБ Маларыцкага раёна), «Мая зямля – Вілейскі край» (Ільянская сельскай інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна).

[45] Перечень УМК, программ факультативных занятий, рекомендованные Министерством образования на 20/21 учебный год [Электронный ресурс]. – Режим доступа: adu.by/ru. – Дата доступа: 13.05.2021.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нярэдка пры заканчэнні лекцый і ўрокаў для замацавання матэрыялу слухачам прапануюць паўдзельнічаць у разгадцы красвордаў ці рэбусаў.

### Пытанні і заданні да тэмы 4.2

1. Якія кампаненты вылучаюцца ў сістэме распаўсюджання краязнаўчых ведаў па мэтах трансляцыі і спосабах арганізацыі камунікатыўнага ўзаемадзення бібліятэкі з насельніцтвам краязнаўчых ведаў?

2. Ахарактарызуйце асаблівасці мерапрыемстваў у межах кожнага кампанента.

## 4.3. Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліяграфічнае інфармаванне па краязнаўстве ажыццяўляецца ў традыцыйным і электронным рэжымах. Выбар аднаго з іх залежыць ад спецыфікі тэматыкі і крыніц інфармацыі. Краязнаўчыя даведкі могуць выконвацца праз віртуальную даведачную службу (ВДС).

***Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (ДБА).*** Выконваюцца ўсе віды даведак: аб наяўнасці і месцазнаходжанні канкрэтнага дакумента (пры яго адсутнасці ў фондах бібліятэкі); удакладненні бібліяграфічных даных; тэматычныя і фактаграфічныя даведкі.

У патоку запытаў і адпаведна выкананых даведак (у параўнанні з бібліяграфічнымі) прэваліруюць фактаграфічныя. Пераважаюць запыты карыстальнікаў па канкрэтных вузкіх пытаннях.

Для фактаграфічных і бібліяграфічных даведак характэрны наступныя асаблівасці:

1) *вузкая тэматыка*, абумоўленая наступнымі прычынамі:

– невялікая тэрыторыя – малы населены пункт ці іншы аб’ект, напрыклад лес, вуліца, асобны будынак, ручай;

– частка тэрытарыяльных і геаграфічных аб’ектаў, па якім ідзе пошук, зніклі, знішчаны, не існуюць у наш час;

– пошукі пра людзей ускладняюцца тым, што вядомасць многіх нешырокая, яны не належаць да славутых і знакамітых;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) *недастатковасць звестак у сучасных апублікаваных крыніцах інфармацыі*, што патрабуе неабходнасць звароту да:

– газет мінулага часу (асабліва раённых);

– правядзення інфармацыйнага маніторынгу інтэрнэт-рэсурсаў (Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БелТА), Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала РБ, сайта Нацыянальнага статыстычнага камітэта РБ, у т. л. размешчаных на ім электронных версій штогодніка «Рэгіёны Беларусі», краязнаўчых сайтаў).

*Змястоўныя асаблівасці краязнаўчых бібліяграфічных і фактаграфічных даведак дазваляюць выдзеліць наступныя іх тыпы:*

– гісторыя населеных пунктаў;

– сучаснае развіццё рэгіёна/населенага пункта;

– тапаніміка населеных пунктаў і іншых геаграфічных аб'ектаў;

– гісторыя асобных устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў і іншых падобных аб'ектаў у рэгіёне;

– сучасныя аб'екты (установы, арганізацыі, прадпрыемствы);

– падзеі ў рэгіёне/населеным пункце ў мінулым і ў наш час; край ці населены пункт у асобныя гістарычныя перыяды; юбілейныя даты;

– знакамітыя ўраджэнцы і дзеячы, іх юбілеі;

– мясцовыя роды, мясцовая сямейна-родавая гісторыя (генеалогія), калі неабходна вызначыць сямейна-родавыя сувязі асобы і аказаць дапамогу ў стварэнні радавода;

– групы асоб, аб'яднаныя ўдзелам у падзеі, навучаннем у пэўнай уставе, працай на канкрэтным прадпрыемстве, прыналежнасцю да групы па роду заняткаў ці іншых прыметах, выкананні пэўных функцый;

– рэгіянальныя асаблівасці беларускай мовы (мясцовыя дыялекты і гаворкі);

– турыстычныя маршруты, аб'екты турыстычнай інфраструктуры;

– рэгіянальная геральдыка.

Пры выкананні фактаграфічных запытаў выкарыстоўваюцца краязнаўчыя даведачныя выданні, фактаграфічныя і камбінаваныя БД, пуцевадзіцелі па краязнаўчых рэсурсах інтэрнэту, друкаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі адпаведнай тэматыкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

календары знамянальных і памятных дат, фактаграфічныя і камбінаваныя БД, пуцевадзіцелі па краязнаўчых рэсурсах інтэрнэту, друкаваныя фактаграфічныя матэрыялы розных жанраў.

У АУБ Беларусі ДБА па краязнаўстве ажыццяўляецца ў асноўным у краязнаўчых аддзелах/сектарах, у іншых бібліятэках – у прынятым рэжыме выканання даведак карыстальнікаў. Краязнаўчыя даведкі выконваюцца праз службы віртуальных даведак. У некаторых расійскіх абласных/краявых бібліятэках арганізаваны сайты для выканання краязнаўчых даведак, напрыклад, «Спроси у краеведа» (Ленинградская областная универсальная научная библиотека), «Спроси краеведа» (Донская государственная публичная библиотека», «Краеведческая справочная служба» (Томская АБ им. А. С. Пушкина), «Спроси об Алтае» (Центральная библиотека города Рубцовска, Алтайскі край), «Скорая помощь библиографа-краеведа» (Государственная универсальная научная библиотека Красноярского края).

У буйных замежных бібліятэках функцыянуюць асобныя віртуальныя даведачныя службы па краязнаўстве, напрыклад даведачная служба аддзела краязнаўства і генеалогіі Бібліятэкі Кангрэса. Канцэнтруюць бібліяграфічныя і даведачныя рэсурсы, арганізуюць доступ да знешніх КІР, прадстаўляюць кваліфікаваныя кансультацыі, прапануюць трэнінгі.

Выконваюцца даведкі, акрэсленыя карыстальнікамі па мэтах як *пазнавальныя* і *вучэбныя*.

Абмежаванні пры прыёме даведак у краязнаўчую ВДС:

– некарэктныя пытанні;

– пытанні, звязаныя з напісаннем твораў, рэфератаў, навуковых, дыпломных, курсавых і кантрольных работ;

– даведкі, якія патрабуюць складанага навуковага і прафесійнага пошуку;

– запыты, звязаныя з прадстаўленнем інфармацыі забаўляльнага характару (рашэнне крыжаванак, удзел у конкурсах, віктарынах).

Краязнаўчыя даведкі паступаюць як ад жыхароў рэгіёна, іншых населеных пунктаў краіны, так і ад жыхароў замежных краін (прычым нярэдка каля паловы ад агульнай колькасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчых запытаў). Прыкладнае палажэнне аб віртуальнай краязнаўчай даведачнай службы прадстаўлена ў дадатку Г.

***Краязнаўчае бібліяграфічнае інфармаванне*** ажыццяўляецца ў разнастайных рэжымах і тэхналогіях. Гэта спісы/бюлетэні новых паступленняў, абвяшчэнні праз рэгіянальны друк, тэлебачанне, буклеты, дайджэсты, агляды, краязнаўчыя выставы, дні краязнаўства, а таксама абвяшчэнні ў стужках навін, выбарчае распаўсюджанне інфармацыі (ВРІ) у аўтаматызаваным рэжыме. Шырокае прымяненне атрымала інфармаванне пра новыя краязнаўчыя кнігі на сайтах бібліятэк, напрыклад на сайтах у Столінскай, Слуцкай і многіх іншых бібліятэк можна знаёміцца з навінкамі краязнаўчай літаратуры. У Кобрынскай ЦБС арганізуюцца выязныя краязнаўчыя выставы, адкрытыя прагляды краязнаўчай літаратуры па актуальных тэмах.

## Пытанні і заданні да тэмы 4.3

1. Ахарактарызуйце асаблівасці краязнаўчых фактаграфічных і бібліяграфічных запытаў карыстальнікаў і адпаведна даведак, якія выконваюцца ў бібліятэках.
2. Якія тыпы краязнаўчых даведак вылучаюцца па прымеце зместу?
3. Як арганізавана ў бібліятэках Беларусі і замежных краін выкананне краязнаўчых запытаў аддаленых карыстальнікаў праз інтэрнэт?
4. Раскрыйце формы і метады бібліяграфічнага інфармавання пра новыя краязнаўчыя дакументы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Спіс выкарыстанай літаратуры


*Асноўны*

1. *Ажеева, Р. Б.* Историко-краеведческая деятельность публичных библиотек : учеб. пособие / Р. Б. Ажеева. – М. : Литера, 2011. – 105 с. – (Серия «Современная библиотека»).

2. *Балацкая, Н. М.* Библиотечное краеведение / Н. М. Балацкая // Библиотечная энциклопедия / гл. ред. Ю. А. Триханов. – М., 2007. – С. 198–199.

3. Библиотечное краеведение : терминолог. словарь / сост. В. С. Крейденко, А. В. Мамонтов. – СПб. : СПбГАК, 1998. – 85 с.

4. Бібліятэчнае краязнаўства: прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зб. навук. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2013. – 286 с.

5. *Демидова, С. Е.* Краеведческий документ: библиотечная обработка : учеб.-практ. пособие / С. Е. Демидова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 104 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век»).

6. Краеведческая составляющая библиотечно-библиографического обслуживания // Справочник библиотекаря / науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – Изд. 3-е, перераб. и доп. – СПб., 2006. – С. 171–176.

7. Краеведческие указатели и БД // Справочник библиографа. – Изд. 4-е, перераб. и доп. – СПб., 2014. – С. 552–564.

8. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк : метад. рэкамендацыі / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Р. М. Чыгірова, М. У. Сокал. – Мінск : НББ, 1994. – 102 с.

9. *Криворотенко, С. Н.* Краеведческий фонд библиотек : учеб. пособие / С. Н. Криворотенко. – М. : Либерея-Бибинформ, 2005. – 94 с.

10. *Кушнаренко, Н. Н.* Краеведческая деятельность библиотеки : учеб. пособие / Н. Н. Кушнаренко. – М. : МГИК, 1993. – 89 с.

11. *Мамонтов, А. В.* Библиотечное краеведение : учеб. пособие : в 2 вып. / А. В. Мамонтов. – СПб. : Акад. культуры, 1996–1998. – Вып. 1 : Основы краеведения, 1996. – 36 с. ; Вып. 2 : Краеведческий библиотечный фонд. – 1998. – 38 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Михлина, И. И.* Краеведческая библиография : науч.-метод. пособие / И. И. Михлина. – М. : Либерея-Бибинформ, 2008. – 176 с.

*13. Михлина, И. И.* Основные понятия краеведческой библиографии : учеб.-метод. пособие / И. И. Михлина. – М. : ИПО Профиздат, 2002. – 80 с.

*14. Неверова, Т. А.* Краеведческая деятельность библиотек. – М. : Либерия, 2005. – (Библиотекарь и время. XXI век).

*15.* Проблемы краеведческой деятельности библиотек : материалы XVII Всерос. науч.-практ. семинара (г. Рязань, 4–7 окт. 2016 г.) / ред. Н. М. Балацкая, О. Я. Азовцева. – Рязань : Рязан. обл. тип., 2017. – 412 с.

*16.* Проблемы краеведческой деятельности библиотек – 2019 : материалы XX Всероссийского научно-практического семинара / РНБ, РБА, Нац. б-ка Чувашской Республики ; сост. и науч. ред. Н. М. Балацкая. – СПб. : Рос. нац. б-ка, 2020. – 400 с.

*17. Саітава, В. І.* Сучасныя тэндэнцыі развіцця бібліятэчнага краязнаўства ў лічбавым фармаце: беларускі вопыт / В. І. Саітава, С. В. Зыгмантовіч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2018. – № 2. – С. 149–156.

*18. Саітава, В. І.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства / В. І. Саітава // Гісторыя краязнаўства Беларусі / В. І. Саітава. – Мінск, 2009. – С. 44–46, 73–74, 130–132, 143–148, 167–170, 192–195.

*19. Саітава, В. І.* Краязнаўства / В. І. Саітава // Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 567–569.

*20. Сомова, Т. Н.* Краеведческая деятельность детской библиотеки : учеб.-практ. пособие / Т. Н. Сомова ; Орловский гос. ин-т искусств и культуры. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 88 с.

*Дадатковы*

*1. Балацкая, Н. М.* Краеведческая деятельность региональных библиотек: новая модель / Н. М. Балацкая, А. М. Ковалева, М. Б. Мартиросова // Библиография. – 2017. – № 5. – С. 38–43.

*2. Бенин, В. Л.* Исследовательская деятельность библиотек по краеведению как средство патриотического воспитания

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

молодежи / В. Л. Бенин, Р. А. Гильмиянова, Н. Н. Смирнова // Вестн. культуры и искусств. – 2020. – № 2 (62). – С. 36–47.

3. *Долгополова, Е.* Краеведческие ресурсы публичных библиотек в сети Интернет: размышления пользователя / Е. Долгополова // Бібліятэчны свет. – 2021. – № 1. – С. 14–17.

4. *Зыгмантовіч, С. В.* Навуковая дзейнасць па краязнаўстве як увасабленне культурнай місіі бібліятэкі / С. В. Зыгмантовіч, В. І. Саітава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 1 (21). – С. 119–125.

5. *Ковалева, А. М.* Краеведческий корпоративный ресурс «Алтайский край» / А. М. Ковалева // Науч. и технич. библиотеки. – 2012. – № 5. – С. 60–67.

6. *Лиховид, Т. Ф.* Кадровое обеспечение краеведческой библиографической деятельности / Т. Ф. Лиховид, Н. З. Шатохина // Библиография. – 2009. – № 1. – С. 30–37.

*7.* Метадычныя падыходы да выяўлення рэгіянальных дакументаў і адлюстраванння іх у электронным інфармацыйным рэсурсе «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі» // Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў / Нац. б-ка Беларусі ; пад навук. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск, 2016. – С. 76–80.

*8.* Методыка індэксавання беларусазнаўчых і краязнаўчых дакументаў // Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў / Нац. б-ка Беларусі ; пад навук. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск, 2016. – С. 85–102.

9. *Пугачова, С. А.* Магчымасці выкарыстання інструментарыя Універсальнай дзесятковай класіфікацыі для адлюстравання беларусазнаўчага і краязнаўчага кантэнту / Т. В. Кузьмініч, С. А. Пугачова // Нацыянальныя дакументы Беларусі: методыка і тэхналогія сучаснай бібліятэчнай працы : навук.-метад. выданне / Нац. б-ка Беларусі ; пад навук. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск, 2019. – С. 125–135.

*10.* Руководство по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ : принято на Всероссийском библиотечном конгрессе XXIII Ежегодной конференции РБА (г. Владимир, 17 мая 2018 г.) / РНБ, РБА // Информац. бюллетень РБА. – СПб., 2018. – № 82.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*11.* Руководство по краеведческой деятельности центральной библиотеки субъекта РФ / РНБ, РБА ; сост. Н. М. Балацкая, А. М. Ковалева, М. Б. Мартиросова. – СПб. : РНБ, 2017. – 24 с.

*12. Стрижонок, И. М.* Краеведческий фонд библиотеки в системе социально-культурных коммуникаций / И. М. Стрижонок // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (13–14 лістап. 2008 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2010. – С. 230–235.

*13. Стрыжонак, І. М.* Краязнаўчая функцыя бібліятэкі як сацыяльна-культурнага інстытута грамадства / І. М. Стрыжонак, В. І. Саітава // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. – Минск, 2008. – Вып. 2. – С. 681–686.

*14. Тараненко, Л. Г.* Внедрение информационно-коммуникационных технологий в библиотечное краеведение / Л. Тараненко // Библиотековедение. – 2017. – Т. 66 (№ 3). – С. 263–270.

*15. Тараненко, Л. Г.* Качество электронных краеведческих продуктов: опыт разработки критериев и экспертиз / Л. Г. Тараненко, Л. О. Миронова // Библиотековедение. – 2020. – Т. 69, № 6. – С. 589–598.

*16. Тараненко, Л. Г.* Технология создания электронного краеведческого каталога: трансформация в условиях электронной среды / Л. Г. Тараненко // Науч. и технич. библиотеки. – 2019. – № 2. – С. 5–71.

*17. Тараненко, Л. Г.* Эволюция содержания понятия «библиотечное краеведение» / Л. Тараненко // Вестн. культуры и искусств. – 2017. – № 3 (51). – С. 23–30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТКІ

***Дадатак А***

ПАЛАЖЭННЕ
аб аддзеле краязнаўства ______________абласной бібліятэкі

*1. Агульная частка*

1.1. Аддзел краязнаўства з'яўляецца структурным падраздзяленнем _______ абласной бібліятэкі і знаходзіцца ў падпарадкаванні дырэктара (намесніка дырэктара па навуковай рабоце).

1.2. Аддзел краязнаўства з'яўляецца цэнтрам навукова-даследчай і метадычнай работы па краязнаўчай бібліятэчнай дзейнасці (КБД) у бібліятэцы і для бібліятэк рэгіёна і выконвае асноўныя яе віды ў каардынацыі з іншымі аддзеламі.

1.3. Дзейнасць аддзела вызначаецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, «Палажэннем аб абавязковым экзэмпляры», Статутам бібліятэкі, загадамі дырэктара, іншымі дакументамі, якія рэгламентуюць працу бібліятэкі і гэтым Палажэннем.

*2. Асноўныя задачы і кірункі дзейнасці аддзела краязнаўства*

2.1. Задачы:

– забеспячэнне даступнасці краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў у рэгіёне і за яго межамі;

– садзейнічанне фарміраванню і развіццю краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей насельніцтва;

– стварэнне камфортных умоў для бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў;

– садзейнічанне краязнаўчаму грамадскаму руху ў рэгіёне.

2.2. Кірункі дзейнасці:

– сумесна з аддзелам камплектавання і апрацоўкі дакументаў выяўляе па шырокім колам крыніц краязнаўчыя дакументы і мясцовыя выданні;

– фарміруе фонд краязнаўчых дакументаў усіх відаў выданняў і забяспечвае іх захаванасць, фарміруе фонд мясцовага друку;

– з максімальнай паўнатой адлюстроўвае звесткі аб краязнаўчых дакументах і мясцовых выданнях у краязнаўчым да-

ведачна-бібліяграфічным апараце (незалежна ад іх месца захоўвання);

– ажыццяўляе інфармаванне карыстальнікаў аб краязнаўчых дакументах і мясцовых выданнях у адпаведнасці з разавымі і доўгатэрміновымі краязнаўчымі бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі запытамі на бязвыплатнай і платнай аснове;

– прадастаўляе краязнаўчыя дакументы карыстальнікам сваёй бібліятэкі і аддаленым карыстальнікам (па сістэмах МБА і ЭДД);

– фарміруе сістэму краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і мясцовых выданняў;

– стварае і падтрымлівае зводныя каталогі краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў;

– распаўсюджвае краязнаўчыя веды, інфармацыю аб рэгіёне праз сістэму сродкаў інфармацыйнай і культурна-дасугавай бібліятэчнай работы;

– сумесна з аддзелам бібліятэказнаўства вызначае стратэгію развіцця краязнаўчай дзейнасці Бібліятэкі і распрацоўвае доўгатэрміновыя праграмы па КБД у рэгіёне, аналізуе стан КБД у рэгіёне;

– аказвае метадычную дапамогу па пытаннях зместу і методыкі краязнаўчай дзейнасці бібліятэкам рэгіёна, прымае ўдзел у рабоце па павышэнні кваліфікацыі супрацоўнікаў публічных бібліятэк у галіне бібліятэчнага краязнаўства;

– арганізуе міжведамаснае ўзаемадзеянне бібліятэк у галіне бібліятэчнага краязнаўства;

– арганізуе і праводзіць навукова-даследчую работу ў галіне КБД і краязнаўства.

*3. Арганізацыя дзейнасці. Структура аддзела краязнаўства*

3.1. Работа аддзела ажыццяўляецца ў адпаведнасці са Статутам бібліятэкі, Палажэннем аб аддзеле, тэхнічнай і метадычнай дакументацыяй, зацверджанай дырэктарам бібліятэкі.

3.2. Работа праводзіцца на падставе гадавых планаў, зацверджаных дырэктарам бібліятэкі.

3.3. Кіраўніцтва аддзелам ажыццяўляе загадчык пад кантролем намесніка дырэктара па навуковай рабоце.

3.4. Загадчык аддзела прызначаецца загадам дырэктара бібліятэкі на аснове працоўнага дагавора, заключанага ў адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3.5. Кіраўніцтва аддзелам ажыццяўляе загадчык пад кантролем намесніка дырэктара па навуковай рабоце.

3.6. Загадчык аддзела прызначаецца загадам дырэктара бібліятэкі на аснове працоўнага дагавора, заключанага ў адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

3.7. Правы і абавязкі загадчыка аддзела і работнікаў вызначаюцца службовымі інструкцыямі, зацверджанымі дырэктарам бібліятэкі.

3.8. Штат аддзела складаецца з пяці спецыялістаў: загадчыка, вядучага бібліятэкара, галоўнага бібліёграфа, бібліятэкара, бібліёграфа.

*4. Узаемадзеянне з іншымі падраздзяленнямі бібліятэкі*

4.1. Аддзел краязнаўства каардынуе сваю працу з падраздзяленнямі бібліятэкі па пытаннях:

– камплектавання фонду з аддзелам камплектавання;

– фарміравання краязнаўчага ДБА на кнігі і мясцовыя выданні з аддзелам камплектавання і апрацоўкі літаратуры і арганізацыі каталогаў;

– метадычнай работы з аддзелам бібліятэказнаўства і іншымі аддзеламі бібліятэкі;

– аўтаматызацыі і праграмнага забеспячэння з аддзелам інфармацыйных тэхналогій;

– прадастаўлення краязнаўчых дакументаў аддаленым карыстальнікам з аддзелам міжбібліятэчнага абанемента;

– аналітычнага роспісу цэнтральных перыядычных выданняў з інфармацыйна-бібліяграфічным аддзелам;

– арганізацыі выстаў з выкарыстаннем дакументаў з фондаў іншых аддзелаў з аддзеламі-фондатрымальнікамі;

– арганізацыі працы з адміністрацыяй бібліятэкі.

4.2. Правядзенне сумесных мерапрыемстваў узгадняецца з адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі.

*5. Правы аддзела краязнаўства*

Для рэалізацыі ўскладзеных задач і функцый аддзел мае права:

– удзельнічаць у абмеркаванні навукова-метадычных, вытворчых і арганізацыйных пытанняў, звязаных з дзейнасцю абласной бібліятэкі і бібліятэк вобласці;

– уносіць прапановы па ўдасканаленні дзейнасці бібліятэкі і аддзела;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– атрымліваць ад падраздзяленняў бібліятэкі і бібліятэк вобласці звесткі, неабходныя для дзейнасці аддзела;

– планаваць сваю дзейнасць, вызначаючы тэхналогію, формы і метады працы ва ўстаноўленым парадку;

– па ўзгадненні з адміністрацыяй бібліятэкі прыцягваць да арганізацыі асобных мерапрыемстваў супрацоўнікаў іншых структурных падраздзяленняў абласной бібліятэкі;

– прадстаўляць да заахвочвання найлепшых супрацоўнікаў аддзела;

– па даручэнні адміністрацыі прадстаўляць бібліятэку і яе дзейнасць па краязнаўстве ў іншых установах і арганізацыях.

*6. Адказнасць*

Аддзел нясе адказнасць за:

– рэалізацыю задач і функцый, ускладзеных гэтым Палажэннем, загадамі і распараджэннямі кіраўніцтва бібліятэкі;

– своечасовае прадастаўленне планавых і справаздачных дакументаў і дакладных звестак;

– за захаванасць дакументаў – кніг і іншых матэрыяльных носьбітаў інфармацыі, якія складаюць фонд аддзела;

– за стан і якасць сваёй дзейнасці;

– арганізацыю працы, захаванне працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны, правіл аховы працы і пажарнай бяспекі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак Б*

АНКЕТА

**Паважаныя калегі!**

З мэтай вывучэння стану бібліятэчнага краязнаўства праводзіцца сацыялагічнае даследаванне «Краязнаўчая дзейнасць публічных бібліятэк».

Вынікі даследавання дапамогуць выявіць праблемныя месцы, перадавы вопыт і інавацыі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк; вызначыць тэматыку метадычных распрацовак і пошукава-даследчай дзейнасці.

Анкету прапануецца запоўніць кіраўнікам ЦБС або спецыялістам ЦГБ (ЦРБ), якія адказваюць за краязнаўчую дзейнасць бібліятэк.

Запоўненыя анкеты просім даслаць не пазней за_________ г. па адрасе (email).

**1. Арганізацыйныя пытанні**

1.1. У вашай ЦБС (выберыце варыянт адказу):

а) ёсць філіял, які спецыялізуецца на краязнаўчай дзейнасці (прывядзіце поўную назву)

_______________________________________________

б) ёсць бібліятэкі, у якіх функцыянуе краязнаўчы сектар/цэнтр ці інш.

(Прывядзіце поўную назву)

_______________________________________________

в) (прывядзіце прозвішча, імя, пасаду кіраўніка краязнаўчага структурнага падраздзялення, ці бібліятэкара, адказнага за краязнаўчую работу)

_______________________________________________

1.2. Ці замацаваная адказнасць за краязнаўчы кірунак у службовых інструкцыях супрацоўнікаў?

а) так

б) не

в) не ва ўсіх

г) ваш варыянт

_______________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2. Стан фонду ЦГБ (ЦРБ)**

2.1. Арганізацыя фонду:

а) адкрыты доступ

б) закрыты доступ

2.2. Ці выдзелены краязнаўчы фонд як частка бібліятэчнага фонду?

а) так

б) не

2.3. Аб'ём краязнаўчага фонду:

а) колькасць кніг, брашур (назв.) _______________

б) з іх на:

– беларускай мове ________________

– замежных мовах ________________

2.4. Новыя паступленні краязнаўчых выданняў за ________год:

а) колькасць кніг, брашур (экз.)______

б) колькасць кніг, брашур (назв.)_______

в) колькасць краязнаўчых газет (назв.)_________

г) колькасць краязнаўчых часопісаў (назв.)_______

2.4.1. Пералічыце назвы краязнаўчых газет:

_____________________________________________________

2.4.2. Пералічыце назвы краязнаўчых часопісаў:

_____________________________________________________

2.5. Якія раздзелы краязнаўчага фонду, на ваш погляд, укамплектаваны недастаткова:

а) эканоміка

б) права

в) тэхніка

г) гісторыя

д) мемуары

е) прыродазнаўчыя навукі

ж) сельская гаспадарка

з) літаратуразнаўства

і) мовазнаўства

к) мастацкая літаратура

л) гісторыя мастацтва

м) іншыя (назавіце)___________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2.6. Назавіце 2–3 тэмы, найбольш дрэнна забяспечаныя літаратурай:

______________________________________________________

2.7. Назавіце 3–4 назвы кніг, у якіх найбольш часта даводзіцца адмаўляць чытачам:

______________________________________________________

2.8. Назавіце 3–4 кнігі, найбольш часта запытаныя па МБА:

______________________________________________________

**3. Стан краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарата**

3.1. Краязнаўчыя бібліяграфічныя базы даных (назавіце і ўкажыце аб'ём)______________________________________

3.2. Краязнаўчыя фактаграфічныя базы даных (назавіце)

______________________________________________________

3.3. Картачны краязнаўчы каталог (універсальная картатэка) ЦГБ (ЦРБ) (назавіце і ўкажыце аб'ём):

______________________________________________________

3.4. Ці выдзелены краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд:

а) так

б) не

**4. Метадычная дапамога:**

4.1. Ацаніце па 4-бальнай шкале і пералічаных у табліцы крытэрыям, наколькі Вы і Ваша бібліятэка задаволены метадычнай дапамогай па краязнаўстве, аказанай _______________ бібліятэкай:

4 – задаволены (а)

3 – пераважна задаволены (а)

2 – пераважна не задаволены (а)

1 – не задаволены (а)

4.2. Навукова-метадычныя (прафесійныя) мерапрыемствы:

4.2.1. Семінары, нарады, канферэнцыі, школы, круглыя сталы

4.2.2. Прафесійныя стажыроўкі (практыкумы)

4.2.3. Тэматычныя семінары ў фармаце вебінараў

4.2.4. Дадатковыя адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

4.2.5. Выезды з мэтай удзелу ў раённых семінарах і аказання канкрэтнай метадычнай дапамогі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5. Нарматыўныя дакументы, метадычныя, аналітычныя, інфармацыйныя матэрыялы**:

5.1. Задаволенасць матэрыяламі, падрыхтаванымі _____________абласной ці ____________________цэнтральнай раённай/гарадской) бібліятэкамі:

5.1.1. Прывядзіце назвы метадычных матэрыялаў__________________________________________________

5.1.2. Ці адпавядае іх тэматыка Вашым прафесійным інтарэсам па краязнаўстве:

а) так

б) не

5.1.3. Ці маюць метадычныя матэрыялы практычную каштоўнасць і магчымасць выкарыстання ў прафесійнай дзейнасці:

а) так

б) не

**6. Метадычныя кансультацыі:**

6.1. Падкрэсліце форму прадстаўлення метадычных кансультацый:

прадастаўленыя па тэлефоне, у электронным выглядзе, у ходзе прафесійных мерапрыемстваў, у перыяд камандзіровак (індывідуальныя, групавыя, калектыўныя).

6.2. Адзначце адпаведнасць зместу метадычных кансультацый Вашым запытам:

а) так

б) не

6.3. Адзначце адпаведнасць аператыўнасць і своечасовасць атрымання метадычных кансультацый:

а) так

б) не

**7. Правядзенне навуковых даследаванняў:**

а) бібліятэка не праводзіць пошукова-даследчую работу па краязнаўстве;

б) бібліятэка **праводзіць даследаванні па тэмах (назавіце):**

______________________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак В*

ПАЛАЖЭННЕ АБ КРАЯЗНАЎЧЫМ ФОНДЗЕ

ЗМЕСТ

Сфера прымянення ...................
Нарматыўнае забеспячэнне ...........
Склад і структура фонду .........
Камплектаванне фонду .........
Улік і апрацоўка дакументаў фонду ......
Захаванасць фондаў ................
Выкарыстанне фонду ...............
Кіраванне фондам ....................
Адказнасць ..................
Ліст занясення змяненняў .................

**1. Сфера прымянення**

1.1. Краязнаўчы фонд (далей – КФ) з’яўляецца часткай асноўнага фонду Бібліятэкі, фармуліруецца і функцыянуе ва ўзаемадзеянні з ім.

1.2. Краязнаўчы фонд разглядаецца як асабліва каштоўная і ўнікальная частка сукупнага нацыянальнага бібліятэчнага фонду. Дакументы КФ прызначаны для аператыўнага задавальнення інфармацыйных патрэб карыстальнікаў у іх навуковай і вучэбнай дзейнасці, у адукацыйных і культурна-асветніцкіх мэтах.

1.3. Дадзенае Палажэнне аб КФ (далей – Палажэнне) устанаўлівае парадак арганізацыі, фарміравання, захавання і выкарыстання КФ Бібліятэкі. Палажэнне адносіцца да ліку рэгламентуючых і арганізацыйных дакументаў Бібліятэкі.

**2. Нарматыўнае забеспячэнне**

2.1. Кодэкс аб культуры і іншыя нарматыўна-прававыя акты Рэспублікі Беларусь, якія рэгламентуюць гаспадарчую, фінансава-эканамічную і іншыя напрамкі дзейнасці бібліятэкі; пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

2.2. Пастановы, рашэнні, праграмы рэгіянальных органаў улады і ўпраўлення.

2.3. Палажэнне (статут) Бібліятэкі і іншая дакументацыя, якая рэгламентуе дзейнасць Бібліятэкі.

2.4. Палажэнне аб Аддзеле бібліятэчнага краязнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3. Склад і структура фонду**. У краязнаўчы фонд Бібліятэкі ўключаюцца:

3.1. Апублікаваныя дакументы, цалкам прысвечаныя рэгіёну (або любой яго часткі) або змяшчаюць значныя па аб'ёме або каштоўнасці звесткі пра яе, незалежна ад фізічнай формы (друкаваныя, электронныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы, мікрафільмы і мікрафішы), тыпу і віду выдання, мовы, часу і месца выдання.

3.2. Неапублікаваныя дакументы (рукапісы, калекцыі фатаграфій, выяўленчых матэрыялаў і інш.), цалкам прысвечаныя рэгіёну (або любой яе часткі) ці змяшчаюць значныя па аб'ёме або каштоўнасці звесткі пра рэгіён, якія перадаюцца ў Бібліятэку на пастаяннае захоўванне прыватнымі асобамі або ўстановамі.

3.3. Выдадзеныя на тэрыторыі Кемераўскай вобласці, незалежна ад зместу, фізічнай формы (друкаваныя, электронныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы і інш.), тыпу і віду выдання, мовы і часу выдання (у адпаведнасці з функцыямі, замацаванымі за Бібліятэкай у рэгіянальных нарматыўна-прававых актах аб абавязковым экзэмпляры дакументаў).

3.4. Апублікаваныя дакументы, аўтарамі якіх з'яўляюцца прыватныя асобы або ўстановы рэгіёна, незалежна ад фізічнай формы (друкаваныя, электронныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы і інш.), тыпу і віду выдання, мовы, часу і месца выдання.

3.5. Неапублікаваныя дакументы (рукапісы, калекцыі фатаграфій, выяўленчых матэрыялаў і інш.), аўтарамі якіх з'яўляюцца прыватныя асобы або ўстановы рэгіёна, якія перадаюцца ў Бібліятэку на пастаяннае захоўванне.

3.6. Прыярытэтнае значэнне пры фарміраванні краязнаўчага фонду аддаецца: навуковым, навукова-папулярным, даведачным, картаграфічным, літаратурна-мастацкім, мемуарным, інфармацыйным, бібліяграфічным выданням.

3.7. У мэтах забеспячэння надзейнай захаванасці і рацыянальнага выкарыстання краязнаўчых дакументаў вылучаныя самастойныя падфонды асноўнага фонду Бібліятэкі.

3.8. Размяшчэнне дакументаў у фондзе Аддзела краязнаўства ў сістэматычна-алфавітным па раздзелах «Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэк Рэспублікі Беларусь» ці ББК, часткова – тэматычнае і па відах выданняў;

3.9. Фонды спецыялізаваных структурных падраздзяленняў Бібліятэкі; размяшчэнне дакументаў згодна з палажэннем аб фондзе падраздзялення.

**4. Камплектаванне краязнаўчага фонду**

4.1. Камплектаванне КФ з'яўляецца часткай яго фарміравання і ўяўляе сабой вызначэнне, заказ і набыццё дакументаў. Камплектаванне КФ Бібліятэкі ажыццяўляе аддзел камплектавання і апрацоўкі дакументаў. У камплектаванні КФ прымаюць удзел аддзел бібліятэчнага краязнаўства і адказныя асобы структурных падраздзяленняў Бібліятэкі.

4.2. Бібліятэка вядзе сістэматычную працу па выяўленні краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, выкарыстоўваючы для гэтага выдавецкую і кнігагандлёвую інфармацыю, бібліяграфічныя крыніцы, ДБА іншых бібліятэк, непасрэднае абследаванне фондаў, інтэрнэт, краязнаўчыя дакументы і інш.

4.3. Бібліятэка вядзе бягучае і рэтраспектыўнае камплектаванне КФ, выкарыстоўваючы ў якасці крыніц: абавязковы мясцовы экзэмпляр выданняў; дамовы з мясцовымі выдавецкімі ўстановамі і арганізацыямі; падпіску; дар або перадачу; кнігаабмен; куплю (у тым ліку на аўкцыёнах і ў прыватных асоб), капіраванне і рэпрадуктаванне дакументаў (на электронныя, папяровыя носьбіты).

4.4. Краязнаўчы фонд Бібліятэкі камплектуецца выданнямі ад 1 да 5 экзэмпляраў. Тыпы, віды, тэматыку і экзэмплярнасць дакументаў, неабходных для папаўнення краязнаўчага фонду, вызначае Аддзел бібліятэчнага краязнаўства.

4.5. Дакументы, набытыя для КФ Бібліятэкі, размяркоўваюцца паміж структурнымі падраздзяленнямі ў адпаведнасці з іх задачамі і профілем камплектавання. Аддзел краязнаўства карыстаецца пераважным правам у атрыманні краязнаўчых дакументаў.

**5. Улік і апрацоўка дакументаў фонду**

5.1. Краязнаўчы фонд Бібліятэкі падлягае індывідуальнаму і сумарнаму ўліку. Улік руху КФ ажыццяўляецца аддзелам камплектавання і апрацоўкі і структурнымі падраздзяленнямі бібліятэкі, якія маюць фонды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структурныя падраздзяленні, якія забяспечваюць захоўванне і выкарыстанне замацаваных за імі частак краязнаўчага фонду Бібліятэкі, вядуць на яго сумарны ўлік. Бухгалтарскі ўлік вядзецца бухгалтэрыяй.

5.2. Бібліяграфічная апрацоўка дакументаў КФ праводзіцца аддзелам камплектавання і апрацоўкі. У апрацоўцы краязнаўчых дакументаў прымаюць удзел адказныя асобы структурных падраздзяленняў Бібліятэкі.

5.3. Краязнаўчы фонд прадстаўлены ў КДБА Бібліятэкі, які ўключае:

• электронны каталог;

• універсальная бібліяграфічная база даных;

• генеральны алфавітны каталог (службовы);

• каталог (база даных) мясцовых выданняў;

• краязнаўчы сістэматычны каталог;

• электронная паўнатэкставая калекцыя і інш.

**6. Захаванасць фондаў**

6.1. Бібліятэка забяспечвае захаванасць краязнаўчага фонду, якая прадугледжвае:

• рэгулярнае абследаванне фізічнага стану (з вылучэннем экзэмпляраў, якія патрабуюць тэрміновай кансервацыі або рэстаўрацыі, абмежаванні выкарыстання, першачарговага капіравання і інш.);

• кантроль умоў захоўвання і выкарыстання;

• рэгуляванне умоў прадастаўлення карыстальнікам унікальных (неапублікаваных, рэдкіх і наяўных у бібліятэцы ў адзіным экзэмпляры) краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў;

• планамернае стварэнне страхавых копій.

6.2. У мэтах забеспячэння надзейнай захаванасці і рацыянальнага выкарыстання краязнаўчых дакументаў актыўна выкарыстоўваная частка краязнаўчага фонду захоўваецца на адкрытым доступе ў Аддзеле краязнаўства. Асноўная частка КФ захоўваецца ў падфондзе краязнаўчых дакументаў Аддзела захоўвання асноўнага фонду і ўяўляе сабой спецыялізаваную частку асноўнага фонду Бібліятэкі.

На пастаянным захоўванні ў фондах адпаведных спецыялізаваных падраздзяленняў знаходзяцца:

• спецвіды тэхнічнай дакументацыі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• нотныя, выяўленчыя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы;
• выданні на замежных мовах;
• рэдкія выданні, рукапісныя і архіўныя матэрыялы;
• неапублікаваныя дакументы;
• афіцыйныя дакументы мясцовых органаў улады.

**7. Выкарыстанне фонду**

7.1. Краязнаўчы фонд Бібліятэкі выкарыстоўваецца ў рэжыме аператыўнага абслугоўвання і па папярэдняй замове на падставе чытацкага патрабаванні і/або электроннага замовы. Выдача дакументаў з Фонду рэгулюецца Правіламі карыстання Бібліятэкай і правіламі карыстання структурнымі падраздзяленнямі.

7.2. Дакументы з Фонду, якія ёсць у адзіным экзэмпляры, выдаюцца карыстальнікам толькі ў чытальных залах. Бібліятэка мае права ў мэтах забеспячэння захаванасці абмяжоўваць іх выкарыстанне, падаючы карыстальнікам копіі на папяровых, электронных або іншых носьбітах.

7.3. Дакументы з краязнаўчага фонду выдаюцца па МБА і ЭДД у іншыя бібліятэкі, за выключэннем дакументаў, якія ёсць у адзіным экзэмпляры. Для карыстальнікаў могуць быць выраблены копіі з выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве і сумежных правах.

7.4. Карыстальнікі могуць бясплатна атрымліваць у карыстанне краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы і матэрыялы БД, размешчаныя на афіцыйным сайце Бібліятэкі. Пры выкарыстанні дакументаў – спасылка на крыніцу абавязковая.

7.5. Краязнаўчы фонд Бібліятэкі выкарыстоўваецца для арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў у Бібліятэцы і за яе межамі. Раскрыццё і прамоцыя КФ ажыццяўляецца праз індывідуальныя, групавыя і масавыя формы працы (кніжныя выставы, прэзентацыі, літаратурныя вечарыны і інш.).

**8. Упраўленне краязнаўчым фондам**

8.1. Упраўленне КФ уключае планамернае і мэтанакіраванае ўздзеянне на арганізацыю, фарміраванне, захоўванне і выкарыстанне Фонду ў мэтах яго нармальнага функцыянавання і далейшага развіцця. Кіраванне забяспечвае своечасовую карэкціроўку складу і структуры фонду, яго рацыянальнага размяшчэння і выкарыстання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8.2. Адміністрацыйнае кіраванне КФ ажыццяўляецца дырэктарам Бібліятэкі. Метадычнае кіраўніцтва здзяйсняецца аддзелам краязнаўства і Камісіяй па захаванасці фондаў. Аператыўнае кіраўніцтва асобнымі часткамі Фонду праводзіцца кіраўнікамі адпаведных структурных падраздзяленняў. Яно ўключае:

• сумарны ўлік фонду падраздзялення;

• збор і аналіз звестак па ўсіх параметрах камплектавання, арганізацыі і выкарыстання КФ;

• карэкціроўку складу КФ на аснове аналізу эфектыўнасці і якасці працэсаў яго фарміравання;

• кантроль за выкананнем аптымальных рэжымаў захоўвання, захаванасці і выкарыстання дакументаў КФ.

8.3. Упраўленне Фондам выпрацоўваецца на аснове гэтага Палажэння, Палажэння аб Бібліятэцы і іншай дакументацыяй, якая рэгламентуе дзейнасць Бібліятэкі.

**9. Адказнасць** за захаванасць краязнаўчых дакументаў нясуць супрацоўнікі:

9.1. Аддзела захоўвання асноўнага фонду;

9.2. Аддзела краязнаўства і спецыялізаваных структурных падраздзяленняў, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца падфонды краязнаўчага фонду Бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак Г*

# ПАЛАЖЭННЕ АБ ВІРТУАЛЬНАЙ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДАВЕДАЧНАЙ СЛУЖБЕ (ВКДС) (*Прыкладны варыянт*)

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Віртуальная краязнаўчая даведачная служба (ВКДС) працуе на базе краязнаўчага аддзела як адзін з кірункаў даведачна-інфармацыйнай дзейнасці бібліятэкі.

1.2. Дзейнасць ВКДС накіравана на выкананне краязнаўчых запытаў аддаленых карыстальнікаў з выкарыстаннем традыцыйнага і электроннага даведачнага апарата бібліятэкі і рэсурсаў сеткі Інтэрнэт.

1.3. ВКДС размяшчаецца ў сетцы Інтэрнэт на сайце бібліятэкі.

## 2. Асноўныя прынцыпы абслугоўвання:

2.1. Агульнадаступнасць і бясплатнасць для ўсіх карыстальнікаў.

2.2. Аператыўнасць выканання даведак, якая залежыць ад складанасці атрыманых запытаў.

2.3. Абавязковасць выканання прынятых запытаў.

2.4. Карэктнасць узаемных зносін персаналу бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў.

2.5. Канфідэнцыяльнасць інфармацыі пра карыстальнікаў.

## 3. Арганізацыя работы службы

3.1. Запыты карыстальнікаў прымаюцца да выканання ў гадзіны працы бібліятэкі.

3.2. Рабочымі мовамі ВКДС з’яўляюцца беларуская і руская.

3.3. Колькасць выкананых запытаў абмежаваны да трох у дзень.

3.4. Ад аднаго карыстальніка прымаецца толькі адзін запыт у дзень.

3.5. Запыты выконваюцца ў парадку іх атрымання.

3.6. Каардынатар ВКДС – краязнаўчы аддзел (сектар) бібліятэкі.

3.7. Для арганізацыі працы ВКДС прызначаецца супрацоўнік краязнаўчага аддзела, які нясе адказнасць за аператыўнасць і якасць выкананых запытаў. Супрацоўнік (адміністратар) арганізуе працэс функцыянавання ВКДС, правядзенне работ па ўдасканаленні і далейшаму развіццю ВКДС, ажыццяўляе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыспетчарызацыю, каардынацыю і бягучы кантроль запытаў/адказаў.

3.8. Форму адказу выбірае супрацоўнік ВКДС.

3.9. Для выканання запытаў, якія патрабуюць выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў іншых аддзелаў, яны перадаюцца для выканання ў гэтыя аддзелы.

3.10. Праграмная падтрымка ВКДС ажыццяўляецца Аддзелам інфармацыйных тэхналогій бібліятэкі.

**4. Катэгорыі карыстальнікаў**

Абслугоўваюцца ўсе карыстальнікі, якія звярнуліся ў службу, незалежна ад таго, з'яўляюцца яны рэальнымі карыстальнікамі бібліятэкі ці не.

**5. Тыпы выконваемых запытаў**

5.1. Прымаюцца запыты толькі краязнаўчага характару, якія датычацца вобласці.

5.2. Запыты аб наяўнасці канкрэтных выданняў, якія захоўваюцца ў фондах бібліятэкі.

5.3. Тэматычныя запыты, выкананне якіх не патрабуе складанага бібліяграфічнага пошуку.

5.4. Запыты па ўдакладненні элементаў бібліяграфічнага апісання.

5.5. Фактаграфічныя запыты – звесткі аб канкрэтнай падзеі, даце, факце, арганізацыі, персоне.

**6. Якія прадстаўляюцца паслугі**

6.1. Па запыце аб наяўнасці выдання ў фондзе бібліятэкі карыстальнік атрымлівае кароткі адказ з указаннем аддзела захоўвання.

6.2. Па тэматычным запыце карыстальнік атрымлівае бібліяграфічны спіс дакументаў (не больш за 10 найменняў).

6.3. Па ўдакладняльным запыце пра элементы бібліяграфічнага апісання дакументаў карыстальнік атрымлівае адказ з поўным бібліяграфічным апісаннем дакумента.

6.4. Па фактаграфічных запытах карыстальнік атрымлівае даведку з указаннем крыніцы інфармацыі.

6.5. На асобныя запыты карыстальнік атрымлівае спасылку на крыніцу інфармацыі ў інтэрнэце для ажыццяўлення самастойнага пошуку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**7. Тэрміны выканання запытаў**

7.1. Запыты аб наяўнасці канкрэтных выданняў у фондах бібліятэкі выконваюцца на працягу адных сутак.

7.2. Удакладняючыя, фактаграфічныя запыты выконваюцца на працягу 1–3 дзён.

7.3. Тэматычныя запыты ў залежнасці ад складанасці выконваюцца на працягу 1–5 дзён.

**8. Рэсурсная база абслугоўвання**

8.1. Пры выкананні запытаў выкарыстоўваюцца электронныя каталогі і базы даных, інтэрнэт-рэсурсы, картачныя каталогі і картатэкі, іншыя даведачныя і бібліяграфічныя рэсурсы.

8.2. Запыты і выкананыя адказы аўтаматычна генеруюцца ў базе даных «Архіў выкананых даведак» з наяўнасцю пошукавай сістэмы для самастойнага выкарыстання.

**9. Абмежаванні**

9.1. Не выконваюцца запыты, звязаныя з прадстаўленнем інфармацыі забаўляльнага характару (рашэнне крыжаванак, удзел у інтэлектуальных гульнях, віктарынах, конкурсах).

9.2. Не выконваюцца запыты, якія патрабуюць складанага навуковага і прафесійнага пошуку.

9.3. Не прадстаўляюцца скіраваныя тэксты дакументаў.

9.4. У рамках звароту ў ВКДС карыстальнік мае права даслаць толькі адзін запыт у дзень.

9.5. Не выконваюцца запыты на прадстаўленне гатовых рэфератаў, курсавых, дыпломных і іншых відаў пісьмовых работ.

9.6. Не разглядаюцца пытанні, зададзеныя некарэктна. Супрацоўнікі службы маюць права іх выдаляць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**Саітава** Валянціна Іванаўна

# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

Рэдактар В. А. Ляйкоўская
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая
Дызайн вокладкі І. Л. Беланоўская, М. М. Чудук

Падпісана ў друк 01.06.2021. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 10,75. Ул.-выд. арк. 8,81. Тыраж 80 экз. Заказ 698.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ